ARCHE Зьмест № 6’2001 СКАРЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. hato601
3. bulh601
4. bukc601
5. ivac601
6. czyz601
7. zuko601
8. duba601
9. jure601
10. halub601
11. paciu601
12. ahije601
13. pazn601

[image]

A R C H E **S k a r y n a** **№ 6 (20) – 2001**

[image]

[image]

[image]
[image]’[image]2001
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

З ь м е с т

Аляксандар Гатоўскі
Беларускі “эканамічны цуд” 90-х: уява або рэальнасьць?
„Падчас выбарчай кампаніі 2001 году асноўныя кандыдаты на пасаду прэзыдэнта многа гаварылі пра перагляд дагэтуляшняй эканамічнай палітыкі. Як правіла, пры гэтым мелася на ўвазе адмова ад умяшальніцтва дзяржавы ў гаспадарчую дзейнасьць прадпрыемстваў…“ {далей}
Валерка Булгакаў
Дэмакратычная апазыцыя ў пошуках саюзьніка
„Падчас выбарчай кампаніі 2001 году недзяржаўныя СМІ многа гаварылі пра хаўрус паміж намэнклятурай і дэмакратычнай апазыцыяй, які меўся прывесьці да абраньня прэзыдэнтам Беларусі праэўрапейска настроенага палітыка…“ {далей}
Грамадзянін Крынак: з Сакратам Яновічам гутарыць Сямён Букчын
„З Сакратам мы знаёмыя, відаць, ужо больш за 25 год. Наведаў ён калісьці маю менскую кватэру, а я пасядзеў за чаркай у яго ў Беластоку…“ {далей}
Марыюс Івацкявічус
Ці тужаць літоўцы па камунізьме
„Я якраз пераскочыў з адной эпохі ў другую. Зусім не для таго, каб напісаць тэкст пра настальгію па савецкіх часах. Я пасварыўся з жанчынай і з яе шыкоўных апартаментаў у прыгарадзе Вільні перанёсся ў сваю кватэру ў Каралінках…“ {далей}
Кшыштаф Чыжэўскі

Томас Вэнцлава — чалавек зь іншага боку

„“Дуброўнік? Прага? Кракаў? Можа, Сэйны”,— пытаўся ўголас сам у сябе былы дысыдэнт, эмігрант і бадзяга, намагаючыся на мапе сваіх духовых вандраваньняў вызначыць месца жыцьцёвага гнездаваньня…“ {далей}

Даніла Жукоўскі

Чырвоныя зь зялёным і чырвоныя зь белым. Агляд літаратурных часопісаў 2001 году.

„Мне даводзілася чытаць у “Полымі” агляды літаратурных часопісаў, і я дагэтуль дзіўлюся з іхніх аўтараў. Яны пяшчотна парадкавалі пісьменнікаў, драматургаў і паэтаў у шэрагі і калоны адпаведна з векам і родам дзейнасці…“ {далей}

Сяргей Дубавец

Чалавек тугі. Вытлумачэньне Янкі Лучыны.

„Няма тугі па прамінулым XX стагодзьдзі. Бо ўсё лепшае, што за гэты час рабілася ў беларушчыне, само было прадыктаванае тугою па стагодзьдзі дзевятнаццатым. Маю на ўвазе сам дух культуры і культурны кантэкст…“ {далей}

Лявон Юрэвіч

Пераклады эміграцыі

„Пераклад як літаратурны жанр вылучае сярод іншых пэўная безабароннасьць, асабліва ва ўмовах таталітарнай краіны. Бо забараніць грамадзянам думаць і пісаць у роднай мове сваё, патаемнае, вольнае, як мы пераканаліся на лёсе беларускае літаратуры, немагчыма. Зусім іншае — адлучыць ад сусьветнай культуры празь ненавучаньне замежным мовам, праз старанны адбор дазволенага да перакладу дазволенымі перакладчыкамі…“ {далей}

Рэцэнзіі. Палеміка

Леанід Галубовіч

Выйсьці са штольні

Юры Пацюпа

Як Эдвард Кінан выбіў Богу вокны

Уладзімір Агіевіч

Ne sutor ultra crepidam

Валеры Пазьнякоў

Масонскае скарыназнаўства

[image]
[image]

№ 6 (20) – 2001

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2002/11/07
[image]

hato601

Беларускі “эканамічны цуд” 90-х: уява або рэальнасьць?*
Аляксандар Гатоўскі Аляксандар Гатоўскі супрацоўнік Міністэрства эканомікі Беларусі.

* Тэкст паўстаў дзякуючы стажу ў Польшчы, арганізаванаму Фондам Сьцяпана Батуры, Фондам “Ведаць як” і National Endowment for Democracy.

Падчас выбарчай кампаніі 2001 году асноўныя кандыдаты на пасаду прэзыдэнта многа гаварылі пра перагляд дагэтулешняй эканамічнай палітыкі. Як правіла, пры гэтым мелася на ўвазе адмова ад умяшальніцтва дзяржавы ў гаспадарчую дзейнасьць прадпрыемстваў, напрыклад, у рэгуляваньне цэнаў, валютнага курсу і г.д. Але ў перадвыбарных праграмах асноўных кандыдатаў выбарцы так і не пабачылі сумленнай ацэнкі стрэтэгіі эканамічнага разьвіцьця апошніх год. Разам з тым, толькі аналіз эканамічных працэсаў апошніх гадоў, параўнаньне з сытуацыяй у іншых краінах, якія ўдала рэалізавалі рынкавыя рэформы, дазваляе выявіць найбольш пэрспэктыўныя крокі для рэфармаваньня эканомікі Беларусі. Лібэралізацыя пад прымусам? Існуючая ў цяперашні час эканамічная сыстэма была сфармаваная ў 1990—1995 гадох. Цяжка назваць гэта пэрыядам мэтанакіраванага рэфармаваньня беларускай эканомікі, таму што зьмены ўводзіліся, як правіла, нерашуча, пад ціскам абставінаў і з аглядам на суседзяў. У гэты пэрыяд у краіне яшчэ не сфармавалася дастаткова моцная палітычная эліта, здольная распрацаваць і пасьлядоўна рэалізаваць праграму рынкавых рэформаў. Не было і дастаткова актыўнай падтрымкі такіх рэформаў з боку грамадзтва, якое ўспрымала гэтую ідэю хутчэй як модны павеў, прынесены звонку, чымся як аб’ектыўную неабходнасьць. Таму зьмены ў Беларусі ішлі надзвычай павольна, мелі палавіністы характар. Узяць, напрыклад, лібэралізацыю цэн. У Расеі цэны былі цалкам адпушчаны ў студзені 1992 году. Паколькі Беларусь у той час знаходзілася яшчэ ў рублёвай зоне, то й ёй давялося абвясьціць лібэралізацыю са студзеня 1992 году. Аднак, нягледзячы на

дэкляраваны пераход на вольнае цэнаўтварэньне, цэны на асноўныя спажывецкія тавары і паслугі, такія як хлеб, мясамалочныя прадукты, дзіцячыя тавары, жыльлёва-камунальныя і транспартныя паслугі і інш., заставаліся фіксаванымі. Падобным жа чынам пераход на ўласную грашовую адзінку заняў амаль тры гады і быў цалкам завершаны толькі ў верасьні 1994-га. З-за нерашучасьці ў правядзеньні рэформаў эканамічная сытуацыя з 1991 году пачала пагаршацца. Стрымліваньне цэн і затрымка зь пераходам на ўласную грашовую адзінку стварылі дэфіцыт тавараў на ўнутраным рынку. Калі ў Расеі ў 1992 годзе цэны вырасьлі ў 26,11 разу, то ў Беларусі — толькі ў 16,6 разу, што пры адзінай грашовай адзінцы і ўзьніклым камэрцыйным гандлі не магло не прывесьці да татальнага вывазу беларускай прадукцыі за межы краіны. Пры канцы 1992 году ўрад ужо не кантраляваў сытуацыі і тэмпы інфляцыі вырасьлі — 20,97 разу ў 1993 і 20,6 разу ў 1994 гадох, — тады як у Расеі інфляцыя ўжо пайшла на спад — 9,4 і 3,2 разу ў 1993 і 1994 гадох адпаведна. Няскончаная стабілізацыя? Пасьля рэкорднага павышэньня цэнаў у жніўні 1994 году — 53,4 % за месяц — урад адважыўся канчаткова перайсьці на ўласную грашовую адзінку, забараніўшы рабіць на тэрыторыі краіны плацяжы ў любой замежнай валюце. Толькі з гэтага моманту ў Беларусі пачала рэалізоўвацца самастойная грашова-крэдытная палітыка. Ува ўмовах гіпэрінфляцыі прадпрыемствы і гандлёвыя арганізацыі фармавалі цану не ў нацыянальнай валюце, а ў так званых умоўных адзінках, ці, па-простаму, у далярах ЗША. І толькі пры дапамозе бягучага абменнага курсу даляравыя цэны пераводзіліся ў беларускія рублі. Таму спыніць рост цэнаў у краіне можна было, толькі запаволіўшы рост валютнага курсу. У сувязі з гэтым Нацыянальны банк, па-першае, абмежаваў павелічэньне колькасьці беларускіх грошай у эканоміцы, якія насельніцтва і прадпрыемствы імкнуліся адразу ж абмяняць на замежную валюту, што аказвала ціск на валютны курс. І, па-другое, пачаў продаж замежнай валюты ў такіх колькасьцях, што адбылося насычэньне рынку і рост курсу спыніўся, замацаваўшыся з сакавіка 1995 году на адзнацы ў 11 500 беларускіх рублёў за 1 даляр ЗША. Рост цэнаў у эканоміцы пачаў запавольвацца, рэальныя працэнты стаўкі па рублёвых дэпазытах выйшлі на дадатны ўзровень, што паслужыла

дадатковым фактарам стрымліваньня росту грашовай масы ў абарачэньні. Узровень інфляцыі ўпаў з 1960 % прыросту спажывецкіх цэнаў у 1994 годзе да 244 % у 1995 і да 39,3 % у 1996 годзе. Здавалася, што поўны посьпех у барацьбе з інфляцыяй не за гарамі. Аднак у сытуацыю ўмяшаліся палітычныя фактары. Пасьля прыходу да ўлады А. Лукашэнка паспрабаваў адразу ж рашучымі дзеяньнямі (у адпаведнасьці зь перадвыбарнымі абяцаньнямі) “навесьці парадак” у краіне. Найбольш яскравай праявай ягонай палітыкі зьявіўся знакаміты лістападаўскі (1994 году) указ, у якім загадвалася вярнуць назад надзвычай узрослыя цэны на сацыяльна значныя тавары і паслугі. Асноўнай ідэяй новай палітыкі стала падпарадкаваньне эканамічных адносінаў інтарэсам “простых” людзей і фармаваньне грамадзтва сацыяльнай справядлівасьці. У афіцыйнай ідэалёгіі ўзьнік нават спэцыяльны тэрмін для абазначэньня мадэлі беларускай эканомікі — “сацыяльна-арыентаваная рынкавая эканоміка”. У 1996 годзе ў пералік прыярытэтаў дзяржаўнай эканамічнай палітыкі трапляюць жыльлёвае будаўніцтва і сельская гаспадарка. Людзі павінны быць накормленыя, што, на думку афіцыйных ідэолягаў, могуць зрабіць толькі кантраляваныя дзяржавай калгасы, а таксама мець страху над галавой. Паколькі дзяржаўныя фінансы пакідалі жадаць лепшага, то для падтрыманьня калгасаў і будаўніцтва жытла была выкарыстаная эмісійная крыніца фінансаваньня (запушчаны варштат для друкаваньня грошай). Вынік не прымусіў сябе доўга чакаць. Узровень інфляцыі вырас з 39,3 % прыросту спажывецкіх цэн у 1996 годзе да 63,1 % у 1997 годзе, 181,7 % у 1998 годзе і 251,2 % у 1999 годзе. Рэальныя працэнтавыя стаўкі па рублёвых дэпазытах ізноў сталіся адмоўнымі, а рынкавы валютны курс пачаў расьці тэмпамі, якія апярэджвалі цэны. Апроч таго, з-за нежаданьня ўраду прызнаць сваю няздольнасьць стрымліваць рост валютнага курсу ўзьнікла сытуацыя, пры якой Нацыянальны банк устанаўляў свой курс, а камэрцыйныя арганізацыі — свой. Да 1999 году даляр па афіцыйным курсе каштаваў у тры разы таньней, чымся па курсе чорнага рынку, з-за чаго назіраўся надзвычай востры дэфіцыт замежнай валюты. Каб забясьпечыць закупкі неабходных краіне імпартных тавараў, такіх як энэрганосьбіты, лекі, збожжа, цукар і інш., урад быў вымушаны забіраць у экспарцёраў значную частку іх валютнага прыбытку

па афіцыйным абменным курсе. Такім чынам, з-за папулісцкіх мераў новага ўраду фінансавая стабілізацыя беларускай эканомікі так і не была скончаная. Беларускі “эканамічны цуд” Другая палова 1995 — пачатак 1996 году сталі найбольш удалымі з пункту гледжаньня фінансавай стабільнасьці беларускай эканомікі. З канца 1996 году сытуацыя крута мяняецца. Нягледзячы на глыбокі палітычны крызыс, зьвязаны зь пераглядам Канстытуцыі і роспускам парлямэнту, дэвальвацыю рубля і ўзрослую інфляцыю, беларуская прамысловасьць пачала ажываць. У 1997 годзе рост прамысловай вытворчасьці становіцца ўсё больш прыкметным. Калі за папярэдні год быў дасягнуты толькі 3,5 %-ны прырост аб’ёму вытворчасьці, то за гэты статыстыка зафіксавала 18,8 %. На фоне прамысловага спаду ў Расеі і іншых краінах былога Савецкага Саюзу такое ажыўленьне прамысловасьці выглядала эканамічным цудам. А за кошт чаго быў дасягнуты эканамічны рост канца 1996—1997 гадоў? Найперш неабходна адзначыць, што ў гэты і ў папярэдні пэрыяд нейкіх значных інвэстыцыяў у тэхнічнае пераабсталяваньне прадпрыемстваў, у распрацоўку новых узораў прадукцыі не было дый не магло быць, таму што ў эканоміцы ўсё яшчэ пераважала дзяржаўная ўласнасьць. Прыватызацыя ў Беларусі была яшчэ менш пасьпяховай, чым лібэралізацыя і фінансавая стабілізацыя. Нягледзячы на тое, што першыя невялікія прадпрыемствы былі прыватызаваныя яшчэ ў 1990 годзе, да 1996 году толькі 20 % ВУП Беларусі ствараласа на прыватных фірмах, што было найніжэйшым паказьнікам сярод краін былога Савецкага Саюзу (70 % у Расеі, Літве і Эстоніі, 60 % у Латвіі, 55 % ува Ўкраіне і 45 % у Малдове). Віной таму была ўсё тая ж нерашучасьць у правядзеньні эканамічных рэформаў. Закон “Аб разьдзяржаўленьні і прыватызацыі” быў прыняты Вярхоўным Саветам толькі ў 1993 годзе і толькі з чацьвертай спробы, нягледзячы на тое, што ягоныя канцэптуальныя палажэньні былі ўхваленыя яшчэ ў траўні 1991 году. А поўнае заканадаўчае афармленьне беларуская прыватызацыйная стратэгія атрымала толькі ў сярэдзіне 1996 году. Паколькі з канца 1996 году на ўсю моц разгарнулася новая эканамічная палітыка А. Лукашэнкі, то аб прыватызацыі ўжо размовы не ішло, і яна скончылася, так і не пасьпеўшы пачацца. Такім чынам, да пачатку ажыўленьня ў эканоміцы ў прыватнай уласнасьці знаходзіліся толькі невялікія

прадпрыемствы гандлю, побытавага абслугоўваньня, лёгкай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці. А бальшыня прадпрыемстваў знаходзілася ў дзяржаўнай уласнасьці, што не дазваляла прыцягнуць інвэстара, абнавіць вытворчыя фонды і дывэрсыфікаваць выпуск прадукцыі. Адпаведна, рост у прамысловасьці ня быў ініцыяваны прадпрыемствамі. Каб выявіць рухальныя сілы эканамічнага росту канца 1996—1997 гадоў, неабходна зьвярнуцца да сытуацыі 1995 году, калі рэалізоўвалася праграма фінансавай стабілізацыі беларускай эканомікі. Дадзеная праграма ў якасьці асноўнага захаду прадугледжвала жорсткую фіксацыю валютнага курсу з мэтай запавольваньня тэмпаў інфляцыі. Цэлы год — з сакавіка 1995-га да сакавіка 1996-га — валютны курс трымаўся на адзнацы 11 500 беларускіх рублёў за 1 даляр ЗША, тады як цэны ў рублях вырасьлі за гэты пэрыяд у 1,7 разу. Як вынік — страта канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі ня толькі на вонкавым, але й на ўнутраным рынку. Запасы гатовай прадукцыі на складах у той пэрыяд расьлі, а аб'ёмы вытворчасьці падалі. У 1996 годзе адбылася дэвальвацыя беларускага рубля, якая зь лішкам кампэнсавала ранейшае яго ўзмацненьне. Даляравыя цэны рэзка зьнізіліся, збыт прадукцыі за мяжу вырас, яе запасы на складох пачалі скарачацца, прадпрыемствы запрацавалі на поўную магутнасьць, пачалі адклікаць работнікаў з вымушаных адпачынкаў. Такім чынам, рост у прамысловасьці канца 1996—1997 гадоў быў пабочным эфэктам некампэтэнтнай манэтарнай палітыкі органаў дзяржаўнага кіраваньня, якія выкарыстоўвалі эмісійную крыніцу фінасаваньня для крэдытаваньня сельскай гаспадаркі і будаўніцтва і справакавалі дэвальвацыю беларускага рубля. Гэты рост быў дасягнуты толькі за кошт таго, што невялікі пад'ём прыйшоў на зьмену глыбокаму падзеньню. Пры гэтым абсталяваньне ў прамысловасьці не абнаўлялася, новыя ўзоры прадукцыі не распрацоўваліся, а збыт за мяжу стымуляваўся толькі за кошт нізкіх цэн прапановы. Такая стратэгія не прывяла да ліквідаваньня эканамічных праблем, а толькі да адтэрміноўкі іх вырашэньня. Момант ісьціны? Ажыўленьне ў прамысловасьці было выкліканае дэвальвацыяй беларускага рубля, якая прывяла да зьніжэньня даляравых цэнаў экспарту і стымулявала такім чынам збыт прадукцыі за мяжу. У той жа час зьніжэньне цэнаў стала магчымым толькі за кошт падзеньня

сярэдняга заробку ў даляравым выражэньні (пералічаным праз рынкавы валютны курс). У выніку насельніцтва стала працаваць болей за меншую колькасьць даляраў. Каб не дапусьціць падзеньня жыцьцёвага ўзроўню ў краіне, урад пачаў актыўна рэгуляваць спажывецкія цэны і дамогся ў гэтым такога посьпеху, што пры зьніжэньні заробку ў даляровым выражэньні назіраўся рост яго пакупніцкай здольнасьці ў беларускіх таварах і паслугах. Стваралася ўява павышэньня дабрабыту насельніцтва. Сьпярша жорсткае абмежаваньне цэнаў на спажывецкія тавары і паслугі прывяло толькі да зьніжэньня заробкаў у сельскай гаспадарцы проці сярэдняга ўзроўню ў прамысловасьці. Насельніцтва зь сельскай мясцовасьці памкнулася на заробкі ў горад. 2000 год краіна сустрэла з новым прэм'ер-міністрам, якім стаў мэр Менску У. Ярмошын. Зьмена прэм'ера была знакавай для Беларусі. Акурат з гэтага моманту адбываецца паварот у дзяржаўнай эканамічнай палітыцы. У 2000 годзе стала больш жорсткай грашова-крэдытная палітыка, было абмежавана льготнае крэдытаваньне сельскай гаспадаркі і будаўніцтва, ліквідавана множнасьць валютных курсаў, адпушчаныя цэны на харчовыя тавары. Як вынік — зьніжэньне тэмпаў інфляцыі з 251,2 % прыросту спажывецкіх цэнаў у 1999 годзе да 107,5 % у 2000, дадатны прырост сельскагаспадарчай вытворчасьці ўпершыню з 1997 году, рост сярэдняй заработнай платы ў даляравым эквіваленце. І тут выявілася, што, пакуль у Беларусі стымулявалі прамысловасьць дэвальвацыямі, у асноўнага яе гандлёвага партнэра — Расеі — прыватызаваныя прадпрыемствы ня толькі ачомаліся ад крызысу, але і пачалі выпускаць новую, больш якасную прадукцыю, здольную канкураваць зь беларускімі таварамі. Да таго ж Расея пачала абмяжоўваць замежнагандлёвыя бар'еры, што яшчэ больш зьнізіла канкурэнтаздольнасьць тавараў зь Беларусі. У выніку беларускія вытворцы сутыкнуліся зь вельмі непрыемнай дылемай. З аднаго боку, іх прадукцыю куплялі толькі па вельмі нізкіх цэнах, а з другога, рост сярэдняй заработнай платы ў даляравым эквіваленце з-за ўзмацненьня беларускага рубля прывёў да значнага росту выдаткаў вытворчасьці. На пачатак 2001 году ў прамысловасьці налічвалася ўжо 40 % нерэнтабэльных прадпрыемстваў, ізноў пачаўся пераход на няпоўны працоўны тыдзень. Такім чынам, нягледзячы на пяць

год, здавалася б, незвычайнага росту, эканоміка Беларусі вярнулася да пачатковага стану 1995—1996 гадоў з той толькі розьніцай, што сельская гаспадарка аказалася практычна разбуранай, вытворчыя фонды ў прамысловасьці маральна й фізычна састарэлі, а сярэдні заробак у прамысловасьці так і не дасягнуў адзнакі ў 100 даляраў ЗША — узроўню сьнежня 1995 году. Высновы Аналіз дзяржаўнай эканамічнай палітыкі і створанай ёй сытуацыі выяўна паказвае, што апошняе дзесяцігодзьдзе не было для Беларусі пэрыядам рашучага, мэтанакіраванага і пасьлядоўнага рэфармаваньня эканомкі. Калі ў 1990–1995 гадох яшчэ адбываліся нейкія зьмены, выкліканыя тым, што дзеялася ў суседніх краінах былога СССР, то апошнія пяць год назіраліся толькі ваганьні вакол дасягнутага стану — пэрыяд лібэралізацыі зьмяніўся рухам да цэнтралізацыі, пасьля якога ізноў адзначаецца паварот да лібэралізацыі. Трэба, аднак, адзначыць, што ўсе апошнія гады ўрад не забываўся зноўку і зноўку называць эканоміку Беларусі пераходнай. Але пераходны стан мае на ўвазе зьмены, якія радыкальна мяняюць прынцыпы функцыянаваньня ўсёй сыстэмы, і з гэтых пазыцыяў працэсы ў Беларусі выглядаюць хутчэй таптаньнем на месцы, чым рухам у якім-небудзь кірунку. За дзесяць год так званага “пераходу” ўрад так і не распрацаваў аніводнай праграмы рынкавых пераўтварэньняў у Беларусі. Пісаліся праграмы стабілізацыі, сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця, але ня рынкавага рэфармаваньня. Чамусьці лічылася (і лічыцца дагэтуль), што ўсім і так вядома, якія зьмены павінны быць праведзеныя для пабудовы рынкавай эканомікі. І тым больш незразумела, чаму за ўсе гэтыя гады такая праграма не была распрацаваная апазыцыйнымі сіламі. Сёньня Беларусь ізноў робіць крок у бок лібэралізацыі, выкліканы абвастрэньнем нявырашаных эканамічных праблем. Крок гэты пакуль яшчэ нерашучы, з аглядкай назад.

bulh601

Дэмакратычная апазыцыя ў пошуках саюзьніка

Валерка Булгакаў ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ галоўны рэдактар часопісу “ARCHE”, укладальнік зборнікаў “Быць (або ня быць) сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне” (Энцыклапедыкс, 2000), “Палітычная сыстэма Беларусі і прэзыдэнцкія выбары 2001 году” (2001). Апошняя ягоная публікацыя ў часопісе — артыкул “Выбары прэзыдэнта крэолаў” (№ 4-2001).

Падчас выбарчай кампаніі 2001 году недзяржаўныя СМІ многа гаварылі пра хаўрус паміж намэнклятурай і дэмакратычнай апазыцыяй, які меўся прывесьці да абраньня прэзыдэнтам Беларусі праэўрапейска настроенага палітыка. Для навязваньня сувязяў з намэнклятурай дэмакратычнай апазыцыяй быў дэлегаваны былы міністар сельскай гаспадаркі і харчаваньня, а пасьля некаторы час турэмны вязень Васіль Лявонаў. І ўжо зь вясны 2001 году ў недзяржаўнай прэсе пачалі рэгулярна зьяўляцца публікацыі, якія недвухсэнсоўна паказвалі, што праца з намэнклятурай ідзе. 17 красавіка 2001 году “Народная Воля” апублікавала расейскамоўны “Зварот вайскоўцаў запасу да грамадзянаў Рэспублікі Беларусі”, падпісаны дванаццацьма афіцэрамі запасу ў рангу ад генэрал-лейтэнанта да маёра, якія абвінавацілі рэжым Лукашэнкі ў зьніжэньні дабрабыту беларускага народу. 25 траўня тая самая “Народная воля” выдрукавала, гэтым разам на беларускай мове, “Зварот да беларускага народу” групы асобаў, у якой ізноў ладнае месца займалі прадстаўнікі намэнклятуры, што падзялялі дэмакратычныя вартасьці. Падобныя публікацыі зьяўляліся і пасьля. Прыкладна ў гэты самы час у кулюарных размовах шэраг прадстаўнікоў сталічнай дэмакратычнай грамадзкасьці вельмі дадатна выказваліся наконт магчымасьці вылучэньня ў прэзыдэнты Паўла Казлоўскага акурат з той самай прычыны: маўляў, ён пацягне за сабой намэнклятуру, маючы, відаць, на ўвазе, кадравых вайскоўцаў і работнікаў праваахоўных органаў. Ні для кога не было вялікім сакрэтам, што і посьпех Уладзімера

Ганчарыка, які выявіўся ў наданьні яму паўнамоцтваў кандыдата ад шырокай грамадзянскай апазыцыі на прэзыдэнцкіх выбарах, таксама ў вялікай ступені быў абумоўлены яго намэнклятурнай мінуўшчынай. Разьлік рабіўся на катаклізм у намэнклятурным асяродзьдзі, калі зьмена палярнасьці аднаго элемэнту выклікае незваротную ланцуговую рэакцыю. Ідэалягічна хаўрус дэмакратычнай апазыцыі і намэнклятуры ўзяўся абгрунтаваць лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. У сваім опусе "Саюз дэмакратаў і намэнклятуры: пэрспэктывы і рызыкі" ("Народная Воля" ад 11 жніўня) ён пісаў: "Ці можна выйграць палітычную кампанію, менаваную "прэзыдэнцкія выбары"? Безумоўна! Але пры адной умове. Калі будзе саюз дэмакратаў і намэнклятуры". Далей Лябедзька працягвае: "Стаўка была зробленая на кампраміс. Фактычна "пяцёрка" выконвала функцыі пасярэдніка паміж дэмакратамі і намэнклятурай". Апагей выбарчай кампаніі азначыўся малаўцямнымі інвэктывамі на адрас рэжыму з боку былога віцэ-шэфа КДБ і Рады бясьпекі Валера Кеза, генэрал-маёра Валера Паўлава і некаторых іншых "вайсковых пэнсіянэраў". Хоць пры гэтым у пагадненьні "Аб узаемных забавязаньнях адзінага кандыдата і шырокай грамадзянскай кааліцыі падчас і пасьля выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі" тэма гарантыяў для намэнклятуры ў выпадку абраньня прэзыдэнтам дэмакратычнага кандыдата адсутнічала зусім. Да палітычна важкіх наступстваў высілкі па перацягваньні "намэнклятуры" на бок апазыцыі не прывялі. Намэнклятура засталася вернай Аляксандру Лукашэнку. Пасьлявыбарная заява лідэра АГП Анатоля Лябедзькі аб тым, што хаўрус дэмакратычных сілаў з намэнклятурай аказаўся стратэгічна правільным, выглядала на імкненьне схаваць уласную разгубленасьць за нагрувашчаньнем словаў. Перш чым адказаць на пытаньне, у чым прычыны таго, што намэнклятурная міна, падкладзеная пад вынайдзеную лукашэнкаўскім рэжымам канструкцыю ўлады, так і не зацікала, варта адзначыць, што само паняцьце "намэнклятура" ў тым выглядзе, у якім яго ўжываюць дэмакратычныя дзеячы нашай краіны, праблематычнае. Трэба з жалем канстатаваць, што ў іх мысьленьні на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя не адбылося крытычнага пераасэнсаваньня гэтага паняцьця. У пару заняпаду СССР і набыцьця Беларусяй незалежнасьці

“намэнклятура” ўяўляла сабой сынкрэтычнае паняцьце, пад якім разумеліся работнікі партыйных, савецкіх (улучна з прафсаюзамі і іншымі марыянэткавымі грамадзкімі арганізацыямі) і гаспадарчых органаў. Іншымі словамі, пры дзяржаўнай эканоміцы існавала зрашчэньне органаў дзяржаўнай улады і кіраўнічага пэрсаналу суб’ектаў гаспадараньня. Таму на момант распаду СССР і ў першыя гады незалежнасьці Беларусі ў палітычным мысьленьні паняцьце “намэнклятура” разумелася як рэальная крыніца ўлады. Як закрытай палітычнай клясе, якая валодае неабмежаваным уладным патэнцыялам, “намэнклятуры” надаваўся арэол загадкавасьці і ўсёмагутнасьці. За ёй прызнавалася здольнасьць скідаць і прызначаць прэзыдэнтаў і драбнейшых дзяржаўных службоўцаў, вяршыць лёс краіны. Галоўны ўрок выбарчай кампаніі 2001 году палягае ў тым, што такая “намэнклятура” больш не існуе ў беларускай палітычнай рэальнасьці, але працягвае паразытычна існаваць у мысьленьні дэмакратычных лідэраў. Заснаваная на гэтым анахранічным паняцьці “намэнклятуры” перадвыбарная праграма дэмакратычных сілаў мела выразна ўтапійны характар, што зрабіла свой унёсак у канфузную паразу 9 верасьня. Тое, што дэмакратычныя лідэры “праспалі” важныя працэсы ў палітычнай гісторыі Беларусі, наводзіць на горкія роздумы. “Усёмагутная” намэнклятура адышла ў нябыт разам з абраньнем Аляксандра Лукашэнкі прэзыдэнтам Беларусі ў 1994 годзе. Створаны Лукашэнкам рэжым пасьлядоўна ажыцьцяўляў дэпрыватызацыю ўлады, г.зн. запабягаў зрастаньню дзяржаўнага апарату і гаспадарчых элітаў, калі першы робіцца простым выканальнікам волі найбуйнейшых алігархічных груповак. Гэтаму спрыяла кадравая палітыка Лукашэнкі, накіраваная на нэўтралізацыю “кебічаўскіх намэнклятурнікаў” на чале зь Міхаілам Мясьніковічам дзякуючы ўзмацненьню выхадцаў з праваахоўных органаў на чале зь Віктарам Шэйманам і Ўралам Латыпавым. Шматзначная пасьлявыбарная адстаўка Міхаіла Мясьніковіча з пасады кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта і прыход на гэтую пасаду былога загадчыка катэдры спэцдысцыплінаў Вышэйшых курсаў КГБ СССР (цяперашняга Інстытуту нацыянальнай бясьпекі Рэспублікі Беларусі) Урала Латыпава зь яго найбліжэйшымі паплечнікамі сьцьвердзіла перш-наперш канчатковую маргіналізацыю “кебічаўскіх на-

мэнклятурнікаў”. Іх палітычная вага цяпер настолькі малая, што найбліжэйшае абкружэньне Лукашэнкі з кадэбісцкім мінулым перастае зь імі лічыцца. Гэта таксама азначае, што цяперашняя лукашэнкаўская кліка нарэшце дасягнула змогі кантраляваць прамысловы сэктар эканомікі і фінансавую сыстэму краіны без дакучлівых пасярэднікаў у выглядзе “кебічаўскіх кадраў”. Гэтаму ў вялікай меры паспрыяла функцыянальная дзеяздольнасьць дзяржаўнай бюракратыі, або дзяржапарату, які цягам апошніх гадоў мэтаскіравана ачышчалі ад “выпадковых” элемэнтаў. На момант выбарчай кампаніі 2001 году “намэнклятуры” як такой ужо не існавала. Яе касьцяк, кебічаўскія гаспадарнікі, імкліва губляў сваю палітычную ўвагу, заснаваную на канвэртацыі сувязяў з дырэктарамі буйных прамысловых прадпрыемстваў, кіраўнікамі банкаў і г.д. у палітычны капітал. Дзяржаўная бюракратыя захоўвала сваю ляяльнасьць рэжыму дзякуючы сваёй карпаратыўнай этыцы. Пры гэтым лукашэнкаўская прапаганда эфэктыўна палохала яе стратай яе пазыцый у будучыні, выстаўляючы нацыянальную дэмакратыю ў якасьці сілы, якая прагне разбурыць сфармаваную за дзесяць гадоў беларускай незалежнасьці сыстэму дзяржаўнай улады, а значыць здольную пахіснуць “прыродную” раўнавагу палітычных адносінаў у беларускім грамадзтве. Нарэшце, была яшчэ адна сіла, якая часткова разьвілася з “намэнклятуры” пачаткаў беларускай незалежнасьці — новыя фінансава-прамысловыя эліты. Лідэры дэмсілаў, застаючыся ў палоне ўласных жа стэрэатыпаў аб антырынкавым характары беларускай эканомікі, традыцыйна ігнаравалі кантакты зь імі. Зь якой жа тады “намэнклятурай” так заўзята навязвалі кантакты дэмакратычныя дзеячы? Па сутнасьці, уся іх праца па “разлажэньні” намэнклятуры зьвялася да перацягваньня на свой бок былых работнікаў дзяржапарату накшталт Валера Кеза, якія адышлі ад актыўнай прафэсійнай дзейнасьці. Зьвёўшыся да працы з адстаўнымі або другараднымі работнікамі дзяржапарату, якія прадстаўлялі толькі саміх сябе з сваімі крыўдамі і амбіцыямі, намэнклятурны фронт беларускай апазыцыі ператварыўся ў пародыю на самога сябе. Параза 9 верасьня ня зьняла цалкам прыроднага пытаньня пра пошук дэмакратычнай апазыцыяй хаўрусьнікаў для дасягненьня сваіх палітычных мэтаў. Больш за тое, яна з усёй відавочнасьцю паказала, што датуль, дакуль палітычныя партыі, выбарчыя

блёкі і шырокія грамадзянскія кааліцыі не займеюць моцнай зваротнай сувязі з усім грамадствам, не паставяць па-над усім у сваёй актыўнасьці эканамічныя інтарэсы айчыннага вытворцы і сацыяльныя спадзяваньні асноўных грамадзкіх групаў, яны застануцца адно марыянэткамі ў руках тых ці іншых сілаў, схільных да махінацый і маніпуляцый. І будуць скаланацца ўнутранымі інтрыгамі, бо толькі слабасьць і няпэўнасьць саміх сябе партыйных (і, шырэй, палітычных) лідэраў ёсьць зарукай іх залежнасьці ад вонкавых рэсурсаў існаваньня. Разглядаючы пытаньне пра магчымых хаўрусьнікаў дэмакратычных сілаў, трэба здаваць сабе справу з таго, што старыя кебічаўскія намэнклятурнікі фактычна выціснутыя на пэрыфэрыю палітычнага жыцьця, дзяржаўная бюракратыя дэмаралізаваная і атамізаваная дзякуючы майстэрскай кадравай палітыцы Лукашэнкі, а таксама карпаратыўнай этыцы і групавой салідарнасьці, навязанай ёй рэжымам. Таму нельга не сканстатаваць, што адзінай палітычна значнай сілай, якая валодае неабыякім матэрыяльным і нават адміністрацыйным патэнцыялам і якая да таго ж моцна расчараваная ў папулісцкай палітыцы беларускага кіраўніцтва, у культываваным ім ідэале сацыяльнай роўнасьці, застаюцца бізнэс-эліты зь іх асноўным прынцыпам — дасягненьнем максымальнага прыбытку. Зь першых ста дзён другой Лукашэнкавай кадэнцыі вынікае, што акурат прамыслова-фінансавыя эліты, або, шырэй, узьнікаючую клясу буржуазіі і буйных прыватных вытворцаў, а таксама новапаўсталыя “змычкі” паміж ёй і дзяржаўнай бюракратыяй беларускі рэжым уважае за найбольшую небясьпеку свайму панаваньню. Тыя акцыі дэманстрацыйнага запалохваньня, якія былі зьдзейсьненыя ўладамі зь верасьня да студзеня і якія атрымалі гучны розгалас, былі скіраваныя пераважна якраз на гэтыя бізнэс-эліты (арышты кіраўнікоў адносна самастойных з эканамічнага пункту гледжаньня прамысловых прадпрыемстваў, а таксама рынкаў і, што асабліва паказальна, крымінальныя скандалы вакол асобаў экс-начальніка Беларускай чыгункі Віктара Рахманька і экс-дырэктара МТЗ Міхаіла Лявонава, якія, паводле афіцыйнай інфармацыі, дапусьціліся да шкоды дзяржаве, даючы выгадныя кантракты прыватным фірмам). На фоне рэзкага абвастрэньня адносінаў паміж лукашэнкаўскай дзяржавай і прамыслова-эканамічнымі

элітамі нельга не зьвярнуць увагі на адносную пасіўнасьць лукашэнкаўцаў у дачыненьні да дэмакратычнай апазыцыі. У гэтым абсягу падзеі ста дзён мелі значна меншую інтэнсіўнасьць — паціху тлеў ініцыяваны, магчыма, беларускімі спэцслужбамі мэдыйны скандал, зьвязаны зь фінансавымі злоўжываньнямі беларускай апазыцыі (на думку аб удзеле спэцслужбаў у гэтым скандале наводзіць яго характар: асноўныя абвінавачаньні ў нямэтавым выкарыстаньні грошай прагучалі з вуснаў апазыцыйных жа палітыкаў — Аляксандра Фядуты, Мікалая Статкевіча і Барыса Гюнтэра; пасьля абвіначаваньняў не адбылося ніякіх захадаў з боку дзяржаўных праваахоўных органаў, хай сабе нейкай “пракурорскай праверкі”; гэтая паказная нэўтральнасьць дзяржавы толькі паглыбляла прапагандысцкі эфэкт акцыі: маўляў, апазыцыя загрузла ўва ўласным брудзе, і ніхто з гэтым рады даць ня зможа). Увагу некаторых назіральнікаў таксама прыцягнула інфармацыя ў “Белорусской деловой газете”, згодна зь якой цяперашні кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Ўрал Латыпаў мяркуе стварыць масавую палітычную партыю “сацыял-дэмакратычнай” арыентацыі. Аднак гэтая сюжэтная лінія не атрымала разьвіцьця, з чаго найхутчэй вынікае, што найбліжэйшым часам партыйныя краявіды ў Беларусі мала зьменяцца. Рэжым здолеў падпарадкаваць сабе дзяржапарат, але ня змог падпарадкаваць новых прамыслова-фінансавых эліт. Падпарадкаваньне апошніх — фактычна невыканальная мэта для яго, бо яны ня будуць цалкам кантраляваць датуль, пакуль існуе прыватнакапіталістычны сэктар эканомікі. Нізкая інтэнсіўнасьць захадаў супраць апазыцыі з боку рэжыму паказвае, што магутныя аналітычныя службы пры Радзе бясьпекі не ўважаюць яе за рэальную пагрозу. Зусім інакш зь бізнэс-элітамі: крымінальны перасьлед іх выбітных прадстаўнікоў, вядомых усёй краіне, вымоўна паказвае ўзрастаньне іх значэньня ў эканамічным і, як вынік, у палітычным жыцьці краіны. Можна канстатаваць, што сёньня склаліся дзьве апазыцыі Лукашэнку і створанаму ім рэжыму ўлады. Фармальна неляяльная, але гатовая дзейнічаць толькі ў канстытуцыйных рамках нацыянал-дэмакратыя і фармальна ляяльныя, а насамрэч схільныя да закулісных камбінацыяў бізнэс-эліты. Калі нацыянальнай дэмакратыяй палітычная актыўнасьць зьдзяйсьняецца зь вялікай мерай публічнасьці, то

групы ўплыву бізнэс-элітаў стараюцца ніяк не афішаваць сваіх інтарэсаў і захадаў. Пры гэтым бізнэс-эліты — вельмі дынамічная сіла, чый палітычны капітал увесь час павялічваецца і будзе павялічвацца ў меру трансфармацыі беларускай эканомікі. Факт утварэньня дзьвюх апазыцый рэжыму Лукашэнкі не азначае, што дэмакратычныя сілы канечне пойдуць на хаўрус зь бізнэс-элітамі, каб дасягнуць сваёй стратэгічнай мэты — пераняцьця палітычнай улады ў краіне, хаця гэткага сцэнару разьвіцьця падзеяў нельга выключаць. На працягу чарговага тэрміну прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі дэмсілы сутыкнуцца зь неабходнасьцю выбару паміж трыма стратэгіямі палітычнай барацьбы: або захаваць ранейшы палітычны курс на альянс з "намэнклятурай", зразуметай як работнікі дзяржаўнага апарату, адхіляючы ўсе закіды наконт нежыцьцяздольнасьці гэтага альянсу; або адмовіцца ад любых кантактаў з "намэнклятурай" у сьвятле іх палітычнай неэфэктыўнасьці, культывуючы палітычную "цнатлівасьць" у духу Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ; або намацваць пункты палітычнага судакраненьня, завязваць дыялёг з новымі бізнэс-элітамі, які пры памысным зьбегу абставінаў неўпрыкметку можа перарасьці ў рэалізацыю супольных праектаў па палітычным пераўладкаваньні краіны. Пры гэтым трэба ўлічваць, што стратэгічныя інтарэсы дэмсілаў і бізнэс-элітаў наагул супадаюць — і першыя, і другія зацікаўленыя ў ператварэньні Беларусі ў буржуазную рэспубліку зь вялікай доляй прыватнаэканамічнага сэктару і лібэральнай эканамічнай палітыкай. Разыходжаньні ж непазьбежна пачнуцца толькі пры абмеркаваньні культурнай палітыкі і ідэалягічнага самавызначэньня дзяржавы. Праблематычнасьць альянсу нацыянал-дэмакратыі зь бізнэс-элітамі палягае ў тым, што апошнія пераважна расейскамоўныя і расейскакультурныя, нярэдка карумпаваныя, што яны традыцыйна ўспрымаюць Расію перш за ўсё як агромністы выгадны замежны рынак. Пры гэтым у беларускіх бізнэс-элітах параўнальна нізкая ўдзельная вага этнічных беларусаў. Беларусы ўва ўмовах савецкага, а цяпер постсавецкага культурнага каляніялізму застаюцца далёка ня самай сацыяльна мабільнай этнічнай групай у беларускім грамадзтве, нягледзячы на сваё фармальнае першынство (сацыяльная мабільнасьць вышэйшая ў касмапалітычных

носьбітаў сацыяльна больш прэстыжнай культуры некарэннага насельніцтва). Яшчэ адна важная перашкода палягае ў тым, што бізнэс-эліты баяцца іміджу “апазыцыйнасьці”, бо набыцьцё такога іміджу найчасьцей азначае пагрозу для іх прафэсійнай дзейнасьці. У гэтым сэнсе варта ўлічыць досьвед палітычнай камунікацыі зь бізнэс-элітамі, які на мінулых прэзыдэнцкіх выбарах прадэманстравалі, нягледзячы на ўсю двухсэнсоўнасьць іхнага палітычнага статусу, Леанід Сініцын і Міхаіл Марыніч, а менавіта: беларускай апазыцыі ня варта чакаць знакаў увагі з боку новых беларускіх бізнэсоўцаў, але трэба палітычнымі сродкамі мэтакіравана і рашуча змагацца за прызнаньне гэтай сацыяльнай групай сябе ў якасьці прадстаўніка інтарэсаў вытворцаў і ўласьнікаў у агульнанацыянальным маштабе. Прэзыдэнцкія выбары 2001 году сапраўды сталіся этапнай падзеяй для дэмакратычных сілаў, бо яны ўпершыню з такой сілай паказалі ўсяму грамадзтву іх жаданьне ісьці на альянс зь іншымі палітычнымі сіламі. Зь іншага боку, гэтае жаданьне засьведчыла цьвярозую ацэнку стратэгамі дэмсілаў бягучай палітычнай сытуацыі: яно дэ-факта было прызнаньнем таго, што дэмсілы ня ў стане дабіцца ўлады ў краіне самастойна.

bukc601

Грамадзянін Крынак З Сакратам Яновічам гутарыць Сямён Букчын СЯМЁН БУКЧЫН публіцыст, літаратуразнаўца, дасьледчык беларуска-расейска-польскіх літаратурных сувязяў, творчасьці Пушкіна і Гогаля і іхнай сувязі зь Беларусяй. Жыве й працуе ў Варшаве. Аўтар кнігі “Белорусская трагедия” (2000).

Сакрат Яновіч эсэіст, празаік, выдавец альманаху Annus Alboruthenicus. Апошняя кніга Сакрата Яновіча — кніга эсэ “Ojczystoњж. Biaioruskie њlady i znaki” (Культурная супольнасьць “Borussia”, 2001). Апошняя публікацыя — артыкул “Украінства ў беластоцкім краі: ілюзіі за грошы” ўва “Ўкраінскім” нумары “ARCHE”.

З Сакратам мы знаёмыя, відаць, ужо больш за 25 год. Наведаў ён калісьці маю менскую кватэру, а я пасядзеў за чаркай у яго ў Беластоку. Было й ліставаньне, і абмен кніжкамі... Даўнавата гэта ўсё... Але вось у Крынках, гэтай сакратаўскай Ёкнапатофе, давялося пабываць зусім нядаўна. Пачуцьцё, што Сакрат — гэта своеасаблівы Фолкнэр Крэсаў, жыло ўва мне, але ўзмацнілася тут, у Польшчы, падчас майго ўжо больш як трохгадовага тутэйшага побыту. Тры гады жыву ў Варшаве і вось толькі пад канец мінулага верасьня выбраўся ў Крынкі. Я даўно прагнуў гэтага падарожжа. І пабачыў і адчуў тое, што і хацеў, і спадзяваўся пабачыць і адчуць. Мала кранутую цывілізацыяй зеляніну палеткаў, шэрасьць і правінцыйную таямнічасьць Крынак — гэтых струхлелых драўляных дамкоў і абшарпаных камяніцаў. І гэта Villa Sokrates — звычайная местачковая забудова, хаця ж і дагледжаная, і даволі прасторная, нават са спартанскім гатэлікам на чатыры ложкі на паддашку. Насупраць, на той жа вуліцы Сакольскай, месьціцца сапраўдная віла — аздобленая ці не барокавымі акрасамі трохпавярховая камяніца. І як выклік і ёй, і Эўропе, і ўсяму сьвету — тыпова местачковая Villa Sokrates, былы бацькоўскі дом, які Сакрат напачатку аплянаваў зграбным плотам, а потым вырамантаваў і, як сам піша, “дубападобную панэль і мэблю заказаў у былым павятовым горадзе ў хвацкага сталяра”. І мы сядзелі за гэтым

раблезіянскіх памераў сталом і гутарылі… І мацнела адчуваньне, што тут жыве Фолкнэр Крэсаў. Ці не зачаста згадваю-прыцягваю імя славутага амэрыканца? Што рабіць? Усе мы бедныя ў пошуках дакладных вобразаў і параўнаньняў. Але не магу пазбавіцца адчуваньня блізкасьці сьвету сакратаўскіх Крынак і сьвету фолкнэраўскай Ёкнапатофы. Ці гэта так важна, што Крынкі недалёка ад Беластоку, раптоўнае зьнікненьне якога, лічыць Сакрат, у Польшчы заўважылі б хіба на трэці дзень, а тая вымысьленая Ёкнапатофа — у нейкім затурканым штаце на амэрыканскай поўначы? Дакладная акрэсьленасьць местачковых характараў, праблемнасьць правінцыйнага жыцьця як выдатнага эпасу, як Сусьвету, які тут пачынаецца і тутака ж заканчваецца. Бо далей — чужое, незразумелае, можа, і нялюдзкае. Бо нездарма ж калісьці ў Крынках і ваколіцах лічылі, што ёсьць адна сапраўдная мова — беларуская… І мова жыхароў Ёкнапатофы, яна адзіная на ўвесь сьвет. Я не люблю слова “крэсы”. Ёсьць штосьці абразьлівае, могілкавае, занядбанае… Але ж іншага няма. Таму пішу Крэсы — хаця б зь вялікай літары. Няхай будзе азначэньнем краіны. Польскай Беларусі. Хто Сакрат у гэтай краіне? Беларускі аятала, які змагаецца зь няверным — рознымі ворагамі беларушчыны, што галоўным чынам увасобіліся ў тутэйшай польскай бюракратыі? Прарок, што апявае “доўгую сьмерць Крынак”? Хітраваты польска-беларускі Леў Талстой, які зразумеў, што лепш зьмяніць звычайную кватэрку ў шэрым беластоцкім блёку на экзатычнае жытло ў Крынках і ператварыць яго ў сваю Ясную Паляну, гэта значыць у Villa Sokrates? Варта паглядзець, як шасьцідзесяціпяцігадовы Сакрат паволі рухаецца па крынкаўскіх завулках у сваім модным (хутчэй старамодным, але падкрэсьлена інтэлігенцкім) чорным палітоне з пасам, у чорным — але, зразумела, пісьменьніцкім — капялюшыку, як ветліва здароўкаюцца зь ім і дарослыя, і дзеці, як ён пры гэтым прыўздымае свой капялюшык… Ну чысты тэатар! Але ж гэта вам ня Леў Талстой у ботах і падперазанай раменьчыкам кашулі. Гэта, браткі, Эўропа, хай сабе і зьмешчаная паміж Супрасьлем і Гайнаўкай. І ведаеце, чаму Эўропа? Таму што ў Крынках выходзіць раз на месяц свая газэта, дарэчы, звонку падобная да часопісу. Яна называецца “Tutaj w Krynkach i okolicy”, і ў ёй Сакрат піша не на “адвечныя” талстоўскія тэмы, а, напрыклад, пра зьдзічэлых, кінутых сваімі гаспадарамі

крынкаўскіх сабакаў, якія зьвягаюць уночы і ўвогуле нясуць небясьпеку. І яшчэ адно... Падчас нашага спатканьня без усялякага папярэджаньня, проста самавольна, увайшоў у хату нейкі мужык, здаецца, трохі нападпітку, і даволі бесцырымонна, бы так і мае быць, папрасіў, каб Сакрат зрабіў яму канапку. І Сакрат моўчкі, літаральна ані слова ня кажучы, зрабіў і падаў... Вось, можа, сапраўднае наканаваньне пісьменьніка — ратаваць сваіх суайчыньнікаў ад захворваньня на вар'яцтва і рабіць для іх бутэрброды.

— Слухай, Сакраце, а можа, і сапраўды — гэта найважнейшае? Каго, урэшце, ратавала тая літаратура, культура? — Ня будзем абсалютызаваць... І артыкул пра бяздомных сабакаў у мясцовай газэце, і канапка для жабрака — гэта звычайныя справы. Як, дарэчы, і тое, што вось Букчын прыехаў і хоча пагутарыць на нейкія важкія тэмы... — Але ж жыцьцё пісьменьніка на правінцыі вымагае пэўных паводзінаў... — Калі б я быў сапраўдным правінцыялам, дык усчыніў бы таму жабраку скандал. Чаго ты, да халеры, прыпёрся, калі ў мяне такі важны госьць з Варшавы? Я б саромеўся яго... — Ну добра, гэта натуральнасьць паводзінаў натуральнага чалавека. Але ж ёсьць такая зьява — правінцыйнасьць у літаратуры? — Слухай, людзі чамусьці ня ведаюць, што няма правінцыі. Цемра страшэнная! Дактары навук ня ведаюць гісторыі літаратуры! — Абсалютна разумею, дружа, у чый гэта бок... — Ну, дык ці трэба тлумачыць, што праблемы памежжа — гэта праблемы глябальныя? Гэта ня ёсьць праблемамі той жа Беласточчыны. Гэта ж наша шчасьце, што мы жывем на сутыку дзьвюх ці трох культур. Нядаўна я казаў палякам на сустрэчы ў Гданьску: я вам вельмі спачуваю, таму што я, як беларус, народжаны на сутыку Беларусі і Польшчы, ужо даўно ў Эўропе, а вы яшчэ — не... — А яны дзе ж, твае слухачы-палякі? Ці ня згодна з пэўнай, вядома дрэннай, традыцыяй, калі ты ў Эўропе, дык яны ў... гэтай самай... Спадабаўся ім гэты камплімэнт? — Вядома, шуму нарабілі... Хтосьці выгукнуў: мо ён піша па-ангельску? Але ж кніжная мова мяне не цікавіць. Справа ў тым, што я ад малога рос у дзьвюх культурах. У этнічнай, натуральнай, беларускай, а ўсё мае далейшае выхаваньне, адукацыя адбываліся ў культуры польскай. А яшчэ ж даходзіла й расейскае, праз царкву, вядома... Няма нічога больш кепскага для культуры, калі яна

замкнутая ў самой сабе. Тады яна задыхаецца. Тым слухачам у Гданьску я прыпомніў, што Пілсудзкі параўноўваў Польшчу з абаранкам, які смачнейшы па краях. А чаму Міцкевіч нарадзіўся ня ў Познані ці Варшаве, а ў нейкім заглухлым Навагрудку, Славацкі — у заходнеўкраінскім мястэчку? Паглядзіце ў энцыкляпэдыі — чаму так мала польскіх пісьменнікаў ад Кракава, ад Познані, нават з Варшавы? У апошняй яны жывуць, але таленты нараджаюцца на так званай правінцыі. А марнуюцца ўжо ў сталіцы, дзе ствараецца сытуацыя рынку. А хіба Пушкін, Лермантаў — гэта не памежныя людзі? Першы — гэта скрыжаваньне ня толькі расаў, але і культураў — расейскай і французскай. Пушкін усё жыцьцё гаварыў з выразным французскім акцэнтам. Лермантаў — гэта скрыжаваньне шатляндзка-славянскае. Я чытаў аднаго аўтара, які даводзіць, што расейская мова ў Гогаля вельмі ўкраінская... — А можа, таксама ня будзем абсалютызаваць гэтага памежнага паходжаньня? Так, усе гэтыя рэчы вядомыя — скрыжаваньне культураў, узаемаўзбагачэньне, я сам пра гэта шмат пісаў, калі працаваў у Інстытуце літаратуры Акадэміі навук. Ні ад чога не адракаюся... Але ж Пушкін — гэта перш за ўсё не французскі пранонс, а вось гэта: “Здесь русский дух, здесь Русью пахнет”. І Лермантаў — гэта перш за ўсё не шатляндзкі міт пра нейкага сярэднявечнага Лерманта, а Тарханы, як для цябе Крынкі. А яшчэ ёсьць расейская тэорыя культурных гнёздаў... Тая ж Арлоўшчына — гэта ж глыбінная Расея, але колькі таленавітых птушак вылецела з гэтага гнязда — Тургенеў, Бунін, Леанід Андрэеў... — Дый я ж не пад уласнае становішча тэорыю будую! Я пра тое, што раса падлягае дэгенэрацыі, калі няма даплыву іншай крыві. І тое самае робіцца з культурай. Нацыяналізм нацыянальную культуру душыць. Французская культура такая магутная таму, што адкрытая. У ёй, можа найменш “чыстых” французаў. Там запрацавалі скрыжаваньні. Як і ў прыродзе — у культуры скрыжаваньні даюць новыя гатункі. А гісторыя нацыяў — хіба гэта не гісторыя безупынных скрыжаваньняў? Расейцы — гэта славяне, вугра-фіны і хто там яшчэ... Украінцы — гэта скіты і славяне. Беларусы — фактычна аславяненыя балты. Дзевяноста працэнтаў нашых генаў супадаюць з генамі цяперашніх літоўцаў. — Каб яшчэ з гэтымі генамі перанялося імкненьне да сапраўднай нацыянальнай незалежнасьці і культуры... Але вернемся да праблемаў культуры. Дакладней —

да ролі культурных цэнтраў. Страшэннай трагедыяй, можна сказаць, культурнай катастрофай, было закрыццё Віленскага ўнівэрсытэту пасьля паўстаньня 1830 году. Але ў пэўнай ступені — непараўнальна, вядома, — замянілі яго Пецярбурскі, Маскоўскі, Харкаўскі, Кіеўскі ўнівэрсытэты... Там польская і беларуская моладзь ня толькі атрымлівала адукацыю, але й нацыянальна кшталтавалася. Пецярбург першай паловы XIX стагодзьдзя, дый у пэўнай ступені другой, — гэта досыць касмапалітычны культурны цэнтар. Прэса, кнігі на розных мовах... Усе значныя выданьні Шаўчэнкі, пачынаючы з “Кабзара”, выходзілі ў расейскай сталіцы. Талент Міцкевіча сталеў у літаратурных салёнах Пецярбургу, побач з Пушкіным і Жукоўскім... Той жа салён Зінаіды Валконскай... Для Гемінгуэя і Фіцджэральда вельмі значную ролю адыграў парыскі гурток Гертруды Стайн. Такім чынам, роля культурных цэнтраў неаспрэчная, што б мы ні гаварылі пра ўзбагачанае памежнасьцю паходжаньне творцы. Ці твая Villa Sokrates — гэта ня спроба стварэньня такога цэнтру? Тут жа зьбіраюцца ў цябе пагутарыць пра лёсы беларускія людзі з самых розных краінаў... — Villa Sokrates існуе, Сямёне, не для беларусаў, а для беларускай культуры, асабліва літаратуры, якую трэба засвоіць Эўропе. Таму працуем на ўсіх заходніх мовах, як і перакладаем адтуль на беларускую. У Villa Sokrates пераважаюць немцы, французы, ангельцы, швэды... Бачыш, у ранейшыя часы такая зьява, як Villa Sokrates, была немагчымая. Цяпер вельмі значную ролю адыгрываюць тэхналёгіі. Седзячы вось за гэтым сталом, я маю сувязь з усім сьветам. Справа ня толькі ў Інтэрнэце. Дарэчы, я ня маю кампутара, але памочнікаў з гэтай страшэннай для мяне сфэры багата. Кожная эпоха мае свае магчымасьці. Калі мне трэба ў Бэрлін, дык я ня мушу ехаць два тыдні. Я еду ад шасьцёх да васьмёх гадзін. Мне падабаецца амэрыканскае паняцьце — глябальная вёска. Тут зьнікае ўся мэтафізыка гораду. Горад усё ж такі выкліканы патрэбамі перш за ўсё эканамічнымі. Ідэал — гэта дэцэнтралізацыя гораду. Я еду сто кілямэтраў па Нью-Ёрку, а горад усё не канчаецца. Амэрыканскія гарады даюць візуальна смак таго, што мае быць. Ёсьць цэнтар, Сыты, а рэшта — тая самая вёска. — А дзе ж месца той самай традыцыйнай вёскі? — Сьвет ідзе ад цывілізацыі поля і хлява да цывілізацыі гораду і лесу. Зьнікае праблема прадукцыі. Але ўзьнікае праблема духу. Галодныя ня

вешаюцца, яны шукаюць ежы. Чамусьці вешаюцца заможныя. — Так, сумны досьвед Данії, Швайцарыі... — Дзякаваць Богу, нам да гэтага далёка... Але і ў нас хлеб будзе проста таварам, ня чымсьці сьвятым. Знаёмы фэрмэр у Канадзе разам з сынам робяць на зямлі чатырыста гэктараў. Але яны да зямлі не датыкаюцца. Глябалізацыя нараджае новую камунікацыю. Чалавек ужо ня ёсьць такім ізаляваным. — А што рабіць зь вядомымі пратэстамі антыглябалістаў? — Прадукцыю для сотні чалавек могуць вырабіць дваццаць. Што рабіць з астатнімі? Чалавек не пасьпявае за грамадзкімі і эканамічнымі зьменамі. У Крынках сёньня семдзесят працэнтаў людзей ня маюць работы і ня будуць яе мець. У заможных краінах плацяць людзям, якія нават абавязваюцца, што ня будуць шукаць работы. У тых жа Нідэрляндах плаціць чалавеку нейкі засілак, каб ён мог нармальна жыць, менш каштуе, чым стварыць для яго новае месца працы. Але ж у нас гэта немагчыма. І што рабіць сапраўды з тымі, што складаюць восемдзесят працэнтаў, гэтак званымі лішнімі людзьмі ў беспасярэднім ужо сэнсе гэтага слова? Польшча — бедная краіна. Зрабіць зь іх інтэлектуалаў? Але ж колькі на гэта трэба часу? Пакаленьні... А жыць трэба сёньня. Праблема страшэнная... Ну, жудная! І прамовамі-заклінаньнямі яе ня вырашыш. Трэба натугі, адчаю, мэты, а не цішыні. — Я не антыглябаліст, але не магу ня бачыць, як глябалізацыя робіць сьвет аднастайным, бясколерным. Гэтыя выродлівыя гіпэрмаркеты літаральна зьнявечылі польскія гарады. Сусьветныя канцэрны дыктуюць сваё, прымітыўна-аднолькавае, ад полюсу да полюсу... Сумна... Не кажу ўжо пра вядомыя эканамічныя страты для нармальнага чалавека. Ці ж гэта нармальна — прывучаць чалавека, каб ён сядзеў на засілку і не шукаў працы? Сумная мэтазгоднасьць... Дый на засілак той у Польшчы не праіснуеш... — Маеш рацыю, бо ўжо дэталізуеш. Але ад глябалізацыі мы нікуды ня дзенемся. Як бы мы ні плакалі і ні крычалі... Зь ёю будзе так, як з усімі вынаходзтвамі, з тым жа кланаваньнем чалавека. Уся справа ў тым, як гэта перажыць... Я маю шэсьцьдзесят пяць, таму гэта мяне як быццам мала кранае, але каб быў маладзейшы, вядома, гэта б мяне больш трывожыла. Зьмены ідуць вельмі хутка. — Ці ня хочаш сказаць, што й лукашэнкаўскай Беларусі нікуды не падзецца ад гэтых працэсаў? Кажаш, што Беларусь цябе мардуе. Можа, і таму, што хочаш пабачыць зьмены? — Гэта мой эгаізм, што я

сапраўды хачу пабачыць тыя зьмены. Але калі застаюся сам, у цішыні, то дасканала ведаю, што не прычакаю гэтага. Аднак напэўна ведаю, што Беларусь павалакуць іншыя, як п'яную бабу па гасьцінцы. — Трэба спадзявацца, што ў добрым кірунку? Бо столькі роспачы цяпер, пасьля выбараў... А з другога боку, відавочная недаацэнка тых калясальных зьменаў, што адбыліся болей чым за дзесяцігодзьдзе. Што ў нас было да гэтага? Суцэльная пустэча... І вось жа зьявілася новае беларускае інтэлектуальнае асяродзьдзе, няхай малалікае — яно й ня можа быць іншым. А Лукашэнка — гэта абсалютна натуральнае выпрабаваньне для беларускасьці. Дакладней, гэта процістаяньне адной беларускасьці другой. Натуральны працэс, калі ўлічыць асаблівасьці беларускай гісторыі, нацыянальнага мэнталітэту. Дык чаго плакаць і енчыць? Тым больш што побач вольныя Польшча, Літва, Латвія... — Так, тое, што зьяўляецца цяпер у Беларусі, калісьці ў Эўропе прыходзіла праз пакаленьні. Адчувальная паскоранасьць працэсаў... — Але вось скардзімся, як раней, ківаем у бок Расеі: маўляў, ад яе залежыць наша беларускае шчасьце... — Я даўно казаў: слухайце, Расеяй кіруюць ня дурні. Што тычыцца анэксіі Беларусі, дык калісьці Шохін сказаў, што ў іх няма ста мільярдаў даляраў на гэтую справу. Калёніі цяпер перасталі акупляцца. Таму і Англія ў свой час выйшла з Індыі... На халеру Расеі Беларусь, калі яна свае дзяржаўныя інтарэсы мае там забясьпечаныя з усіх бакоў. Гэта беларускі калідор у Эўропу, гэта беларускі балькон, зь якога можна азірацца на Ўкраіну, на краіны Балтыі, на Польшчу і далей на Захад. А што значыць пад такім ці іншым выглядам анэксаваць? Гэта значыць запрасіць за свой уласны стол, за якім і так небагата. Па-другое — нарабіць панікі сярод суседніх краінаў, былых рэспублік СССР. Ці трэба гэта сёньня Расеі? Эпоха калёніяў скончылася яшчэ й таму, што цяпер калі хочаш падвоіць вытворчасьць прадукцыі, дык ня трэба падвойваць ўласныя тэрыторыі і ўвогуле колькасьць занятых людзей. Усё вырашаюць новыя тэхналёгіі... У Крынках існуюць дзьве вытворні мінэральных водаў, на якіх калісьці працавала чалавек шэсьцьдзесят, а цяпер хапае дваццаці. — А рэшта? — Уцякаюць. Галоўным чынам у Амэрыку. Тут амаль кожная другая хата — нехта ў Амэрыцы. Як выехаў швагер, то цягне швагерку, брат — сястру... На маёй вуліцы толькі ў двух дамах ёсьць нармальныя сем'і... Астатнія ўсе падзеленыя — старыя

тут, маладыя — далёка. — А ў цябе асабіста? — Адзін з сыноў зьбіраецца ў Нарвэгію. — А мой зьехаў у Германію разам з унукамі, безь якіх так цяжка... — Гэта барбары, што дзейнічаюць на рынку. Яны цяпер робяць націск на Захад. Як калісьці — на Рым. — Але ж і сам Захад патрабуе гэтых людзей, бо старэе. — І Рыму былі патрэбныя... Плятон сядзеў у сваёй садовай Акадэміі, але на яго працавала пара соцень рабоў. Сёньняшняя Амэрыка — гэта свайго роду Рымская імпэрыя. У сэнсе патэнцыялу і фабрыкі ідэяў. — Мяркуеш — разваліцца? — Імпэрыі заўсёды валіліся... — Але ж тое, што сёньня мы назіраем пасля тэрарыстычных нападаў на Нью-Ёрк і Вашынгтон, гэта не вайна імпэрыі з паўсталымі за сваю вольнасьць калёніямі. Амэрыканцы лічаць, што бароняць тое, што закладзена ў пачатках іхнай гісторыі. У Дэклярацыі незалежнасьці яны сфармулявалі каштоўнасьці і законы, якія Творца надаў чалавеку. Гэта значыць права на жыцьцё, вольнасьць, імкненьне да шчасьця. Вайна з тэрарызмам — гэта вайна з абсалютна іншымі вартасьцямі: з фанатызмам, нянавісьцю да чалавека, спробамі забараніць яму быць шчасьлівым. — Абсалютна згодны. Гэтыя атакі пасажырскімі самалётамі — праявы гістэрыі, паталёгіі. Той развал Амэрыкі, які я маю на ўвазе, гэта не канец амэрыканскай дзяржавы і грамадзтва. Гэта зыход амэрыканскага дыктату ў сьвеце — амэрыканскіх уплываў, грошай, культуры. Магутныя Злучаныя Штаты ў пасьляваенны час вельмі справінцыялізавалі Эўропу, яна гэта адчувае і імкнецца выбрацца з-пад гэтага цяжару. І такі развал амэрыканскай імпэрыі здаецца мне няўхільным. Эўропа хоча быць роўнай Амэрыцы па ўсіх пазыцыях, таму відавочны канфлікт інтарэсаў. Але гэта працэс, і вельмі доўгі... Зьвярні ўвагу: як правіла, імпэрыі ўзьнікаюць на базе новых і важных чалавецтву ідэяў, але гэта іх не выратоўвае ад застою і заняпаду. Іх проста высмоктваюць “варвары”, Расею — таксама, палезла яна ў Азію і ляснула, падвучыўшы тых... — Можа, і палезла таму, што ў пэўным сэнсе заўсёды там была... А што да экспансіі Амэрыкі, дык тут мо яна й забылася на пэўны ізаляцыянізм, запавяданы яшчэ Джорджам Вашынгтонам. Але ж часы зьмяніліся... Няхай сабе і не заўсёды бескарысьліва і ня вельмі ўдала, але Злучаныя Штаты імкнуліся бараніць рухі дэмакратычныя, незалежніцкія, антыдыктатарскія. І Польшча, і Чэхаславаччына, і Вугоршчына ў свае часы вельмі разьлічвалі

на іх... Вядома, што і беларуская апазыцыя чакае падтрымкі з боку Штатаў. — І яе не пазбавяць канчаткова гэтай падтрымкі. Тым больш што пара мільёнаў даляраў — гэта, увогуле, рэч незаўважная для дзядзькі Сэма. Але дзе сёньня галоўныя інтарэсы ЗША? Не ў Беларусі, зразумела, і нават ня ў Польшчы, якая, дарэчы, вельмі гэта адчула ў апошнія часы... Арабскі Ўсход, там, дзе нафта, — там ляжыць галоўны амэрыканскі інтарэс. А што датычыцца лёсаў палякаў і беларусаў — дык гэта перш за ўсё іхная ўласная справа. Амэрыканцы, зразумела, могуць дапамагчы, але ратаваць, тым болей кіраваць, ня будуць... — А мы будзем працягваць скардзіцца на ўвесь сьвет — на перасьлед, на зьнікненьні-забойствы вядомых апазыцыянэраў, на ўціск вольнага слова, на грэбаваньне з боку ўлады ўсім беларускім... — Гэта ўсё фальклёр! А ў фальклёры адсутнічае праца, ён прасякнуты цудадзейнасьцю, спадзяваньнем на “залатую рыбку” або мужычка “с ноготок”. — З трагічным адценьнем, тым ня менш, гэты фальклёр. — Ты лепш за мяне ведаеш, што ў Беларусі пакуль што дамінуе савецкі чалавек. Патрэбная зьмена пакаленьняў. Чалавека фармуе лёс, а ня кніжкі. Як быў я малады, дык верыў у моц слова. Хрысьціянства існуе больш за дзьве тысячы год. А што яно зьмяніла? Колькі жорсткасьці — і ўсё ў імя хрысьціянства... У выпадку Беларусі самае цяжкое — што яна вельмі савецкая. — Ці не занадта мы строгія да гэтага савецкага чалавека? Праца і заробак былі гарантаваныя, нейкі парадак існаваў. Не было такога моцнага падзелу на багатых і бедных... А вольнасьць, дэмакратыя — гэта ж абстракцыя для нашага чалавека, да якой ён зусім не імкнуўся... — Тое самае адбываецца ў сёньняшняй Польшчы, пра што сьведчаць вынікі апошніх выбараў у Сойм. Звычайны чалавек у Народнай Польшчы нават не падазраваў пра існаваньне сакрэтнай паліцыі. Яго гэта не датычыла. Але розьніца паміж Польшчай і Беларусяй палягае на тым, што ў Беларусі ўсё яшчэ няма сапраўднай інтэлігенцыі. Ёсьць тое, што Салжаніцын калісьці ўдала акрэсліў як “образованщину”. Ёсьць людзі з дыплёмамі палітэхнікі, універсытэту, але гэта не інтэлігенцыя. — На Захадзе таксама няма інтэлігенцыі ў нейкім пашыраным сэнсе. Ёсьць купка інтэлектуалаў. — Так, сам тэрмін “інтэлігенцыя” — гэта выдумка расейская. Але хтосьці з ангельцаў сказаў, што ў Брытаніі заўсёды ёсьць дзьвесьце чалавек, якія ўяўляюць сабою

сумленьне нацыі. Дзьвесьце чалавек — гэта даволі. Перш за ўсё маральная катэгорыя. Маральная “шапка” грамадзтва. Калі яны штосьці кажуць, дык гэта мае вагу. У Беларусі гэта літаральна некалькі чалавек. Можа, Быкаў, можа, яшчэ хто, дый тых ня вельмі чуваць, ня вельмі да іх прыслухоўваюцца... А дакладней, няма спосабаў перадачы іх думак уніз, да людзей. І да таго ж самі людзі вельмі недаверліва ставяцца да ўласных прарокаў — жывуць недзе там па загранiцах, маюць сваё, дык ці варта іх слухаць? — Ня ўпэўнены, што палякі вельмі прыслухоўваюцца да ўласных прарокаў. Яны ім нават адмовілі ў апошніх парлямэнцкіх выбарах. — У Польшчы ёсьць, можа, дзесяць працэнтаў людзей, якіх цікавіць ці абыходзіць увогуле Польшча. Дзевяноста працэнтаў маюць тое, як кажуць, у дупе. Яны хочуць есьці, піць і мець бабу. І ўсё. Як той казаў, большасьць належыць да арганізацыі, якая называецца ЗьВіП, што азначае — “зьесьці, выпіць і пая.аць”... Ды ж тыя дзесяць працэнтаў — гэта рэальны слой таксама. — Але што ён можа? — Бачыш, народ раз за імі, за тымі адукаванымі, бяжыць, бо кепска яму. Другім разам — у адворотны бок. Каб у часы “Салідарнасьці” народ ведаў, чым гэта скончыцца, дык невядома, дзе б мы зараз былі. Бо расчараваньне, ці, як тут кажуць, фрустрацыя, сёньня вельмі значная ў польскім грамадзтве. Але народ бегае ад плоту да плоту. Ён ня ходзіць пасярэдзіне. І ўвогуле, што такое народ? Народніцкая выдумка. Расейцы стварылі паняцьце народу. Народу няма — ёсьць нейкія адзінкі, зь якіх складаюцца больш ці менш падобныя масы. Што да нацыі, то гэта больш навуковы тэрмін, за якім стаіць разуменьне, што ўсе свае. — Але ж разам з тым гэта і нейкая супольная памяць. Усе палякі ведаюць свайго першага караля — Мешка Першага... А беларусам тое самае ВКЛ, як кажуць, да лямпачкі.. Што б там ні дзяўблі нашыя патрыёты пра Эўфрасіньню Полацкую, Сапегу і Радзівіла... — Але дзякуючы каму палякі ведаюць? Той самай больш пашыранай — бо ўключае ў сябе і настаўнікаў, і бібліятэкараў, і акадэмічную прафэсуру — інтэлектуальнай “шапцы”, якая існуе ў грамадзтве... У Беларусі — і тут мы зноў вяртаемся да раней закранутага — гэтая “шапка” ўжо фармуецца. Бо мусіць. Гэта як фізіялёгія. Патрэбныя эліты. Бязь іх нацыя ёсьць хворая. Яе практычна няма, яшчэ падрастае. — Эліты фармуюцца больш у супраціве рэжыму, уладзе. — І гэта адбывалася заўсёды. Бо само інтэлектуальнае пашырэньне ўжо

цябе ўводзіць у канфлікт з уладай. Усё тое самае ад антычных часоў… Сакрата атруцілі цыкутай, Вэргілій апынуўся на выгнаньні… Але гэта ня значыць, што эліта павінна быць пры ўладзе. Было б штосьці страшнае, каб паўсюдна патачылася згодна з Плятонам, які хацеў, каб уладарылі інтэлектуалы. Бо кожны інтэлектуал — у пэўным сэнсе гэта фашыст. Я гэта бачу па сваім асяродзьдзі. Можна меркаваць па Лёніку Тарасэвічу. Дый я таксама недалёка адышоў. Бо інтэлектуал калі бачыць, што народ шыбуе ня ў той бок, дык ён хоча бізуном завярнуць яго. Каб скіраваць у рай. Мао пісаў вершы, Гітлер быў нядрэнным мастаком, Сталін меў густ да літаратуры. Не кажу пра Леніна, Троцкага, якія свабодна валодалі некалькімі эўрапейскімі мовамі. — Што не перашкаджала ім спакойна расстрэльваць тысячы безабаронных людзей. — Як і Гітлеру — паліць людзей у Асьвенціме. Таму і кажу, што ўладныя пасады павінны быць за такімі, як Пуцін, як Квасьнеўскі… Усё, зразумела, залежыць ад асабістай у іх культуры. І ад культуры насельнікаў дзяржавы. Бо інтэлектуальны ўзровень Квасьнеўскага і Лукашэнкі, праўдападобна, той самы. Маюць жа на руках нейкія вышэйшыя дыплёмы. — Ну, з дыплёмам Квасьнеўскага сам ведаеш, які быў скандал пад час выбараў яго на першы тэрмін… У сэнсе папяровым наш, лічы, акадэмік… Тым ня менш, давай памяняемся. Мы вам нашага хаця б на месяц, а вы нам — вашага… Пабачым, як вы праз тры дні запросіце “з повротэм” пана Кваха… — Дык я ж і кажу пра выхаваньне, пра культуру асобы… А інтэлект гэта ж іншае! Vide: прафэсар-хам, прафэсар-бандыт, etc. — Ня будзем уцягвацца ў гэтую размову, дзе канчаецца культура асобы і дзе пачынаецца інтэлект. Што б ты ні казаў пра той самы польскі ЗьВіП, але ж ён не захацеў Валенсы зь ягонымі вядомымі “валенсаліямі” — гэта значыць дурнавата-непісьменнымі выказваньнямі, што, як анэкдоты, перадаваліся па ўсёй краіне. — Вядома, пры ўсім сваім “ЗьВіПаўстве” палякі ня хочуць мець прэзыдэнтам чалавека, які ў адказ на працягнутую руку палітычнага апанэнта кажа, што можа падаць толькі нагу. — А ў нас прэзыдэнт можа і Гітлера ўголас пахваліць… І нічога, спакойна… — Таму і кажу, што ваш ЗьВіП больш саветызаваны. Яму што Сталін, што Гітлер… — Але ж я і сярод палякаў сустракаў людзей, якія спрабавалі даводзіць, што за немцамі было больш парадку, бо саветы проста рабавалі кожнага. Тут

мы ізноў уваходзім у праблемы, якія могуць нас вельмі далёка завесьці… Вайна — такая тэма, што патрабуе асобнай размовы. Таму вернемся да больш надзённага — узаемаадносінаў эліты і народу. Некаторым у Беларусі падаецца, што малыя наклады нацыянальнага незалежнага друку сьведчаць пра невялікую ўплывовасьць новай беларускай эліты. — Абсалютна нармальная зьява — малыя наклады для друку з інтэлектуальным кірункам. Сто тысяч — гэта для газэты, дзе пануюць інфармацыя і камэнтар. Калісьці “Новый мир” выходзіў у Маскве накладам пад паўтара мільёна, але гэта адпавядала сытуацыі душнага падвалу, у якім знаходзілася грамадзтва і дзе ў кутку паліўся нейкі агеньчык. А цяпер ён мае трохі болей за 10 тысяч. Але ж гэта на ўсю Расею. Дык пяць тысяч “Нашай Нівы” ці тысяча альбо меней для “Arche” — гэта абсалютна нармальна. — Ну добра, эліты — зрэшты, вельмі не люблю гэтага слова — так ці інакш фармуюцца. — Іх можна толькі расстраляць. — Будзем спадзявацца, што да гэтага ня дойдзе… А народ што — ён у нас нават ад плоту да плоту ня бегае, як у Польшчы. Сядзіць ціха, як мыш пад венікам. Апазыцыя лічыць: чым горш будзе ў краіне, тым хутчэй можна спадзявацца, што ён абудзіцца і пачнуцца нейкія зьмены. — Ведаеш, гісторыя сьведчыць, што рэвалюцыі ніколі не адбываюцца на самым дне, калі ёсьць найгорш. А тады, калі рэжым, што давёў да гэтага дна, пачынае папраўляцца. Ангельская і французская рэвалюцыі адпаведна XVII і XVIII стагодзьдзяў пачаліся не тады, калі было найгорш, а калі пачало быць трохі лепей. І тады народ як бы азірнуўся і сказаў сабе: Божа, як жа мы жылі! — Адчуваецца, дружа, што ты чытаў добрыя кніжкі… Відаць, таго ж Бокля “Гісторыю цывілізацыі ў Англіі”, французскіх гісторыкаў Мішле, Тэна… Так, яны пра гэта пішуць. Але той жа Сталін, літаратурны густ якога ты паважаеш, казаў, што гістарычныя паралелі небясьпечныя. І, здаецца, меў рацыю. Бо зьмяніліся гістарычныя ўмовы, зьмянілася тое, што называюць нацыянальным, ці, можа, лепей у нашай сытуацыі называць, грамадзкім мэнталітэтам. Увогуле, як на маю думку, дык існуе пэўны час для нараджэньня нацыяў. І, можа, для іх памяранья. Народ зусім не бесьсьмяротны, як аптымістычна праклямавала савецкая ідэялёгія. Колькі было зьнішчана нармальнага, разумнага люду ў часы рэвалюцыі, колькі ў наступныя дзесяцігодзьдзі, да таго ж 30 мільёнаў, можа, найлепшага з

насельніцтва, што пасьля таго заставалася яшчэ ў Савецкім Саюзе, загінула пад час другой сусьветнай вайны. І вось маем тое, што маем... І адпаведнага прэзыдэнта, і адпаведны электарат... — Так, у Беларусі сёньня існуе як бы задаволенасьць лёсам, у тым сэнсе, што няма вайны, няма Чачэніі, дамоў не ўзрываюць, як у Маскве, можна бульбы назапасіць на зіму... Але ж гэтага мала. Празь нейкі час узьнікае жаданьне — каб яшчэ лепей... Ведаеш, Беларусь усё ж такі, дзякаваць Богу, не на нейкай высьпе. Калі б і ў суседніх Польшчы, Літве, тым больш у Расеі было таксама дрэнна, як у Беларусі, ну дык што ж... Калі ўсюды так, дык і мы ня самыя горшыя, пагодзімся з тым, што ёсьць. Але калі навокал жыцьцё зьмяняецца ў лепшы бок, а ты застаешся ў гэтай беспрасьветнай аазе галечы... Тады ўзьнікаюць іншыя настроі і адпаведна іншая грамадзкая сытуацыя... — Каб ты ведаў, колькі ўжо і апазыцыя, і незалежны беларускі друк спакушалі суайчыньнікаў прыкладам суседзяў. Як гарох аб сцяну. Да таго ж просты чалавек ня мае грошай, каб паехаць і пабачыць тыя зьмены ў суседзяў на ўласныя вочы... — Ну не кажы... Беларусы шмат ведаюць і пра Польшчу, і пра Літву. Дужа, да нас, прынамсі, езьдзяць... Езьдзяць, бачаць і рана-позна завозьмуцца думаць: а чаму ў нас ня так? Колькі можна глядзець на замежны сьвет, як на байку для дарослых? — Гандляры, галоўным чынам, езьдзяць... Ну і што бачаць яны на Падляшшы хаця б? Тую ж бяду, заняпад... — Так, ёсьць праблемы сацыяльнага парадку і вельмі сур'ёзныя. Але ж ці ня сам ты і пішаш, і гаворыш, што гэта праблемы іншага ўзроўню ў параўнаньні зь беларускімі? Што ні кажы, магчымасьцяў у палякаў паправіць сваё становішча значна больш, чым у беларусаў. Можа, і таму, што больш вольным паветрам дыхаюць... — Ну дык замкнем кола... Што ж літаратура ў гэтым сьвеце? Эстэтычная гульня? Японскі сад камянёў? — А літаратура ў дасягненьні таго няшмат можа. Хто яе чытае? Чытаюць людзі інтэлігентныя, тыя, якія "уже убеждены", далей бачаць. І гэты слой "разумнікаў" вельмі слаба ўплывае на так званыя масы. Справа ў тым, што ў простага чалавека надта цяжкі лёс, таму ён ня надта слухае тых беларускіх, якія "нічога ня робяць, усё пішуць і пішуць, а хлеб маюць". Тэхналягічныя рэвалюцыі нівэлююць падзел на рабацягаў і адукаванцаў, падзел на лёс цяжкі і лёс лёгкі. Будзе адзін лёс, і тады культура стане патрэбнай усім. Бо цяпер яна

яшчэ неабавязковая, безь яе не памрэш. — Здаецца, ужо і Лем пазбыўся таго аптымізму... Але, можа, скончым на гэтым, бо далей бачыцца чыстая схаластыка. А мы ж з табой ня дзе-небудзь у космасе, а ў самых сапраўдных Крынках.

ivac601

Ці тужаць літоўцы па камунізьме Марыюс Івацкявічус Марыюс Івацкявічус літоўскі празаік і драматург, аўтар раману “Гісторыя з хмары”. Гэтае эсэ было ўзятае з падрыхтаванай да друку кнігі “Настальгія”.

Я якраз пераскочыў з адной эпохі ў другую. Зусім не для таго, каб напісаць тэкст пра настальгію па савецкіх часах. Я пасварыўся з жанчынай і з яе шыкоўных апартаментаў у прыгарадзе Вільні перанёсся ў сваю кватэру ў Каралінках. Шматпавярховы дом, збудаваны за Брэжневым, побач фантан, які даўно не дзейнічае, двор у выбоінах, мясцовыя гастраномы (некалі яны называліся “Космас” і “Сатурн”), тралейбусны прыпынак “Касманаўтаў” і да таго падобныя рэчы, якія павінны былі дапамагчы нам як мага ясней зразумець, што космас пакаралі літоўцы. Цяпер усё гэта здаецца непрыемна ўстарэлым — гэтыя лесвічныя клеткі, і людзі, што сядзелі на лаўках цэлымі гадзінамі, і дні, якія міналі быццам у нудным дзяжурстве або чаканні нечага, што вернецца ці зменіць усё да непазнавальнасці. Мы былі прызвычаеныя жыць паволі. Піць і абсмоктваць ва ўспамінах мінулае. Хоць бы гэты фантан, у якім калісьці плёхалася вада. Кожны час нясе з сабой людзей, вымушаючы іх з’яўляцца на свет, кахаць, цешыцца маладосцю, і яшчэ ніводзін лад не здолеў гэтага змяніць, савецкі ў тым ліку. Часам лады, нават самыя жорсткія і нялюдскія, прыводзяць да таго, што людзі, якія ў іх выраслі, атаясамліваюць тугу па прамінулым жыцці з тугою па самім ладзе. Згадкі пра першыя спатканні або студэнцкія гады непарыўна з’ядноўваюцца з яго атрыбутамі. Не магу сказаць, што сярод усіх народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы літоўцы найчасцей блытаюць гэтыя два віды настальгіі. Можа, якраз наадварот. Больш таго, самая антысавецкая частка нашага народу жыве ў пастаянным страху перад настальгіяй па савецкіх часах і нават спрабуе забараніць астатнім тужыць па маладосці. У адным лесе на поўдні Літвы адзін прадпрымальнік, які распанеў на гандлі грыбамі, залажыў парк, што выклікаў немалыя спрэчкі. У гэты парк, які завецца паркам Грута, з усіх літоўскіх плошчаў былі

звезены савецкія помнікі. Менавіта з гэтай нагоды грамадскасць падзялілася на тры групы. Адны (самыя непрымірымыя) крычалі, што парк з'яўляецца здзекам з памяці ахвяр савецкага рэжыму і найгоршым прыкладам для маладога пакалення, якое ўбачыць "вялікіх савецкіх правадыроў", ізноў узнесеных на п'едэстал. Прадпрымальнік абяцаў ім абгарадзіць парк калючым дротам, каб ад гэтай уяўнай пашаны не засталося ані знаку: калі ўжо немагчыма засадзіць за краты саміх правадыроў, апляцём дротам хоць бы іх каменныя выявы. Больш памяркоўныя абаранялі парк як доказ таго, што нацыя пазбавілася ідалаў. Прагматыкі, у сваю чаргу, выказвалі пажаданні цалкам перанесці парк у цэнтр Вільні, дзе ён зрабіўся б найпершай славутасцю для турыстаў. Адсутнасць чацвёртай катэгорыі — тых, хто жадаў бы ліквідацыі парку і вяртання помнікаў на ранейшыя месцы, — азначае, што настальгіі па ладзе сапраўды няма. "Цюльпан" і іншыя набыткі гісторыі Памерлы за савецкім часам і ўваскрэслы сёння чалавек не знайшоў бы не толькі знаёмых помнікаў, але таксама аўтаматаў з газіраванай вадой на кожным рагу, дзе вада з сіропам каштавала тры капейкі, а без сіропу — капейку. Не знайшоў бы прывазных бочак з квасам і півам пры кожным магазіне, напаткаў бы ад сілы адну ці дзве "Лады", "Волгі" ці "Масквічы". Праўда, знайшоў бы добра ўсім вядомую булку за тры капейкі, да якой ніводная іншая назва не прыжылася. Няхай і запакаваная ў фольгу, яна па-ранейшаму называецца "тры капейкі", хоць каштуе дваццаць пяць літоўскіх цэнтаў. Калі б гэта гэта быў мастак ці літаратар, памерлы дваццаць пяць год таму, які пры жыцці не цураўся ўцех, ён знайшоў бы адзін рэлікт у самым цэнтры Вільні — рэстаран "Нерынга". Гэтая слынная ўстанова цудам ацалела і, амаль не змяніўшыся, па-ранейшаму мае прыхільнікаў. Ратуюць яе, напэўна, народжаныя ўжо ў вольнай прэсе легенды пра "непаўторнае жыццё" колішняй віленскай багемы і яе паклоннікаў у гэтым рэстаране. Старая багема вымерла або пастарэла, новая памяняла прапіску, але "Нерынга" засталася, і часам квартэт ветэранаў выконвае там настальгічныя рэтра-мелодыі. А зрэшты, "Нерынга" — не адзіная забягалаўка тых часоў, пра якую ходзяць легенды. Астатнія, якія хутка пазнікалі або памянялі назвы, гаспадароў і фасады, таксама не засталіся ў забыцці. Пры гуках назваў "Вайва", "Ротунда", малочны бар

“Блініне”, кафэ-марожанае “Лядайне”, “Літаратурны” ў Вільні альбо “Цюльпан” ці “Метраполія” ў Каўнасе не ў аднаго пяцідзесяцігадовага зашчыпле вочы. Забягалавак было няшмат, але амаль усе яны ўвайшлі ў гісторыю. Няма цёткі Юлі Тры лаўрэаты Нобелеўскай прэміі — Гюнтэр Грас, Віслава Шымборска і Чэслаў Мілаш — у кастрычніку 2000 году прыехалі ў Вільню, каб на вуліцы Людвісарскай адкрыць мемарыяльную дошку чацвёртаму — Іосіфу Бродскаму. Чытаючы з гэтай нагоды Бродскага, Мілаш зрабіў характэрную памылку: “Літоўцы — найлепшы народ у Літве” (і тут жа паправіўся — “у імперыі”). У камяніцы побач з домам па вуліцы Людвісарскай некалькімі днямі раней памерла бабулька — стрыечная сястра маёй мамы. Паўстагоддзя таму яе жытло стала прытулкам для цэлай сям’і, якая вярнулася з высылкі з Архангельскай вобласці. У трох пакоях размясціліся дзве радзіны — 12 чалавек. З цягам часу сем’і разрасталіся і раз’язджаліся, аж пакуль у кватэры не засталіся двое — цётка Юля з мужам. На пахаванні можна было пачуць, што ў магілу кладуць не проста жанчыну, а цэлую эпоху. “Цётка Юля была асобай, вакол якой гуртаваліся ўсе… Цётка Юля памерла… Няма цёткі Юлі…” — казалі сваякі — прадпрымальнікі, рабочыя, беспрацоўныя. “Пасля ўсіх майскіх і лістападаўскіх дэманстрацый мы збіраліся ў цёткі Юлі”. Так было. Але памерла гэта ўсё раней, чым у іншы свет адышла цётка. Навошта збіраліся ў яе? Каб яшчэ раз перажыць адчуванне страчанай еднасці? “Людзі больш між сабой сябравалі” — вось найчасцей называная перавага тых часоў. З аднаго боку, да сяброўства былі змушаны, займаючы камунальныя кватэры з супольнай кухняй, ванным пакоем і сценамі, аклеенымі паперай. Былі змушаны расстаўляць святочныя сталы ў некалькіх пакоях адразу, бо тыя былі занадта малыя. Праўда, маглі заставіць іх ежай дзякуючы таму, што прадукты каштавалі няшмат. З другога боку, рытм жыцця быў у некалькі разоў павальнейшы, і вольны час даводзілася нечым запаўняць. У фільме Эльдара Разанава “Іронія лёсу, ці Лёгкі дух!” герой, на добрым падпітку памылкова засунуты ў самалёт “Масква — Ленінград”, у чужым горадзе знаходзіць такую самую вуліцу і дом, такую самую кватэру, як у сябе ў Маскве, адчыняе яе сваім маскоўскім ключом, і нават мэбля ў кватэры не будзіць у яго падазрэння, што ён не дома. Гэты ланцуг супадзенняў, можа,

трохі перабольшаны; людзям з Захаду ён наагул здаўся б прыцягнутым за вушы, але для савецкага гледача гісторыя выглядала цалкам верагоднай. Чаму б не — усе кватэры мелі амаль ідэнтычную планіроўку, іх напаўнялі секцыі, шафы і ложкі адной мадэлі, і кожны адчуваў сябе часткай аднаго вялікага ідыятызму. Гэта аб'ядноўвала людзей. У адной радыёперадачы трое вядучых маіх гадоў успаміналі школу, чорна-карычневую форму дзяўчынак і цёмна-сінюю — хлопчыкаў, чырвоныя піянерскія гальштукі, прагулкі па школьных калідорах і воклічы дзяжурных настаўнікаў "Ходзім, ходзім, не стаім", шалёную гонку да сталоўкі на другім перапынку, калі старшакласнікам здаралася збіваць з ног не толькі маладзейшых, але і сяго-таго з педагогаў. Я слухаў гэтую размову, і мяне не пакідала адчуванне, што яны гавораць пра маю школу, мае класы і калідоры. У гэтай размове не прамільгнула ніводнага адрознення ці неадпаведнасці, калі я мог бы сказаць: "Ну не, у нас было па-іншаму". Гэтая радыйная тройца паходзіла з гарадоў — двое з Вільні, а адзін з Клайпеды, — у той час як я хадзіў у школу ў маленькім правінцыйным мястэчку, і ўсё-такі ўспаміны былі такія падобныя, нібыта ўсе мы сядзелі 15 год таму за адной партай. Паміж журбой і журбой Гэта дзіўна, але мінулы лад часткова паўплываў нават на нацыянальныя рысы літоўцаў. Два майскія святы — працы і перамогі ў другой сусветнай вайне, лістападаўскія святкаванні чарговай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі — усё гэта яднала людзей ва ўсеагульнай неабгрунтаванай радасці, хоць самі святы амаль нічога для літоўцаў не значылі або выклікалі зусім іншыя думкі. Тым не менш вымушаны аптымізм, на якім былі замяшаны і святы, і ўвесь лад, нечым нас паланіў. І мне, у той час дзіцяці, нават у галаву не магло прыйсці, што па натуры літоўцы — маркотны народ. Свят у нас цяпер значна болей, яны не абавязковыя, але кожнае з іх агорнута бязмежнай журбой. Некаторыя іменна так і называюцца — дні жалобы, калі на нацыянальных сцягах завязваюцца чорныя стужкі. На сапраўдныя святы ніхто стужак не вяжа, але настрой пераважае падобны — мы журымся. Мы журымся 14 чэрвеня, калі на ўсход рушылі першыя эшалоны з сасланымі, журымся 13 студзеня, калі страцілі 13 абаронцаў тэлевежы, нягледзячы на тое што за намі ў 1991 годзе была маральная перамога, а тагачасныя падзеі сталіся пераломнымі ў барабацьбе з акупацыяй і

сістэмай. 16 лютага, у Дзень незалежнасці, мы не радуемся, таму што тую незалежнасць у нас неўзабаве адабралі, 11 сакавіка, у Дзень аднаўлення суверэнітэту, зноў не выпадае цешыцца, бо небагата часу аддзяляе яго ад злапамятнага 13 студзеня. Нават Дзень маці, які выцесніў Міжнародны жаночы дзень, адназначна звязаны з савецкай традыцыяй, адзначаецца хутчэй як дзень памерлых матак, чым тых, што з намі. Мяркую, што толькі час можа паказаць, быў смутак нашых нацыянальных свят процівагай савецкаму аптымізму альбо мы проста такія ёсць. Адзетыя, але галодныя Стабільнасць — вось па чым мы іншым разам сумуем. Многія адчуваюць сябе так, нібыта спазніліся на цягнік. Банкруцтвы банкаў, інфляцыя — усё тое, да чаго прывык Захад, у нас з'явілася ў дзікім выглядзе і сталася неспадзяванкай для наіўных і непадрыхтаваных людзей. Тое, што было звычайным, зрабілася раскошай, і наадварот: машыну можна купіць за некалькі заробкаў, не чакаючы ў чарзе дзесяць год. Людзі, якія некалі былі голыя, але сытыя, раптам адчулі сябе адзетымі, але галоднымі. Права на працу ператварылася ў магчымасць быць беспрацоўным, паездка ў былую "неабсяжную" айчыну стала куды цяжэйшай за наведанне Парыжу і г.д. Неабходнасць абдумваць кожны крок — праз знікненне апякунскага механізму над галавой — шмат каго пазбавіла раўнавагі. Стаячая вада змянілася бурлівай плынню, у якую не ўсім было дадзена ўліцца. Некалі літовец, латыш ці эстонец быў грамадзянінам Краіны Саветаў першага гатунку. У той вялізнай дзяржаве мы былі Захадам ва ўсіх адносінах. Цяпер мы зрабіліся ўсходам Еўропы і зноў і зноў мусім высвятляць, хто мы і адкуль. Даўнейшая Вільня толькі цяпер, калі змяніліся не толькі назвы вуліц, але і сам горад, пачынае сцірацца ў людской свядомасці. Яшчэ некалькі год таму, нягледзячы на новыя шыльды на дамах, людзі ўвесь час па звычцы праходзілі вуліцай Горкага, збочвалі на бульвар Леніна, потым падымаліся па вуліцы Касманаўтаў ў бок вакзалу, мінаючы вуліцу Саветаў, альбо ішлі ў процілеглым кірунку — па вуліцы Дзяржынскага ў напрамку Палацу піянераў ці Музею рэвалюцыі. Сёння гэты маршрут выглядае так: Вялікая, Замкавая, Завальная, Стэфанская, Кальварыйская, бульвар Гедзіміна, Палацы вучняў або школьнікаў. Было мастацтва, была літаратура Савецкая Літва — гэта краіна, у якой людзі жылі, аб'яднаныя супольнай тайнай. Кожны ў

глыбіні душы ведаў, што можа жыць лепш, што ён больш працавіты, чым выглядае звонку. Літоўцы, як магло падацца, бераглі сябе, чакаючы лепшых часоў, робячы роўна столькі, колькі ад іх патрабавалася. Гэтая тайна таксама яднала людзей. А калі нарэшце тайнае стала яўным і выявілася, што рэзервы не такія і вялікія, як меркавалася, усіх ахапіла расчараванне. Прыкладам можа быць літаратура. Пісанне паміж радкоў лічылася моцным бокам нашай літаратуры, хоць хто ведае, ці былі мы сярод савецкіх народаў выключэннем. У свеце, аднак, верылі, што свабоднаму літоўскаму пісьменніку напэўна будзе што сказаць. Аказалася, што не. Высокая літаратура перажывае сёння крызіс, бо творцы, якія пісалі паміж радкоў, не навучыліся пісаць па-іншаму, а новыя яшчэ не з'явіліся. Крызіс перажывае не толькі мастацтва ў цэлым, але і старыя яго прадстаўнікі, якія страцілі даўнейшыя прывілеі і пашану. Пісьменнік пасля выдання раману не толькі не атрымлівае кватэры, машыны, але вымушаны задавальняцца мізэрным тыражом свайго тварэння і са слязой у воку прыгадваць, як ён выдаваўся некалі сотнямі тысяч экзэмпляраў. Штотыднёвік "Літэратура ір мянас" ("Літаратура і мастацтва"), які сёння ледзь сточвае канцы з канцамі, у свой час належаў да найпрэстыжнейшых. Нават мае бацькі, тагачасныя студэнты медінстытуту, лічылі сваім абавязкам купляць яго па суботах. Я не прамяняў бы ніводнага напісанага сёння радка на колішнія сотні квадратных метраў жылплошчы, але, урэшце, мне ніколі не даводзілася паспытаць увагі, якой у савецкія часы надзялялі дзеячаў мастацтва. Хто ведае, ці не апаноўвала б мяне сёння туга, калі б, пяцідзесяцігадовы, згалелы і не прыстасаваны да новага жыцця, я блукаў па віленскіх вуліцах, сягаючы ў памяці на 20 год у мінулае. Двухсот-трохсоттысячныя тыражы мастацкай літаратуры ў краіне, якая ледзьве налічвала тры з паловай мільёны жыхароў, не былі нармальнай з'явай. Сённяшнія лічбы сведчаць, колькі людзей сапраўды чыталі кнігі, а колькі куплялі іх дзеля снабізму. Папулярнасць літаратурнага штотыднёвіка таксама не адлюстроўвала тагачаснага зацікаўлення літаратурай, проста гэта была адзіная газета, у якой праз заслон цэнзуры часам прабівалася смялейшая думка. І ўсё-такі цікавасць да літаратуры і мастацтва была большай. Праз адсутнасць больш даступнага заменніка людзі — нават сённяшнія аматары мыльных опер і

бульварных раманаў — вымушаны былі спасцігаць больш глыбокія, хоць і насычаныя ідэалогіяй творы. Такі культурны гвалт, як і любы іншы, нельга ўхваліць, і ўсё ж з усіх відаў гвалту гэты, бадай што, найбольш прынадны. Перавагі жыцця за дротам Нягледзячы на тое што імперыяй кіраваў — ці, можа, павінен быў кіраваць — пралетарыят, адукацыя была справай прэстыжу. Гэта парадокс, але пасля знішчэння міжваеннай літоўскай інтэлігенцыі, прызнанай самым небяспечным класавым ворагам, савецкая ўлада пачала гадаваць сабе новую, лаяльную генерацыю інтэлігентаў, якая ўрэшце аказалася далакопам свайго мецэната. Рызыкуючы нажыць сабе ворагаў, асмелюся сцвярджаць, што такое абнаўленне мела і свае пазітыўныя бакі. Зразумела, не для міжваеннай інтэлігенцыі. Сапраўды, цяжка ўявіць, як выглядала б сённяшняя Літва, калі б не завіруха другой сусветнай вайны і пасляваеннага перыяду. Аднак калі палічыць амаль мільён літоўскіх эмігрантаў у ЗША і Заходняй Еўропе за спадкаемцаў тагачаснай інтэлігенцыі і дапусціць, што, каб не савецкі перыяд, сённяшняя Літва мела б такую самую ментальнасць і стваральную моц, давялося б прызнаць і сёе-тое іншае: жыццё за калючым дротам выхавала ў нас лепшыя рысы, чым тыя, што ўзніклі на вольнай (у сэнсе правоў чалавека) эміграцыі. Сённяшняе літоўскае мастацтва не сказала яшчэ на поўны голас слова аб савецкім часе. З другога боку, сваёй чаргі чакаюць ненапісаныя і нязнятыя (а таксама неасэнсаваныя) тэксты і фільмы пра больш далёкае мінулае — міжваенны перыяд, другую сусветную вайну і “вайну пасля вайны”, як сёння часта называюць партызанскую барацьбу, якая ішла ў Літве сама меней дзесяць год. Прайшло яшчэ толькі дзесяцігоддзе ад часу з’яўлення гучных кніг, якія выкрывалі савецкі маразм, у свядомасці народу барацьба з саветчынай усё яшчэ ідзе, па-ранейшаму пануе пэўнае бязладдзе, таму разважаць пра тугу па нядаўнім ладзе нашым мастакам слова няёмка. Дагэтуль мы падлічваем панесеныя страты, дазнаёмся, што і мы не святыя, што не толькі мы самі пакутавалі, але і праз нас пакутавалі іншыя, напрыклад, яўрэі. Асэнсаваць цэлае стагоддзе за дзесяць год нялёгка, тым больш што толькі нядаўна мы атрымалі свабоду ацэньваць мінулы перыяд не “так, як трэба”, а так, як было напраўду. Таму ацэнкі, натуральна, спазняюцца, тое, што ўжо павінна быць асэнсавана, адкладваецца на пасля, і я не здзіўлюся, калі найлепшы твор

пра савецкія часы напіша некалі чалавек, які тых часоў наагул не пакаштаваў. Сам я часта думаю, што маё пакаленне (я нарадзіўся ў 1973 годзе) цалкам адрозніваецца ад усіх тых пакаленняў, якія называюць страчанымі. Я выхоўваўся ў імперыі зла і ў той жа час не быў пакалечаны ёю, як гэта сталася з маімі бацькамі. У самую пару насталі "добрыя" часы, і амаль адначасова я атрымаў атэстат сталасці і свабоду. Гэта была нібыта двайная свабода, уступленне ў самастойнае жыццё як у прыватным, так і ў грамадскім сэнсе. Я меў шчасце ў тым, што спазнаў на ўласным вопыце дзве сістэмы, якія спрадвек спадарожнічалі чалавецтву, бо такі досвед выпадае не кожнаму. Раю няма і не будзе Вяртаючыся да настальгіі… Калі яна і ёсць, то не па ўсім савецкім перыядзе. Хто ведае, ці прызнаецца калі хто-небудзь у Літве ў настальгіі па часах перад хрушчоўскай адлігай? Для Літвы сталінскі перыяд быў, мусіць, страшнейшы за любую вайну. Гэта найчарнейшая паласа жыцця народу, і я не думаю, каб той час быў прыемны нават тым, хто выконваў волю Сталіна. Тагачасная Літва нагадвала сённяшнюю Чачэнію, з паверхні якой сцёртыя горы, а ў галовах барацьбітоў трохі менш фанатызму, бо рэлігія і тэмперамент іншыя. Аднак і метады тых, хто атакаваў, і заўзятасць тых, хто абараняўся, былі амаль такія самыя. І амаль такой самай была атмасфера паўсюднага страху. Пасля смерці Сталіна Літва з краіны, што найбольш супраціўлялася акупацыі і ператварэнню ў "братнюю рэспубліку", робіцца часткай СССР, якая старанна лавіруе, каб здабыць карысць для сябе. Хрушчоў загадвае ўсю бацькаўшчыну засеяць кукурузай, і літоўцы не супраціўляюцца гэтаму, для падману вока сеючы кукурузу ўскрай палеткаў пшаніцы. Такія прыклады можна доўжыць, цяжка сказаць, наколькі яны верагодныя, але кожная легенда мае нейкі рэальны грунт. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляюцца нашы дарогі. Пад крылом Расіі, адвеку вядомай кепскімі дарогамі, Літве ўдалося выбудаваць такія аўтастрады, якіх марна шукаць не толькі на абшарах былога Савецкага Саюзу, але і ў іншых краінах сацыялістычнага лагеру. Прычынай былі шчодрыя дары, якія ішлі з Вільні ў Маскву, дзе дзялілася агульнасаюзная каса. Калі настала пара будаваць дабрабыт вольнай ужо айчыны іншымі метадамі, такімі, як развіццё эканомікі, то, не заглыбляючыся ў навуковыя дэталі, якіх сам не ведаю, скажу толькі адно: старыя навыкі засталіся. Карупцыя, якая ў свой час ратавала нам

жыццё, цяпер заганяе нас саміх у галечу. Але вернемся да настальгіі. У 1990 годзе свет з чорна-белага зрабіўся каляровым. Пры саветах усе добра ведалі адно: улада хлусіць наконт загніваючага капіталізму і нашай светлай будучыні. Хлуснёй мы лічылі і ўсё астатняе, што на самай справе было праўдай. Светлая будучыня, якую мы будавалі, ведаючы, што не пабудуем, на нашу думку, чакала нас за жалезнай заслонай. Лічачы свой свет ледзь не ўвасабленнем зла, мы верылі, што той, другі, — гэта ўвасабленне дабра. Гэтая вера грэла нас. Але, як выявілася, няма раю на зямлі. Кабельнае тэлебачанне квітнее ў Літве ў вялікай ступені дзякуючы таму, што літоўцы хочуць глядзець расійскія праграмы. А глядзець іх яны хочуць галоўным чынам дзеля старых савецкіх фільмаў, якія будзяць настальгію па ранейшым часе. Фільмы, ад якіх у свой час усіх вanітавала і якія ганебна прайгралі ў канкурэнтнай барацьбе за гледача, калі на экраны завіталі першыя мексіканскія і амерыканскія мыльныя оперы, сённня пераглядаюцца зноў і зноў. Многія ведаюць іх на памяць. Выхаваныя ў духу гераізму другой сусветнай вайны, мы самі гулялі ў тую вайну, забіваючы найвялікшых на свеце разявак сярод салдат — “фрыцаў”. І не важна, што такой вайны, як у старых савецкіх фільмах, ніколі не было, для нас яна была створана такой і такой застанецца. І нават бойня ў “Шарагоўцу Раяне” гэтага не зменіць. Клюшкай і кошыкам Баскетбол называюць у Літве другой рэлігіяй. Так было не заўсёды, бо ў свой час ён саступіў поле “народнай” гульні шматнацыянальнай імперыі — хакею. Кошык для гульні быў тады раскошай (з нашага двара яго ўвесь час кралі суседскія дзеці), у той час як каткі на замерзлых копанках, азёрах ці нават тратуарах былі штодзённасцю нашых зім. Амаль кожны з нас меў хакейную клюшку, а вечарамі мы сядалі перад тэлевізарам, каб пахварэць за каманду СССР, якая давала ў косці хлопцам з кляновым лістом на грудзях. Праўда, адначасова шмат свядомых (дарослых) літоўцаў, таксама прыляпіўшыся да экрана, цешыліся з кожнага голу, забітага ў “свае” вароты. Толькі ў спорце можна было зрабіць прыкрасць Расіі і на нейкае імгненне перамагчы яе. У нас пашырылася меркаванне, што літоўскае адраджэнне пачалося менавіта з баскетболу, хоць пры гэтым забываюць, што адраджэнне ў той час пачыналася і ў іншых краінах сацлагеру, дзе баскетбол не карыстаўся такой павагай. Але з гэтага можна зрабіць і

адваротную выснову. Калі б гэтая гульня не зрабілася ў свой час адзінай легальнай зброяй супраць расійцаў, калі б гэтых пяцярых ёлупаў, якія лёталі ад коша да коша, не ўзносілі ў ранг герояў, а спорт — да ўзроўню палітыкі, невядома, ці здабылі б мы пазней, ужо як вольная краіна, тры алімпійскія медалі запар. Адзін з найпрыемнейшых успамінаў пра тыя часы звязаны з бунтам супраць тых самых часоў. А бунт гэты не заўсёды быў такім пасіўным, як, напрыклад, калектыўнае сядзенне перад тэлевізарамі, калі за золата змагаліся каўнаскі "Жальгірыс" і маскоўскі ЦСКА. Каталізаваны часам нечай адвагай ці нават геройствам, гэты бунт выліваўся на вуліцы, душыўся і паўтараўся, як толькі падрастала новае пакаленне, якое не пакаштавала яшчэ гвалту на ўласнай скуры. Можна зайздросціць альбо, наадварот, спачуваць такім дзяржавам, як Бельгія ці Галандыя: у іх няма формы. Літва здаўна мела два бакі: перад, ці твар, які крывіўся або прыхільна ўсміхаўся ў тым ці іншым напрамку (усходнім ці заходнім), і зад, які быў павернуты ў процілеглым кірунку і які мы ўсімі спосабамі імкнуліся зберагчы ад любых замахаў з боку чужынцаў. Толькі што ўзніклая язычніцкая дзяржава пашыралася на ўсход, спрабуючы стрымаць германскія ордэны, якія напіралі з захаду. У нейкі час Літвой нават сумесна кіравалі два князі-браты: Ягайлаў бацька Альгерд прасоўваўся на ўсходнія славянскія землі, а Вітаўтаў бацька Кейстут дбаў пра бяспеку другога краю дзяржавы. Потым мы павярнуліся на захад, якім у той час стала Польшча, затым зноў на ўсход, пад апеку царскай Расіі, на захад, на ўсход, на захад. Жыццё на такім раздарожжы вымушае амаль кожнае другое пакаленне адчуць на ўласнай скуры, як гэтая няхай і невялікая краіна мяняе сваё месца на мапе свету, здзяйсняе пераацэнку вартасцей і выконвае даўнюю абяцанку "хто быў нічым, той стане ўсім". Адсутнасць сапраўдных эліт, прыродных багаццяў і аўтарытэтаў на працягу цэлага стагоддзя значна ўскладняла Літве рух наперад. Адраджэнскія эліты, з якіх звычайна пачынаецца дзяржаўная незалежнасць, не паспяваюць сысці са сцэны і саступіць месца сапраўдным элітам, як лад мяняецца, краіна паварочвае на 180 градусаў і прыходзіць новае пакаленне адраджэнцаў. Людзей раздражняе, калі даўнія савецкія пасрэднасці робяцца "ўсім", а інтэлігенцыя, якая ў той, варожай ёй сістэме была, прынамсі, паважаная, сёння, калі пануе этас грошай, губляе нават павагу. Калі я

паркую свой “опель аскона” (1985 году выпуску) побач з новым шыкоўным “мерседэсам”, мне не дае спакою думка, ці не прыгадае яго ўладальнік часоў, калі ён пачынаў свой шлях у бізнес, і ці не выб’е мне бакавой шыбы, спакушаны маёй магнітолай. Менавіта такім шмат каму бачыцца паходжанне капіталаў сённяшніх “новых літоўцаў”. Чорныя бананы Савецкая сістэма мела адну ўнікальную рысу: утойваючы праўду, яна захоўвала здароўе грамадзянам. Апрача пагрозы ядзернай вайны, якой нас доўга палохалі, уся астатняя інфармацыя была дадатнай. “Такая і такая надаіла больш за ўсіх малака; завершана будаўніцтва новай электрастанцыі; калгас набыў новы камбайн, і цяпер кожны энскі калгаснік збярэ ўдвая большы ўраджай; пракладваецца новы адрэзак Байкала-Амурскай магістралі, дзе плячо ў плячо працуюць людзі з усіх 15 братніх рэспублік — расіец і грузін, туркмен і літовец, казах і эстонец”. Ніхто не казаў аб тым, што пройдзе некалькі год і магістраль тая акажацца непатрэбнай, а ў новапабудаваных сібірскіх гарадах людзі застануцца без працы, аб тым, што дзеля будаўніцтва Каўнаскай гідраэлектрастанцыі давялося затапіць некалькі вёсак і выселіць тых, у каго не толькі дом, але і косці продкаў апынуліся пад вадой. Тым больш не псавалі нам сну войны на Блізкім і Далёкім Усходзе, землятрусы — усё тое, што сёння называецца “міжнароднымі навінамі”. Мы не былі часткай міжнароднай супольнасці, а ў нас адбываліся толькі прагрэсіўныя падзеі. Год таму аўтобус з маладымі і старэйшымі пісьменнікамі пасля заканчэння ўрачыстасцей у Друскеніках, дзе штогод адбываецца своеасаблівы паэтычны семінар (часцей за ўсё ў першай палове кастрычніка), па дарозе завітаў у згаданы парк Грута. Для многіх гэта было першае наведанне могілак старых савецкіх помнікаў. Шмат якія з іх я бачыў на ўласныя вочы ўпершыню. Пад чатырма камунарамі, што ўзяліся за рукі, мы сфатаграфаваліся ўчатырох — чатыры пісьменнікі, расстаўленыя паводле веку так, як камунары на пастаменце. Чатыры камунары — гэта чатыры літоўскія камуністы, закатаваныя ў турмах міжваеннай Літвы, ахвяры тагачасных антыкамуністычных улад. Мой клас быў названы ў гонар аднаго з камунараў. Вуліца, на якой я жыў, таксама называлася Камунараў. Я няшмат ведаў тады пра французскія рэвалюцыі, і таму гэтае слова асацыіравалася ў мяне толькі са згаданай

чацвёркай. У парку мы знайшлі некалькі Вінцасаў Міцкявічусаў-Капсукасаў — помнікаў аднаму з першых літоўскіх камуністаў, мянушкай якога быў названы літоўскі горад Марыямпаль (старэйшыя людзі ўсё яшчэ называюць яго Капсукас), а прозвішчам — Віленскі ўніверсітэт. За апошняе Чэслаў Мілаш пакпіў з нас у “Пошуках Бацькаўшчыны”: Віленскі ўніверсітэт, дзе ступала нага Адама Міцкевіча, у савецкія часы нарэшце ўпрыгожыла прозвішча вялікага паэта. Гэта значыць Міцкявічуса-Капсукаса. Быў і Сталін, і Чарняхоўскі з цяперашняй Плошчы самакіравання ў Вільні, і галоўны помнік савецкай Літвы — бронзавы Ўладзімір Ленін, які стаяў у цэнтры Вільні на цяперашняй Лукішскай плошчы і правай рукой паказваў адным на ўпраўленне КДБ, а ўсім другім — на адзін з найбольшых у сталіцы рэстаранаў “Таўрас” — каму як пашанцавала. Мы ішлі па гэтых могілках, жартуючы, пстрыкаючы фотаапаратамі, пазіруючы, як раптам на ўскрайку парку я заўважыў адзін белы помнік і замёр у здзіўленні. Я адзін ведаў, каму належыць гэты белы твар на фоне белага конскага лба. Вітаўтас Путна. Вылеплены вядомым літоўскім скульптарам Гедымінасам Якубонісам. Іронія лёсу выявілася ў тым, што гэтая яго скульптура апынулася тут, у той час як ягоны ж на чатыры гады старэйшы помнік Адаму Міцкевічу стаіць, акружаны пашанай, каля касцёлу святой Ганны і нагадвае пра першы мітынг 16 лютага 1987 году — пачатковы этап літоўскага адраджэння. Памятаю, колькі было спрэчак наконт таго, ці павінен палкаводзец Вітаўтас Путна сядзець на кані, бо першы праект быў менавіта такі. Урэшце было вырашана, што савецкі народ не ставіць помнікаў коням, і ад жарабца засталася адна галава. Вітаўтас Путна — гэта адзіны, на думку савецкай улады, варты помніка чалавек, які паходзіць з маіх мясцін і з’явіўся на свет літаральна за некалькі кіламетраў ад радзімага дому польскага містыка Анджэя Таваньскага. У міжваенны перыяд Путна быў военачальнікам маладой савецкай дзяржавы, змагаўся з калчакоўцамі, кіраваў атрадамі Чырвонай Арміі ў вайне з палякамі, хадзілі нават чуткі, што ён адбіў у Пілсудскага і Жалігоўскага ахвоту ісці на Літву і тым самым выратаваў рэшту краіны ад польскай акупацыі. Можа, у гэтым ёсць частка праўды, тым больш што радзіма Путны — вёска Мацкона знаходзіцца не так далёка ад дэмаркацыйнай лініі, якая аддзяляла Літву ад Віленшчыны.

Пазней Путна выконваў абавязкі ваеннага аташэ СССР у Японіі, Фінляндыі, Германіі, Вялікабрытаніі, а ў 1937 годзе, падобна да многіх высокапастаўленых асоб, быў расстраляны на загад Сталіна. Вось і ўся біяграфія. Літве нічым нашкодзіць не паспеў, але нічым і не паспрыяў, каб застацца ўпрыгажэннем цэнтральнай плошчы ў маім пасёлку. Але гэта толькі жменя біяграфічных звестак, якія не маюць нічога супольнага з тым, што я адчуваў, стоячы перад белым помнікам у Груце. Я стаяў перад дрэвам майго дзяцінства, якое, здавалася, знікла, было знішчана навальніцай ці проста ссечана і пушчана на дошкі. Аж выявілася, што не: яго толькі вырвалі з каранямі і перасадзілі. Я ўспамінаў сваё дзяцінства — вось што адбывалася ўва мне, калі я там стаяў. Ужываючы навуковыя тэрміны, я перажыў рэфлексійны шок (аб гэтым я пісаў магістарскую працу), калі адна драбніца раптоўна затрымлівае час і на момант прыадчыняе браму вечнасці. У гэтым імгненні змяшчаецца ўсё: і піянерская атрыбутыка, і прысяга пад згаданым помнікам Путну, калі мы ўступалі ў піянеры, і ўсведамленне, што гэта ўсё ўява. А поруч з усім гэтым — звычайнае жыццё пасёлка, і людзі, большасць з якіх па-ранейшаму жывуць там, і азёры, якія засталіся такія самыя, толькі больш зараслі, і аранжавыя “Жыгулі”, якія кожны вечар ставіў пад акно бацька, і знакамітая юная спявачка Вайда, якая жыла ў нашай шматпавярхоўцы і ў свой час была самым вядомым дзіцем у Літве — славу ёй прынесла песня “Чунга-чанга” з папулярнага савецкага мультфільму, якую яна выконвала на дзіцячым музычным конкурсе. Мы ганялі на веласіпедах, да ночы гулялі ў мяч на двары, гушкаліся на арэлях, калі закрылі дзіцячы сад і бацька той самай Вайды, старшыня пассавету, паклапаціўся, каб гушкалка з былога дзетсаду была перанесена ў двор ягонай дачкі. Раз у некалькі год у пасёлак прывозілі бананы, і нашы маткі, некалькі гадзін прастаяўшы ў чарзе, прыносілі іх дадому. Аднойчы мая мама нават напісала ў Маскву, каб ёй прыслалі бананы поштай. І прыслалі. І хоць яны былі зусім счарнелыя, мы паклалі іх на хрустальнае блюда, елі і частавалі гасцей. Было смачна. Звычайнае дзяцінства, калі не хапала многіх рэчаў (не толькі бананаў) і адначасова лепш цанілася тое, што даставалася так рэдка і насілу. Пасёлак, вядома ж, змяніўся. Няма белага твару на фоне белага конскага лба, калгасаў, куды мы ездзілі на бульбу, а часам і летам дапамагалі вазіць сена,

каб пакласці ў скарбонку трохі грошай. У “яўрэйскім Крамлі” (так зваўся найстарэйшы будынак з чырвонай цэглы ў цэнтры, дзе ў міжваенны перыяд месціліся яўрэйскія крамы) зноў з’явіліся магазінчыкі, у колішняй адзінай у пасёлку сталоўцы цяпер знаходзіцца сучасны супермаркет майго аднакласніка, а ў будынку адзінага ў нас рэстарану размясціўся суд. Затое поўна іншых кавярань, бараў, у дзіцячым садзе, адкуль Вайдзін бацька некалі даставіў гушкалку, з’явілася гасцініца, а на месцы былой гасцініцы — стаматалагічны кабінет маёй суседкі Аўрэліі і кафэ з більярдам старога бацькавага сябра Гофмана, які ў даўнейшыя часы працаваў на будоўлі і меў багатую калекцыю заходніх кружэлак. Толькі берагі возера, як я ўжо казаў, вельмі зараслі трыснягом і чаротам. Але якраз нядаўна я прачытаў у мясцовай газеце, што ў возера збіраюцца запусціць нейкіх кітайскіх рыб — белых амураў, якія гэтым трыснягом і чаротам кормяцца. Белыя амуры жывяцца травой, вырастаюць на паўтара метра, вудай іх не зловіш, хіба што будзеш сядзець на беразе возера і чакаць, бо яны, здаецца, як згаладнеюць, часам самі выскокваюць на бераг паскубсці травы, а наеўшыся, вяртаюцца ў ваду. “Дык нельга будзе купацца, — палохаецца мама, — калі гэтыя вялізныя рыбы развядуцца”. “Павылоўліваем, — супакойвае яе бацька. — Вунь, Вацыс, Юргіс адным махам павыцягваюць тых амураў”. І я думаю, што сапраўды павыцягваюць. Для чалавека, выхаванага ў савецкі час, няма нічога немагчымага. Мы выраслі незвычайна загартаванымі. Я асабліва адчуваю гэта, гледзячы ў наіўныя твары людзей з Захаду. Што гэтыя велізарныя вегетарыянцы, белыя амуры, нам, людзям Усходу, якія пакаштавалі ўсякага. Абы не ашукала нас гэтая святая наіўнасць.

На беларускую мову пераклаў Сяргей Петрыкевіч

czyz601

Томас Вэнцлава — чалавек зь іншага боку Кшыштаф Чыжэўскі КШЫШТАФ ЧЫЖЭЎСКІ польскі культурны дзеяч, падарожнік па Сярэдняй Эўропе. Галоўны рэдактар часопісу “Краснагруда”, беларускі нумар якога пабачыў сьвет летась. Апошняя ягоная публікацыя на беларускай мове — эсэ “Босьнія становіцца нашай, калі нам баліць” (“ARCHE-Скарына”, № 2-2000).

Калі штосьці нас і лучыць так, як лучыла ў мінуўшчыне, — дык гэта адно зацятыя галасы, галасы, якія не пагаджаюцца зь існым сьветам. Томас Вэнцлава

“Дуброўнік? Прага? Кракаў? Можа, Сэйны”, — пытаўся ўголас сам у сябе былы дысыдэнт, эмігрант і бадзяга, намагаючыся на мапе сваіх духовых вандраваньняў вызначыць месца жыцьцёвага гнездаваньня. — “Хіба што Кракаў... Хоць і іншыя ня горшыя... Хаця, у прынцыпе, ня надта... Ня горшыя, а нават крыху лепшыя... Гэта значыць, крыху, і нават ня толькі крыху... Амаль напэўна... Уласна, гэта нармальна...” Ён гаварыў па-віленску, на мове, якая з адной ёй уласьцівай чуласьцяй патрапіла прытупіць вастрыё найлепшых аргумэнтаў, ён рупіўся пра сьціпласьць, пакідаў месца для іншага, зьдзекаваўся з пэўнасьці, якая раней ці пазьней мусіла стаць сьмехатой. Мы сядзелі ў па-амэрыканску вялізнай гасьцінай зь відам на разьлеглы кампус Ельскага ўнівэрсытэту, у будынку, уваход у які ахоўваў бездакорна апрануты і шматслоўна ветлівы чарнаскуры парт’е. Прафэсар Томас Вэнцлава, які мае сталую работу ўва ўнівэрсытэце й гарантаваную пажыцьцёвую пэнсію, нават не ўяўляе магчымасьці застацца ў Нью-Гейвэне. Яго тут анічога не трымае. Калісьці ён бы мог сказаць сьледам за Міцкевічам: “Шчасьця не зазнаў, бо яго не было на бацькаўшчыне”. Але ягоная Літва першай вырвалася з савецкай імпэрыі і атрымала чаканую незалежнасьць хутчэй, чым ён гэта мог бы сабе ўявіць у найсьмялейшых марах. Таму нешта іншае падказвае яму такі выбар месца жыхарства. Ён не дапускае і магчымасьці вяртаньня ў Вільню. І там, у маладой дэмакратычнай Літве, здаецца, яму ня месца. Ён шукае яго

хутчэй у краіне-суседцы сваёй радзімы, нібы баючыся страціць дыстанцыю й незалежнасьць, што гарантуе свабоду крытычнага мысьленьня. Дзе блізкія ня толькі архітэктура і супольная культурная спадчына, але й падобны гістарычны досьвед — досьвед паняволеньня таталітарнай імпэрыяй і барацьбы зь ёй. Хто ж ён — Томас Вэнцлава, чужы ў Амэрыцы, якая яго клапатліва прыгарнула, і ня прагны да вяртаньня ў незалежную Літву, за незалежнасьць якой ён так рашуча змагаўся? Што ж гэта за бадзяга, які сапраўды цікавіцца кожным неспазнаным куточкам сьвету, але ўвадначас сумуе па тым адзіным, усходнім і правінцыйным закутку Эўропы? Што ж гэта за касмапаліт, які часта выступае ад імя літоўцаў і як голас сумленьня свайго народу? Што ж гэта за нацыяналіст, які бязьлітасна змагаецца з усімі праявамі этнацэнтрызму і правы асобы ставіць вышэй за правы нацыі? Што ж гэта за літовец, якога суайчыньнікі клянуць за “антылітоўскасьць”? Што гэта за вілянчук, які прагне жыць у Кракаве альбо Дуброўніку? Што гэта за паэт, які ўвязваецца ў палітычныя спрэчкі? Дзе ж ягонае месца? Дзе кола найбліжэйшых яму людзей, і на якой мове яны гавораць? А можа, нязьведаным выракам лёсу ён асуджаны на бяздомнасьць і самотнасьць? Томас Вэнцлава — пазбаўлены бацькаўшчыны і самотны чалавек? Так, ён шмат калі адчуваў сябе беспрытульным і адзінокім. Калі б ён скардзіўся на гэта, яму можна было б адказаць: “Сам вінаваты”. Але гэта не адзіная праўда пра яго, можа, нават ня ўся праўда... Бо ж той заўзяты літовец-грамадзянін сьвету — чалавек, надзвычай нам блізкі. Нам — палякам, жыдам, расійцам... Нам — праваслаўным, грэка-каталікам, мусульманам... Нам — нацыянальным мяншыням... Нам — сярэдне- і ўсходнеэўрапейцам... Нам — пераемнікам Вялікага Княства Літоўскага... Нам з Сараева, Грознага... Нам — людзям з розных краінаў і кантынэнтаў, якія выступаюць супраць паняволеньня і дэгуманізацыі.

Калісьці Вэнцлава напісаў пра сябе, што ён “чалавек з таго боку”. Няма розьніцы, які канкрэтна бок ён меў на ўвазе ў момант, калі запісваў тыя словы. Томас Вэнцлава ёсьць папросту “чалавекам зь іншага боку”, у кожны момант жыцьця і творчасьці. Ён ніколі ня быў бы сабой у цуглях этнацэнтрызму, самахвальства, аднастайнасьці, аднадушнасьці. Ён бы ня вытрываў доўга без дыялёгу, сутыкненьня розных паглядаў,

безь пераправы на іншы бераг, дзе глядзяць на сьвет інакш і пачуваюцца іначай, бяз вострай крытыкі, скіраванай на ўсё, што “маё”, бяз спробы пранікнуць у шматслойнасьць і пачуць шматгалосьсе. Ён зьявіўся на сьвет і вырас у гарадох памежжа — Клайпэдзе і Вільні — і застаўся чалавекам памежжа, заўсёды “з таго боку”. Для майго пакаленьня, якое навучалася Эўропы на войнах у былой Югаславіі, ён у дыялёгу зь Мілашам усталяваў нормы паводзінаў на памежжах: не хапаць адзін аднаго за грудкі, патрабаваць найперш ад сябе, а суседа паважаць, імкнучыся да глыбейшага спазнаньня яго й зразуменьня яго. Гэтая пазыцыя, якой ён застаўся верным, не зважаючы на цкаваньні з розных бакоў, найбольш выразна праявілася ў ягоных публіцыстычна-палкіх эсэ, друкаваных у самвыдаве і ў выгнаньні. Вілянчук Для літоўца, які пераехаў у сваю гістарычную сталіцу ў 1946 годзе з Коўна, дзе перажыў нямецкую акупацыю, Вільня была зусім незнаёмым горадам. У першы ж дзень, ідучы са школы, заблукаў у руінах, “і гэтае пакутнае, бясьсільнае блуканьне ў пошуку дому, якое цягнулася чатыры гадзіны (не было каго спытацца дарогу, бо людзей сустракаў я мала, да таго ж яны не гаварылі па-літоўску)”, сталася сымбалем ягонага жыцьця. Верагодна, для Чэслава Мілаша, які дапамог яму перабрацца ў Амэрыку, бачачы ў ім свайго пераемніка на катэдры славянскіх моваў і літаратураў у Бэрклі, Томас Вэнцлава быў тады перадусім літоўцам зь Вільні, які прыводзіў на памяць Мілашавых даўніх літоўскіх прыяцеляў. Узмужненьне ў адным горадзе, навучаньне ў адным унівэрсытэце абумовіла ўзаемную сымпатыю, якая яшчэ больш узмацнілася за акіянам. Аднак яны ведалі не адну і тую самую Вільню. Для Мілаша Вільня была пунктам пачатку каардынатаў, “магчымасьцю нармальнасьці”, бо яна атаесамлялася з тым пэрыядам гісторыі, калі ўсё яшчэ было “нармальна”. Цяжка сказаць тое самае пра Вільню яго малодшага прыяцеля. Для дзевяцігадовага Томаса “горад без імя” быў горадам руінаў і хаосу. Яму давялося яго вывучаць з нуля і нанова выбудоўваць для сябе. Вільня была “ўзьнёслай мінуўшчынай сярод дзіўнай і незразумелай сучаснасьці, традыцыяй у сьвеце, раптоўна пазбаўленым традыцыі, культурай у некультурным сьвеце”. Нялёгка было ўлавіць пераемнасьць, адкрыць цэлы палімпсэст накладзеных адзін на адзін слаёў, даць новае імя, ня схібіўшы. Даваенная Вільня была табуяванай тэмай. “Родную Эўропу” ён

прачытаў сшытаю з урыўкаў, якія перасылалі поштаю з Захаду ягонаму прыяцелю Юозасу Тумэлісу. Мова архітэктуры — так, ён ведаў кожную ейную драбніцу, але важнейшымі былі іншыя віленскія мовы, польская і расійская, якія пасіўна ён вывучыў яшчэ ў Коўне, чытаючы кніжкі з бацькавай бібліятэкі. Дапамагло ў гэтым, без сумневу, і сямейнае выхаваньне (бабка па кудзелі была полькай, а бацька, даволі вядомы паэт-футурыст, які друкаваўся, між іншага, у варшаўскіх “Wiadomoњciach Literackich”, ганарыўся знаёмствам з расійскімі пісьменьнікамі, у тым ліку з Барысам Пастарнакам). Аднак толькі Вільня зрабіла так, што польская і расійская сталі ягонымі мовамі арганічным чынам, а Іосіф Бродзкі мог пра яго напісаць, што “ён сын, удзячны сын трох літаратураў”. Перачытваючы пісьмёны свайго гораду, Томас Вэнцлава прымяраўся да ролі таго, каго Юзаф Мацкевіч назваў бы “спадкаемцам ранейшага адзінства”. Гэта рэдкая зьява на руінах Вялікага Княства Літоўскага ў эпоху стварэньня нацыянальных дзяржаваў і мэнтальнасьці этнічных бастыёнаў. Яго чакала ня толькі адкрыцьцё забытых ці замоўчаных старонак гісторыі й культурнай спадчыны, але й не адна сутычка з тымі, хто тыя старонкі прыўлашчыў для сваіх уласных патрэбаў. У далікатным пытаньні прыналежнасьці Вільні ў міжваенны пэрыяд ён нагадаў і літоўцам, і палякам канцэпцыю Поля Гіманса. У 1921 годзе бэльгійскі палітык прапанаваў стварэньне двух кантонаў — віленскага і ковенскага, зыходзячы з таго, што Польшча і Літва прызнаюць узаемна сувэрэннасьць адна аднае, што віленскі кантон будзе дзьвюхмоўным і што на гэтым памежжы пачнецца шчыльнае супрацоўніцтва накшталт “мініятурнай эўрапейскай супольнасьці”. Рэанімаваўшы тую канцэпцыю, ён вінаваціў абодва бакі ў недастатковай палітычнай сьпеласьці, у выніку чаго гісторыя пайшла тою хадою, якою пайшла. З-за гэтага Вэнцлава трапіў пад агонь крытыкі — зрэшты, гэтак жа сама, як перад вайной Оскар Мілаш альбо іншы прыхільнік прапановы Гіманса — Эрнэстас Гальванаўскас, на якога як на “нацыянальнага здрадніка” ў міжваенным Коўне ўчынілі замах. У духу дыялёгу з Чэславам Мілашам Томас Вэнцлава ўключаецца ў стварэньне новай ідэнтычнасьці Вільні, якая б злучала ў сабе “ўсю гісторыю гораду і ўвесь ягоны культурны патэнцыял”. Літоўцаў, узрадаваных вяртаньню Вільні як

сталіцы іх незалежнай дзяржавы, ён перасьцерагаў: “Баюся, што ня будзе ейны лёс шчасьлівым, калі хаця б часткова не ажыве ў ёй ейная шматкультурная тканка — сапраўдная традыцыя Вялікага Княства Літоўскага”. На пачатку 90-х гадоў, назіраючы літуанізацыю ўсяго віленскага й пастаянны моцны абмежавальны этнацэнтрызм, — ня верыў у ажыцьцяўленьне гэтага праекту. Але цяпер на літоўскім кніжным рынку зьявіўся новы віленскі бэдэкер, а хутка маюць выйсьці ягоныя вэрсіі на іншых мовах, у тым ліку й па-польску. Ягоны аўтар — Томас Вэнцлава, “спадкаемца ранейшага адзінства”. І ён, як і Чэслаў Мілаш, ніколі ня мог уцячы ад гэтага гораду. Хаця абодва пакідалі яго з пачуцьцём палёгкі і суму па сьвеце больш шырокім, чым засьценак. “Я не хацеў бы вярнуцца ў ранейшую Вільню, бо, уласна, ня мог бы там вытрываць”, — мо гаварыў ён Мілашу. Абодва ня верылі, што вернуцца. І абодва зноў і зноў вярталіся. Іх сустракалі з пашанай. Нядаўна Мілаш атрымаў тытул ганаровага грамадзяніна Вільні. Вэнцлава пакуль што задавольваецца ордэнам Гедыміна і Дзяржаўнай прэміяй Літвы, прысуджанай яму пазалетась. Дысыдэнт Усё пачалося... зь містычнай відзежы… Ён быў ідэйным камсамольцам, якога ўзрушыў “сакрэтны даклад” Хрушчова на XX зьезьдзе КПСС. Але ён быў перакананы, што вялікую ідэю можна выратаваць, што й абяцалі хваляваньні ў Польшчы й Вугоршчыне. Яму было дзевятнаццаць гадоў, калі прачытаў у газэце зацемку пра ўварваньне савецкіх войскаў у Вугоршчыну й пра тое, што Імрэ Надзь — здраднік. Ён прыгадваў той момант у інтэрвію Ірэне Грудзінскай-Грос і Яну Гросу для часопісу “Aneks”: “Я зразумеў абсалютна ўсё. Гэта была містычная відзежа... Яна зьявілася мне ў вельмі сканцэнтраваным выглядзе, у пробліску сьвядомасьці. З таго моманту я стаў ужо сапраўдным дысыдэнтам”. Стварыўшы разам з прыяцелямі гурток самаадукацыі, у якім чыталі, між іншага, Кафку і Джойса, ён стаецца адным з “носьбітаў згубнага ўплыву”. Яны выдаюць альманах “Kuryba” (“Творчасьць”), у хуткім часе “арыштаваны” цэнзурай. Гэтага было дастаткова, каб імі зацікавіўся КДБ і даручыў аднаму пісьменьніку-пачаткоўцу напісаць пасквіль на іх. Лепш такая кара, чым турма, у якую яны патрапілі б, калі б папаліся яшчэ некалькі гадоў раней. У творы гэтага пісьменьніка Вэнцлава выступае як малады мастак, здольны, але з схільнасьцяй да абстракцыянізму, а да таго ж — ён чытае

фашыстоўскага пісьменьніка Бадлера (г.зн. Шпэнглера). Калі пасьля здабыцьця Літвой незалежнасьці Вэнцлава атрымаў для азнаямленьня сваё дасье з КДБ, ён высьветліў, што праходзіў у той справе пад псэўданімам “Дэкадэнт”. Уявіце яго сабе за рулём грузавіка: выключаны на год з унівэрсытэту, ён працуе кіроўцам, чытае Цьвятаеву і моцна п’е, каб не звар’яцець. Ці паддаваўся ён калі-небудзь ціску функцыянэраў рэжыму? Не, ніколі — ні ў дачыненьні да іншых людзей, ні ўва ўласнай літаратурнай творчасьці. Ён прыгадваў калісьці сваю ”малую ганьбу”: напісаўшы ў 1961 годзе навукова-папулярную кніжку пра касьмічныя ракеты, ён паддаўся намовінам выдавецтва і ўставіў у яе пару разоў слова “сацыялізм”. І гэтага хапае, каб усё жыцьцё саромецца. У 1958 годзе, калі цкавалі Барыса Пастарнака пасьля прысуджэньня яму Нобэлеўскай прэміі, ён піша разам з прыяцелямі — Тумэлісам, Рамунасам Катылюсам і Пранасам Моркусам — ліст, у якім выказвае захапленьне творчасьцяй пісьменьніка і салідарнасьць зь ім. Ён вельмі рана пачаў супрацоўнічаць з прыяжджомым у Вільню з Масквы Аляксандрам Гінзбургам і яго “Сынтаксысам” — першым часопісам, выдаваным у самвыдаве. Гінзбург плянаваў выданьне грузінскага і літоўскага нумароў, для літоўскага Вэнцлава даў свае вершы. У хуткім часе, аднак, Гінзбурга арыштавалі, і тыя нумары так і ня выйшлі.

Асобны разьдзел у дысыдэнцкай дзейнасьці Томаса Вэнцлавы складае членства ў літоўскай Гельсынскай групе. Хто ведае, ці выказаў бы ён калі-небудзь адну з найважнейшых максымаў свайго жыцьця — noblesse oblige, — калі б ня Віктарас Пяткус, літоўскі нацыяналіст, пра якога Вэнцлава пазьней скажа: “Разумны і вельмі цярпімы чалавек”. Ён сядзеў некалі з Гінзбургам у адным лягеры. Пяткус спатыкаўся з Андрэем Сахаравым, калі ў Вільні праходзіў працэс Сяргея Кавалёва — маскоўскага дысыдэнта, які дапамагаў літоўцам перадаваць на Захад “Хронікі Літоўскага каталіцкага касьцёлу”, найважнейшы ў тую пару часопіс літоўскага самвыдаву. Сахараў быў у Вільні, а тым часам у Осла ягоная жонка Алена Бонэр атрымлівала ад ягонага імя Нобэлеўскую прэмію міру. У гэтыя дні пры канцы 1975 году нарадзілася ідэя ўтварэньня літоўскай Гельсынскай групы. Пяткус прапанаваў уступіць у яе Томасу Вэнцлаву, імя якога было ўжо вядомае ў дысыдэнцкіх колах з нагоды ліста да

ўладаў, у якім ён дамагаўся дазволу выехаць за мяжу, выяўляючы пры гэтым сваё нязломна варожае стаўленьне да сыстэмы. Сваімі адозвамі яго падтрымалі Мілаш і Бродзкі. З тэатральных сцэнаў Літвы тады зьнялі п'есу Артура Мілера, і гэтак у Вільні даведаліся, што й ён выказаў падтрымку літоўскаму дысыдэнту. Памагчы вызначыцца з уступленьнем ў Гельсынскую групу меліся перададзеныя яму Пяткусам "Турэмныя дзёньнікі" Эдуарда Кузьняцова, у якіх былі без прыхарошваньня адлюстраваныя рэаліі савецкай турмы. "Я прачытаў гэтую кнігу за ноч і жудасна спалохаўся. Хіба ўпершыню зразумеў, што гэта ня жарты і што гэта можа адбыцца штохвіліны. І два дні я сядзеў дома і дрыжэў. Потым неяк перамог гэта, пайшоў да Пяткуса і кажу: noblesse oblige, уступаю". Было 1 сьнежня 1976 году, калі яны паехалі на першую прэс-канфэрэнцыю ў Маскву. У студзені 1977 году ён атрымаў пашпарт і праз Парыж выехаў у Амэрыку. За некалькі месяцаў яго пазбавілі савецкага грамадзянства. Суцяшэньнем яму быў той факт, што такі самы лёс спаткаў Салжаніцына, Максімава, Растраповіча... Ён стрымаў слова, дадзенае сваім віленскім таварышам па барацьбе, і за акіянам застаўся гарачым прыхільнікам іх справы. Ён супрацоўнічаў з эмігранцкімі выданьнямі і часта браў слова, каб выславіць праўду пра камуністычны рэжым, у якую Захад упарта не хацеў верыць.

За што змагаўся Вэнцлава-дысыдэнт і якім прынцыпам заставаўся верны гэты сын масьцітага пісьменьніка савецкай Літвы? Ён рос у пару, калі паэт Пуцінас (сапраўднае імя і прозьвішча Вінцас Мікалайціс) пісаў, што "народ павінен дасьпець ня толькі да свабоды, але і да няволі". Ён збунтаваўся супраць такой пазыцыі, палічыўшы яе капітулянцкай. Адкуль у яго стала сілы на такі раньні бунт? На яго, пэўна, узьдзейнічалі тэлюрычныя сілы Вільні, а таксама традыцыі ўнівэрсытэту, пра які ён пазьней скажа, як той навучыў яго, што "культура й прага свабоды — практычна незьнішчальныя". Ужо ў часе навучаньня ўва ўнівэрсытэце ён стаў нанкарфамістам, назіраючы, як прыстасаваньне да сыстэмы — хоць шмат хто называў яго толькі паказным — працінае ўсё чалавечае нутро. У адказе Пуцінасу ён сьцьвярджаў: "Ня трэба прызвычайвацца да ролі нявольніка". Што гэта азначала для яго на практыцы? Падчас дыскусіі пасьля паказу тэлевізійнага фільму "Галакост",

у якім апавядалася пра літоўскі легіён СС, які браў удзел у ліквідацыі варшаўскага гета, калі некаторыя сілы ў Літве паспрабавалі былі “выратаваць гонар нацыі”, замоўчваючы, перакручваючы й звальваючы віну на немцаў альбо жыдоў, ён сфармуляваў некалькі аксыёмаў, якімі заўжды кіраваўся: ні пра якае злачынства нельга маўчаць; былі і ёсьць калябаранты, але не бывае народаў-калябарантаў; антысэмітызм і саветызацыя — абое рабое. Уважлівае прачытаньне ягоных эсэ, безумоўна, дазволіла б значна пашырыць сьпіс аксыёмаў, якія сфармавалі ягоную пазыцыю. Вось, напрыклад, вартыя згадкі радкі: “Валей перакрытыкаваць, чымся недакрытыкаваць”; “Правы асобы стаяць вышэй за правы супольнасьці, гэта азначае, што правы чалавека стаяць вышэй за правы нацыі (а таму правы нацыі вынікаюць з правоў чалавека, а не наадварот)”. Літоўскай нацыяналістычна настроенай інтэлігенцыі, якая трактавала абарону правоў чалавека як субстытут адкрытай абароны нацыі, зусім немажлівай у савецкіх варунках, ён тлумачыў, што “правы чалавека для нас не пытаньне тактыкі, але пытаньне прынцыпу”. Палякам і літоўцам, зноў уцягнутым у канфлікт падчас адлігі пасьля сталінскіх “маразоў”, бачачы памылкі, якія робяць абодва бакі, ён тлумачыў: “Як літовец, уважаю за свой абавязак засяродзіцца на літоўскіх памылках. Гэта першае і найпрасьцейшае правіла для інтэлігента, які адчувае адказнасьць за лёс уласнага народу”. Шакаваны трагедыяй Сараева, ён стварае ўласны кодэкс паводзінаў, у якім на першым месцы знаходзіцца прынцып Гіпакрата: primum non nocere — не зашкодзь. І ў чарговы раз, нібы баючыся водгульля балканскага сындрому на іншых памежжах, паўтарае, што гэта азначае: “Ніколі ня ставіць інтарэсаў свайго народу па-над правамі людзей; ніколі не прыхарошваць сваёй гісторыі і асабліва не ўважаць за герояў нікчэмнікаў, якія нібыта ”змагаліся за народ”; ніколі не забывацца і не апраўдваць сваіх памылак, нават калі памылкі праціўнага боку здаюцца або насамрэч ёсьць большымі ад уласных; ніколі не паслугоўвацца падвойнай маральлю, нават калі гэтым мэтадам паслугоўваюцца сусед ці праціўнік”. Ён памятае іншае азначэньне свабоднага чалавека, чымся распаўсюджанае ў сьвеце лібэралізму і грамадзянскіх свабодаў: “Як слушна сказаў Іосіф Бродзкі, свабодны той, “хто ў сваёй паразе не вінаваціць нікога, апроч сябе самога”. Стараючыся дзейнічаць паводле

такіх прынцыпаў, ён павялічыў колькасьць сваіх ворагаў ня толькі ў лягеры рэжыму, але і ў іншых асяродках, часам рэзка апазыцыйных. Але такі ўжо лёс дысыдэнта, пра якога Андрэ Маруа сказаў калісьці, што, “каб застацца верным сваім поглядам, ён згадзіўся стаць у апазыцыю да ўлады і ні пры якіх умовах ужо ня будзе баяцца выкліку грамадзкай думкі”. Усходнеэўрапеец Я буду доўга памятаць вечар у мяне дома, за некалькі дзён пасьля сьмерці Зьбігнева Гербэрта, калі Томас Вэнцлава чытаў на памяць “Вяртаньне праконсула”. Мы сядзелі каля стала, услухоўваючыся ў мэляс расійскай мовы, у якой вядомыя радкі, здавалася, гучаць нечакана аўтэнтычна, а пэўныя сэнсы і схаваныя падтэксты выкрышталізаваліся нават разчэй. Гэты пераклад ён зрабіў для новага “Сынтаксысу”, рэдагаванага Андрэем Сіняўскім на пачатку “перастройкі”, калі ў эміграцыйных асяродзьдзях абмяркоўвалася праблема, “вяртацца ці не вяртацца”. Ён скончыў дэклямаваць і адразу пачаў тлумачыць усялякія нюансы перасыланьня паэзіі Гербэрта сваёй жонцы (а яна ў яго з Расіі). А потым мы чыталі “Трэн Фартынбраса”... Я зразумеў тады, што азначае быць напраўду ўсходнеэўрапейцам: цалкам належаць да Сярэдняй Эўропы, якая імкнецца вызваліцца з “братніх” абдымкаў імпэрыі, падкрэсьліць прыналежнасьць да літоўскіх, заходніх межаў савецкага архіпэлягу і адначасна шукаць падтрымку, разуменьне і духовую свайню ў ваколіцах Пецярбургу ці Масквы. Калі праўда тое, што Расію ад сярэднеэўрапейскіх краінаў аддзяляе бездань, пра якую пісаў Мілан Кундэра, дык Томас Вэнцлава ўзводзіць па-над ёй натуральны мост, дык Вэнцлава — найлепшы праваднік для падарожнікаў у абодва бакі. Гэта можна адчуць ужо ў ягоным падыходзе да паэтычнай мовы — іншым, чым, напрыклад, падыход Чэслава Мілаша, які пазьбягае ўплыву “моцнага beat расійскага ямбу”. Для дыкцыі аўтара “Размовы ўзімку” арганічным ёсьць верш сыляба-танічны, і пры тым — адчуваньне дыстанцыі й сярэднеэўрапейскай іроніі. Вэнцлава-ўсходнеэўрапеец парушае аснаваныя калючым дротам межы варожага стану й зьняпраўджвае словы Фартынбраса:

Не выпадае нам ані павітацца ні разьвітацца мы жывем на архіпэлягах А гэтая вада гэтыя словы што яны могуць што яны могуць княжа* * Пераклад з польскай Юрася Бушлякова.

Трыюмвірат Вэнцлавы, Мілаша і Бродзкага (для якога ўсё ж сярэднеэўрапейская ідэнтычнасьць была зацеснай) быў найлепшым паказьнікам выніковасьці гэтага супраціву. І ў гэтым выпадку Вэнцлава быў чалавекам зь іншага боку: заходняга сярод расійцаў і ўсходняга сярод усходнеэўрапейцаў.

Трыццаць гадоў ён чакаў моманту, калі ён зможа ўскласьці гвазьдзікі перад помнікам Бэму ў Будапэшце. Ён фіксуе гэты момант у вершы “Інструкцыя”. Ён чакаў набліжэньня да людзей, якія з гэтага месца распачалі вугорскае паўстаньне і якія “чакалі цэлае стагодзьдзе. Больш: сто восем гадоў”. Ён чакаў моманту, калі ён зможа выказаць удзячнасьць такому парыву свабоды, які зьмяніў мноства — і яго таксама — падданых імпэрыі. Хто тая асоба, што стаіць на помніку, яго вучыў Норвід. Ён паўтараў сабе ў думках “Памяці Бэма жалобны рапсод”, “найлепшы верш сьвету”, які сам некалі пераклаў на літоўскую. У яго ён выклікаў асацыяцыі ня столькі з рамантызмам, колькі з “Вугорскім дзёньнікам” Віктара Варашыльскага, што быў для яго пераломнай чытанкай падчас назапашваньня ведаў пра сыстэму, у якой давялося жыць. Ён чытаў яго ў перакладзе па-расійску ўжо ў 1956 годзе дзякуючы калегу, Віргіліюсу Чапайцісу, якому кіраўніцтва Інстытуту імя Горкага ў Маскве замовіла — ведаючы, што ён добра ведае польскую, — пераклад гэтага тэксту “для ўнутранага карыстаньня”, а той зрабіў і дадатковыя копіі. Сьпярша ў дворыку Сарбеўскага, у Віленскім унівэрсытэце, зьявіўся надпіс на муры, неўзабаве замазаны ўладамі. А потым насталі Дзяды, кульмінацыя паўстаньня. На могілкі Росы падаліся ўсе разам, але потым падзяліліся: літоўцы пайшлі на магілу Басанавічуса, а палякі — туды, дзе пахаванае сэрца Пілсудзкага. Менавіта на гэтых месцах яны найлепш адчувалі сваю спародненасьць з вугорцамі і іх змаганьнем за свабоду. І так ужо будзе ў жыцьці Томаса Вэнцлавы. Ён будзе прыслухоўвацца, спачуваць, рэагаваць на тое, што робіцца паміж Балтыкай і Балканамі, бэрлінскім мурам і Гулагам. Заўжды будзе блізка, як у студзені 1970 году над Балтыйскім морам. Апынуўшыся “з гэтага боку мора”, ён будзе прысутнічаць увадначас і “з таго боку мора”, будзе сьведкам трагедыі польскіх рабочых. Здаецца, што вада, стыхія, зь якой — падобна да слова, якое кружляе паміж выспамі архіпэлягу, — так саркастычна кпіў Фартынбрас, будзе

несьці словы надзеі суседзям, зь якімі адчувае адзінства лёсу:

Але прарастае зерне і ахвяра, А значыць, няпраўда, што страчана ўсё. (“Трэн Фартынбраса”)

Ён вёў бесьперапынную “размову ўзімку”, бачачы перад сабой краявід, у якім “мост то паказваецца, то зноў зьнікае”, і ўсьведамляючы, што варта нечаму змоўкнуць ці зьнерухомець, як яго зараз жа скуе лёд. Ён адчуваў эмацыйную повязь з усім, што дзеялася ўва Ўсходняй Эўропе, — з дысыдэнтамі, альбо “папросту людзьмі ўсходнеэўрапейскімі, што ў прынцыпе тое самае”. Ён верыў, што з гэтага можа нарадзіцца новая фармацыя, якая ня толькі пераможа сілы рэжыму, але таксама дасьць рады іншым выклікам, якія стагодзьдзямі нагрувашчваліся ў гэтым куточку сьвету. Пішучы пра Вільню як пра места, якому наканавана паспрыяць зьяўленьню такой фармацыі, ён меў, напэўна, на ўвазе ейную складаную тканку нацыянальных і канфэсійных адносінаў, зь якімі трэба разьбірацца штодня. У гэтым сэнсе горад Гедыміна стварае пэўную мадэль сытуацыі, якая паўтараецца ў мностве іншых гарадоў і рэгіёнаў Сярэдне-ўсходняй Эўропы, становячыся ці то іх праклёнам, ці то сапраўдным скарбам. Ён рана ўцяміў, што бяз кодэксу прынцыпаў, якія — калі ўвасобіць іх у жыцьці — прывядуць да адзінства і мудрага вырашэньня шмат якіх праблемаў, успадкаваных ад мінуўшчыны, ня ўдасца ні стварыць такой фармацыі, ні забясьпечыць памыснага разьвіцьця гэтай часткі Эўропы. Затое адмова ад спробы стварыць такі кодэкс магла б у хуткім часе прывесьці да новых канфліктаў і трагедый. Яшчэ задоўга да вайны ў Югаславіі, у 1978 годзе, ён пісаў пра нацыянальную нянавісьць і прагу помсты: “Калі падобныя пазыцыі ўзмоцняцца пад уплывам нейкіх зьменаў ува Ўсходняй Эўропе, мы дачакаемся разьні, перад якой паблякнуць нават цяперашнія падзеі ў Ольстэры ці трагічная барацьба літоўскіх партызанаў”. У дні, калі югаслаўская войска, якое толькі-толькі стала сэрбскім, пачало артылерыйскі абстрэл Дуброўніка, ён перасьцерагае сярэднеэўрапейцаў, што вялізная турма сацыялістычнага лягеру можа незаўважна пераўтварыцца ў малыя турмачкі, у якіх падыктатарску пачнуць кіраваць нацыянальныя сатрапы. Ён прызнае, што незалежнасьць, змаганьне за якую было сьвятой

справай для многіх апазыцыйных асяродкаў, можа служыць, а можа і не служыць дабру ці, прынамсі, годнаму жыццю чалавека... Прыклад гэтага — Альбанія Энвэра Ходжы, дзяржава цалкам незалежная. Ён заўжды ідзе на крок далей ад бягучай кан'юнктуры, заўважаючы будучыя пагрозы і рыхтуючы грунт для іх пераадоленьня. Без сумневу, якраз такой была мэта ягоных так даўно напісаных эсэ пра адносіны паміж літоўцамі і жыдамі, палякамі і расійцамі. У іх ён думкаю імкне да новай Літвы, у іх ён сьведамы патрэбы стварэньня новага культурнага слою, які накладзецца на іншыя, атрыманыя ў спадчыну. Гэта зусім іншы падыход, чым пазыцыя тых, хто ў пару саветызацыі марыў перадусім вярнуць страчанае, хаця б у частцы нацыянальных сымбаляў, рэлігіі, традыцыі. Іхная сьцяжына вяла ў мінуўшчыну, у міжваенны пэрыяд, у небясьпечны (сваім анахранізмам) традыцыяналізм. Вэнцлава заўсёды прастуе наперад, усім сабой імкнучыся ўлавіць і асэнсаваць сымптомы таго, што вястуе будучыню. І пры тым як мала хто іншы ведае мінуўшчыну, усю гісторыю і культуру з найдаўнейшага часу. Мабыць, якраз дзеля імкненьня наперад, амаль навязьлівай боязі загрузнуць у мінулым у згаданым ужо інтэрвію часопісу "Anekc" на пытаньне: "Ці лічыце вы сябе пераемнікам польска-літоўскай традыцыі?", адказаў: "Хутчэй не... я належу ўжо да новай традыцыі, новай літоўскай інтэлігенцыі, якая ў новай сытуацыі шукае новую плоскасьць паразуменьня з палякамі. І ня толькі з палякамі, але і з жыдамі, і з чэхамі, і нават з расійцамі, з кожным усходнеэўрапейскім народам, які выступае супраць сыстэмы". Варта памятаць пра тыя ягоныя словы, чытаючы эсэ пра дачыненьні паміж рознымі народамі. Магло б здавацца, што тэкст "Літоўцы і жыды" найменш датычыць будучыні. На абшарах Літвы, дзе ў пару Галакосту існаваў канцэнтрацыйны лягер у Панарах, жыве цяпер толькі невялікая грамадка жыдоў, штогод меншая — перадусім дзеля эміграцыі ў Ізраіль, якая ўзмацнілася ў 90-х гадох. Аднак з гэтай тэмы Томас Вэнцлава распачынае сваё змаганьне за новы кшталт Літвы. Сёньня можна пачуць, што ў літоўцаў абмеркаваньне Галакосту і іхнага ўдзелу ў ім яшчэ наперадзе. Можа, гэта і праўда, асабліва калі гаварыць пра вялікі, агульнанацынальны абсяг гэтага абмеркаваньня, хоць нямала ў гэтым абсягу ўжо і зроблена. Але распачалі яго літоўцы, калі ў іншых частках сацыялістычнага лягеру гэтая тэма яшчэ не гучала. Цалкам

піянэрскі тэкст Вэнцлавы зьявіўся ў 1976 годзе і па сёньня ня страціў сваёй актуальнасьці, у тым ліку і ў Польшчы. “Я ня бачыў, як забіваюць людзей. У дзяцінстве і ў юнацтве сотні разоў я праходзіў паўз гаражы ля алеі Вітаўта, насупраць гарадзкіх могілак, ня ведаючы нічога пра тое месца й ягоную гісторыю. І ўсё ж я ў тым удзельнічаў. Жыдоў забівалі літоўцы, а я літовец. Забівалі жыдоў у Коўне, а Коўна — мой горад; я ведаю ў ім кожны дом, кожнае дрэва ў прысадах”. Акурат чалавек, такі далёкі ад этнацэнтрызму, чалавек, які не баіцца палемізаваць зь літоўцамі, “бо яны свае”, чалавек, якому ворагі прычапілі эпітэт “касмапаліт”, што было абразай у савецкія часы і сёньня засталося абразай у нацыянальных колах… той самы Томас Вэнцлава ў сытуацыі, калі лепей было б дыстанцыявацца ад мінуўшчыны, ейных цёмных старонак, за якія ён не нясе адказнасьці, бо няма калектыўнай адказнасьці… вось жа, у такой сытуацыі якраз Вэнцлава пачуваецца вінаватым, будучы літоўцам больш, чым калі-небудзь раней, і кажа: “Я ў гэтым удзельнічаў”. І калі далей ён хваліць сваю літоўскую культуру і выказвае гонар за гераічную гісторыю свайго народу, то мы пачынаем разумець, што ж ён хоча нам гэтым сказаць: паколькі пачуваецца спадкаемцам той велічы, дык ня можа вырачыся ліха, якое ўчынілі літоўцы ў сваёй гісторыі. Ён не адразу пачаў думаць так. Ён сам прызнаецца, што раней разважаў гэтаксама, як і многія ягоныя суайчыньнікі: “Вось жа, жыдоў забівалі не літоўцы, а пасьледкі грамадзтва (ці іначай — буржуазныя нацыяналісты), а яны ня маюць нічагусенькі супольнага зь літоўскім народам”. І, пэўна, так бы ўжо й засталося, калі б не ягонае магутнае жаданьне вызваліцца з аковаў правінцыйнага, ксэнафобскага, закрытага грамадзтва. Словы: “Нашыя правіны мы павінны зразумець і выкупіць. У гэтым якраз і палягае прыналежнасьць да той ці іншай нацыі”, — пісаў чалавек, заклапочаны будучыняй сваёй бацькаўшчыны, яе будучай свабодай. Пішучы эсэ “Літоўцы й палякі”, а таксама “Адкрыты ліст да літоўцаў і палякаў”, ён кіраваўся падобным імкненьнем. Ужо ў гэтых тэкстах адчуваецца мэтанакіраваная праца над прывучэньнем да сталасьці й сьвядомае выпрабоўваньне літоўскай інтэлігенцыі агнём “ерасі”. Для гэтага важнейшым за прыгадваньне ўласных крыўдаў, бо іх і так добра ведаем, была спроба зразумець формы чужых няшчасьцяў. У аўтару крышталізуецца асаблівая

любасьць да айчыны, якая “не адмаўляе пачуцьця адказнасьці й крытыцызму”, а прынцыпы ставіць вышэй за “ўласна свае” асабліва высокія патрабаваньні. Шмат палякаў гэта засьпела зьнянацку. І гэта добра. У адваротным выпадку гэта не прынесла б столькі дабра абодвум бакам. Гадамі гэта відаць ужо няўзброеным вокам у Польшчы й Літве, дэмакратычных краінах, якія разам імкнуцца да новага, эўрапейскага саюзу. Хацелася б у гэтым месцы згадаць думку сэйненскага біскупа Антанаса Баранаўскаса / Антонія Бараноўскага, абвінавачанага — як і сам Вэнцлава — у палянафільстве: “Нішчыць саюз — сьмяротны грэх”. Што з таго, што гэты сучасны будзе ня польска-літоўскім, а толькі эўрапейскім? Дык і ранейшы ня быў толькі польска-літоўскім, а наадварот — перадусім эўрапейскім. І сучасны, калі мае быць эўрапейскім, мусіць быць таксама польска-літоўскім. І добра, каб пра гэта памяталі ўсе тыя, хто ня змог дараўняцца рыцарству Гедройцяў, Мілашаў, Моркусаў, Каледаў, а таксама нашчадкаў чэскіх гусітаў, якім Вітаўт даў у Літве палітычны прытулак, абачліва мяркуючы, што пасьля літуанізацыі й прыняцьця прозьвішча Вэнцлава яны стануць адданымі патрыётамі.

Энтані Лайвэн, аўтар прадмовы да ангельскага выданьня эсэ Томаса Вэнцлавы, славуты знаўца сярэдне- і ўсходнеэўрапейскай праблематыкі, уважае, што для будучыні гэтай часткі кантынэнту найбольшае значэньне будуць мець тыя эсэ аўтара “Вобразаў надзеі”, якія закранаюць праблемы дачыненьняў грамадзянаў балтыйскіх дзяржаваў з Расіяй і расійцамі. Хаця з польскага гледзішча тэзу Лайвэна нялёгка прыняць, я пагаджаюся зь ёй, зважаючы на тое, што сам вышэй напісаў пра Вэнцлаву як усходнеэўрапейца. Цяжка запярэчыць таму, што, пішучы пра дачыненьні літоўцаў з палякамі й жыдамі, ён заўсёды ішоў у рэчышчы — хоць бы гэта й выглядала іначай у мясцовым кантэксьце — тэндэнцыяў мадэрнай цывілізацыі. “Што да расійцаў, — піша Лайвэн, — наадварот, Вэнцлава плыве супраць плыні, якая здаецца сучасным гістарычным прылівам, і гэты прыліў нясе з сабою вельмі багата патэнцыйных трагедыяў у будучыні”. Ужо ў 1977 годзе, і прычым перад аўдыторыяй літоўскай эміграцыі, ён меў адвагу проціпаставіць сябе квазірасісцкай рыторыцы, якая атаясамлівала ўсё “расійскае” з “расійска-татара-мангольскай”

ці “азіяцкай” мяшанкай, якая знаходзіцца на ніжэйшым роўні разьвіцьця, а ўсё “азіяцкае” — з “барбарскім”. У той самай рыторыцы “Эўропа” і нават “цывілізацыя” належаць краінам з пратэстанцкай і каталіцкай традыцыяй, а праваслаўныя славяне зь іх выключаныя. Такое разуменьне, недапушчальнае, хаця і пашыранае, на жаль, паміж палякаў і літоўцаў, зьдзіўляе й непакоіць сваёй жывучасьцяй на Захадзе, напрыклад, як зазначае Лайвэн, спаміж высокіх функцыянэраў NATO. У гэтым кантэксьце быць усходнеэўрапейцам азначае ня толькі змагацца з нацыянальнымі стэрэатыпамі й канфліктамі, але таксама — а ў будучыні, можа, і найперш — з цывілізацыйнымі стэрэатыпамі й канфліктамі, якія паводле розных злавесных тэорыяў маюць у хуткім часе апанаваць наш сьвет. Я — новая традыцыя “Самая хорошая нация в империи”, — гаварыў пра літоўцаў Іосіф Бродзкі. У Савецкім Саюзе панавала перакананьне, што ім як нікому іншаму ўдаецца бараніць сваю ідэнтычнасьць і дбаць пра нацыянальныя інтарэсы. За адстойваньне літоўскасьці й антыкамунізм, што ў пэўным часе азначала адно й тое, яны плацілі высокую цану, у чым лёгка пераканацца, прасачыўшы статыстыку дэпартаваных і высланых у Сібір. Потым надышлі часы “нацыянальнага камунізму”, сымбалем якога стаў Антанас Сьнечкус, шматгадовы кіраўнік літоўскай камуністычнай партыі. Ён выразна ставіў інтарэсы Літвы вышэй за інтарэсы Масквы і ўжо напэўна — за інтарэсы міжнароднага камуністычнага руху. Яго паховіны ў Вільні ператварыліся ў сапраўдную патрыятычную маніфэстацыю. Хаця гэта выглядае як парадокс, нацыяналісты былі як у лягерах, так і ў камуністычнай эліце, былі яны й спаміж дысыдэнтаў. Нацыяналістам быў таксама й Томас Вэнцлава, незалежна ад таго што паміж ім і іншымі нацыяналістамі магла ляжаць цэлая бездань. Нялёгка зразумець спэцыфіку савецкай імпэрыі ў такіх пытаньнях, як функцыянаваньне панятку “нацыяналізм” і яго ўвасабленьне на практыцы. Асабліва нялёгка — для людзей, выхаваных у арбіце заходняга сьвету, дзе па вайне з фашыстамі слова “нацыяналізм” займела адценьне адназначна зьневажальнае. Можна было б сказаць, што ў Савецкім Саюзе — таксама. Аднак гэта не было адным і тым жа. У Заходняй Эўропе існавалі нацыянальныя дзяржавы, і кожны меў поўнае права праяўляць сваю нацыянальную ідэнтычнасьць. На Ўсходзе пад дэвізам інтэрнацыяналізму праводзілася

безуважная “ўраўнялаўка”, пакліканая стварыць новага, савецкага чалавека. Натуральнай формай бунту супраць гэтага магла быць нацыяналістычная пазыцыя, сфармуляваная найлепей у слынным выслоўі Ўладзімера Букоўскага: “Я нацыяналіст украінскі, армянскі, жыдоўскі, літоўскі, чэскі, польскі, новазэляндзкі, пэруанскі”. Пад гэтымі словамі мог бы падпісацца і Томас Вэнцлава. У гэтай пазыцыі не было нічога ад шавінізму, узбуджэньня нянавісьці на расавай ці нацыянальнай аснове і нават задушнага нацыянальнага партыкулярызму. Ведама, і шавіністычныя формы нацыяналізму існавалі ў імпэрыі, іх умела падсілкоўвалі ды выкарыстоўвалі для ўмацаваньня дыктатарскай улады й зьнішчэньня яе праціўнікаў. Таму нацыяналісты такога тыпу выявілі сваю слабасьць у змаганьні з камунізмам, а калі сыстэма развалілася — нярэдка зьмешваліся з камуністамі, адрозьненьні паміж імі лёгка сьціраліся. На полі бою застаўся нацыяналізм Букоўскага, які насамрэч аказаўся небясьпечным для сыстэмы, бо ўзрываў ідэалягічны маналіт множнасьцяй асобных ідэнтычнасьцяў і змагаўся за права быць сабой, якое кожны таталітарызм адбірае ў чалавека. Томас Вэнцлава быў сабой, будучы літоўцам. Часта выступаў як літовец, пісаў пра калектыўнае сумленьне, падкрэсьліваў сваю літоўскасьць, асабліва ў сытуацыях, калі гэта патрабавала адвагі. Гэтым ён пратэставаў супраць нормаў, накінутых савецкім рэжымам. Але таксама і супраць прынятых у заходнім сьвеце. У тамтэйшых салёнах яму ня раз даводзілася чуць пра сябе азначэньне “нацыяналіст”, што было ня меншай зьнявагай, чым “касмапаліт” у імпэрыі. Стэфан Кісялеўскі пасьля зьяўленьня ў парыскай “Культуры” “Дыялёгу пра Вільню” напісаў, што Вэнцлава “вярэдзіць старыя раны”, абвінаваціўшы яго ў разьдзіманьні старых нацыянальных праблемаў і комплексаў, навеяных тоеснасьцю. Аўтар эсэ “Дэмакратыя й нацыяналізм” выдатна разумеў, што ходзіць па лязе нажа. Аднак ён ня мог ня рухацца ў абраным кірунку. Ня толькі таму, што, у адрозьненьне ад Кісялеўскага, добра ведаў пра існаваньне гэтых “ комплексаў” пад шыльдай сацыялістычнага інтэрнацыянальнага братэрства, але перадусім таму, што мерыўся даць ім рады. І не было іншага шляху, каб дасягнуць гэтага. Ён апынуўся ў цяжкой сытуацыі, якая вымагала ад яго яснага акрэсьленьня сваёй пазыцыі, бо ў іншым разе мог бы апынуцца (як літоўскі нацыяналіст) у таварыстве

асобаў і поглядаў зусім яму чужых — у турме. У першы чарод ён мусіў змагацца з разнастайнымі нацыянальнымі фобіямі, зь якімі найчасьцей асацыюецца нацыяналізм і якія ўзмацняліся па меры набліжэньня распаду савецкай імпэрыі і ўсяго сацыялістычнага лягеру. “Таталітарызм правакуе абсалютызацыю нацыі, прызнаньне ж нацыі абсалютнай вартасьцяй ёсьць формай таталітарнай сьведамасьці”, — пісаў ён у 1977 годзе. У 1991 годзе, калі ва ўладзе быў ужо “Саюдыс” і гэтая абсалютызацыя стала рэальнай пагрозай, ён адразу ж рэагуе: “Мне не падабаецца напісаньне слова ”Нацыя” зь вялікай літары... Гэта ня што іншае, як рабленьне божышча з нацыі, зразумелае пасьля гадоў жудаснага прыніжэньня; тым ня менш, гэта занятак небясьпечны і забаронены дзесяцьма прыказаньнямі”. Аднак ня толькі на паўстрыманьні нацыянальных эмоцыяў і іх крытычнай ацэнцы засяроджвае ён сваю ўвагу. Найперш ён зацікаўлены, як гэта сам акрэсьліў у дыялёгу зь Мілашам, у “гуманізацыі нацыянальных пачуцьцяў”. А для гэтага яму патрэбная была сыстэма маральных вартасьцяў і прынцыпаў. Эсэістыка Вэнцлавы ў вялікай ступені ёсьць спробай адшукаць і сфармуляваць якраз такі кодэкс. Можа, ён не выглядае як нешта новае — яўна заклікае да ўнівэрсальных вартасьцяў хрысьціянства і эўрапейскай цывілізацыі. Рэаліі савецкай сыстэмы, а потым рэвалюцыйных зьменаў у Сярэдне-Ўсходняй Эўропе, аднак, наклалі на ім адбітак, які абумовіў ягоную арыгінальнасьць. Сёньня ў Літве пішуць пра Вэнцлаву як пра чалавека, які заклаў падмурак літоўскага лібэральнага нацыяналізму. Леанідас Донскіс падкрэсьлівае, што найбольшай ягонай заслугай было злучэньне нацыяналізму з маральным універсалізмам. І ў гэтым няма супярэчнасьці. Літоўцам і палякам, якія сварацца, быў Віленскі ўнівэрсытэт польскім ці літоўскім, ён без ваганьняў адказвае: эўрапейскім. Ад самага пачатку ідучы шляхам змаганьня з рэжымам, які ён лічыў нялюдзкім, ён праставаў у кірунку свабоды асобы й адкрытага дэмакратычнага грамадзтва. Змаганьне за чалавечыя правы і нацыянальную ідэнтычнасьць было істотным і абавязковым этапам гэтага шляху. Прыгадваючы праз гады сяброў літоўскай Гельсынскай групы, ён ня меў праблемаў з акрэсьленьнем асяродзьдзя, зь якога яны былі рэкрутаваныя, або ідэяў, якіх яны датрымваліся: абсалютны каталік, каталік-нацыяналіст з традыцыямі

літоўскага паваеннага супраціву, паэтка з традыцыямі даваеннага левага руху, жыдоўскі актывіст… Меў клопат толькі з акрэсьленьнем сябе: “Я — невядома хто, новая традыцыя”. Яму нялёгка было знайсьці месца для сябе ў гэтай рэчаіснасьці. Апроч тых групаў, былі яшчэ так званыя “мандарыны”, або саветызаваная інтэлігенцыя, якая гаварыла па-літоўску, вызначалася вялікай дозай апартунізму і кантралявалася рэжымам, а таксама нацыяналісты ранейшага, міжваеннага ўзору. Былі яшчэ нацыянальныя дысыдэнты, але ім ён закідаў нежаданьне крытыкаваць “усе праявы таталітарызму, а ня толькі камуністычнага. Таму, — рабіў выснову ў размове з Эльжбетай Савіцкай і Маркам Карпам у 1991 годзе, — у незалежнасьць уступаем нібы адной нагой, ня дужа падрыхтаваныя да плюралістычнай цывілізацыі…” Паколькі ні ў ваднай з гэтых групаў яму не было месца, ён быў змушаны запачаткаваць разам з блізкім, але вузкім колам прыяцеляў “новую традыцыю”. Ручыла яму ў гэтым тое, што ён вілянчук, дысыдэнт, усходнеэўрапеец, а таксама лібэральны нацыяналіст. Ён заўжды імкнуўся, каб ягоныя тэксты — у адрозьненьне ад хоць і блізкіх яму ідэйна, але напісаных акадэмічнай мовай трактатаў прыяцеляў, Вітаўтаса Каволіса і Аляксандраса Штромаса, — былі даступныя й шырока абмяркоўваліся. Нягледзячы на гэта, ён не знайшоў мноства прыхільнікаў, прынамсі на першапачатковых, найцяжэйшых этапах сваёй дарогі. Бурлівыя дыскусіі, якія ён выклікаў, ператвараліся найчасьцей у вострыя атакі на яго асобу й погляды. Ён застаўся ў адзіноце спаміж сваіх. Застаўся чалавекам зь іншага боку. Уладзімер Букоўскі склаў нават такую кароткую показку: “Літоўцы — празь дзьве тысячы гадоў напружаных намаганьняў — спарадзілі ўрэшце свайго першага жыда. Яго прозьвішча гучыць: Вэнцлава”. І на гэтым можна скончыць гэты аповед. Але гэта не адзіная праўда пра Томаса Вэнцлаву, можа, нават ня ўся праўда…

З польскай пераклаў Зьміцер Дзядзенка паводле аўтарскага арыгіналу.

zuko601

Чырвоныя зь зялёным і чырвоныя зь белым. Агляд літаратурных часопісаў 2001 году.

Даніла Жукоўскі Даніла Жукоўскі інжынэр, публіцыст, жыве ў Горадні. Публікуецца ў газэтах “Наша Ніва” і “Наша Слова”. Аўтар артыкулу “Пасткі на хайвэі постмадэрнізму” ў “ARCHE-Скарына”, № 4-2001. 1. Мне даводзілася чытаць у “Полымі” агляды літаратурных часопісаў, і я дагэтуль дзіўлюся з іхніх аўтараў. Яны пяшчотна парадкавалі пісьменнікаў, драматургаў і паэтаў у шэрагі і калоны адпаведна з векам і родам дзейнасці. Яны з любасцю сачылі за жыццём і працаю сваіх паддоглядных, за развіццём кожнага таленту. Яны адсочвалі выхад новых кніжак і цікавіліся творчымі планамі. Яны, нарэшце, шукалі паказчыкі, што характарызуюць літаратурнае жыццё ў цэлым — г.зв. літаратурны працэс. Часамі гэта нагадвала справаздачу старшыні калгасу або дырэктара заводу: па вершах у гэтым годзе рост у якасці і колькасці, па прозе ў малых формах рост у колькасці, па вялікіх формах — у якасці, па драматургіі не дацягнулі, выправім у наступным і г.д. Але для чытання могуць быць і іншыя матывы. Чаму б у якасці своеасаблівае інтэлектуальнае прыгоды не пагартаць беларускія літаратурныя часопісы — а раптам знойдзецца нешта вартае ўвагі. Тут і момант надаўся: пачатак стагоддзя (пра тысячагоддзе не згадваю, бо гэта ўжо манія велічы), дзесяцігоддзе незалежнасці краіны — усё схіляе азірнуцца, каб зрабіць нейкія высновы. Нялёгка сёння аўтару стварыць рэч, якая прыцягне шырокую ўвагу. Няма грамадскага ўзрушэння, калі твор можа стацца фокусам новых ідэяў, няма сытага стабільнага жыцця, якое схіляе да чытання дзеля забавы ды пашырэння кругагляду. Адно хіба ёсць — адчуванне, што агромністыя перамены, якія адбыліся напрыканцы мінулага стагоддзя, яшчэ не зразуметыя і не асэнсаваныя. Ёсць два спосабы распавесці пра такое “падарожжа”: сумленна несумленны (яго мы будзем збольшага прытрымлівацца) — з гледзішча звычайнага чытача, то бо’ несумленна, ігнаруючы ўсё, што з розных прычынаў не прыцягнула ўвагі, — і несумленна сумленны: з пазіцыі

адмыслоўча-калекцыянерскай найважнейшай ёсць паўната, таму належыць старанна і сумленна вывучаць усё, не зважаючы на такія рэчы, як даступнасць і прыцягальнасць. А варта ўвагі, што першым уражаннем ад часопісаў ёсць іхняя недасягальнасць. Такія выданні, як “Калосьсе” ці “Правінцыя”, напачатку толькі й пашанцавала, што хуценька перегарнуць, патрымаць у руках. Чацвёрку больш знаных літаратурных часопісаў (“Полымя”, “Маладосць”, “Крыніца”, “Нёман”) можна атрымаць у чытальнай зале, а дадому ўжо за грошы. Там жа ёсць некалькі нумароў ARCHE, які бібліятэкарка на ангельскі манер называе АРЧ’ам. Трэба мець вялікую цягу да беларускае літаратуры, каб “спажываць” яе на такіх умовах. Упартыя пошукі выявілі ў Горадні чатыры шапікі, дзе можна сустрэць асобныя нумары гэтых выданняў. Трэба зазірнуць на найцямнейшыя паліцы ды разгледзець сярод пярэстых вокладак шэрыя кніжачкі “Крыніцы”, або рудыя — “Полымя”, ці белыя — “Маладосці”. (“Нёман” выяўлены не быў.) На маё шчасце, сустракаліся не толькі апошнія нумары “Полымя” і “Крыніцы”, але й ранейшыя — па зніжаных цэнах. Дзякуй Богу, не спісалі! Усё гэта ставіць пытанне пра рэкламу. Лагічна прапанаваць, каб літаратурныя перыёдыкі прадаваліся ў беларускіх аддзелах кнігарняў не толькі ў Менску. 2. Традыцыйна агляды часопісаў пачынаюцца з паэзіі. Вершаў шмат, паэзія ў нас, беларусаў, неблагая — з тэхнічнага боку. Іншая справа, што застаецца ў галаве і ў душы пасля прачытання вершаў. Найчасцей толькі тое, што адвечныя матывы і вобразы жывыя, як і сто, трыста ці дзве тысячы год таму. Каханне (пачуццё, што ў рух пускае зоры), харaство прыроды, Радзімы, роднае мовы, аналіз эмацыйных станаў чалавечай душы — калі чытач прагне гэтага, ён, безумоўна, усё гэта знойдзе ў досыць вялікай колькасці і цалкам нармальнае якасці, у выкананні дасведчаных ветэранаў, сталых майстроў і пачаткоўцаў. Іншая справа, што падчас чытання такіх твораў мне ані разу не пашчасціла забыцца, што пра гэта я ўжо чытаў раней. Ёсць у вершах грамадзянскія матывы, што выклікае станоўчыя, хаця й стрыманыя, пачуцці. Паэтычныя старонкі “Полымя” і “Маладосці” ўтвараюць нават своеасаблівы дзённік водгукаў на самыя розныя падзеі, якія нейкім чынам трапілі ў поле ўвагі паэтаў. Трапіўся верш - М. Дуксы “Стук падводнікаў”, прысвечаны катастрофе расійскай атамнай падлодкі “Курск” (Полымя, 3-2001):

Як вы не чуеце? Ці вы спецыяльна аглухлі? Ці ваша ўвага на іншы аб'ект перанесена? Б'емся аб корпус, сцюдзёны, нямы і патухлы, мы галавой утрапёнай — не проста жалезінай.

Але гэта хутчэй кур'ёз (што праўда, афарбаваны трагічна). Ёсць вершы пра нашы беларускія справы. Васіль Зуёнак (Полымя, 5-2001) піша пра надыход новага тысячагоддзя:

Усё, што мелі, застаецца з намі: І праваслаўе, з'едзенае моллю, І нацзачыстак хіжае нутро, І мовы іншамоўнае бязмоўе, Як антыбеларускае таўро...

Прыемна, што творы з грамадскім гучаннем з'яўляюцца ў друку, але яны не гучаць, схаваныя на старонках тоўстых часопісаў з іхняй абмежаванай аўдыторыяй. Ім бы з трыбунаў гучаць, у жывым выкананні аўтараў! Тады б не так заўважалася паўтарэнне матываў і заклікаў, якое доўжыцца не адзін год і будзе працягвацца яшчэ невядома колькі:

А мы яшчэ вагаемся, Нібыта Не ведаем: на ростанях нягод Наш гімн Не песня — Вечная малітва За Беларусь І за яе народ. (В. Зуёнак "Гімн")

Дзіўна, што такія розныя па ўзроўні і тэматыцы вершы апынуліся на адной старонцы. Дзіўна, але вельмі характэрна для "Полымя" і "Маладосці". Сёння ўплыў высокіх словаў на сітуацыю ў краіне, мякка кажучы, абмежаваны. Гэта ставіць перад паэтамі патрабаванне адысці ад прасталінейных плакатных схемаў да больш аналітычнага адлюстравання грамадскіх з'яў і настрояў. Паспяховае вырашэнне гэтае задачы яшчэ наперадзе. У вершах, прысвечаных канкрэтным падзеям, заўважная празмерная рэпартажнасць (выразна гэта адчуваецца ў вышэйзгаданага сп. Дуксы). Факты трапляюць у радок, не прайшоўшы паэтычнае апрацоўкі. Я не заклікаю пасоўвацца аж так далёка, як Яраслаў Нерад з апавядання Чапека "Паэта", але верш і фотаздымак — рэчы розныя, хай сабе абодва могуць быць творамі мастацтва. Станоўчы прыклад спалучэння інтэлектуалізму і пачуццёвасці — верш Галіны Булыкі "Вяртаецца мода..." (Крыніца, 9-2001):

Вяртаецца мода, бо трызняцца ў шафах шкілетам мундзірна

пакроены час і акопная золь. Лампасяцца словы, сусаліцца бляск эпалетаў, і поўні гербоў атакуе сусветная моль.

Старонкі “Крыніцы”, прысвечаныя паэзіі, з іхнім спалучэннем твораў паэтаў з водгукамі крытыкаў і калегаў — сапраўдная прапаганда паэзіі і нават ейная рэабілітацыя. Дарэчы тут згадаць пра матэрыял Г. Дубянецкай (Крыніца, 9-2001), прысвечаны перакладу слыннага верша П. Верлена “Arte poetique”:

Хай верш твой будзе светлай авантурай, Што прывідам на золку мкне да зор, Трымціць — і пахне, пахне ў ім чабор... Ўсё іншае — з літаратуры.

Трэба вучыць не толькі пісаць, але й чытаць паэзію. У “Крыніцы”, мне здаецца, гэта зразумелі. Найпрыемнейшая з прыкметаў — наяўнасць у водгуках не толькі камплiментаў, але й заўвагаў. Гэтак, у падборцы (7-2001), прысвечанай - Л. Дранько-Майсюку, змешчаны допіс Дз. Серабракова, які дасціпна і востра атакаваў паэтава какецтва, зусім не адмаўляючы ягонага таленту. Але й без крытычных шчыпкоў і выспяткаў (хоць яны, як на мой густ, вельмі дарэчы) звычайная грунтоўная размова, падмацаваная канкрэтнымі творамі паэты, стварае выдатную магчымасць супаставіць тое, што знаходзяць адмыслоўцы і калегі, з непасрэднымі ўражаннямі ад прааналізаваных твораў. Гэта на карысць што чытачам, што аўтарам. Шкода, што іншыя часопісы, у тым ліку тыя, што быццам свядома арыентуюцца на выкладчыкаў і навучэнцаў, аддаюць перавагу традыцыйным спосабам публікацыі, калі творы і іхняе абмеркаванне сепараваныя адзін ад аднаго, разнесеныя па розных рубрыках і нумарах. Для паэтычнага раздзелу “Правінцыі” характэрная менавіта правінцыйнасць. Паэтычныя творы тут хутчэй прэзентуюць аўтара, а не разгортваюць нейкую мастацкую ідэю. На агульным фоне прыемна вылучаюцца тэхнічнаю дасканаласцю вершы Ю. Гуменюка. Першы нумар “Правінцыі” (пазначаны 2000-м годам, але да чытача дайшоў у 2001-м), увогуле, можна назваць удалым: ён ідэальна адпавядае назве, сапраўды прэзентуючы правінцыйных аўтараў з тыповаю для правінцыялаў увагаю да кожнага свайго чалавека, з большаю, у параўнанні са сталічнымі выданнямі,

свабодаю для творцаў. Пра іншае, акрамя маніфестацыі “Мы ёсць, мы — такія”, гаварыць пакуль рана. Пра падкрэслена інтэлектуальную паэзію Андрэя Хадановіча (Крыніца, 1-2001) трэба сказаць асобна. Нібыта гарэзлівае дзіця размантавала творы вялікіх папярэднікаў і складае з іх, як з частак канструктара, новыя. Уражанне — незвычайнае. Вось як выглядае смерць у фінальных радках санету “Першае спатканне”:

Джакондаю ў гагарынскім абліччы ўсміхаецца la belle dame sans sourcils: паехалі, маўляў, — ніхто ня кліча!

Дарэчы, аўтар крыху перастараўся, паставіўшы эпіграф з Міцкевіча ў мове арыгіналу: “Jedźmy, nikt nie woia”. Абазнаныя ў польскай культуры зразумеюць такую алюзію і без эпіграфу. Гэта сеанс адначасовай гульні выкладчыка літаратуры сп. Хадановіча з сусветнаю літаратураю — гульні жвавейшай і весялейшай, чымся змрочныя вядзьмарствы Х. Борхеса, але гэткай жа амбіцыйнай (нездарма паэт гэтак цікавіцца гарацыевым “Помнікам”). Пытанне, якое найчасцей насоўваецца пры першым поглядзе на новыя вершы гэтага аўтара, — як доўга ён яшчэ пратрымаецца, колькі здолее балансаваць паміж магутнай стыхіяй знанага ды непазбыўным жаданнем выказаць сваё? Наколькі хопіць творчых сілаў шукаць новыя абліччы спрадвечнага:

Ты б мог сягнуць вышэй за піраміды, але ў кампутары
Семіраміды твой сад завіс яшчэ ў палеаліт.

Гадуючы жыгучку і дзядоўнік чакаеш, пакуль з’явіцца садоўнік, які націсне “ctrl”-”alt”-”delete”. (“Паслямова”)

На сёння крыжовая выправа ў шырокі літаратурны свет паспяхова працягваецца, адкрываючы для чытача нечаканыя магчымасці беларускага слова. Што праўда, уласцівая паэту падлеткавая гарэзлівасць часам падаецца празмернай. Іншы раз хочацца спыніць стракаценне запазычаных словаў, у якіх губляецца аўтарская думка. Але на ягоную карысць у моры паэтычнага “дэжа вю” гаворыць аргумент Кіма з аднайменнага рамана Кіплінга: “He is new”. Вершы Аркадзя Моркаўкі (гэта ягонае сапраўднае прозвішча, а не “селянізаваны” псеўданім),

паэта часоў юнацтва нашае літаратуры (Крыніца”, 2-2001), зусім іншыя, але не менш уражваюць сваёю свежасцю:

Разгарнулася ўрачыста глыбіня міжзорнай далі,
Брыльянцістымі дажджамі разліваецца абшар. Хай яшчэ раз чысцінёю песні лірнае уславіць Лічбы зораў, пырскі сонца ўсхваляваная душа.

У цэлым жа паэзія застаецца абмежаванаю і тэматычна, і тэхнічна, што не заўсёды выклікана нейкімі цэнзурнымі меркаваннямі, але звыклай інерцыяй. А што гэта за вершы, калі яны напісаныя па інерцыі? 3. Кароткае апавяданне, як самы дэмакратычны жанр, вартае асаблівай увагі. Рэдкаю ўласцівасцю інтрыгаваць чытача вызначаюцца кароткія апавяданні Л. Маракова (Крыніца, 1-2001 — “Іваноў”, Полымя, 6-2001 — “Бацька і сын”, “Настаўнік фізікі”, “Першага верасня”, “Мальбара-Лайтс”). Чытаюцца яны лёгка, пакідаючы ў душы жаданне чытаць далей, і кожны можа адшукаць у іх нешта для сябе, без прыкрасці пазнаёміўшыся з усімі. Галоўнае, што прыцягвае, — аўтар даводзіць мэтазгоднасць барацьбы з Ліхам. Ягоныя героі змагаюцца за сваю годнасць — і хаця яны не заўсёды перамагаюць, іхнія высілкі не выглядаюць марнымі. Іншыя апавяданні неяк не затрымаліся ў памяці, хаця аўтары — людзі вядомыя: Васіль Быкаў (Полымя, 1-2001 — “Велікоднае яйка”), Вячаслаў Адамчык (Полымя, 2-2001 — “Бронекамізэлька № 36”), Барыс Пятровіч (Крыніца, 5-2001 — “Кніга”, “Веласіпед”, “Каханне”, ”Клініка”). Для чытання мініяцюраў А. Кірвеля (Полымя, 9-2001 — “Рэквіем”, “Калі-небудзь”, “Ключы на запас” і інш.) патрабуецца адпаведны настрой. Некаторыя творы ўспрымаюцца як чарговая варыяцыя на даўно адпрацаваную тэму (“Не дажыць” І. Сідарука ў “Правінцыі”). У асобных адштурхоўвае аўтарская пазіцыя (Ю. Станкевіч, Крыніца, 9-2001 — “Усе дзеці любяць бананы”, “Коткі ў бібліятэцы”). Найвялікшая таямніца нашай літаратуры: чаму ў нас так мала твораў, якія проста прыемна і цікава чытаць? 4. Аповесць Андрэя Федарэнкі “Нічые” (Полымя, 3-2001) прыемна вылучаецца на агульным фоне. Найперш гэта ўдалы гістарычны твор. Аўтар дамогся высокай ступені матэрыяльнасці ў адлюстраванні мінулага. Знаўца знойдзе хібы і памылкі, але немагчыма адмовіць пераканаўчасці малюнку. Апрацаваўшы

мемуары і гістарычны матэрыял пра Слуцкае паўстанне, А. Федарэнка здолеў на гэтай аснове стварыць вобразы без ідэалагічнага грыму. Сюжэт аповесці, угрунтаваны ў сведчаннях сучаснікаў, адыходзіць ад іхніх крайніх інтэрпрэтацыяў, што надае яму, улічваючы навуковую нераспрацаванасць пытання, амаль правакацыйны характар. Разам з тым, пісьменнік не маніпулюе фактамі, дазваляючы сабе толькі інтэрпрэтацыю з пазіцыі, багацейшай гістарычным досведам прамінулых дзесяцігоддзяў. У аповесці “Нічые” найцікавейшая менавіта сталая прысутнасць за кадрам праблематыкі дня сённяшняга. Вобразы ўдзельнікаў слуцкіх падзеяў лёгка праектуюцца на сучаснасць. На камернай сцэне ў дэкарацыях Слуцкага павету 1920 году адбываецца тое, што праз семдзесят год паўтарылася на мінскіх плошчах і ў Авальнай зале Дому ўраду. Што я не самотны ў такім разуменні “Нічыіх”, пацвярджае звышасцярожная рэцэнзія дасведчанага А. Марціновіча ў “ЛіМе” (19.10.2001), напісаная гэтак узважана, гэтак абачліва, быццам гаворка ў аповесці пра інтымнае жыццё дзеючага кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта, а не пра падзеі васьмідзесяцігадовае даўніны, вядомыя нам (у тым ліку й рэцэнзенту) адно з кніжак. Жаўрыд, які палымяным словам дамагаецца немагчымага, адольвае перашкоды, адмаўляючы іхняе існаванне. Чайка, якому не пад сілу гэткае духоўнае практыкаванне, які бачыць безнадзейнасць справы, за якую ўзяўся, і зайздросціць тым, хто, пераканаы ў адваротным, аддаўся радаснаму ўзрушэнню. Гэтая п’еса ставілася ў Беларусі не аднойчы. Часта драма пераходзіла ў трагедыю і ані разу ня мела шчаслівага канца. Выявіць глыбінныя прычыны гэтага — дапамагчы нацыі стацца нацыяй, але лячэнне не можа не быць балючым. А. Федарэнку, несумненна, будуць папракаць за недахоп патрыятызму, прыніжэнне герояў Бацькаўшчыны, за сімпатыю да апартуністаў. Дагэтуль эпізоды барацьбы за нацыянальнае вызваленне і дзяржаўную незалежнасць разглядаліся ў нас пераважна ў гераічным ракурсе. Некаторыя аўтары спрабуюць карнавалізаваць нават калабарацыю ў акупаваным фашыстамі Менску (С. Балахонаў, “Смерць лютніста” — ARCHE, 2-2001). Аўтар “Нічыіх” адкідае рамантычныя спрашчэнні. Аповесць кранае фундаментальную праблему развіцця беларускага грамадства — ягоную палітычную нясталасць. Юнацкі максімалізм, слабая арганізаванасць, дзіцячая падатнасць на правакацыі, практычная

адсутнасць прадуманай загадзя стратэгіі і несумненная чысціня ідэалаў складаюць у аповесці і падмурак канфлікту, і падмурак палітычнай няўдачы. Твору, магчыма, не стае глыбіні, але тут вінаваты хутчэй часопісны фармат. Шмат у чым гэтая аповесць нагадвае эцюд, у якім позірк толькі прадчувае магчымае харство вялікага твору. Яна можа легчы ў аснову раману, калі характары герояў атрымаюць большую глыбіню і дыялектычнасць. Я перакананы, што Чайку нельга адмаўляць у беларускім нацыяналізме. Проста яму сорамна прызнацца ў гэтым перад сабою, бо ён не верыць у рэалізацыю ідэяў БНР і яму страшна штурхаць людзей на пакуты і смерць у імя таго, што бачыцца прывідам. Лучнасць мінулага з сучасным пакідае рыску ў памяці чытача, але не яна першапачаткова змушае ўчытацца ў аповесць. Перш ідзе цікавасць да гісторыі. Аўтар вельмі старанна пазбягае асветніцкага тону. Гістарычныя звесткі падаюцца ашчадна і выконваюць хутчэй функцыю эмацыйнага ўздзеяння, чымся інфармавання, асцярожна рассоўваючы імглу вакол некалькіх вёсак на “нічыёй” зямлі паміж польскім і бальшавіцкім войскамі (для чытача — але не для герояў, якія робяць свой цяжкі выбар ува ўмовах страшэннага дэфіцыту інфармацыі). Абраная А. Федарэнкам мадэль стварае нязручнасці для тых, хто не трымае ў галаве асноўных гістарычных фактаў пра слуцкія падзеі, але дапамагае захоўваць неабходны для чытання тэмп развіцця дзеяння ды з’яўляецца сродкам выказвання аўтарскае пазіцыі. Аўтар заклікае чытача спачуваць сваім героям і вучыцца на іхнім прыкладзе, што напаўняе невялікую і нескладаную ў пабудове аповесць асаблівым зместам. Нельга зусім не згадаць і пра раман В. Іпатавай “Альгердава дзіда” (Полымя, 9, 10-2001), пазнавальна “іпатаўскі”, які, аднак, на мой погляд, крыху саступае ранейшым творам пісьменніцы з прычыны спрошчанай інтрыгі і празмернай “легендызацыі” гістарычных падзеяў. 5. Пра цікавыя творы пішацца лёгка, а пра нецікавыя шмат гаварыць няма ахвоты. Праўда, тое, што не зацікавіла мяне, можа захапіць іншага. Іншая справа — творы, што пішуцца на цёмна-шэрым фоне чорнаю фарбаю з барвовымі адценнямі, творы, ад якіх вее безнадзейнасцю, сметніцкім смуродам і п’яным перагарам. Лёгка зразумець, адкуль у аўтараў бяруцца такія думкі, але цяжка апраўдаць іх, калі яны не толькі дазваляюць ім выліцца на паперу, але й на меру свайго таленту

імкнуцца надаць вобразам адчаю і безнадзейнасці як мага большую выразнасць і сугестыўнасць. Найбольш вядомы з “чарнушнікаў” Ю. Станкевіч. Новыя навелы (“Крыніца”, 9-2001) не патрабуюць ніякага карэктавання ацэнак, што даваліся раней (Arche-Скарына, 2-2001). Трохі іначай бярэцца за справу Франц Сіўко ў аповесці “Ўдог” (Полымя, 6-2001). Позірк Станкевіча скіраваны ў будучыню. Ён грунтуе свае змрочныя малюнкі ў сучасных праблемах распаду савецкага грамадства, а на даляглядзе бачыць орды чужынцаў-прыхадняў, якім наканавана канчаткова знішчыць тубыльцаў. Ф. Сіўко зазірае ў мінулае і стварае канцэпцыю своеасаблівага “шкодніцтва” чужынскага элементу дзеля згубы беларускае нацыі, якое цягнецца стагоддзямі (першы эпізод прывязаны да паўстання 1863 году). Варта ўвагі, што ў абодвух аўтараў шкоднікі маюць досыць выразную этнічную характарыстыку, якая выступае як тлумачэнне, скуль родзяцца іхнія пякельныя намеры. Таксама этнічнаю рысаю выглядае бездапаможнасць ахвяраў. Такім чынам, ёсць адказы адразу на ўсе пытанні, акрамя аднаго: “А што ж рабіць?” Да гонару нашых песімістаў, яны не прапагандуюць той “паслядоўнай” праграмы, якая лагічна вынікае з іхніх тлумачэнняў паходжання Ліха ў Беларусі — і не дзіва, бо яна выглядала б небяспечна. Горай, што яны, як здаецца, увогуле не бачаць патрэбы ў праграме барацьбы са злом, або дакладней — не вераць у яе магчымасць. Аматары чорнае фарбы — эскейпісты з мазахісцкім ухілам — не хочуць шукаць выйсця з цяжкога становішча. Ім менш балюча маляваць з’явы шчэ больш жудасныя, чым рэчаіснасць. “Чарнушнікі” прынцыпова адрозніваюцца ад аўтараў, якія ідуць шляхам вострай сацыяльнай крытыкі і гратэску (прыкладам, Я. Палубятка ў “Прыгодах Мармулка” ў “Крыніцы”, № 4, 5-2001). Ліха ў іхніх творах пазбаўляецца сацыяльнае прывязкі, набываючы характар метафізічнага гаспадара гэтага свету. Роля чалавечай істоты чыста пасіўная, Ю. Станкевіч, здаецца, адмаўляе ёй нават у магчымасці ўратаваць душу. Менш за ўсё на свеце клапоціць “чарнушніка” поспех змагання з Ліхам. Застаецца пытанне: а навошта гэта чытачу? 6. У часопісах 2001 году відаць добрая тэндэнцыя: пераклады на беларускую мову нарэшце зрабіліся часткаю культурнага жыцця. Яны — неад’емны складнік канцэпцыі такіх выданняў, як “Крыніца”, “Правінцыя”, “ARCHE”, але з’яўляюцца і ў “Полымі” (“Ніхто не

дасць нам вызвалення” С. Пясэцкага, 6-2001). Вядома, пра сапраўдны росквіт перакладніцкае дзейнасці сёння можна толькі марыць. Для гэтага патрэбныя карэнныя змены на літаратурным рынку. Істотная, аднак, якасная змена ў стаўленні да перакладаў, па-новаму асэнсаваная іхняя каштоўнасць для беларускае літаратуры. Доказам гэтаму не толькі перыёдыка, нагадаем самы яскравы ўзор: В. Сёмуха, дзякуючы сваёй нястомнай працы перакладчыка, бясспрэчна, стаіць нароўні з найбуйнейшымі сучаснымі беларускімі пісьменнікамі. Найістотней, што перакладныя творы, прэзентаваныя часопісамі, хочацца прачытаць, хаця ў большасці выпадкаў якасць перакладаў не заслугоўвае, на жаль, адзнакі “выдатна” (на “добра з плюсам” можна ацаніць пераклады - В. Буйвала з Умберта Эка і Г.Г. Маркеса ды Л. Баршчэўскага — з Г. Бёля). Адчуваецца дэфіцыт перакладаў, або, як кажуць эканамісты, “рынак вытворцы”. Засваенне спосабаў працы з імі ў рэдакцыяў яшчэ наперадзе. Але працэс пайшоў! Эсэ Умберта Эка (Крыніца, 5-2001), навелы амерыканскіх пісьменнікаў (Крыніца, 9-2001), чэх Б. Грабал (“Правінцыя”) ці далёкі новазеландскі сатырык А.К. Грант (Крыніца, 10-2001) — пошукі ў скарбніцы сусветнае культуры пакрысе робяцца (зноў робяцца, дакладней) спосабам асэнсавання ўласна беларускіх праблем. Часам захапленне аўтарытэтам нават пераходзіць межы таго, што лічыцца нармальным у наш час (даўжэзнае эсэ А. Астраўцова “Не казка, а міф” (Крыніца, 3,4,6-2001) цалкам прысвечанае пераказу некаторых канцэпцый К.Г. Юнга, думкам жа самога аўтара месца амаль не засталося). Але, у прынцыпе, гэты факт трэба вітаць. Пераклады разбіваюць сцяну нашага няўмення параўноўваць сябе з іншымі і вучыцца на прыкладзе іншых. Пра беларускія справы немагчыма забыцца, чытаючы Пясэцкага (дзеянне адбываецца ў Беларусі ў рэвалюцыю і першыя паслярэвалюцыйныя гады), ці артыкулы Х. Артэгі-й-Гасэта (Крыніца, 3-2001), ці апавяданні Г. Бёля (“Мой сумны твар”, Крыніца, 01-2001). Дзякуючы перакладам сама беларуская мова нарэшце пачынае не фармальна, а насамрэч выконваць функцыю інструменту сусветнае культуры ў Беларусі. Узмацненне пазіцый перакладу ёсць выразнай прыкметай свабоды. Тое, што гэты працэс ідзе надзвычай павольна, характарызуе беларускую калялітаратурную супольнасць не з лепшага боку, але працэс набірае моц і

робіцца сталым важкім культурным чыннікам. Беручы ў рукі часопіс з перакладнымі творамі, маеш амаль 100 % упэўненасці, што знойдзеш нешта цікавае. Іншая справа, што гэткі стан ня можа трымацца доўга: праз нейкі час чытача ўжо нельга будзе задаволіць самым фактам перакладу — ён запатрабуе якаснага перакладу цікавага твору. 7. Дык што прапануе нам сёння беларуская літаратура для асэнсавання жыцця ды тых зменаў, што адбыліся ў апошняе дзесяцігоддзе? Што спрабуюць пісьменнікі дадаць да створанага раней? Даследуецца перадусім феномен свабоды, яе ўздзеянне на чалавека і грамадства. Можна адрозніць два метады. Першы: практычнае даследаванне магчымасцяў, створаных новай сітуацыяй большай свабоды, найперш — у інфармацыйнай сферы. Тут і сярэднявечнае захапленне назапашанай іншымі мудрасцю, і суперсучаснае абыходжанне з чужымі тэкстамі ў традыцыях постмадэрнізму, і грунтоўнае даследаванне гісторыі, і непрыхарошаныя малюнкі сённяшняга дня. Аўтары карыстаюцца магчымасцю глыбокага і бесстаронняга вывучэння пытання ды дазволенасцю шчырага, не пазбаўленага суб'ектыўнасці выказвання. Гэта аптымістычны метад, бо ён адвольна і міжвольна акцэнтуе менавіта станоўчыя бакі новае сітуацыі. Другі засяроджваецца на дэманстрацыі праблемаў жыцця ва ўмовах свабоды. У цэнтры ўвагі асоба ў трансфармацыі пад уплывам магутных грамадска-палітычных чыннікаў. Свабода не заўсёды добра ўплывае на чалавека, таму нельга адмовіць аўтарам у нейкай рацыі. Іншая справа, засяродзіўшыся на выніку, яны недаравальна часта трактуюць пытанне пра прычыны павярхоўна. Страчваецца найважнейшая функцыя літаратурнага твору — тлумачыць. Лёгка знайшлі ўваход у літаратуру вонкавыя прыкметы новага ладу жыцця (як квінтэсенцыю можна тут прыгадаць "Прыгоды Мармулка" Я. Палубяткі (Крыніца, 4, 5-2001)), але надзвычай марудна і з неверагоднымі цяжкасцямі ідзе працэс пераасэнсавання вартасцяў. У жыцці ён зайшоў нашмат далей, літаратура ж адстае настолькі, што героі часам выглядаюць як акторы, якія граюць малазразумелую ім п'есу (як у савецкім тэатры пра замежнае жыццё). Беларускія пісьменнікі выявіліся мала падрыхтаванай да надыходу свабоды групай грамадства. Між радкоў іхніх твораў занадта часта чытаецца разгубленасць. Пераважаюць непераканаўчыя дэкларатыўныя спасылкі на

неакрэсленыя агульначалавечыя каштоўнасці — ці ўвогуле на Бога. Занадта агульныя гэта адказы, каб выклікаць сапраўдную цікавасць у чытачоў. Праблемай стала “чарнушніцтва”. Небяспека яго, на мой погляд, недаацэньваецца гэтак жа, як пераацэньваецца ягоная непазбежнасць. Пра памылковасць гэткага падыходу добра напісаў Кастусь Травень (“Наша Ніва” за 12.11.01). Самая вялікая бяда беларускай “чарнухі” ў тым, што яна заступае сабой сацыяльную крытыку, падмяняе асэнсаванне жыццёвых праблем абсурдам. Зрухі ёсць. Яны выразна відаць на прыкладзе “Крыніцы” ці “ARCHE” з іх больш сучаснай канцэпцыяй (у адрозненне ад закасцянелай акадэмічнасці “Полымя”), з іх сур’ёзнай, але чытэльнай крытыкай, ахайнай мовай і больш выразным шрыфтам. “Крыніцу” можна чытаць як часопіс — “Полымя” і “Маладосць” гартаеш, каб пазнаёміцца з творамі, што ў іх змяшчаюцца. У першым выпадку відаць праца рэдакцыі над кампаноўкай кожнага нумару, у другіх — хутчэй ціск шматгадовае традыцыі. Мастацкія творы ў “тоўстым” “ARCHE” вызначаюцца эксперыментальнасцю і наватарствам, на якія неспрактыкаваны чытач-дылетант не заўсёды рэагуе станоўча. З іншага боку, нідзе так не адчуваецца імкненне рэдакцыі пераадолець апрыкрыя савецкія стэрэатыпы нашага прыгожага пісьменства. Утрымацца ад перагібаў цяжка, і ў нешырокім коле аматараў беларускага чытання “тоўсты” “ARCHE” адрасаваны яшчэ больш вузкаму колу інтэлектуалаў ды асобаў са снабісцкім ухілам. У нейкім сэнсе гэта “Полымя” наадварот. Супрацьлегласці сыходзяцца, і ў выніку чытэльнасць спажыўцу, як і ў выпадку “Полымя”, даводзіцца вызначаць асобна для канкрэтнага нумару. Пісаць трэба для чытача — думка ня новая і нават у нейкім сэнсе папулярная, але пакуль, як пішуць у газетах, “незапатрабаваная”. Аўтары (за нешматлікімі выняткамі) не адольваюць гэтай вышыні. Нягуста і твораў са смелай грамадзянскай пазіцыяй. У “абноўленай” уладнымі захадамі “Крыніцы” вы ўжо не сустрэнеце “Рабунькі” сп. Наварыча. Чаго нагвалт не хапае ўсім літаратурным часопісам, дык гэта смеху — кепікаў, жартаў, рогату, але найбольш — спакойнай мудрай усмешкі ды самаіроніі. На агульным фоне “Камедыя памылак” Сянкевіча (Крыніца, 3-2001) ці “Стары новы год” С. Астраўцова ў “Правінцыі” выглядаюць нейкімі дыяментамі добрага настрою. Трывалага аптымізму знаёмства з літаратурнымі

часопісамі не выклікае. На сёння перад імі стаяць тры вялікія праблемы: даступнасць, надзённасць і чытэльнасць. Ёсць зрухі, якія могуць абнадзейваць. Ёсць літаратурная грамада — людзі, якія могуць гэтыя зрухі падтрымаць. Але што адбудзецца насамрэч, сказаць цяжка. Справа тут у нейкай прынцыповай незаймальнасці балышыні твораў беларускіх пісьменнікаў. Гэта, як згадвалася раней, сапраўдная таямніца нашае літаратуры (а не часопісаў). Адна справа — дапамагаць настаўніку беларускай літаратуры, памятаць пра патрабаванні педагогікі, пазбягаць непрыстойнасцяў, іншая — рабіць стаўку на школьны прымус як адзіны спосаб выжывання беларускай літаратуры. Неяк галоўны рэдактар “Полымя” прызнаўся, што часопіс свядома арыентуецца на настаўнікаў і навучэнцаў. Гэта мо’ й добра, але мне згадваецца замежная показка: “Наша кампанія дамаглася, каб школьныя ланчы выдаваліся дзецям у зялёных пакетах з чырвонаю аблямоўкай, якія выкарыстоўваюць нашы канкурэнты для сваіх тавараў. Пакуль дзеці падрастуць, яны з нянавісцю будуць глядзець на зялёныя пачкі і потым будуць купляць толькі нашы — чырвоныя з белым”.

duba601

Чалавек тугі Вытлумачэньне Янкі Лучыны

Сяргей Дубавец

СЯРГЕЙ ДУБАВЕЦ вядучы аўтарскай праграмы “Вострая Брама” на радыё “Свабода”. Аўтар кнігі эсэістыкі “Дзёньнік прыватнага чалавека” (Эўрофорум, 1998), укладальнік кнігі Алеся Адамовіча “Vixi”. Ягоная апошняя публікацыя ў “ARCHE” — артыкул “ Апошняе слова Алеся Адамовіча “ (“ARCHE-Скарына”, № 3-2001).).

1. Няма тугі па прамінулым ХХ стагодзьдзі. Бо ўсё лепшае, што за гэты час рабілася ў беларушчыне, само было прадыктаванае тугою па стагодзьдзі дзевятнаццатым. Маю на ўвазе сам дух культуры і культурны кантэкст. У дакумэнтальнай рэальнасьці ХХ-га, нібы тыя печы на папялішчах хат, парасстаўляныя мулкія і неадушаўлёныя знакі бяды — Курапаты, Хатынь, Чарнобыль. А за імі, нібы параграфы разьдзелаў, — калектывізацыя, нацдэмы, партызаншчына, радыяцыя, намэнклятура, Лукашэнка... Блукаеш паміж гэтых знакаў, а ў душы — туга. Бо сама культура наша — туга па ідылііі: па фантастычна прыгожых краявідах, як на малюнках Орды — зямля сядзібаў; па чалавечай шчырасьці, як у лістах Пачынальнікаў; па яснай мэце змаганьня, калі не мяшаюцца дабро і зло, як у бітвах 1831-га і 1863-га; па высокім аўтарытэце гуманістыкі і адукацыі, як у Полацкім калегіюме або Віленскім унівэрсытэце; па чысьціні і людзкасьці. Самыя беларускія творцы, чыё мастацтва прасякнутае нацыянальнай ідэяй, — людзі гэтай тугі. Уладзімер Караткевіч, да прыкладу, — пісьменьнік ХІХ стагодзьдзя. А Пётра Сергіевіч — мастак ХІХ стагодзьдзя. Зянон Пазьняк — палітык ХІХ стагодзьдзя. Ад творцаў пазьнейшага часу іх адрозьніваюць рамантызм, адназначнасьць і першынство маралі. Таму і творы ХІХ-га чытаюцца ўсе, нібы сёньняшнія. Выглядае, што пры канцы ХІХ стагодзьдзя выразьнікі беларускай ідэі моцна затужылі па сваім пражытым веку. Туга тая стала культурай на ўсю пэрспэктыву, і цяпер ужо мы са

сваёй верхатуры часу, тым ня менш, таксама — частка тае тугі і тае культуры. Адлік усяго гэтага тужэньня пачынаецца з канкрэтнага чалавека — зь Янкі Лучыны. Лучына любіў тонкі стыль і краявіды. Сярод тагачаснага ўсеагульнага захапленьня народніцтвам Лучынавы “Паляўнічыя акварэлькі з Палесься” ўспрымаюцца як эстэцтва. Лучына аб’яднаў у сабе дзьве плыні зародкавага беларускага нацыяналізму — усходнюю і заходнюю, пісаў і па-польску, і па-расейску, кантактаваў адначасова і зь дзеячамі заходне-рускага, і крэсовага кірункаў. Лучына стаў адпраўным пунктам нацыянальнага адраджэньня пачатку ХХ стагодзьдзя. Менавіта ягоная кніжка хадзіла па руках тых, хто створыць “Нашу Ніву” і БНР. Са спадчыны Лучыны захавалася найболей твораў па-польску. Ня могучы шырака друкавацца на забароненай беларушчыне, паэт перакладаў свае творы на польскую мову, у выніку чаго захаваліся якраз апублікаваныя вершы і паэмы. Найперш гэта тычыцца Лучынавага шэдэўру — “Паляўнічых акварэлек з Палесься”. Можна цалкам дапусьціць, што арыгінал пісаўся па-беларуску, бо захаваўся адзін разьдзел — “Стары лясьнік” — на беларускай мове. Цікава, што галоўны герой акварэлек — Стары лясьнік — больш літаратурны, чым, скажам, сацыяльны ці этнаграфічны пэрсанаж. Як заўважае дасьледнік Уладзімер Мархель, “паводле маштабу і ўзроўню мастацкага абагульненьня роўнага яму вобразу ні ў беларускай літаратуры, ні ў іншамоўнай літаратуры Беларусі другой паловы XIX ст. няма. Таму “Паляўнічыя акварэлькі з Палесься” можна паставіць у такі гістарычна пэрспэктыўны рад выдатных твораў, як “Песьня пра зубра” Міколы Гусоўскага і “Пан Тадэвуш” Адама Міцкевіча, якія перадвызначылі зьяўленьне “энцыкляпэдыі беларускага жыцьця” — “Новай зямлі” Якуба Коласа”. Гаспода вось. На градцы посуд. Чыста ў хаце. Абраз з выявай Божай Вастрабрамскай Маці На покуці ў вянку. Таўстуха-печ. Вакол Абеглі лавы проста змайстраваны стол. На ім выглядваў хлеб з-пад чыстай палатніны, Нож побач, соль на сподку. Ток чысьцюткі з гліны Заместа мосту — гаспадыніна хвала. Пры печы вілы, качарга і чапяла. Лучына моцна прывязаны да рэчаў і да краявідаў, што часьцяком робіць ягоныя вершы “паэзіяй чыстай красы”, якая перадвызначае ня толькі Коласа, але і Багдановіча. Іншае непасрэднае школы паэтычнага эстэтызму па-беларуску для апошняга папросту не

існавала. Знаходзім мы ў Лучынавых творах і вечна актуальныя філязофскія сэнтэнцыі: Падумае мудры ля блізкай магілы: “За марай пайшоў я ў дарогу, Мне бляскам фальшывым надзея сьвяціла; На сьвеце жывем мы задоўга”. Зусім падобна выкажацца пазьней расчараваны ў сваіх філязофскіх пошуках Альбэр Камю: “Мы занадта доўга жывем”... (Я думаю, а што б стаў пісаць Максім Багдановіч, пражыві ён даўжэй за свае 26 гадоў, якіх яму, здаецца, хапіла, каб цалкам выказацца і стаць беларускім паэтам нумар адзін? Зь іншага боку, 26-гадовага Купалы яшчэ недастаткова, каб гаварыць пра вялікага паэта і народнага песьняра.) Яшчэ адна рыса, што адрозьнівае Лучыну ў шэрагу іншых паэтаў і адначасова пашырае нашыя сёньняшнія ўяўленьні: ён — мянчук. Нарадзіўся, пражыў, памёр і пахаваны ў Менску. Ён — самы менскі паэт у гісторыі беларускай літаратуры, гарадзкі культурны герой, вядомы кожнаму тагачаснаму менчуку і на вуліцах места, і ў менскім тэатры, дзе ад імя ўдзячнай публікі па-беларуску вітаў заежджыя трупы. Акурат на ганку тэатру яго разьбіў паралюш. Факт сумнеўны, бо раптоўны паралюш выглядае зручным спосабам, як бы цяпер сказалі, “закасіць” ад працы паводле разьмеркаваньня ў далёкі Тыфліс. Асабліва калі ўлічыць, што, і ўстаўшы на мыліцы, Лучына не пакідае свайго ўлюбёнага занятку — паляваньня. Паспрабуйце ўявіць гэткага паляўнічага на ласёў зь мядзьведзямі, які са стрэльбай чыкільгае па лесе на мыліцах... А яшчэ Лучына вывучае падзеі паўстаньня 1863 году, згадвае свае гутаркі ў Пецярбурскай студэнцкай тусоўцы з будучым тэрарыстам Грынявіцкім, а таксама свой нядоўгі побыт на Каўказе, у Тыфлісе — горадзе, які на той час сытуацыйна нічым не адрозьніваўся ад сёньняшняга Гудэрмэсу. На паляваньні ён выяжджае ў фальварак Мархачоўшчыну пад Стоўпцамі. Да Неслухоўскіх (сапраўднае прозьвішча Лучыны) Мархачоўшчыну арандаваў Аляксандар Кандратовіч, бацька Ўладзіслава Сыракомлі. Стары “Слоўнік геаграфічны Польскага каралеўства і іншых славянскіх земляў” паведамляе, што маленькі літоўскі лірнік рабіў тут першыя крокі на шляху асьветы, дачыняўся з прыродай і з народам, палюбіўшы яго праз досьвед ягоных тагачасных бедаў. А Ўладзімер Мархель дадае, што ў сям’і Неслухоўскіх вельмі шанавалі Сыракомлю за ягоную творчасьць. Дарэчы, Сыракомля памёр у Вільні, калі менчуку Янку Лучыну было 11 гадоў. Можна нават уявіць сабе, што

будынак быў той самы і што ложкі паэтаў стаялі на тым самым месцы, можа быць і такое, што гэта была тая самая мэбля... Што ж да фактаў, дык згадаю хіба што яшчэ такі. Газэтны. Сёлета ў лютым у Мархачоўшчыне адбылося здарэньне. Зіма, цемра, шостая раніцы. Адзін тутэйшы п'янтос сьпіць пасярод вуліцы, другі едзе на сваім трактары. З прычыны напітасьці абодва нічога не заўважылі... Згадзіцеся, даволі звычайная беларуская гісторыя. Зь незвычайнасьцяў заўважу яшчэ, што ў Мархачоўшчыне ёсьць памятны знак пра Сыракомлю і Лучыну — двух выдатных паэтаў. А мясцовы калгас носіць імя трэцяга — Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Да сказанага дадам дапушчэньне, якое магло б праясьніць біяграфію паэта. Сапраўды, ён не любіў гораду, у якім працаваў у чыгуначнай канторы. Ён любіў свой фальварак і XIX стагодзьдзе. Цяпер — сюжэт. Малады чалавек сканчае інстытут у Пецярбургу і адпраўляецца ня ў родны Менск, а ў Тыфліс — працаваць на чыгуначных складах. Дома прычапіцца не далі — бацька быў пад сталым наглядам паліцыі за паўстаньне. Праз два гады Лучына часова вяртаецца ў Менск, і тут на ганку гарадзкога тэатру яго разьбівае паралюш. У Менску чалавек цягаецца на мыліцах на нялюбую працу. А як выпадаюць вольныя дні, адпраўляецца на вёску. Тут мыліцы адкідаюцца ўбок, Лучына распраўляе плечы, і перад ім разгортваецца поўная праграма здаровага жыцьця. Ён купаецца ў Нёмане, выходзіць на доўгія зацяжныя паляваньні ў навакольныя лясы, добра харчуецца. Навокал зычлівыя паспалітыя людзі, а можа быць, і тая сялянка... Пасьля ўсяго гэтага чалавек вяртаецца ў свой футарал — устае на мыліцы, надзявае акуляры і едзе ў Менск. Проціпастаўленьне выглядае цалкам праўдзіва. Гэта Менск для яго — футарал. А Мархачоўшчына — самое жыцьцё, сьвятая Літва і сьвятая Беларусь, якая натхняе яго на творчасьць.

2. Думаючы сёньня пра творчасьць Янкі Лучыны, раптам разумееш, як за апошнія два дзесяцігодзьдзі зьмянілася Беларусь. Зусім ня тыя кантэксты. Ранейшыя ацэнкі не задавальняюць, іх цяжка зразумець. Што такое "паэт-народнік", або "паэт-дэмакрат", або "пясьняр народнай долі"? Словы, якія сёньня, у часы посткамунізму і Інтэрнэту, нічога ня значаць. Можа, і сама паэзія Неслухоўскага перастала прамаўляць да сучасных душаў і закранаць пачуцьці? Можа, гэта сёньня ўсяго

толькі літаратурны помнік? Дэкаратыўнае словаспляценьне? Першая мая ідэя — перачытаць творы Лучыны менавіта як жывую паэзію. Гэта значыць адшукаць у іх тыя ноты, якія б гучалі актуальна і цяпер. Найперш гэта тычыцца экзыстэнцыйных матываў. Далей — пазнавальныя дэталі і вобразы, зь якімі не аднойчы сустракаўся сам. Забягаючы наперад, заўважу, што і першае, і другое ў вершах Лучыны ёсьць. Але найперш пачытаем крытыку, і ў ёй паміж дэфініцыяў “паэта-дэмакрата” і “паэта-народніка” знойдзем адэкватныя для сёньняшняга розуму азначэньні. Першую тлустую рысу пад творчасьцю Яна Неслухоўскага падвёў ягоны сучасьнік, рэдактар варшаўскай “Праўды” Аляксандар Сьвентахоўскі. Радкі з гэтага тэксту, прысьвечанага сьмерці паэта, яшчэ ў 60-я гады мінулага стагодзьдзя прывёў у сваёй кнізе Адам Мальдзіс: “У Менску памёр чалавек, якога ня ведала шырокая грамадзкасьць, якога гісторыя літаратуры не ўвекавечыла на сваіх старонках, а пасьля сьмерці часопісы не прысьвяцілі яму нават дробнай нататкі. Стоячы ўдалечыні, на ўзьмежку, ён ня быў фаварытам, ня меў падтрымкі, ня стаў пестуном якога-небудзь часопісу, не здабыў сабе сяброў, якія напісалі б нэкралёг, хаця ў сваёй душы ён хаваў і талент, і запал. Ён палюбіў прыроду, прытым літоўскую прыроду, на яе ўлоньні выхаваўся і яе прывабнасьцю захапіўся. Быў ён чалавекам добрым і справядлівым, змог у сабе падтрымліваць агонь духоўнага энтузіязму, нягледзячы на фізычныя пакуты”. Можна дапусьціць, што менавіта з гэтых паблажлівых радкоў пачалася традыцыя прыніжэньня Лучынавага таленту. Пасьля не аднойчы мы прачытаем пра недастатковую адоранасьць паэта Неслухоўскага. І заўсёды будзем адчуваць неабгрунтаванасьць гэтых ацэнак. Урэшце, дзеля чаго тады столькі ўвагі нейкаму нязначнаму эпігону? І чаму тады менавіта Лучынавы вершы сталі адпраўным пунктам для літаратуры нашаніўскае пары? Што да невядомасьці яго для шырокай грамадзкасьці, дык з варшаўскім аўтарам можна паспрачацца. Лучына, верагодна, быў добра вядомы ў правінцыйным Менску, калі ад імя месьцічаў вітаў заежджыя тэатральныя трупы. Зрэшты, самая постаць гэтага чалавека на мыліцах, які штодня хадзіў на працу ў чыгуначную ўправу, не магла ня кідацца ў вочы менчукам. Традыцыю прыніжэньня творчае значнасьці Лучыны працягнулі якраз нашаніўцы, у прыватнасьці, Максім Гарэцкі ў сваёй

“Гісторыі беларускае літаратуры” пісаў: “У нашай паэзіі Неслухоўскі ідзе сьледам за Багушэвічам, з каторым ён адначасна і пісаў. Уплывы Багушэвіча ясна відаць на яго творчасьці. Аднак паэзія Неслухоўскага бяднейшая; няма ў ёй той выразнасьці матываў і таго багацьця фарбаў, што ў Багушэвіча; слабейшая сацыяльная сьведамасьць і не зусім выразная сьведамасьць нацыянальна-беларуская. Быць можа, тут пашкодзіла ахвота ўславіцца ў літаратуры польскай, у каторай Неслухоўскі, аднак, неарыгінален і мала відзен, — ён толькі пераказвае там другіх, асабліва Сыракомлю. У гісторыі нашае літаратуры Неслухоўскі вызначаецца мяккасьцю паэтычных тонаў і лірычнасьцю. У слоўніку яго можна адзначыць некаторыя русізмы, прышчэпленыя, мусіць, расейскаю школаю, як: грудзь замест грудзі, кружась замест кружачыся, робячы кругі, ня даш замест не дасі (гэта ж разам і польшчына) і іншыя”. Максім Гарэцкі ўжо адкрыта піша, што паэзія Неслухоўскага бяднейшая за паэзію Багушэвіча. І якраз у Гарэцкага пачынаюцца тыя незразумелыя сёньня вызначэньні. Што такое “слабейшая сацыяльная сьведамасьць”? І ці можа яна быць крытэрам ацэнкі паэзіі? Зрэшты, як і сьведамасьць нацыянальная. Відавочна Гарэцкі паддаўся тут моднай за савецкім часам сацыялягізацыі, якую пазьнейшай парою крытыкі назавуць вульгарнай. Дасьледчыкі найноўшага часу пазьбягалі параўнаньня паэзіі Лучыны з творчасьцю Багушэвіча. Скажам, Уладзімер Мархель папярэднікам Неслухоўскага называе толькі Сыракомлю: “Прадаўжаючы эстэтычныя традыцыі літаратуры Беларусі сярэдзіны XIX ст., ён аставаўся традыцыйным у польска- і рускамоўных творах і адначасова быў наватарам у вершах, напісаных па-беларуску, дзе ўзаемадзейнічалі рэалістычныя і рамантычныя пачаткі”. Духоўным бацькам Неслухоўскага са спасылкай на колішніх польскіх рэцэнзэнтаў называе Сыракомлю і Адам Мальдзіс. Што да спалучэньня рэалістычных і рамантычных пачаткаў, дык тут ёсьць пра што задумацца ў нашу эпоху постмадэрнізму. Ня так проста ў цяпершчыне вычуць гэтыя самыя рамантычныя пачаткі. Няхай сабе ў вершах, дзе многае тлумачыцца чыстай дэкаратыўнасьцю. Але як уявіць гэткі лад думак і настрой душы не ў паэзіі, а ў жыцьці? Як уявіць сабе рамантычнага чалавека сёньня? Згадваю, што за савецкім часам такіх пытаньняў і жаданьняў не ўзьнікала. Бо менавіта для савецкага часу быў

уласьцівы рамантызм. Усё экзыстэнцыйнае і нэарэалістычнае ў той утопіі ўсеагульнага шчасьця было супрацьпаказанае. Прынамсі, усё гэта вытыркалася на агульным тле, зь якога пры тым ніяк не выпадалі і нават не адрозьніваліся ў агульным філязофска-псыхалягічным клімаце ані рамантызм Сыракомлі, ані рамантызм Купалы. Яшчэ дваццаць гадоў таму гэтыя вершы было цяжка датаваць паводле мэтаду. Чыстым архаізмам гучалі барочныя і клясыцыстычныя творы, а вось рамантычныя часьцяком былі нібы сёньня напісаныя. І вось прайшлі гэтыя гады, і рамантызм “здаўся”, набыў характэрнае гучаньне архаікі. Сама сабою пачалася глябальная пераацэнка каштоўнасьцяў. Калі літаратура — гэта паралельнае жыцьцё, дык рамантычная літаратура перастала быць паралельнай менавіта нашаму жыцьцю, як тое было яшчэ ня так даўно. Сучасная энцыкляпэдычная характарыстыка ўжо не параўноўвае Неслухоўскага з Багушэвічам і ня піша пра бяднейшую творчасьць паэта. Яна карэктна сьцьвярджае, што ў творах Лучыны — вытокі беларускай філязофскай лірыкі. Але, напэўна ж, ня толькі гэта. Зьвернемся да вершаў, у якіх я абяцаў адшукаць матывы і вобразы, зразумелыя сучаснаму чалавеку, і такім чынам спраўдзіць, наколькі творчасьць паэта жывая, ці яна не састарэла. Дзеля чысьціні экспэрымэнту бяру толькі тыя творы, якія былі напісаныя па-беларуску. Польскамоўныя вершы, перакладзеныя на беларускую нашымі сучаснікамі, — ладнейшыя, але вымагаюць многіх агаворак і дапушчэньняў. Вось твор, які мае назву “Роднай старонцы”. Услухайцеся ў гэтыя неадназначныя радкі: Ты параскінулась лесам, балотамі, Выдмай пясчанай, неураджайнаю, Маці-зямліца, і умалотамі Хлеба нам мерку ня даш звычайную.

А сын твой, беднаю адзет сярмягаю, З лыка пляцёныя лапці абуўшы, Едзе драбінамі ці калымагаю, Конем, што цягне, як бы заснуўшы...

Усё ў табе бедна. Часта заплача Мужык араты дзеля злой долі, Цяжка працуючы. Ён жа, аднача, З табой расстацца ня жджэ ніколі.

І непрыглядную хату з пажыткамі, І поле скупое, выган бяз пашы Мы, апрануўшыся старымі сьвіткамі, Любім і цэнім — бо

яны нашы.

Дасьць Бог крывавым потам аратаму Здабрыць пясчану зямліцу здарыцца, Быць добра сытаму, хоць не багатаму, А дзеля празьніка чарка нам зварыцца.

Сонца навукі скрозь хмары цёмныя Прагляне ясна над нашай ніваю, І будуць жыці дзеткі патомныя Добраю доляй — доляй шчасьліваю!.. У гэтым вершы мы, сёньняшнія паяжджане на вёску, знаходзім адэкватнае сваім пачуцьцям адлюстраваньне. Колькі сустракаецца на нашым шляху гэтых непрыглядных хатаў з пажыткамі, скупых палёў ды зарослых выганаў бяз пашы. Толькі сёньня мы тое “любім і цэнім, бо яны нашы” паўтараем з радасьцю ад таго, што на нашай зямлі сканчаецца панаваньне звыродлівай савецкай індустрыялізацыі і буйства прыроды вяртае краю ягонае сапраўднае аблічча. У Неслухоўскага ж былі іншыя прычыны выказаць гэткае пачуцьцё: “любім і цэнім, бо яны нашы”. Хоць слова “цэнім” — гэта наша слова, сучаснае, і яно лучыць нашыя пачуцьці. Між іншым, далей у цытаваным вершы, які ў зборніку “Вязанка” ў 1903-м выдалі самыя першыя беларускія нацыяналісты, чытаем страфу, што вызначыла, магчыма, і ўсю будучыню беларускай справы й ідэі: Сонца навукі скрозь хмары цёмныя Прагляне ясна над нашай ніваю, І будуць жыці дзеткі патомныя Добраю доляй — доляй шчасьліваю!.. Хто б сёньня не падпісаўся пад гэтымі радкамі! Але я не пра тое. Сонца над “нашай ніваю”. На той час ніва — знакавае расейскае слова. Назва пецярбурскага часопісу, частае слова ў паэзіі папулярнага тады Някрасава. Няма сумневу, што менавіта з гэтага Лучынавага верша паходзіць назва галоўнай беларускай газэты “Наша Ніва”. Але, вяртаючыся да абяцанае высновы, я і адсюль вазьму толькі адно слова — наша. Разам выходзіць: цэнім наша. Прыклад Неслухоўскага-Лучыны дае зусім нечаканую ў параўнаньні з ранейшай крытыкай трактоўку плачу беларускіх паэтаў па роднай старонцы і нараканьняў на неўмалот ды нішчыміцу. Пазьнейшыя паэты пад уплывам згаданага Някрасава сапраўды станавіліся плакальнікамі над доляй беларускага мужыка, “паэтамі-народнікамі”. Але ў Лучыны падставаў для такога сацыяльнага рыданьня не было. Ягоны плач мае зусім іншы кантэкст. Беларускі паэт другой паловы XIX — пачатку XX

стагодзьдзя быў шляхціцам. Ці то Лучына, ці то Купала. Можна сабе ўявіць атмасфэру сем'яў, у якіх яны выхоўваліся, дзе штодня гаварылася пра колішняе багацьце, скарб і гонар, пра тое, колькі дзед меў зямлі, сялянаў і маёнткаў, пра тое, як бацька страціў усё дзедава багацьце ў выніку расейскае акупацыі, пра тое, як брата за антырасейскае паўстаньне пад кіраўніцтвам Каліноўскага саслалі ў Сыбір. Дык вось: іхны плач па роднай старонцы насамрэч быў плачам па адабранай маёмасьці. Зусім не сялянскае нараканьне на сацыяльную няроўнасьць, а менавіта абурэньне беларускай арыстакратыі зьнявагаю сваёй мовы, веры і адабраньнем зямлі. Янка Неслухоўскі-Лучына — бясспрэчны клясык і галоўны выразьнік гэтага настрою. Зямля і ніва — наша — не ў філязофскім, не ў абстрактным сэнсе, а "паводле дакумэнтаў", паводле фамільнае памяці. Зямля, забраная ў нас незаконна і несправядліва. Ужо наступнікі Неслухоўскага пачнуць тыражаваць той плач, і ў тыражаваньні паступова страціцца, згубіцца ягоны праўдзівы кантэкст. Словы пра беднасьць ды неўмалот стануць разумецца і пісацца ў дачыненьні да мужыка, народу менавіта з сацыяльным значэньнем. А выгадаваны далёка ад Беларусі Максім Багдановіч, не зразумеўшы рэальнага вытоку гэтых нараканьняў, усклікне: "Кінь вечны плач свой аб старонцы". Тым самым любімы паэт нацыі выкрые праўду пра край, якім у часе каротката эміновага прыезду быў літаральна зачараваны, і няпраўду беларускай арыстакратыі, пад якой тая арыстакратыя хавае свае патаемныя пачуцьці. Багдановіч нібы заклікае паэта-шляхціца: паглядзі, якая твая старонка прыгожая і ў сапраўднасьці багатая! Не, запярэчыў бы яму Янка Лучына, не магу я бачыць сваю бясконца любімую зямлю прыгожай ды багатай, пакуль яе топча чужацкі бот.

jure601

Пераклады эміграцыі* Лявон Юрэвіч Лявон Юрэвіч архівіст Рады БНР, супрацоўнік Нью-Ёрскай публічнай бібліятэкі. Аўтар гістарычнае кнігі “Вырваныя бачыны. Да гісторыі Саюзу Беларускае Моладзі” (Энцыклапедыкс, 2001). Ягоная апошняя публікацыя ў “ARCHE” — артыкул “Сьвет эміграцыйнага эпісталярыю” (“ARCHE-Скарына”, № 3-2001).

* Артыкул напісаны паводле дакладу на канфэрэнцыі, прысьвечанай 30-годзьдзю Скарынаўскай бібліятэкі (2930 верасьня 2001 году).

Пераклад як літаратурны жанр вылучае сярод іншых пэўная безабароннасьць, асабліва ва ўмовах таталітарнай краіны. Бо забараніць грамадзянам думаць і пісаць у роднай мове сваё, патаемнае, вольнае, як мы пераканаліся на лёсе беларускае літаратуры, немагчыма. Зусім іншае -- адлучыць ад сусьветнай культуры празь ненавучаньне замежным мовам, праз старанны адбор дазволенага да перакладу дазволенымі перакладчыкамі. Дзяржава магла кантраляваць гэты працэс, робячы аддзелы іншамоўнай літаратуры ў бібліятэках даступнымі адно па пропусках (чым прыраўноўвала яе да антысавецкай, эміграцыйнай літаратуры, у аддзелы захоўваньня якой, каб патрапіць, таксама быў патрэбны адмысловы дазвол). І тут цяжка не пагадзіцца з Андрэем Дыньком: “Савецкі рэжым у Беларусі ставіў задачу поўнага сьціраньня ранейшае культурнае традыцыі... і татальнай падмены яе культурай новага, “сацыялістычнага” зьместу. ...Існавала негалоснае вэта на пераклады з сусьветных моваў на беларускую. Кантакт беларускай думкі з сусьветам мусіў адбывацца праз расейскае пасрэдніцтва”. Што гэта насамрэч так, што фактычна дзяржава перашкаджала разьвіцьцю перакладчыцкай дзейнасьці, знаёмству празь пераклады з сусьветнаю культураю, добра даказваюць падзеі 90-х гадоў, калі, як толькі ў краіне запанавала адносная свабода творчасьці, першыя здабыткі вызваленае беларускае літаратуры былі зьвязаныя найперш зь перакладамі: адразу зьявілася плеяда новых перакладчыкаў

(Андрэй Хадановіч, Валерка Булгакаў, Мікола Раманоўскі, Валеры Буйвал, Юрась Бушлякоў, Сяржук Мінскевіч), а людзі старэйшага веку, як Васіль Сёмуха, змаглі нарэшце перакладаць жаданае. Эміграцыя атрымала такую магчымасьць нашмат раней. Значэньне перакладчыцкай дзейнасьці нашае эміграцыі адзначыў ува ўласьцівай яму манеры Сакрат Яновіч, беларус на заходне-ўсходнім памежжы (гэта ня столькі геаграфічная прывязка да пэўнага месца, колькі вытлумачэньне комплексаў пісьменьніка), у прыватным лісьце да Часлава Найдзюка ад 11 сакавіка 1983 году: “Выданьне па-ангельску твораў Купалы ці Коласа беспараўнальна болей значыць для справы нашага народу і яго культуры, чымся розныя “прошчы” і “маніфэстацыі” -- гаворачы нейкім вобразным прыкладам, каб быць правідлова зразуметым у галоўным. Чаму ідуць дзясяткі тысячаў даляраў у тую яму херні, а няма грошай, каб заплаціць перакладчыку Купалавага й выдаўцу Купалавага?! Ёсьць на Фларыдзе Пятроўскі, які сам абеларушчыў і выдаў Плятона, Аўрэлюса. Каб Вы тое бачылі, як ён гэтым падняў нас тут на духу: жартанькі -- Плятона можна ўжо чытаць па-беларуску! І Аўрэлюса! Яго гэтыя кніжкі афіцыйна даходзяць да нас тут, за імі ганяецца проста нашая інтэлігэнцыя, як за кніжкай прафэсара МакМіліна з Англіі аб беларускай літаратуры ці бо анталёгіяй Веры Рыч “Як агонь, як вада” (выбар беларускага вершу на ангельскай мове, якую ў нас ведае сёньня амаль што другі малады інтэлігэнт). Мы прагнем далучыцца да сусьветнае культуры й чакаем помачы ў гэтым так жа ад эміграцыі, зразуменьня ёю, што праз гэткае далучэньне зробімся бесьсьмяротнымі, вечнымі, здольнымі жыць далей, а не гібець у нікому не цікавых сьлёзах-крыўдзе (каму мілы жабрак-неўдалота?). Амэрыканцы любяць і ўмеюць паказацца з добрага, самага моцнага ім боку. І нам трэба таго, і маем чым. Ня ведаю, ці акурат не памыляюся, але менавіта гэтак я разумею айца Надсана і лічу яго адным зь немнагалікіх, якія ўмеюць думаць цьвяроза, без шалёных фантасмагорый ды дзіцячасьці ў палітыцы. Скарынінская бібліятэка выклікае ў нас самыя добрыя спадзяваньні, ганарымся ёю ды ўсяляк успамагаем яе. Беларускае вакно на Захад! Але аднаго вакна ў хаце мала, трэба больш!”1 . Пераклады зь беларускай мовы і ў беларускую, скіраванасьць на Захад і Ўсход -- вось два напрамкі перакладніцкай дзейнасьці нашае эміграцыі, два ейныя

вэктары. Эміграцыяй перакладаліся рэчы чатырох катэгорый. Першая -- палітычныя. Пераважна гэта былі адозвы, дэкларацыі (у тым ліку й знакамітая Ўсеагульная дэкларацыя правоў чалавека), адным словам, дакумэнты, што перакладаліся й пашыраліся ў справе змаганьня за вызваленьне Беларусі, як намаганьне растлумачыць таму амаль мітычнаму Захаду сваю праўду. Другая катэгорыя -- тэксты Сьвятога Пісаньня, Стары й Новы Запаветы, малітвы, багаслужбы. Гэтая дзялянка ня проста была занядбаная на Бацькаўшчыне; яна сьвядома й неаднаразова праполвалася службоўцамі з розных інстанцый -- да поўнага вынішчэньня. Фактычна, за рэдкім выняткам (а гэта пераклады айца Чарняўскага, Анатоля Клышкі, Васіля Сёмухі), усё, што сёньня мае беларус у гэтай галіне, ён мае дзякуючы створанаму на эміграцыі. Трэцяя -- пераклады, якія сёньня ўяўляюць больш гістарычную цікавасьць, як практычную, але адыгралі немалую ролю ў лягерох ДП. Маю на ўвазе тыя падручнікі для кіроўцаў альбо “Асновы скаўцкай мэтоды” -- кніжачкі, што дапамаглі практычна ўваходзіць у новае жыцьцё, ствараць на эміграцыі сваё школьніцтва, сваю адукацыйную сыстэму з адною мэтаю: не згубіць моладзь, даць ёй добрую адукацыю й даць яе ў беларускай мове. Хацеў бы спыніцца на чацьвертай катэгорыі -- перакладах мастацкіх твораў, хоць бы подбегам акрэсьліць агульную карціну зробленага эміграцыяй у гэтай галіне, якая да сёньня бадай што не рабілася аб’ектам самастойнага дасьледаваньня2 . Зрэшты, такая няўвага ўласьціва й гуманітарным навукам у мэтраполіі: прыкладам, нават у апошняй па часе акадэмічнай гісторыі літаратуры ХХ стагодзьдзя, два тамы якой ужо пабачылі сьвет у Менску, таксама няма разьдзелу “Пераклады”.

Першым эміграцыйным перакладным выданьнем Новага часу стаўся друк кніжачкі “Про багацтво і бедносць” у 1881 годзе ў Жэнэве. Гэта быў пераклад з украінскай брашуры, напісанай Сяргеем Падалінскім. Беларуска-ўкраінскі ўзаемапераклад на эміграцыі -- сапраўды даўняя традыцыя. Маючы супольнага ворага й падобныя перашкоды, украінцы й беларусы былі цікавыя адзін аднаму. Прыязна складваліся асабістыя адносіны й паміж пісьменьнікамі, што таксама спрыяла перакладчыцкай дзейнасьці. Перакладалі шмат і ахвотна: Міхась Кавыль -- Яра Славутыча, М. Рыльскага, П. Тычыну; Натальля Арсеньнева --

М. Драй-Хмару; Алесь Салавей -- Леаніда Палтаву; Масей Сяднёў -- Славутыча й Палтаву; Уладзімер Дудзіцкі -- Тараса Шаўчэнку; Янка Золак -- Я. Пітруса, А. Навіцкага, Ул. Сьвідзінськага, Тараса Шаўчэнку, Лесю Ўкраінку3 . У 1989 годзе ў Эдмантане было выдадзена “Выбранае” Яра Славутыча ў перакладах М. Сяднёва, М. Кавыля, В. Бірыча (Ант. Адамовіча)4. Нямала перакладалі й з польскай мовы. Найбольш значным дасягненьнем, відаць, трэба лічыць зроблены ў 1956 годзе айцом Пятром Татарыновічам пераклад раману Г. Сянкевіча “Quo Vadis”5 . Калі ж перакладалі творы сучасных польскіх паэтаў, кіраваліся, як і ў выпадку з украінскімі пісьменьнікамі, ня толькі мастацкімі крытэрамі, але й ідэалягічнымі.

Ідэалёгія перакладу ішла побач з культураю перакладу; істотна было ня толькі каго перакладаць, але і як. Патлумачу сказанае на прыкладзе “Песьні пра зубра” Міколы Гусоўскага ў перастворы Натальлі Арсеньневай. Праца над перакладам пачалася яшчэ пры канцы 70-х гадоў з ініцыятывы дырэктара БІНІМу доктара Вітаўта Тумаша. Зробленыя на той час пераклады ён лічыў недасканалымі: Каспровічаў -- дакладным, але недастаткова паэтычным, са зьменены рытмам, да таго ж няскончаны; літоўскі пераклад Казлаўскаса -- пэдантычна дакладным, але па памеры набліжаным да Каспровічавага; пераклад на расейскую мову менскага знаўцы лаціны Парэцкага, наадварот, недакладным, бо быў большым за арыгінал на 72 радкі. Зробленае ж Язэпам Семяжонам ацэньвалася як палітычная пераробка паэмы. Таму дырэкцыяй БІНІМу было прапанавана зрабіць з дапамогаю біскупа Часлава Сіповіча новы пераклад, які б адпавядаў арыгіналу паэмы і ў мастацкіх якасьцях, і з палітычнага гледзішча. Праца над перакладам была цяжкой, заняла нямала часу, і твор быў надрукаваны адно ў 1996 годзе6 . Захаваліся лісты Н. Арсеньневай да В. Тумаша, якія даюць уяўленьне пра тую розьніцу ў падыходзе да арыгіналу й пераствору паміж эмігранткаю Арсеньневай і савецкім дзеячам Семяжонам: “Даражэнькі спадар Доктар, нарэшце сабралася Вам адпісаць. Матар’ялаў да перакладу ў мяне цяпер хіба хапае. Ідэалам, праўда, быў бы так званы падрадкоўнік -- даслоўны пераклад прозай кожнага лацінскага радка, але я разумею, што пры нястачы ў нас сапраўдных лаціністых гэта немагчыма. І таму

трэба абысьціся тым, што ёсьць. Каспровічаў пераклад бліжэйшы да арытмэтыкі, чымся да паэзіі, у ім чамусьці шмат чаго няма. Думаю, што пры карацейшым радку яму даводзілася выпушчаць некаторыя падрабязнасьці. Але, ведама, калі “на чорна” перакладу ўсё, буду карыстацца й Каспровічам. Перакладаць, заглядаючы ў кажны радок, я ня ўмею. Бо, калі чалавек занурыцца ў пераклад, словы ў сказе неяк самі пачынаюць імкнуць, і перарываць іхны імпэт, штораз заглядаючы ў пераклад чужы, спрычыняешся да таго, што перарываецца натхненьне й трэба нанова “разагараць машыну”. Ну, а калі будзе скончана праца, дык “на халодна” можна будзе й пераглядаць, і параўноўваць, і папраўляць. Дагэтуль я пераклала 272 радкі. Ад Калядаў, у студзені, блізу нічога не пераклала, розныя клопаты і іншае не давала часу спакойна ўзяцца за працу. За тыдзень мяркуем ехаць у Фларыду, там -- Вялікдзень, шмат за гэты час ня зробіцца. Але тады спадзяюся зноў памкнуць наперад. Я перакладаю “Зубра” з прыемнасьцяй. Да душы мне й разьмер верша, зусім быццам вецер плыве на вершалінах дрэваў у пушчы. Гусоўскі, відаць, быў сапраўдным паэтам”. І яшчэ адзін ліст: “Даражэнькі спадар Доктар, зь вялікім спазьненьнем адказваю на Вашыя лісты ў справе “Песьні пра Зубра”. Пераклад Семяжона прачытала пару разоў. Ён добры з аднаго боку, але немагчымы -- зь іншых. Першае, ён цалкам супярэчыць асьведчаньням аўтара “Песьні”. У адным месцы сам Гусоўскі кажа, што ён стараецца ўжываць толькі гэткія словы й выразы, якія будуць даспадобы ягонаму апекуну й працадаўцу Біскупу Эразму Плоцкаму, і “ў згодзе із станам сьвятарскім”. А ў Семяжона раз-пораз гэткія выразы, як “нагой у азадак”, “дрэйфіў”, “адвальваў ня скупа” (гэта Вітаўт -- сьвятарству!). Гэтаксама ў яго поўная супярэчнасьць з аўтарам у паглядзе на князя Вітаўта. Для Гусоўскага Вітаўт -- ідэал, якім ён захоплены, а ў Семяжона Вітаўт -- “князь вар’ят”, із “шалёнай прыхамацяй”, “факельшчык войнаў са слабым, а з дужым -- анёл-міратворца”. Тэндэнцыя тут гэткая выразная, што нават не патрабуе аніякае праверкі з лацінскім тэкстам. Калі я скончыла чытаць, у мяне застаўся вялікі нясмак, ну й пратэст. У расейскім перакладзе нічога гэткага няма. Пераклад гэты спакойны, у меру паэтычны і амаль заўсёды ў згодзе з аўтарам “Песьні”. Вітаўта Парэцкі нідзе ня лае. Дый мова ягоная скрозь “у згодзе із станам сьвятарскім”. Паколькі размова зайшла аб

Н. Арсеньневай, хацелася б згадаць і іншыя творы, перакладзеныя ёю, адзначыўшы шырыню абсягу: Уільям Шэксьпір, “Рамэо і Джульета. Пралёг”7 , Г. фон Кляйст, “Разьбіты кубак”8 , Гэргард Гаўптман, “Затонуты звон”9 , вершы Гётэ, Адама Міцкевіча (у тым ліку ўрыўкі знакамітых “Дзядоў”10). Пры параўнальнай нешматлікасьці перакладаў мастацкай літаратуры ўсё ж набытак даволі значны. Асобнымі выданьнямі выходзілі кнігі Р. Стывэнсана “Чортава бутэлька”11 , О. Уайльда “Шчасьлівы прынц”12 , Д. Дэфо “Рабінзон Круза”13 , Д. Сьвіфта “Падарожжа Гулівэра да волатаў у краіне Бробзынгнаг”14 , “Парсіваль”15 . Друкаваліся цэлыя блёкі перакладных твораў; прыкладам, у адным з нумароў часопісу “Сакавік”16 пад рубрыкаю “З сусьветнае скарбніцы” былі надрукаваныя імпрэсія “Выгнанец” Дэ Лем’ен у перакладзе І. Дальняй, “Зварот у далі дзён маленства” У. Сараяна ў перакладзе М. Вольнага, казка Г.Х. Андэрсэна “Сьвінапас” у перакладзе Ул. Ш-ца, а таксама пачатак казачнай драмы Г. Гаўптмана “Затонуты звон”. Уладзімер Клішэвіч перакладаў рубаі Амара Гаяма17 . Свайміперакладамі зь Мікеляндж эла, Гётэ, Гайнэ ведамы Масей Сяднёў18. Рыльке перакладаў Алесь Салавей. Міхась Кавыль, акрамя згаданай ужо ўкраінскае мовы, перакладаў з ангельскае (Н. Гімбел), польскае (В. Гамуліцкі, Л. Падгорскі-Аколаў), расейскае (Б. Пастарнак). Але перакладамі займаліся ня толькі прызнаныя пісьменьнікі, ды друкаваліся яны ня толькі ў “Конаднях” ці “Сакавіку”, “Бацькаўшчыне” ці “Беларусе”. Магчымасьць навучаньня замежным мовам -- як сучасным, гэтак і клясычным, вольны доступ да карыстаньня культурным набыткам заходніх культураў вабілі беларусаў розных пакаленьняў, рознай адукацыі паспрабаваць сябе ў перакладзе19 . Адсутнасьць муру -- як палітычнага, гэтак і моўнага -- паміж пісьменьнікамі -- эмігрантамі зь Беларусі і вольным сьветам дазваляла ня толькі далучацца да таго, што мы звыкла мяркуем здабыткамі сусьветнай культуры, але й -- што ня менш істотна -- рабіць гэта своечасова, не запозьнена -- на гады й дзесяцігодзьдзі. Прыкладам, калі ў 1950 годзе да друку рыхтаваўся чарговы, 10 нумар часопісу “Шыпшына”, акрамя апавяданьня Сараяна “Грунт пад нагамі” ў перакладзе М. Вольнага і ўрыўку з раману С. Максімава “Алім Ахтураў у Патокіна” ў перакладзе Юркі Віцьбіча, акрамя перакладаў Ул. Клішэвіча з Сафо й М. Кавыля

з Гётэ, мелася быць надрукаванай Нобэлеўская прамова Ўільяма Фолкнэра 1949 году (ў перакладзе Міколы Вярбы (Сільвановіча): “Я адчуваю, што ўзнагарода гэтая прысуджана ня мне як чалавеку, але маёй працы -- працы майго жыцьця, што складаецца з поту й душэўных пакутаў і рабілася ня дзеля славы й меней за ўсё дзеля выгоды, але дзеля таго, каб з матар’ялаў чалавецкага духу стварыць нешта тое, чаго дагэтуль не існавала. Такім чынам, я лічу, што ўзнагарода гэтая мне не даецца, але толькі даручаецца. Няцяжка будзе знайсьці грашоваму ейнаму боку прыстасаваньне. Але я хачу знайсьці такое ж прыстасаваньне й зьвязанай з гэтай узнагародай вядомасьці, карыстаючыся гэтым момантам як вяршыняй, зь якой мяне, магчыма, пачуе мужчынская й жаночая моладзь, што прысьвяціла сябе такой жа пакутнай працы й што ўжо мае ў сваім асяродзьдзі таго, хто калісьці будзе стаяць на тым мейсцы, дзе зараз стаю я. Сучасная нашая трагедыя -- усеагульны й паўсюдны фізычны жах. Мы адчуваем яго гэтак доўга, што ён робіцца нязносны. Гэта ўжо не духоўная праблема. Цяпер гэта толькі пытаньне: калі мяне ўзарвуць у паветра. У сувязі з гэтым малады пісьменьнік спакідае без увагі праблемы чалавечага сэрца -- адзіныя праблемы, якія зьяўляюцца крыніцай добрае гістарычнае працы, бо гэта адзінае, аб чым варта пісаць, бо толькі яно заслугоўвае працы й пакутаў”20 . Аўтары перакладаў адгукаліся ня толькі на запатрабаваньні часу, але й на канкрэтныя патрэбы пашырэньня ведаў пра Беларусь. Прыкладам, пераклады вершаў Эзры Паўнда ў выкананьні Янкі Юхнаўца, Зоры Кіпель і Янкі Запрудніка (непрафэсійных перакладчыкаў) суправаджаліся наступным тлумачэньнем: “Беларускі інстытут навукі й мастацтва надоечы атрымаў запытальнік аб перакладах твораў Эзры Паўнда на беларускую мову для ўключэньня ў бібліяграфію, якая рыхтуецца ды неўзабаве мае выйсьці ў амэрыканскім выдавецтве. З ініцыятывы Інстытуту зроблена колькі першых перакладаў вершаў Эзры Паўнда”21 . Інакш кажучы, пераклад быў выкарыстаны для зазначэньня самога назову Беларусь у амэрыканскім бібліяграфічным даведніку сусьветна вядомага паэта -- вось тое клясычнае паяднаньне ідэалёгіі й культуры ў перакладах эміграцыі. Янка Юхнавец пазьней надрукаваў нізку перакладаў яшчэ аднай культавай постаці заходняй культуры -- Томаса Эліята22 . Гаварыць аб

перакладах на эміграцыі і абмінуць постаць Яна Пятроўскага -- наўрад ці магчыма. Хоць ягоная дзейнасьць добра вядомая, дазвольце прынамсі пералічыць тыя выданьні: Вільгельм фон Гумбольдт, “Унутраная хворма мовы” (1988), Вэрнэр Ёгер, “Тэалёгія грэцкіх думаньнікаў” (1980), “Роздумы” (1978) Марка Аўрэлюса (сумесна з М. Кавылём). І, натуральна, пераклады “Дыялёгаў” Плятона. Пры ўсіх магчымых (і часам даволі слушных) закідах аўтару перакладаў трэба прызнаць: нічога падобнага ў Беларусі ня зроблена да сёньня. Дасюль гаварылася аб перакладах у беларускую мову, аб тым самым акне на Захад. Час сказаць і пра значнасьць культурнага акна на Ўсход -- аб перакладах зь беларускае мовы. У 1948 годзе Мікола Вольны (Панькоў) у артыкуле “Сусьветная літаратура й мы”23 выказаў наступнае: “Калі найперш папытаемся, што ж гэта гэткае -- сусьветная літаратура, дык адразу пабачым, што гэтае паймо вельмі туманнае. [...] Шукаючы паважнага ўяўленьня аб сусьветнай літаратуры, часова можам чыста тэхнічна адзначыць яе гэтак: да сусьветнае літаратуры належаць тыя творы, якія перакладзеныя ў 45 вялікіх, г.зв. сусьветных моваў. Найперш успомнім ангельскую, французскую, нямецкую, пасьля яшчэ італьянскую й гішпанскую мовы. Маскоўская мова дзеля пашырэньня твораў блізу ня мае ніякага значэньня. [...] Найперш трэба, каб творы нейкага пісьменьніка пераклалі ў адну з 45 вялікіх моваў”. І гэтак сталася! Эмігранты спрыялі перакладу ў заходнія мовы клясычных твораў нашай літаратуры. Для ацэнкі зробленага ў адносінах да твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа існуе цэлая бібліяграфія “Янка Купала і Якуб Колас на Захадзе”, укладзеная Зораю Кіпель і Вітаўтам Кіпелем24 . Перакладалі й Максіма Багдановіча. Адным зь першых, у 1948 годзе, часопіс “Сакавік” зьмясьціў пераклады двух вершаў пад назовам “Максім Багдановіч панямецку” -- “Meine Lieder” і “Emigranten”, пазначыўшы, што “вершы гэтыя ўзятыя з падрыхтаванага да друку ў нямецкай мове зборніку вершаў Максіма Багдановіча ў перакладзе Аўгена Энгельгарта”25 . У тым самым 1948 годзе газэта “Бацькаўшчына” выдрукавала нэкралёг Аўгена фон Энгельгарта, напісаны В. Максімовічам (Вітаўтам Тумашам), і зьмясьціла побач верш у перакладзе нябожчыка “Mein Letzter Wunsh”. У ягоным жа перакладзе ў 1996 годзе быў надрукаваны і “Апокрыф”26 . Усім вядомыя пераклады вершаў Багдановіча ў

ангельскую мову, зробленыя Вераю Рыч. Яны сталі ўжо амаль клясычнымі, як і анталёгія “Як агонь, як вада” -- унікальнае выданьне як у станоўчым пляне -- сваёю якасьцю, ахопам, гэтак і ў адмоўным -- тым, што яна адзіная. Вельмі істотным падаецца той факт, што эмігранты перакладалі не адно клясыкаў, але й сучасных пісьменьнікаў, таксама эмігрантаў. Гэтак, канадзкая газэта The Winnipeg Tribune ад 24 сьнежня 1952 году зьмясьціла ці ня першы ў ангельскай мове твор эмігранта-беларуса -- апавяданьне Вольгі Таполі Orphan of Forest Wept з пазначэньнем “Беларуская народная легенда” ў перакладзе Леон Косар. Нашмат раней, у 1947 годзе, Ю. Вітан-Дубейкаўскаю ў нямецкую мову быў зроблены пераклад кнігі Сяргея Хмары “Аб багох крывіцкіх сказы” -- Ueberlieferungen von den Goettern der Kriwitschen (Weissruthenischer Mythos). Але пераклад быў адбіты толькі ў некалькіх асобніках у лягеры Ватэнштэт, а таму застаўся невядомым шырокаму колу нямецкамоўных чытачоў і беларускіх дасьледнікаў. Ёсьць і свае загадкі ў перакладчыцкай дзейнасьці нашае эміграцыі. Адна з найбольшых, як для мяне, -- пераклады, і шматлікія, вялікай колькасьці твораў беларускіх пісьменьнікаў у англамоўнай кнізе Антона Адамовіча “Супраціў саветызацыі ў беларускай літаратуры”. Магчыма, самай перакладаная кнігаю сталіся ўспаміны айца Язэпа Германовіча “Кітайібір, што былі выдадзеныя ў літоўскай27 , італійскай28 , польскай мовах29 . Вяліся перамовы аб перакладзе і ў ангельскую мову30 . Сьведчаньнем узроўню, дасягнутага эміграцыяй у перакладчыцкай дзейнасьці, і пэўным сымбалем і гэтай дзейнасьці, і самой эміграцыі, урэчаісьненай ідэяй яе бачыцца “Беларускі Трыстан”, перакладзены сп. Зораю Кіпель у ангельскую мову31 : твор заходняй культуры, перакладзены ў беларускую мову і ўспрыманы як твор нашае культуры, “вярнуўся” на Захад у перакладзе дзеяча дыяспары.

1 Ліст захоўваецца ў архіве Фундацыі імя П. Крачэўскага. 2 Дзеля гістарычнай праўды трэба адзначыць, што адным зь першых аб перакладах напісаў Барыс Сачанка. Дзеля той самай праўды трэба й зацытаваць напісанае: “Пераклады. Іх няшмат, і амаль усе яны, за невялікім выключэньнем, ня надта высокай якасьці”. (Б. Сачанка. Сьняцца сны аб Беларусі... Менск, 1990. С. 62). Першым сур’ёзным і бадай адзіным дасьледаваньнем на

сёньня варта лічыць артыкул В. Кіпеля “Notes on Belarusian-American-English Literary Relations”. Гл.: “Запісы БІНІМ”, # 20, 1992. С. 108118. 3 Л. Палтава. Пераклады.[Алеся Салаўя, Натальлі Арсеньневай]. “Конадні”, # 3, 1955. С. 4748.; З украінскага. Пераклады [М. Кавыля, В. Бірыча]. “Конадні”, # 4, 1955. С. 4950; З украінскае літаратуры: Яр Славуціч, Ігар Кастэцкі, Леанід Палтава, Олэкса Вератэнчанка ў перакладах Масея Сяднёва, Янкі Юхнаўца, Алеся Салаўя. “Шыпшына”, # 5, 1947. С. 4348; Янка Золак. Творы. Том другі. 1981. Разьдзел “З чужога палетку”. 4 Падрабязьней пра беларуска-ўкраінскія літаратурныя сувязі гл.: Л. Юрэвіч. Да гісторыі беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей. “Беларус”, # 454, травень 1998. С. 5. 5 Sienkievіи, H. Quo Vadis. U bieiaruskim pierakiadzie ks. Dr. P. Tatarynoviиa. -- Rym: Vydavectva bieiaruskaha peryjodyka “Цniи”, 1956. 6 “Запісы БІНІМ”. #22, 1996. С. 434. 7 “Наперад”, Лювэн, #25, 1953. С. 5155. 8 Пераклад быў зроблены ў 1943 г. у Менску. 9 “Сакавік”, #1 (2), 1948. С. 2634; “Конадні”, # 1, 1954. С. 5268; “Конадні”, # 2, 1954. С. 5167. 10 Н. Арсеньнева. Між берагамі. Ню Ёрк, 1979. С. 309317. 11 Стывэнсан, Робэрт Люі. Чортава бутэлька. Пераклад з ангельскае Б. Г. [Баляслаў Грабінскі] і В. Т. [Вітаўт Тумаш]. Ватэнштэт, 1947. 12 Уайльд, Оскар. Шчасьлівы прынц. Пераклад з ангельскай Л. Хвалько. Ватэнштэт, 1947. Шкода, што пра гэтыя пераклады нічога не вядома ў Беларусі сёньня. Гэта ня проста мёртвая спадчына; перавыдадзеныя, творы й зараз могуць працаваць на культуру. І ня трэба было б тады, друкуючы пераклад турэмнай споведзі Оскара Ўайльда ў часопісе “Крыніца”, згадваць як адзінае выданьне “Салавей і Ружа” 1978 году (Галіна Дубянецкая. Пра жэўжыкаў і горкія лекі. -- “Крыніца”, # 64, 2001. С. 132). 13 Даніэль Дэфо. Рабінзон Крузо. Пераклаў з ангельскае мовы на беларускую - С. Коўш. Ватэнштэт, 1947. 14 Swift, J. Падарожжа Гулівэра да волатаў у краіне Бробзынгнаг. Пераклаў В. П. [Вацлаў Пануцэвіч]. Фленсбург, 1949. 15 Парсіваль. Сярэдневяковая легэнда. Пераклад зь нямецкае Л. Галяка. Выдавецтва “Я.С.” Ватэнштэт. 1947. 16 “Сакавік”, #1 (2), 1948. С. 2637. 17 Гл. Лявон Юрэвіч. Архіўная кніга. Нью Ёрк, 1997. С. 212256. 18 Масей Сяднёў. А часу больш, чым вечнасьць. Глен Коў -- Нью Ёрк, 1989. С. 6191; Ён жа. Масеева кніга. Менск, 1994. С. 183192. Дарэчы, цікава параўнаць перакладніцкую дзейнасьць -

М. Сяднёва з мастацкай літаратуры, разуменьне ім важнасьці перакладаў для разьвіцьця нацыянальнай культуры -- і адначасова непрыманьне й неразуменьне ня меншай важнасьці перакладаў рэлігійных тэкстаў (М. Сяднёў. Да пытаньня перакладаў рэлігійных тэкстаў на беларускую мову. У кн.: “Беларусіка 5: Культура беларускага замежжа; Беларуска-амэрыканскія гістарычна-культурныя ўзаемадачыненні”. Менск, 1995. С. 7174). 19 Напрыклад: Фэдрус. Варона і ліса. Воўк і ягнё. Жаба і вол. Ліса і вінаград. Пераклады баек з лацінскае мовы. Перакладаў М. Фабулевіч. “У выраі”, # 1, 1947. С. 2829; “Два залатыя яблыкі”. Калядная зага зь Ніжняе Аўстрыі. Пераклаў Ал. Крыжаноўскі. “Сьветач Хрыстовае навукі”, # 12 (60). Сьнежань 1961. С. 78. 20 Пра нявыдрукаваны нумар часопісу “Шыпшыны” й матар’ялы зь яго гл.: Літаратурная спадчына: новы ўгляд. “Беларус”, # 432. Люты 1996. С. 7. 21 “Запісы БІНІМ”, # 19, 1989. С. 150157. 22 T.S. Elliot у перакладах Янкі Юхнаўца. “Беларус”, # 462. Красавік-травень 1999. С.7. 23 “Сакавік”, # 1 (2), 1948. С. 3839. 24 Янка Купала і Якуб Колас на Захадзе: бібліяграфія. Уклад. Вітаўт Кіпель і Зора Кіпель. Нью Ёрк: БІНІМ, 1985. 25 “Сакавік”, # 2 (3), 1948. С. 31. 26 “Запісы БІНІМ”. # 22, 1996. С. 3544. 27 Hermanovicius, Juozapas, Mic, Kun. Raudonuju Stovyklose... Londonas, 1969. 28 Hermanovii, Giuseppe. Cina--Siberia--Mosca. Marx e Lenin in Ralta. Roma, Ed. Paoline, 1969. 29 Hermanovicz, J., Ks. Chiny--Sybir--Moskwa. Wspomnienia misjonarza z lagryw sowieckich. London, Veritas, 1966. 30 Л. Юрэвіч. Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі. БІНІМ, Нью Ёрк, 1999. С. 65.

halub601

Рэцэнзіі. Палеміка

Выйсці са штольні Леанід Галубовіч Віктар Слінко. Штольні вясны. -- Менск: Беларускі кнігазбор, 2001. “Грэць камень, Каб потым Сагрэцца ля каменя?” (“Паэзія”. В.Слінко) Апошнім часам даводзіцца шмат чытаць і проста перагортваць дзесяткі новых паэтычных зборнікаў, якія цяпер раз-пораз выскокваюць з розных выдавецтваў, як першыя восеньскія апенькі з утравелых пнёў... Зазвычай іх прыносяць самі аўтары з разлікам, што ты, прыняўшы падарунак, раптам аддзячыш ім водгукам ці рэцэнзіяй на тую кніжачку... Аднак гэта здараецца вельмі рэдка з той прычыны, што тыя зборнікі вершаў не выклікаюць у тваёй душы аніякага творчага ці хоць бы таварыскага водгуку. Як любіць жартаваць адзін мой літаратурны знаёмец, уся каштоўнасць гэтых кніжачак аплачваецца самімі аўтарамі... Я ж люблю чытаць тое, што прыносіць не толькі эстэтычнае задавальненне, але і змушае да глыбокага роздуму, а то і ўвогуле вучыць нечаму новаму, адкрываючы перад тваім досведам тое, да чаго ты сам з тых ці іншых прычынаў не змог “дакапацца”... ды шчымліва й хвалююча будзіць у памяці даўно забытае й ціха прыспанае... Нешта падобнае здарылася ў мяне з паэтычным зборнікам Віктара Слінко “Штольні вясны”. Аўтар гэты як для паэта -- не малады, а як для сучасніка-грамадзяніна -- то ў самым зеніце сталасці. Аднак яму не хапае веры і ўпэўненасці ў сваёй паэтычнай сіле... І, мажліва, гэта не горшая адзнака творцы. Бо, да прыкладу, у адрозненне ад папярэдняй сяброўскай іроніі наконт самакаштоўнасці звершаваных кніжачак, у Слінко сваё ўласнае разуменне і стаўленне да жыццёвых і чалавечых вартасцяў, таму што

“тое, за што заплочана, губляе сваю цану”, --

афарыстычна кажа ён свайму чытачу, і гэтаму верыш, не зважаючы на маладосць аўтара. Яшчэ раней ад людзей, якія блізка ведаюць Віктара Слінко, я дачуўся, што ў юнацтве ён захапляўся вершамі і жыццёвай планідай трагічнага

расійскамоўнага паэта Ігара Паглазава, таленавітага трынаццацігадовага менскага васьмікласніка, што ў 1980 годзе самохаць сышоў з яшчэ толькі распачатага жыцця... Ці не шчымліва-роспачныя радкі таго паэта-юнака часта перачытваў сам сабе такі ўражлівы і прымхлівы да ўсіх праяваў свайго лёсу Віктар Слінко?

Мне не простит Господь Моих святых грехов. Его я проклял плоть, Его я пролил кровь. Я не боюсь Тебя. Услышь мой глас земной. Я вышел из огня, Чтоб умереть с тобой! Параўнайце гэтыя радкі з загалоўнымі (эпіграфнымі) радкамі да першага зборніка вершаў Віктара Слінко “Апошні снег”:

Узнёслы -- шукаю прыгажосць, прыгнечаны -- вострае лязо. Усё патрабуе выйсця натхненне і самота, словы і кроў...

Новы ж зборнік паэта “Штольні вясны” пачынаецца вершам “Дэмасфен”, філасофская аснова якога падсвядома праектуецца на ўсю змястоўную прастрань кнігі.

я не ўмеў гаварыць над плячамі падвешваў мячы каб валодаць сабою; выходзіў да мора казаць свае словы і ў доўгай прамове сябе пакідаць прывітаннем аблокам і птушкам якія былі толькі сведкі маўчання майго

У жыццяпісе Дэмасфена незраўнаны Плутарх, аспрэчваючы Эўрыпіда, які нібыта сказаў, што “для поўнага шчасця чалавеку найперш неабходна мець бацькаўшчынай места знакамітае і слаўнае”, піша, што “ўсё ж калі нашы помыслы і ўчынкі не зусім бездакорныя, то вінаваціць за гэта па справядлівасці трэба саміх сябе, а не сціплыя памеры сваёй бацькаўшчыны”, не прамінуўшы, аднак, бессаромна зазначыць напрыканцы, што асабіста ён жыве “ў невялікім гарадку і, каб не зрабіць яго яшчэ меншым, збіраецца ў ім жыць і надалей”... Спадзяюся, што гэтая цытацыя цікавая для большасці чытачоў, таму працягну далей Плутархавы домыслы наконт аракула Дэмасфена, які, будучы слабасільным ад прыроды і не маючы задаткаў трыбуна, усё ж сілай сваёй волі дамогся пастаўленай мэты, -- менавіта адсюль, як мне падаецца, “скрадзеная” і таемна прыхаваная сама сарцавіна ідэі гэтай паэтычнай кніжкі сучаснага аўтара. Не на пустой глебе “вырастаюць” такія радкі:

Вакол Цябе аблога... Невядомасць. Пазнай мяне па тым, як гавару.

Дык вось Плутарх, які, кажучы пра іншых, тым самым гаворыць і пра сябе, са шкадаваннем распавядаючы пра тое, як позна ён вывучыў мову рымлянаў і толькі на схіле гадоў пачаў чытаць рымскія кніжкі, піша наступнае: “І -- дзіўная рэч, але гэта праўда -- са мною здарылася вось што: не так са слоў даведваўся я пра змест, як, наадварот, са зместу, пра які так ці інакш я ўжо меў пэўнае ўяўленне, прыадкрываў значэнне саміх слоў. Вядома, у поўнай меры адчуць прыгажосць рымскага складу, яго сцісласць, мноства метафар і стройнасць -- адным словам, усё, чым упрыгожваецца мова, -- мне здаецца справай цікавай і не пазбаўленай прыемнасці, але яна патрабуе нялёгкай працы і ўпартых заняткаў і па сіле толькі тым, у каго больш вольнага часу і чый узрост яшчэ не з’яўляецца перашкодай для такога роду заняткаў”. Віктар Слінко разумее кошт людскога слова і цану чалавечага жыцця і таму ў сваіх паэтычных інтэрпрэтацыях, у “адцягнутых у часовай прасторы” праекцыях на беларускую моўную сітуацыю не можа не сумнявацца ў некаторых вартасцях цывілізаванага свету, у тым ліку і ў тых, якія зыходзяць не ад чалавека нават, а ад самога Слова. Абсалютна адмежаваўшыся ад палітычных праяваў жыцця, ён -- хоча таго ці не -- пераносіць грамадскую сітуацыю ў свой унутраны свет і міжвольна сам робіцца “палітыкам” свайго, адстароненага ад шырокіх слаёў грамадства суверэннага жыцця, бо

залатыя там кажуцца словы ...але раптам усё гэта -- ловы?

Калі спакойна паставіцца да сітуацыі “чалавека ў самім сабе” і паразважаць над тым, што “быццё вызначае свядомасць”, а не наадварот, то

Куды прывядзе мяне дым, Акрамя папялішча? Не стой на скрыжаванні: гэта месца, Дзе ты належыш усім.

Аднак, прызнаюся, гэта ўжо мае ўласныя домыслы, наўзбоч аўтарскіх тэкстаў і ўсёй паэзіі агулам, напісанай на палях бясконцых сацрэалістычных палотнаў айчыннай прозы... Ізноў Плутарх: “Арыстон Хіёскі прыгадвае словы Тэафраста пра

некаторых аратараў. На пытанне, які, на яго думку, Дэмасфен як аратар, ён адказаў: “Варты свайго места”, а Дэмад -- “Пераўзыходзіць сваё места”.

Я не хачу прысутнічаць пры тым, Як будуць праклінаць, а можа, славіць Паэта, спевака ці валацугу, Як быццам песні выкупляюць смерцю --

напісаў Віктар Слінко, і мы цяпер паспрабуем вярнуцца да самага пачатку і перайсці канкрэтна да яго сціплай асобы. Іранічна заўважу, што вышэй успомненым мыслярам хапіла аднаслоўных імёнаў, каб увайсці ў сусветную гісторыю, а нашым сучаснікам не заўжды дастаткова і двух, а то яшчэ й бацькоўскага імя наўздагон, каб сцвердзіць сябе ў сучаснай літаратуры... Усведамляючы свае чалавечыя слабасці, наш паэт спрабуе “адплыць” ад надзённага да метафарычнай, яшчэ помнай па “Дэмасфене” “ненагляднай радасці”: любіць альбо жыць для людзей... Бо там -- своеасаблівы свет, дзе на дапамогу твайму бяссіллю могуць прыйсці такія блізкія вобразы твайго далёкага маленства, як дзяды і бацькі, сябры і суседзі і нават помныя салодкімі тагачаснымі пахамі хата, двор і сцежка ў траве -- з двара...

І адцягнецца час вяртання Да мясцін, дзе прагляне дарога.

...І цябе там ужо не пазнае Незагоены брук Учарашні.

Развагі над рэчамі, з’явамі, дзеямі і людзьмі, якія засталіся за смугой гадоў і сёння паўстаюць толькі настальгічнымі згадкамі, зводзяцца паэтам да своеасаблівай часовай панацэі ад свайго душэўнага болю. Нават гуляючы ў парку са сваім немаўлём, можна схавацца за ягоны век і ўжо адтуль чыстымі і бязгрэшнымі вачыма дзіцяці вызірнуць з-пад павек у свой сталы сённяшні свет... Але ...немагчыма вярнуцца адтуль, дзе ніколі не быў Целам сваім. І таму прыкаваны ланцуг.

Аўтар, магчыма, і вярнуўся б адтуль, ды яго “трымае матчына ўлонне”... Каханне й любоў, што ўлагоджваюць і задавольваюць нашу душу й плоць, бянтэжаць і прысаромліваюць ягоны дух. Кожны свой зямны плоцкі і цялесны грэх паэт хоча не толькі апраўдаць, але і ўзвысіць...

Дзе, на якіх скрыжалях Напісаць імёны кахання, Каб блізарукае неба Іх прачытала?

Малады паэт ужо не можа задаволіцца, як, скажам, вопытны і майстравіты Рыгор Барадулін, простай чалавечай зямной радасцю на дваіх:

Табе найлепшыя радкі Яшчэ я напішу. Яшчэ я іх кармлю з рукі І не ўзлятаць прашу.

Падобныя “комплексы” “даганяюць” Віктара Слінко і ў таварыскіх, творчых і прафесійных узаемаадносінах з блізкімі людзьмі. Стасункі з імі не дадаюць нашаму аўтару ўпэўненасці ў сваіх сілах. Ён -- максімаліст і не можа дазволіць сабе прыняць версіфікатарства за Паэзію. І таму зайздросціць нават свайму самаму блізкаму сябру, калі таго спасцігае сапраўдная ўдача.

Ты помніш, як падалі зоркі? Нехта страсаў іх з нябачнага дрэва. А ты даў патрымаць мне сваю: Яна ўпала ў тваю далонь, а значыць -- Абрала цябе...

Адным словам, псіхалагічна жыццё ў гэтым свеце даецца нашаму паэту вельмі няпроста... І ці не таму хаваецца ён ад яго негатыўных праяваў за чыстым аркушам паперы, нібы за тэатральнай заслонай.

У глухаце так добра гаварыць З самім сабой у перспектыве смерці.

Матывы глыбокага песімізму, прастрацыі і смерці ў сучаснай беларускай паэзіі хоць і не новыя, але менавіта ў паэзіі Віктара Слінко яны адметна-заўважныя, бо асабіста перажытыя і пераасэнсаваныя.

А за вакном нябожчыцаю ў белым Мая зіма. Навокал пацямнела. Як дыхаецца цяжка пахаваным!

Безумоўна, у наш час, калі моладзь “адрываецца” і “адцягваецца”, а хмарачосы бурацца, немагчыма выказваць уласны боль і звяртаць увагу грамадства на свае асабістыя

праблемы ранейшымі спосабамі. Прасцей “закрыцца” ў сваім абмежаваным свеце і ратаваць уласную душу ў дыялогу са Словам, не задавольваючыся сваім зямным жыццём, але маючы патаемны спадзеў на яшчэ не пражытае ім, хоць унутрана ўжо і перажытае, магчымае пасмяротнае жыццё... У Слінко гэта так:

І тое, што я маю, падзяліць Я не магу ні з кім, ніколі. Гэта Ёсць перспектыва.

Яшчэ ад першай кніжкі паэта цягнецца гэты меланхалічны шлейф “апошняга снегу”, “апошняга слова” ажно да сённяшніх “апошніх” дзён, у якіх таксама нібыта “ў пустых калідорах жыве прадчуванне фіналу”...

Я свой апошні верш не пакажу нікому. Я свой апошні верш не прачытаю сам.

Аднак падобны вобраз жыцця і пісання небяспечны для кожнага аўтара; як казаў Вяземскі адносна згаданай тэматыкі ў Жукоўскага, “Жукоўскі больш за іншых павінен сцерагчыся аднастайнасці: ён вельмі ж лёгка звыкае. Быў час, што ён натрапіў на думку пра смерць і кожны свой верш завяршаў жалобаю. Прадчуванне смерці ўражвае, калі вырываецца; але калі мы бачым, што чалавек кожны дзень чакае смерці, а ўсё-ткі жыве, то прадчуванні яго, у рэшце рэшт, робяцца смешнымі”... Гэтае цытаванне маё не параўнальнае, а ўсяго толькі паралельнае, і ўвогуле як бы наўзбоч тэкстаў і зямнога лёсу нашага паэта. А лёс гэты там, дзе ён не адпавядае аўтарскаму ўяўленню пра яго, паэт намагаецца “ўласнаручна” зблізіць са сваімі тэкстамі ажно да патаемнага спавядання, а часам і самую паэзію намагаецца паставіць на месца ўласнага лёсу, зрабіць яе такім чынам лёсавызначальнай альбо хоць адпаведнай свайму жыццёваму выраку...

Што дзяліла нас, да канца так і не раздзяліўшы? Што яднала ў адно, да канца ўсё ж не аб’яднаўшы?

Але ўжо ў гэтай цытаце адчуваецца, няхай яшчэ й незавершаны (няпэўны і няўпэўнены), філасофскі пошук новых шляхоў і поглядаў на гэты наш нялюбы свет. І яшчэ -- адчуваецца “рука настаўніка”. Некаторыя раннія тэксты Віктара Слінко, асабліва

ў спробах ліра-эпічнага жанру, да прыкладу, з першай кніжкі “Апошні снег” -- скажам, “Паэма непрачытанага раману”, -- ці не ёсць інерцыйным паваротам аўтара да разанаўскага фармальна-пошукавага “Шляху-360”? Вось што пісаў Разанаў у прадмове да першага зборніку вершаў нашага паэта: “У свае юныя гады ён шмат прачытаў, перажыў, перадумаў, яго вершы, як споведзь, гучаць надзвычай шчыра і мужна. Інакш яны не атрымаліся б, інакш мяжа між тым, хто застаецца тут, і тым, што застаецца там, не была б такой празрыстай, а далечыня, адкрытая стратай, такой знаёмай. /.../ Вядучы матыў паэзіі Віктара Слінко -- развітанне, ён у паэзію прыходзіць, як бы развітваючыся з ёю. Не бяруся прадказваць і прадвызначаць яго далейшы шлях. Як усякага сапраўднага “прызванніка”, яго вядзе “неспазнаная мэта”. І ў “Апошнім снезе”, і ў “Штольнях вясны” Віктар Слінко выкарыстоўвае не толькі паэтычныя і філасофскія метады і прыёмы вядомага майстра, але часам збіваецца і проста на голыя фактурныя заёмы, як у вершы “***Я -- залаты, прыгожы...” альбо як у гэтых вось радках з іншага верша:

Дзе разбурыцца хата, там сад забуяе нястрымна. Там шалее бур’ян; гэта горкія яблыкі -- мне, пераможцу.

Аднак у новай кніжцы Віктара Слінко ўжо адчуваецца стомленасць Разанавым і паступовы пошук новых класічных аўтарытэтаў, а заадно і змена ўласнага паэтычнага вектару, хоць пакуль яшчэ й не зусім асабова выразнага. Скажам, у вершы “***Лінейка нотная на шкле...” класічны стыль Барыса Пастарнака праяўляецца аж празмерна.

Я не чытала да канца Той партытуры, Якую ты іграў з ліста, З клавіятуры.

Ну, а чыё мастацкае жыццё спрабуюць працягваць гэтыя радкі Віктара Слінко, пэўна, абазнаным у паэзіі людзям казаць не трэба было б, але стыль Іосіфа Бродскага тут проста відавочны.

Жыву я мужам і сынам, бацькам і братам, але Казюрка аднойчы ноччу завязне ў густой смале Дрэваў, хоць лес -- я знаю! -- не хоча ў сваёй журбе Як горад, нямы і хворы, накласці ўраз на сябе Рукі. Ну што ж, тым болей у алгебры небыцця Месца тваёй

свабодзе адводзіцца на прасцяг Гэтых імгненняў. Проста, няўхільна сказаць: “Хачу...”, З заплюшчанымі вачыма ступаючы на шашу.

Празмернае захапленне “чужой прыгажосцю” нікому шчасця не прыносіла, “свая кашуля бліжэйшая да цела”, няхай яна нават і зацыраваная. Дый век вучнёўскі на сыходзе. Ці не адсюль і роспач гэтых радкоў:

Імкнешся ўсё жыццё да аднаго: Даведацца свой рост і вышыню, Ускінуць рукі да якой ты здольны. Але ёсць дні, перад якімі ўсе Календары бяссільна адступаюць.

Галоўнае -- не надламацца псіхалагічна, празмерна “перагінаючы палку” асабістай недасканаласці, не “гвалціць самога сябе”, не прыбядняцца пры багацці ўласнай душы, бо -- Паэт. Віктар Слінко, бадай, адзіны з вучняў Разанава, хто, як той Дэмасфен высокапрафесійнага мастацкага аратарства, дамогся ўласнай паэтычнай самасці і па праве з’яўляецца сёння адным з найбольш выбітных і перспектыўных нашых маладых паэтаў (паколькі айчынная аморфная крытыка не рупіцца заўважаць лакальных літаратурных удач і здабыткаў беларускіх аўтараў, то насуперак гэтай заганнай звычцы, адзначу ў гэтым радзе і паэтку Людку Сільнову, якая доўгі час таксама “ішла ў разанаўскім фарватэры”, асабліва вылучыўшы яе сёлетнюю адметную публікацыю ў “Нашай Ніве”)... Назоў зборніку “Штольні вясны” блізкі да асацыяцый з сучаснымі прыроднымі катаклізмамі, чалавечымі трагедыямі і агульначалавечым апакаліпсісам увогуле. А ўнутраны свет самога Віктара Слінко настолькі тонкі й датклівы, што пры першым жа выпадковым падзенні аўтара можа разбіцца на вострыя аскепкі прасталюднай будзёнасці... Крый Божа. Тым болей што ў нашага паэта ёсць заўважная схільнасць да адметнай мастацкай прозы, якая ў крытычныя моманты магла б дапамагчы яму ў пераадоленні прозы жыццёвай... Магчыма, на гэта і паказвае аўтар у сваёй “Прытчы”.

...Так ішлі яны раней і не ведалі, хто з іх шукаў смагі, а хто -- вады...

Я дужа спадзяюся, што, апусціўшыся ў глыбокую штольню

чалавечай свядомасці, паблукаўшы ў яе змрочных лабірынтах, надыхаўшыся атрутным цяжкім паветрам, паэту, у рэшце рэшт, трэба выйсці наверх (на-гара), каб адчуць нутром і ўбачыць над галавой высокае неба -- тое, па якім

Бог ідзе з посахам пчалінага рою Бог хоча развязаць нам языкі

paciu601

Як Эдвард Кінан выбіў Богу вокны Юры Пацюпа Часопіс “ARCHE” (2001/2) узрадаваў чытачоў новаю спробаю зьняпраўдзіць аўтэнтычнасьць “Слова пра паход Ігараў”. Падобна да таго, што слава Шэрлака Голмза (з прысмакам славы Герастрата) не дае спакою шмат якім навукоўцам. На гэты раз у якасьці новага скептыка выступіў амэрыканскі славіст, прафэсар Гарвардзкага ўнівэрсытэту Эдвард Кінан. Трэба сказаць, што сп. Кінан ня нудзіць чытача доўгімі подступамі да праблемы, а агаломшвае яго зь першае старонкі, абвясьціўшы тэкст “Слова пра паход Ігараў” падробкаю канца XVIII стагодзьдзя. І, пакуль чытач не пасьпеў апомніцца ды засумнявацца, прапаноўвае яшчэ пару-другую зьнішчальных аргумэнтаў з галіны псыхіятрыі. А тады ўжо -- пераходзіць да тонкасьцяў філялёгіі. Не праз крыўду, а дзеля справядлівасьці паспрабую і я ў сваім запярэчаньні пакарыстацца ягонымі мэтадамі. І пачну з таго, што назаву артыкул сп. Кінана разьлічаным ня больш як на сэнсацыю. А пасьля паспрабую гэта давесьці. Гучныя заявы пры слабой аргумэнтацыі больш разьлічаныя на масавую, чым на навуковую аўдыторыю. Сумняюся, ці захочуць знаўцы “Слова...” нават аспрэчваць той артыкул. Але, раз ён зьявіўся ў мастацкім часопісе, на яго варта адрэагаваць. Хаця б дзеля таго, каб нагадаць чытачу, што адваротная думка ўсё ж існуе і някепска пачуваецца. Зрэшты, яно і добра, скептычныя артыкулы мусяць час ад часу зьяўляцца. Іначай нас чакае застой і заняпад мысьленьня. У гісторыі філялёгіі праблема “Слова” ня першая і не апошняя. Здаўна існуюць праблемы Гамэра, Шэксьпіра, Шолахава і да т.п. Кожная зь іх адметная -- выкліканая адмысловымі абставінамі, абгрунтаваная аргумэнтамі рознае вагі, забясьпечаная рознаю ступеньню разьвязальнасьці. Каб разьвязаць усе існыя пытаньні “Слова”, трэба прысьвяціць гэтаму большую частку чалавечага жыцьця. На жаль, у беларускай навуцы на сёньняшні дзень мала адмыслоўцаў у гэтай галіне. Што да мяне, то я не прэтэндую на арыгінальнасьць, а спрабую толькі нагадаць і прывесьці ў сыстэму, дапоўніўшы ўласнымі заўвагамі, тыя факты і доказы, якія не дазваляюць лічыць “Слова пра паход Ігараў” падробкаю.

Ідэя фальшывасьці “Слова” вылучаецца не ўпершыню і не ўпершыню аспрэчваецца. Што новага тут дадае Э. Кінан? У канчатковым выніку, ён падае толькі дзьве рэчы: 1) прапаноўвае канкрэтную асобу фальсыфікатара -- Ёзафа Добраўскага і 2) прыточвае невялікі шэраг гістарычна-этымалягічных тлумачэньняў тэксту “Слова” дзеля падтрыманьня свае гіпотэзы. За гіпотэзу ён уважае першы момант, а другі -- за сур’ёзныя доказы. Насамрэч, заява пра Ё. Добраўскага ёсьць не гіпотэзаю, а хутчэй маніфэстацыяй ці нават правакацыяй, а яе філялягічныя пацьверджаньні, сваім парадкам, усяго толькі прыватнымі гіпотэзамі ў зьясьненьні складанага масіву тэксту. Бальшыня аргумэнтаў сп. Кінана сумнеўная, а месцамі нават кур’ёзная. Прынамсі, на маю думку, сур’ёзнае крытыкі варты толькі апошні, пяты, разьдзел артыкулу. Але пачнем па парадку.

1. Адкуль наагул зьявілася ідэя падробленасьці “Слова пра паход Ігараў”? Чаму менавіта гэты, а не які іншы помнік стаў аб’ектам крытыкі? Важкаю падставаю для скептыкаў паслужылі дзьве рэчы: страта арыгіналу тэксту і яго надзвычайныя мастацкія вартасьці, гучная слава. Зразумела, што малавартага тэксту ніхто падрабляць ня будзе, а калі і падробіць, дык той нікому не спатрэбіцца. Але ж ці мала ёсьць высокамастацкіх тэкстаў, у якіх страчаны арыгінал і якія не выклікаюць татальнае крытыкі? Галоўнаю, прыхаванаю прычынаю сумнеўнасьці “Слова”, на маю думку, ёсьць яго жанравая вылучнасьць у кантэксьце XII стагодзьдзя. Гераічны эпас, які захаваўся з тае пары, -- зьява рэдкая, вартая асаблівае ўвагі ды пашаны. А ліра-эпічная паэма, ды яшчэ, згодна з агульным меркаваньнем, геніяльная -- і наагул нешта неверагоднае. Прасьцей дапусьціць, што гэтае паэмы не існавала, што зьявілася яна тады, калі эпас і лірыку паэты штампавалі ў масавым маштабе. Але ці там мы шукаем падробку? Нічога асабліва сумнеўнага ні ў мове, ні ў зьмесьце “Слова пра паход Ігараў” няма. Гэта ўжо сто разоў даводзілася і можа быць даведзена ў сто першы раз. Давайце задумаемся вось над чым: найбольшы скепсыс у нас выклікае ня сам тэкст, а ягоная жанравая прыналежнасьць. Усё ж астатняе падганяецца пад гэты агульны сумнеў. А цяпер абстрагуемся ад “Слова” і паразважаем над жанравым мысьленьнем канца XVIII -- пачатку

XIX стагодзьдзя. Мяжа стагодзьдзяў -- гэта час заняпаду клясыцызму, зьяўленьня рамантызму. Час суіснаваньня абедзьвюх парадыгмаў. Найбольш пашыраным жанрам у клясыцызьме была трагедыя. А самым паважаным -- эпічная паэма. У рамантызьме на першы плян выступае лірыка. Але найбольшы аўтарытэт па-ранейшаму мае паэма, якая да таго ж напаўняецца лірычным зьместам. Галоўны канфлікт эпохі адбываецца ня ў жанрах, дзе захоўваецца значная доля паступовасьці, а ў ідэалёгіі. Універсальнасьці клясыцызму рамантызм супрацьстаўляе нацыянальную ідэю. Пачынаецца пераможнае шэсьце фальклёру. І вось на гэтым тле асаблівую вагу набываюць эпічныя творы з нацыянальнае даўніны. Менавіта ў іх бачыцца гонар і веліч народу. Менавіта іх апантана шукаюць і бессаромна падрабляюць. Нястача нацыянальнага эпасу выклікае агульную скруху ды нараканьне, а таксама пагарду шчасьлівейшых суседзяў. І калі зьявілася “Слова пра паход Ігараў”, ніхто не сумняваўся: вось, нарэшце, прыгожы эпас, які ратуе гонар усіх славянаў, ратуе і засьцерагае ад спаконвечнае крыўды і паняверкі ў галіне духу. Але рана ці позна мусілі загучаць галасы скептыкаў. Якраз для гэтага знайшлася дастатковая падстава: зьнікла першакрыніца. Пэўна, невыпадкова, што скептыкамі вельмі часта выступаюць замежныя славісты. Хаця, ведама, было б сьмешна думаць, быццам замежнікі тояць якую-колечы непрыязнасьць да “ўсходніх славянаў”, ці наадварот, апошніх асьляпляе іх патрыятычная заангажаванасьць. Прычына скептыцызму ў іншым. Кожны, хто адчувае рускае1 слова як роднае, хто ведае смак яго старадаўніх формаў, можа толькі атрымаць асалоду, чытаючы “Слова”. Усякія думкі пра падробку тут адпадаюць самі сабою. Помніцца, на першым курсе ўнівэрсытэту “Слова пра паход Ігараў” мяне настолькі захапіла, што я яго чытаў і перачытваў шматкроць. Прабягаў то да канца, то да сярэдзіны, вяртаўся да пачатку -- і зноў перачытваў. Да гэтае пары ўступную частку “Слова” я ведаю на памяць. І дасюль мне не трапляўся ніводзін тэкст, дзе паэтычнасьцю былі б прасякнутыя і граматыка, і лексыка, і вобразнасьць, і агульны зьмест. Харство мовы ў “Слове пра паход Ігараў” арганічна пераходзіць у харство апісаньняў і харство думак. “Задоншчына”, у якой скептыкі бачаць прататып “Слова”, побач з “Словам” выглядае толькі бяздарным і прымітыўным

насьледаваньнем. Ад яе застаецца ўражаньне спрошчанасьці й просталінейнасьці. Але як гэта ўсё давесьці дасьведчанаму славісту? Я разумею, суб'ектыўнае захапленьне ня можа быць аргумэнтам у навуковай спрэчцы. Таму запытаймася ў сябе: а можа, якраз замілаванасьць хараством "Слова" нас і падводзіць? Пэўна, так яно і ёсьць. І скептыкі нездарма капаюць? Толькі капаюць ня там. Ёсьць усе падставы думаць, што ніякі фальсыфікатар нас не падманваў. Мы самі, усе, хто захапіўся "Словам", падмануліся. Падвяло жанравае мысьленьне -- на пераломе ад клясыцызму да рамантызму. І ў той парадыгме мы да гэтае пары чытаем тэкст. Сам ён зусім не фальшывы -- наскрозь фальшывае ягонае прачытаньне. Ніякага гераічнага эпасу такога кшталту ніколі не існавала і не існуе. Сытуацыя парадаксальная, вартая пяра Х.Л. Борхеса. Дарэчы, Борхес наўпрост заўважаў, што чытачы ўспрымаюць тэкст такім, якім хочуць яго бачыць. А ў свой час усім славянам вельмі хацелася мець аўтэнтычны эпас. Трагедыя "Слова пра паход Ігараў" у тым, што яно стала "сьвятою кароваю" расейска-савецкага імпэрыялізму. Да вывучэньня і тлумачэньня гэтага выдатнага помніку была дапушчаная элітная каста расейскіх навукоўцаў. Скептыкаў ды беларуска-ўкраінскіх "нацыяналістаў", якія прагнулі адкусіць панскага пірага, гналі ў плечы. Іх усіх абвяшчалі фальсыфікатарамі ці дылетантамі. Хаця добрая плойма дробных дылетантаў пасьвілася вакол "Слова" ўвесь час, зьбіраючы крыхі ад чужога балю. Але і ў асяродзьдзі "выбраных" навукоўцаў калі-нікалі паўставалі крамольныя ідэі. У 1943 годзе прафэсар Ленінградзкага ўнівэрсытэту І.П. Яромін упершыню выступіў зь нетрадыцыйным разглядам жанравае прыроды "Слова"2. Гэта была пара, глухая да лягічных аргумэнтаў, што таксама, відаць, спрычынілася да неажыцьцяўленьня новага прачытаньня. Пры ўсёй пашане да асобы прафэсара яго ідэі так і засталіся на пэрыфэрыі савецкае навукі. Іх праігнаравалі і ўнівэрсытэцкія курсы, і школьныя праграмы. Зьмест працаў І.П. Яроміна сёньня ведаюць толькі адмыслоўцы-філёлягі. Я раіў бы ўсім перачытаць тыя працы -- як скептыкам, так і апалягетам. І варта было б тут нагадаць іх асноўныя моманты. Ад пачатку публікацыі "Слова" ўсе гаварылі пра яго як пра "песьню", "паэму", "ліра-эпічную паэму", "гераічны эпас". Але да гэтае пары ніхто ня ведаў і ня ведае, якая сыстэма вершаваньня

ўжытая ў той паэме. І як належыць яе чытаць? За два стагодзьдзі ня толькі не знайшлося адказу на гэтыя пытаньні, але й страціласа ўсялякая надзея на адшуканьне станоўчага выніку. Напачатку, ад 1822 году, М. Грамацін, М. Палявой, М. Максімовіч бачылі ў “Слове” народны верш. Пазьней, з 70-х гадоў XIX стагодзьдзя, В. Антановіч, М. Драгаманаў, П. Жыцецкі і Ю. Ціхоўскі рытміку “Слова” прымяркоўвалі да ўкраінскіх народных думаў. У XX стагодзьдзі выдатны нямецкі славіст, беларусіст Р. Абіхт спрабаваў вычытаць у “Слове” алітэрацыйны верш скандынаўскіх скальдаў, а В. Бірчак выводзіў ягоны тэкст зь бізантыйскіх сьпеваў-канонаў. Але й гэтыя намаганьні нічога не далі. Ні Ф. Корш, ні Е. Сіверс, ні М. Штокмар, ні У. Стэлецкі так і ня здолелі давесьці вершаваную прыроду “Слова пра паход Ігараў”. У наш час спрабуюць гаварыць пра вэрлібр3, але гэта ўжо канчатковы заняпад самой ідэі паэмы. Бо свабодны верш як эстэтычны фэномэн можа існаваць толькі на тле канвэнцыйнае паэтычнае сыстэмы, а не на пачатковым этапе нацыянальнае літаратуры. Яшчэ з 60-х гадоў XIX стагодзьдзя ў якасьці альтэрнатывы пачынае разьвівацца жанравае вызначэньне “Слова” як “вайсковае аповесьці”. У гэтым рэчышчы разважалі М. Ціханраваў, В. Мілер, Е. Барсаў і У. Перац. Аднак непадобнасьць “Слова” ні да летапісаў, ні да “Гісторыі юдэйскае вайны” Флявія, брак у ім разьвітае сюжэтнасьці адпрэчылі і гэтае меркаваньне. І, як тое ні сумна, але запанавала тупіковая ідэя “залатой сярэдзіны”. Першым такую эклектычную пазыцыю ў дачыненьні да “Слова”, як сьведчыць І.П. Яромін, заняў Е. Барсаў. З гэтае пары ў жанравых азначэньнях пачынае панаваць дылетанцкая прыблізнасьць: тэрміны “вайсковая аповесьць” і “гераічная паэма” ўжываюцца як сынонімы. І.П. Яромін піша: “Такая фармулёўка пярэчыць усяму, што нам ведама ў сусьветным гістарычна-літаратурным працэсе: нідзе, ні ў адной літаратуры гераічны эпас і гістарычная аповесьць не спалучаліся... пэўнаю адзнакаю гераічнага эпасу, эўрапейскага прынамсі, заўсёды была вершаваная форма”4. Адказ, які прапанаваў праф. Яромін ў вызначэньні жанру “Слова пра паход Ігараў”, геніяльна просты. Ён лічыць “Слова” творам рытарычнага мастацтва. “Слова” -- ня што іншае, як выдатны ўзор сьвецкае эпідэйктычнае (хвальнае) прамовы. Усе жанравыя тэрміны, якія сустракаюцца ў тэксьце славутае прамовы, дасьледнік удала прымяркоўвае да

адпаведных грэцкіх тэрмінаў: слово -- гэта элінскае лпгпж “прамова”; песьнь -- рсппймйпн “рытарычны ўступ”, повесть -- дйзгзуйж “асноўная частка прамовы”, якая часьцей за ўсё мела апавядальны характар, а завяршае тэкст слава -- ерйлпгпж “заключэньне”. Усе лірычныя адступы, што неверагодныя ў іншых жанрах, усе парушэньні храналёгіі -- цалкам апраўданыя і натуральныя ў рытарычнай прамове. Паралелі “Слова” з тэкстамі славутага паганскага рытара IV ст. н.э. Лібанія, якія прыточвае І.П. Яромін, уражваюць. “Слова”: Не лепо ли ны бяшетъ братие, начяти старыми словесы трудныхъ повестий о пълку Игореве, Игоря Святъславлича? Начати же ся тъй песни по былинамь сего времени, а не по замышлению Бояню. Лібані: Ці ня ў час будзе, гаспадар, пачаць нам мову на чэсьць твайго слаўнага прыйсьця -- словамі лесбосца Алкея: “Ты зьявіўся ад крэсу зямлі”. “Слова”: О Бояне, соловию стараго времени! Абы ты сиа плъкы ущекоталъ... /.../ Пети было песнь Игореви того внуку: “Не буря соколы занесе чрезъ поля широкая -- галицы стады бежать къ Дону великому”. Лібані: О, боскі Гамэр! Дайшоўшы да гэтага месца ў казані, ты мовіў бы так: “Скажэце цяпер мне, музы, жыхаркі алімпійскіх харомаў...” Кампазыцыйныя адметнасьці “Слова”, натуральныя для рытарычнае прамовы і досыць дзіўныя для гераічнае паэмы, вайсковае аповесьці, ужо задоўга да І.П. Яроміна зьвярталі на сябе ўвагу пільных чытачоў і дасьледнікаў. Д.І. Празароўскі ў 1882 годзе нават спрабаваў “узнавіць” храналягічную пасьлядоўнасьць тэксту, бачачы ў ім хібнасьць пісцоў. Але гэта быў марны занятак. Украінскі паэт І. Франко глядзеў на кампазыцыю славутага помніку крыху зь іншага боку: на яго думку, “Слова” -- лапікавы твор, які ня мае мастацкае цэльнасьці і складаецца з кавалкаў рознае вартасьці. Ідэі І. Франка ахвотна падхапіў яго беларускі калега М. Багдановіч. Усё гэта таксама можна лічыць подступамі да адкрыцьця рытарычнае прыроды “Слова пра паход Ігараў”, бо рытарычны тэкст, калі мераць яго меркаю мастацкае літаратуры, і праўда, выглядае нейкім неаднародным. Зрэшты, яшчэ ў XVIII стагодзьдзі расейскі гісторык І.П. Ялагін пісаў: “Слово сие преизполнено все-можныя риторския красоты”5. Ужо тады забракла нейкага маленькага нюансу, каб стаць на слушную пазыцыю. У наш час ідэю рытарычнае жанравасьці “Слова пра паход Ігараў” падтрымаў былы дырэктар Віленскае беларускае

гімназіі М. Анцукевіч. Не зважаючы на тое, што свае працы М. Анцукевіч напісаў па-расейску, ён больш, чым хто іншы, прыцягнуў беларускага матэрыялу для вывучэньня помніка. Здавалася б, якая розьніца, на якім матэрыяле дасьледаваць тэкст. Галоўнае, каб гэта было на карысьць навукі. Аж не! Расейская курыя доўга не давала ходу ягоным дасьледаваньням. Вось жа сярод іншага Анцукевіч прапанаваў зьвярнуць больш пільную ўвагу на кампазыцыю “Слова” і ўважліва дасьледаваць яго рытмічныя кляўзулы6. Можна запытацца, як жа так сталася, што гэтулькі людзей не патрапілі адрозьніць рытарычнага тэксту ад паэтычнага? Але ў гэтым няма нічога дзіўнага. “Традыцыйная прамоўніцкая проза, успрыманая як галіна рыторыкі par excellence, -- піша Ю.М. Лотман, -- можа быць апісаная як вынік уварваньня паэзіі ў абсягі прозы і перакладу паэтычнае структуры на мову празаічных сродкаў. А адначасна і ўварваньне мовы прозы ў паэзію стварае рытарычны эфэкт”7. Думка Ю.М. Лотмана выдатна ілюструецца як гісторыяй рыторыкі, так і гісторыяй паэзіі. Айцом рыторыкі Арыстотэль лічыў Эмпэдокля. Гэты філёзаф з Акраганту (бадай што, найбольшы эстэт антычнасьці) ніколі не пісаў ні прамоваў, ні падручнікаў па рыторыцы. Затое стварaў філязофскія працы ў вершах і выхаваў першага рытара -- Горгія. На Эмпэдокля, сваім парадкам, нямала паўплывала творчасьць найслявуцейшага лірыка Эляды Піндара8. У Сярэднявечнай Эўропе, наадварот, верш як зьява паэзіі нараджаўся “ў нетрах красамоўніцкае прозы”. “У такой прозе, -- піша В.І. Халшэўнікаў, -- спарадычна зьяўляліся ў якасьці фігур вымоўнасьці шэрагі сказаў, сынтаксычна паралельных, якія можна лічыць зародкамі вершаў”9. Праўда, былі адрозьненьні ў тэмпах працяканьня гэтага працэсу на розных абшарах. Калі ў польскай літаратуры ён адбываўся больш-менш арганічна, дык у беларускай і асабліва расейскай быў моцна прысьпешаны ўварваньнем польскае сылябікі. У дачыненьні да “Слова пра паход Ігараў” азначаны працэс быў заўважаны яшчэ М. Багдановічам, які пісаў: “Пад наплывам чуцьця зьнікае звычайнае сцапленьне слоў, усюды прабіваецца хоць і зьмяняючыйся, але напружаны рытм, выклад робіцца сьціснутым, мова моцнай, і ўжо пачынаюць фарміравацца пекныя вобразы”10. Пры такім жанравым падыходзе да тэксту, які тарнавалі Яромін ды Анцукевіч, “Слова пра паход Ігараў”

перастае дзіўна вылучацца ў рускім пісьменстве XII стагодзьдзя. Так, яно ўзвышаецца сваімі вартасьцямі. Яно вылучаецца сьвецкім зьместам і паганскаю сымболікай. Але -- не настолькі, каб выглядаць неверагодным. Паганскія ўяўленьні перахаваліся ў беларускім сялянстве да нашых дзён. Пэўныя ўсплёскі паганства назіраліся і ў Эўропе XII стагодзьдзя. Досыць толькі прыгадаць полацкага князя Ўсяслава Чарадзея, якому ў “Слове” адводзіцца нямала месца. Дык чаму ж паганскія элемэнты не маглі назірацца ў княскім асяродзьдзі ўсяго праз 200 гадоў пасьля прыняцьця хрысьціянства? Паганскія боствы, як было ня раз заўважана, выступаюць тут толькі ў якасьці мастацкіх вобразаў. А таксама, што вельмі натуральна, як продкі князёў: “Даждьбози внуци”, “Велесовъ внуче” і г.д. Антычная арыстакратыя некалі таксама ўважала багоў за сваіх продкаў. Прыкладам, лічылася, што род філёзафа Плятона мае Пасэйдонавы карані. Пра вышыню рытарычнае культуры тае пары сьведчаць хаця б такія імёны казаньнікаў, як кіеўскі мітрапаліт Іларыён, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч. Варта зьвярнуць увагу на тое, што зьмест іх нецаркоўных, сьвецкіх прамоваў, якія да нас не дайшлі, быў значна вальнейшы, чым гэта можа падацца на першы пагляд. Кліменту Смаляцічу даводзілася нават апраўдвацца перад залішне стараннымі гарліўцамі веры: “Аз писах от Омира и от Аристоля и от Платона, иж во елиньскых ныpSх славнS бSша, аще и писах но не к тебS но ко князю, и к тому ж не скоро” (“Я пісаў паводле Гамэра, і паводле Арыстотэля, і паводле Плятона, што ў элінскіх абсягах славіліся, але ж калі й пісаў, то не да цябе, а да князя, дый да таго ня часта”)11. Ёсьць меркаваньне, што Смаляціч атрымаў унівэрсытэцкую адукацыю12. У гэты час Русь мела “акно” ў Бізантыю, празь якое добра былі бачныя элінскія далягляды. Рускай культуры тае пары, можа, бракавала нацыянальных адметнасьцяў, яна моцна залежала ад бізантыйскіх уплываў, але найлепшыя творы рускіх кніжнікаў не саступалі сваёй вартасьцю бізантыйскім узорам. У памангольскай Расеі ізаляцыянізм фактычна стаў дзяржаўнай ідэалёгіяй. “Акно” ў Бізантыю і тое, фігуральна кажучы, было забітае негабляванымі дошкамі. Тым часам Беларусь і Ўкраіна пераарыентаваліся на заходнеэўрапейскую традыцыю. Расейскія ж цары, каб унікнуць эўрапейскіх уплываў, забаранілі ўсякія кантакты сваіх падданых з замежнікамі, у тым ліку зь

беларусамі. Нават праваслаўны хрост, учынены ў Літве, лічыўся ня “ісьцінным”. А звычайныя кнігі па арытмэтыцы, астраноміі, геаграфіі, музыцы часам забараняліся13. Г.Г. Шпэт у сваёй “скандальнай” гісторыі расейскае філязофіі зьедліва цытуе аднаго з тагачасных маскоўскіх інтэлектуалаў: “Аз -- сельский человек, учился буквам, а еллинских борзостей не текох, а риторских астроном не читах, ни с мудрыми философы в беседе не бывал, -- учуся книгам благодатного закона, аще бы мощно моя грешная душа очистити от греха”14. І гэта -- пастыр, заўважае Г. Шпэт. А што ўжо казаць пра паству. “Ня толькі сьвятары, самыя япіскапы ня ведалі нічога, нават Сьвятога Пісьма”, -- вымушаны прызнацца гісторык царквы, мітрапаліт Макары15. Дзіўна было б сумнявацца ў стваральных здольнасьцях Русі XII стагодзьдзя і верыць у творчыя сілы Расеі XIVXVII стагодзьдзяў. Дзіўна ня верыць у аўтэнтычнасьць “Слова пра паход Ігараў”, але быць упэўненым у першароднасьці тэксту “Задоншчыны”. Аўтар гэтага помніка, як мне падаецца, шмат чаго не зразумеў у чужой і заскладанай для яго мове “Слова”. І гэта варта было б дасьледаваць асобна. Ён нават блытаў жанры прамовы і летапісу. Калі “Слова” не падрабілі ў XVIII стагодзьдзі, дык гэтага тым больш не маглі зрабіць раней, бо для таго не было ні патрэбы, ні інтэлектуальнага рэсурсу, ні багацьця мовы. Зрэшты, мова ў XVIII стагодзьдзі яшчэ больш зьбяднілася. З гэтае нагоды хацелася б прыгадаць словы А.К. Талстоя, якія пазьней з горыччу цытаваў І. Бунін у “Праклятых днёх”: “І калі я думаю пра красу нашае гісторыі да праклятых манголаў і да праклятае Масквы, яшчэ ганебнейшае за саміх манголаў, мне хочацца кінуцца вобзем і качацца ў роспачы ад таго, што мы ўчынілі з талентамі, дадзенымі нам Богам!”16. А выбар асноўнага тэксту тут -- гэта яшчэ і выбар часу. Бо даўно ведама: або “Слова” першае, або “Задоншчына” -- tertium non datur. Яшчэ больш недарэчнасьцяў ува ўспрыняцьці “Слова пра паход Ігараў” выклікала яго ідэалягічнае тлумачэньне. Мы ўсе паверылі ў байку расейскіх паўпрэдаў ад культуры кшталту акадэміка Дз.С. Ліхачова, што “Слова” -- гэта рупар руска-патрыятычных ідэяў, што заклікае яно славянскія народы да яднаньня і зьместам сваім вельмі спрыяе расейскаму імпэрыялізму. Адныя пра гэта сьведчаць з радасьцю, другія -- са скрухаю. Але, у існасьці, усе думаюць аднолькава. Што тут можна запярэчыць?

Такое ідэалягічнае аднадумства толькі даводзіць праўдзівасьць словаў Ф. Энгельса (словаў, якія з ахвотаю цытаваў Р. Барт), што думкі пануючых клясаў рана ці позна становяцца думкамі ўсяго народу. Гэтаксама, пэўна, ідэі імпэрскіх нацыяў становяцца спакваля ідэямі іхных васалаў, ды толькі ў перакручаным выглядзе. У пэўным сэнсе, ахвяраю расейскае ідэалёгіі стаў і сп. Э. Кінан. Ён паверыў у застарэлыя догмы дасьледчыкаў “Слова” і скіраваў сваю крытыку не на іхныя хімэры, а на рэч куды больш матэрыяльную -- тэкст помніку. Ідэалёгія -- гэта нешта надакучлівае, няўхільна-начэпнае, накшталт галаўнога болю. І ўсё ж, каб зь ёю змагацца, ня варта сьцінаць галавы. Не забываймася, ідэалёгія ня ёсьць фактам тэксту. Ідэалёгія -- факт нашага мысьленьня. Яна можа матэрыялізавацца ў тэксьце, але гэта зусім ня значыць, што тэкст, трапіўшы ў іншыя гістарычныя абставіны, іншыя ідэалягічныя абсягі, будзе ўспрымацца адэкватна. Я зусім не сумняюся, што аўтар “Слова пра паход Ігараў” быў носьбітам тых ці іншых ідэяў. І ідэі тыя паўплывалі на ход стварэньня тэксту. Але гэта зусім ня значыць, што ён разважаў нашымі катэгорыямі. Мы можам як заўгодна тлумачыць тэкст дзеля нашых сучасных інтарэсаў. Мы можам прапаноўваць якія заўгодна вэрсіі яго гістарычнага тлумачэньня. Але ні адно, ні другое ня ёсьць фактам самога тэксту. Зьмест заўсёды менш устойлівы за форму. А ідэалёгія -- найэфэмэрнейшы крытэр зьместу. Абапірацца на яго -- значыць будаваць дом на пяску. Калі верыць догмам расейскіх інтэрпрэтатараў, то “Слова пра паход Ігараў” і праўда выглядае як твор у абарону імпэрска-патрыятычных плянаў Кацярыны II. Але ў XII стагодзьдзі людзі мысьлілі іншымі катэгорыямі. Тады не было патрыятызму, выхаванага на ідэалах абсалютызму ды ідэях прускіх філёзафаў. Што рухала аўтарам “Слова”? Навуковы, гістарычна-імаверны адказ на гэтае пытаньне прапаноўвае Ю.М. Лотман17. Ягонае тлумачэньне этычнага падмурку “Слова” зьявілася параўнальна нядаўна. Згубленае сярод агульна-тэарэтычных парадоксаў тартускага прафэсара, яно наўрад ці прыцягнула ўвагу гісторыкаў літаратуры. Больш за тое, гэтае тлумачэньне, відаць, наагул ніколі ня стане пашыраным -- бо не дазваляе выкарыстоўваць “Слова” як падручны матэрыял для выхаваньня расейскіх патрыётаў. Ключом да зьместу “Слова пра паход Ігараў” ёсьць словы, дзе гаворыцца пра дружыну Ігара: “Сами

скачють, акы cSрыи влъци въ полS, ищучи себе чти, а князю славе". Тэрміны слава і чэсьць -- гэта дакладны адпаведнік лацінскіх gloria і honor, у іх закадаваная максымалісцкая рыцарская этыка Сярэднявечча. Рыцарскі этычны кодэкс вельмі нагадваў сабою кодэкс рамантычнага героя літаратуры Новага часу. Але падабенства гэтае толькі вонкавае. Мэтаю рамантычнага героя ёсьць парушэньне абрыдлых нормаў філістэрскага, буржуазнага грамадзтва, імкненьне па-за абсягі мажлівага. Сярэднявечны чалавек таксама імкнецца да немажлівага, але яго паводзіны ня ёсьць парушэньнем нормы. Наадварот, немажлівае -- гэта якраз норма тагачасных паводзінаў. Норма палягае ў самім імкненьні, а яе поўнае спраўджаньне -- у недасяжнасьці, па-за пабытоваю будзённасьцю. Ігар, які ідзе ў паход з малою дружынаю, максымальна адпавядае рыцарскаму ідэалу. Ён імкнецца зьдзейсьніць немажлівае. Але адначасна князь парушае рыцарскую этыку, бо распачынае свой паход насуперак волі вялікага князя. Як васал ён парушае законы рыцарскае гіерархіі. Адсюль -- дваістае стаўленьне аўтара да асобы галоўнага героя. Тэрміны чэсьць і слава разьмяжоўваюць правы васала і сэньёра. Васал у вайне атрымлівае толькі чэсьць, пад якой перш-наперш мяркуецца матэрыяльная частка здабычы. Чэсьць, як зазначае Ю.М. Лотман, заўсёды даюць, бяруць, надаюць, зьяўляюць і г.д. Гэта матэрыяльны знак, які зыходзіць толькі зьверху ўніз. Калі васал уступае пад вяршэнства сэньёра, ён аддае яму сябе і сваю маёмасьць адно дзеля таго, каб атрымаць усё назад у якасьці вышэйшае ўзнагароды -- чэсьці, зьяўленай сэньёрам. Слава -- знак слоўны, не матэрыяльны. Яна належыць вылучна сэньёру. А калі васалу, дык адно таму, які гераічна загінуў у змаганьні. Слава гучыць, яе вяшчуюць, чуюць, яна даходзіць да нашчадкаў і чужых краёў. Слава заўсёды ўзвышаецца над чэсьцю. І калі чэсьць вымяраецца прасторавaю меркаю, велічынёю, то слава -- меркаю часаваю, даўгавечнасьцю. Толькі ўплыў хрысьціянскае этыкі ператварыў словы чэсьць і слава ў таўталягічнае спалучэньне. Хрысьціянства выпрацавала іншае супрацьстаяньне, заснаванае на розьніцы славы зямное і славы нябеснае. Такім парадкам, гаворка ў "Слове пра паход Ігараў" ідзе не пра патрыятызм у сучасным разуменьні гэтага слова, а пра вернасьць рыцарскаму этычнаму кодэксу. Нельга гаварыць пра нацыянальны

патрыятызм там, дзе няма нацыянальнае дзяржавы. Сярэднявечная дзяржава магла супадаць, а магла і не супадаць з этнічнымі межамі, але ў цэлым яна разбурала традыцыйныя рода-племявыя зьвязкі. А наўзамен нічога, апрача фэўдальнай гіерархіі й хрысьціянскага касмапалітызму, не прапаноўвалася. Сучаснай сьвядомасьці цяжка спасьцігнуць гэтую рэальнасьць. Адсюль і многія парадоксы гістарычнае навукі. Прыкладам, падыходзячы зь меркаю сучаснага патрыятызму да Вялікага Княства Літоўскага, мы да гэтае пары марна спрабуем разабрацца, каму яно больш належала -- беларусам ці літоўцам. Або, ізноў жа, ня можам дацеміць, што станавіла сабою Русь да XIII стагодзьдзя. “Слова пра паход Ігараў” таксама ператварылася для нас у аб’ект разумаваньня, што насамрэч ёсьць фатальным неразуменьнем.

2. Ніякае падазрэньне не ўзьнікае на пустым месцы. А ўсякая сьледчая вэрсія павінна мець хоць мізэрную матывацыю. Усё вышэй сказанае амаль не датыкае артыкулу Э. Кінана наўпрост. Але агульнае пазытыўнае ўяўленьне аб “Слове пра паход Ігараў” у нашай палеміцы важнейшае за ўсе довады “супраць”. Бо яно зражвае падазрэньні. Цяпер, выклаўшы пазытыў, мы можам са спакойным сэрцам перайсьці да канкрэтнае палемікі. Хоць спрачацца практычна няма з чым. На пачатку дзеля справядлівасьці трэба сказаць, што выбар фігуры Ё. Добраўскага ў якасьці прэтэндэнта на фальсыфікатарства больш чым удалы. Цяжка знайсьці прыдатнейшую кандыдатуру на гэтую ролю. Прынамсі, яго асоба тут значна больш імаверная за тагачасных расейскіх філёлягаў, якія наўрад ці валодалі і дзясятаю доляю аказанага ў тэксьце матэрыялу. Ё. Добраўскі, як ведама, адзін з тых найбуйнейшых філёлягаў, якія мелі беспасярэдні доступ да збораў А.І. Мусіна-Пушкіна і якія маглі адныя зь першых прачытаць “Слова” ў арыгінале. Больш за тое, чэскі славіст зрабіў для сябе копію гэтага помніку лацінскімі літарамі. Вытрымка зь ягонае копіі захавалася ў лісьце да польскага філёляга С. Бандтке: “Odievaļa jego teplymi mglami ot velikago Donu do malago Donca Igor kniaz poskoиi gornostajem pretrgosta bo svoia brzaja komonia”18. Запіс Ё. Добраўскага, як і вытрымка І.П. Ялагіна, запісы М.М. Карамзіна, А.Ф. Маліноўскага, -- гэта тыя рэдкія цытаваньні арыгіналу помніку да яго публікацыі, якія захаваліся. Ё. Добраўскі чынна

цікавіўся “Словам пра паход Ігараў”. Ён нават скардзіўся славенскаму славісту В. Копітару на павярхоўнае разуменьне тэксту расейцамі: “Ігарава песьня, якую я атрымаў з Расеі, захапіла б Вас. Дзе-якія мясьціны расейцы зусім не зразумелі”19. З гэтага выказу вынікае важная для нас інфармацыя: Ё. Добраўскі, як і ўсе ягоныя сучасьнікі, не зразумеў жанравае прыроды “Слова”. Дзіўна было б думаць, што сам фальсыфікатар у хаўрусе з пасьлядоўнікамі-памагатымі (калі верыць Э. Кінану) так стварaў гераічную паэму, што, урэшце, забыўся надаць ёй хоць нейкае падабенства вершавае формы. У артыкуле Э. Кінан ня ўсё паведамляе пра Ё. Добраўскага. Ён ведае больш і спасылаецца на сваю будучую кнігу. Але з усяго вынікае, што ён ня ведае галоўнага, патрэбнага для яго вэрсіі. І таму сьціпла, як бы між іншым, вымушаны прызнацца: “Сытуацыя ўскладняецца адсутнасьцю скразных дакумэнтальных доказаў...” Ужо аднаго гэтага досыць, каб усе дасьціпныя пабудовы Э. Кінана назваць блефам. Шчыра кажучы, нават шкада, калі б “Слова” было падробкаю, а аўтар яе -- ня Ё. Добраўскі. Але падобна на тое, калі даць веры гісторыкам У.П. Казлову і У.А. Кучкіну, што Ё. Добраўскі ня толькі не падрабляў, але і ня мог падрабіць тэксту помніку. Першы з навукоўцаў прыходзіць да высновы, што І.П. Ялагін працытаваў “Слова” ўжо ў пэрыяд з сакавіка 1788 да траўня 1790 году20. Другі ў якасьці пэрыяду цытаваньня называе гады 1790 -- 26 ліпеня 179121. У выніку мы атрымліваем амаль дакладны час: першая палова 1790 году. Тым часам Ё. Добраўскі прыехаў у Расею і пачаў працаваць адно зь 17 жніўня 1792 году22. Многае ў сваім артыкуле Э. Кінан толькі галаслоўна маніфэстуе. Сярод усяго ён цьвердзіць пра супярэчнасьці ў сьведчаньнях сучасьнікаў, пра багемізмы, палянізмы і калямбуры ў тэксьце “Слова”. Але амаль нічога з усяго гэтага не паказвае. Таму пакінем падобныя заявы ў якасьці “цьмяных мясьцінаў” у тэксьце самога крытыка і пяройдзем да больш ясных выракаў. Найбольш забаўляюць мяне цьверджаньні Э. Кінана пра тое, што Ё. Добраўскі і К. Калайдовіч былі вар’ятамі. Ня ведаю, што з таго вынікае, але падазраю, што ўвага да натуралістычных фактаў ёсьць нацыянальнаю асаблівасьцю амэрыканскага мысьленьня. Мне ж падаецца, што ўсялякія фізіялягічныя, псыхалягічныя, псыхааналітычныя і да таго падобныя штучкі зусім не датычаць

існасьці рэчы. “Заглыбленьне ў ахутаныя цемрай сутарэньні індывідуальнай псыхалёгіі”, канечне, патрэбнае ў гістарычных раманах, у жоўтай прэсе, але зусім лішняе ў гэтай тэме. Калі б нават уся тагачасная расейская Акадэмія навук, у супольнасьці з заежджымі славістамі, лячылася ў “жоўтым доме”, з гэтага зусім не вынікала б, што тэкст “Слова пра паход Ігараў” падроблены. І, наагул, трэба яшчэ давесьці, быццам вар’яты больш схільныя да падробак і фальсыфікацыяў, чым нармальныя людзі. Мне здаецца, яны проста наіўней хлусяць. А таксама -- шчырэй вераць ува ўласную хлусьню. Не зусім карэктная заява і пра тое, што “да 1792 ці 1793 году не было аніводнага вартага даверу апісаньня тэксту “Слова”. Тут я спашлюся на М. Гудзія, які гэты факт падае больш карэктна: “Палеаграфічнага апісаньня выдаваных старых тэкстаў мы не знаходзім ні ў адным апісаньні помнікаў, зробленым у XVIII ст.”23. Да падобнага ж роду довадаў Э. Кінана адносіцца таксама сьцьверджаньне, быццам бы да 1815 ці 1818 году ніхто не гаварыў пра страту рукапісу. Калі б нават Э. Кінан жыў у першай палове XIX стагодзьдзя, ён і тады ня меў бы права заяўляць пра гэта з такой пэўнасьцю. Прынамсі, трэба хаця б давесьці, што А.І. Мусін-Пушкін і людзі зь яго найбліжэйшага атачэньня лічылі рукапіс нястрачаным пасьля 1812 году. Найбольшай хібай у довадах Э. Кінана ёсьць заява пра Дунай. Яна наагул падрывае ўсякі давер да выракаў амэрыканскага славіста. Можа, і ўвесь астатні ягоны скепсыс тае самае прыроды вынікае зь недасьведчанасьці? “Чаму ў гэтым нібыта эпасе XII стагодзьдзя пра паход чарнігаўскага князя ў раён Дону так многа гаворыцца пра Дунай?” -- пытаецца Э. Кінан. І прапануе адказ, быццам Дунай ёсьць алюзіяй на паўднёвыя войны, якія вяла Расея ў канцы XVIII стагодзьдзя. Ён нават дапускае думку, што ў паасобных месцах “Слова” выдаўцы замянілі Дунай на Дон. Няўжо Э. Кінан ня ведае тае простае рэчы, што слова Дунай -- гэта агульнае месца з славянскага фальклёру? Няўжо ўвесь славянскі фальклёр таксама ёсьць алюзіяй на палітычную заклапочанасьць Расеі ў той ці іншы пэрыяд яе гісторыі? Найменьне Дунай на славянскіх абшарах сустракаецца не аднойчы. Але ня гэта галоўнае. Да ведама сп. Кінана (і ўсё ж дзіўна, што ён таго ня ведае!), у фальклёры слова Дунай ёсьць абазначэньнем усякае вады наагул: і рэчкі, і возера, і мора. Часьцей жа за ўсё Дунай -- гэта вялікая вада,

вялікая рэчка, нешта большае, чым простая рэчка. Да апошняе высновы прыходзіць В. Ластоўскі ў адмысловым этна-лінгвістычным дасьледаваньні гэтага найменьня, апублікаваным некалі ў часопісе “Крывіч”. Пра тое ж, што Дунай -- проста песенны штамп, ведае, бадай што, кожны першакурсьнік беларускае філялёгіі. Далей Э. Кінан пераходзіць да моўнае крытыкі “Слова”, зьвяртаючыся да фрагмэнту: У ПлScньска на болони бSша дебрь Кисаню, и не сошлю къ синему морю. Ён лічыць, быццам словы дебрь Кисаню ёсьць біблійным вобразам. Дзякуй сп. Кінану, што ён робіць свой сьціплы ўнёсак у зьясьненне тэксту “Слова”. Але, збольшага, усё гэта даўно ведама безь яго. Пра тое, што “дебрь Кисаню” -- біблійная “даліна сьлёз”, гаварыў яшчэ П. Вяземскі. У тым самым ключы робіць свой празаічны пераклад і У.І. Стэлецкі: Всю ночь с вечера вещие вороны каркали у Плесьнеска на лугу, были они из Ущелья слёз Кисанского и понеслись к синему морю24. Каб давесьці, што гэтае ўласнае імя не магло быць у “Слове”, трэба давесьці, што яго не было ў грэцкіх і славянскіх перакладах Біблііі. А заявы, быццам біблеізмы “абсалютна недарэчныя для Чарнігава XII стагодзьдзя”, -- проста сьмешныя. Здаецца, сп. Кінан блытае Русь XII стагодзьдзя з памангольскаю Расеяй ці з Амэрыкай XII стагодзьдзя. Моц аргумэнтацыі Э. Кінана палягае яшчэ й на тым, што ён зьвязвае ў адно лягічнае цэлае Дунай, галіцкі Плесьнеск і Кісанскую даліну. Але наколькі надуманая здагадка пра Дунай -- настолькі ж надуманая і ўся памянёная зьвязка. Дарэчы, адмыслова для чытача хацелася б нагадаць, што гэтае цьмянае месца мае й іншыя прачытаньні. М. Шарлемань, прыкладам, пераносіць Плесьнеск з галіцкіх земляў пад Кіеў і піша “дебрь Кіянь”25. М. Анцукевіч “дебрь Кисаню” перакладае як “зарасьнікі плюшчу”. Ён даводзіць: “Кисан ці Кисань -- гэта плюшч. Паводле аналёгіі зь Виссон (звнуфпж) мы б чакалі Киссон, аднак даўнейшыя крыніцы перадаюць яго словамі Кисса і Кись”26. Дзеля прыкладу варта было б прытачыць некалькі больш-менш удалых кан’ектураў, якія гавораць пра гіпатэтычнасьць усіх прачытаньняў. У.І. Стэлецкі: БSша дебри Кисани и несошася къ синему морю27. Л.А. Дзьмітрыеў: БSша дебрь Кияня и несоша мя къ синему морю28. М.П. Анцукевіч: БSша дебрь(е) кисаню и несоша ю къ синему морю29. Больш дасьціпным і арыгінальным у артыкуле Э. Кінана ёсьць

тлумачэньне наступнага фрагмэнту: СтрSляеши съ отня злата стола Салтани за землями. Э. Кінан лічыць, што тут гаворка ідзе не пра султанаў, а пра форму вежы altana, найменьне якой паходзіць ад італійскага alt “высокі” і зьявілася толькі ў эпоху Рэнэсансу. Каб такіх “альтанаў” сп. Кінан пазнаходзіў больш -- можна было б прыслухацца да ягоных заўваг. Іначай жа -- усё гэта ўспрымаецца толькі як больш-менш удалы калямбур. Дарэчы, замена “салтана” на “альтану” робіць фрагмэнт у цэлым крыху недарэчным. Як можна “за землямі” страляць зь вежы? Па-мойму, спалучэньне за землямі блізкае да беларускага за сьветам, блізкі сьвет, за блізкі сьвет, г.зн. “вельмі далёка, няведама дзе”. Ці, нешта падобнае, у Максіма Танка: З-за сьвету // Прыехаў, каб наведаць дом паэта. Каб з такой адлегласьці страляць султанаў, князь мусіў, прынамсі, мець балістычныя ракеты. Неверагоднымі падаюцца Э. Кінану і фразы з “Слова пра паход Ігараў” суды рядя, грады рядяше. Ён лічыць іх неўласьцівымі для расейскае мовы, затое натуральнымі для чэскае. Па-першае, тут крытык забываецца спраўдзіць свае выракі на матэрыяле беларускае і ўкраінскае моваў, якія маюць больш правоў на рускую спадчыну. І, па-другое, чамусьці ён ня ўлічвае такога агульна ведамага расейскага фразэалягізму як судить да рядить. Што да беларускае мовы, дык найбольш грунтоўная крыніца, слоўнік Я. Станкевіча, дае два аманімічныя значэньні слова радзіць -- “падказваць; дапамагаць” і “кіраваць; парадкаваць”. Там падаюцца нават адмысловыя ўстойлівыя спалучэньні з простым дапаўненьнем у вінавальным склоне: радзіць кросны, радзіць стрэльбу30. Наконт мовы “Слова” трэба сказаць колькі слоў адмыслова. Наяўнасьць вялікае колькасьці цьмяных мясьцінаў, якія, да таго ж, рана ці позна атрымліваюць несупярэчлівыя тлумачэньні, гаворыць якраз не пра падробленасьць, а пра аўтэнтычнасьць помніку. І тут нельга не згадзіцца з Дз.С. Ліхачовым, што яснасьць і прастата больш характэрныя для падробак. Адылі пры інтэрпрэтацыі помнікаў рускае даўніны варта ўлічваць колькі правілаў. Першае: ні ў якім разе нельга абапірацца толькі на расейскую мову, ігнаруючы беларускую і ўкраінскую. Расейская мова праз доўгі ўплыў царкоўна-славянскае ў сытуацыі дыглёсіі пастрачвала амаль усе аўтэнтычныя рысы. Да таго ж, этнічныя расейскія землі былі пэрыфэрыяй славянскага расьсяленьня. Другое: нельга

зыходзіць адно з сучаснага стану славянскіх моваў. Сучасныя славянскія мовы, асабліва іх літаратурныя формы, -- вынік хаатычнага неаднаразовага зьмешваньня племянных дыялектаў і неўпарадкаванае гістарычнае сэлекцыі. Мы кепска ведаем моўны матэрыял нават XIX стагодзьдзя, а што ўжо казаць пра XII-е. Тыя словы, якія сёньня падаюцца палянізмамі й багемізмамі, могуць быць у ня меншай ступені натуральнымі і для северскіх гаворак. У падтрымку гэтае думкі прытачу колькі ўласных назіраньняў над “Словам”. Дарэчы, Э. Кінан мог бы скарыстаць іх і на карысьць свае вэрсіі, але мне яны гавораць адваротнае. У “Слове пра паход Ігараў” ёсьць адно месца, якое даўно не ўважаецца, а, бадай, ніколі і не ўважалася за цьмянае, але перакладалася заўжды надта прыблізна. Цікава, што гэтае месца захавалася ня толькі ў копіі 1792 ды выданьні 1800 гадоў, але і ў крыху адрознай ад іх вытрымцы І.П. Ялагіна. “Слова” 1800 году: Почнемъ же братіе повSсть сію отъ стараго Владимера до нынSшняго Игоря, иже истягну умь крSпостію своею и поостри сердца своего мужествомъ; наплънився ратнаго духа, наведе своя храбрыя плъкы на землю половSцькую за землю руськую. Вытрымка І.П. Ялагіна: Почнемъ братіе повSсть сію отъ старого Владимера до нынSшьнего Игоря, иже истягну умъ крепостію своею, и поостри серца своимъ мужествомъ31. Першую грунтоўную спробу разгаданьня цьмяных слоў зрабіў А.С. Пушкін: “Иже истягну умь крSпостію. (Истянул -- вытянул, натянул, изведал, испробовал. Пожарский: опоясал, первые толкователи: напрягши ум крепостию своею). Истянул, как лук, изострил, как меч, -- метафоры, заимствованные из одного источника”32. Як бачым, найбольш загадкавае слова истягнути паэт уважыў за мэтафару ў адпаведнасьці з нормамі сучаснае расейскае мовы. У гэтым жа ключы зразумеў фрагмэнт і Жукоўскі, пакінуўшы яго амаль безь перакладу: “Натянул он ум свой крепостию, // Изострил он мужеством сердце, // Ратным духом исполнился”33. З тае пары мінула дзьвесьце гадоў, але тлумачальны пераклад Дз.С. Ліхачова не сягнуў далей у сэнсе дакладнасьці: “Препоясал ум крепостью своею (подчинил свои мысли своей “крепости” -- мужеству, храбрости) и поострил сердце своё мужеством; исполнившись ратного духа, навёл свои храбрые полки на землю половецкую за землю русскую”. Амаль тое самае і ў празаічным перакладзе: “Скрепил ум силою своею

и поострил сердце свое мужеством; исполнившись ратного духа”34. Відаць, не без уплыву Пушкіна бальшыня перакладнікаў і навукоўцаў мяркуе, што князь Ігар “умацаваў” розум, зрабіў паводле розуму. Меншыня пільнуецца адваротнае вэрсіі -- насуперак розуму. Перакладнікаў і камэнтатараў настолькі захапіла “збройна-кавальская” мэтафара, што некаторыя зь іх, прыкладам І.Д. Цівуноў, усур’ёз пачалі зьвяртацца да сакрэтаў кавальскага майстэрства. Адным зь першых, хто выказаў адваротную вэрсію быў Янка Купала: “Дык пачнем жа, брацьця, аповесьць ад старага Ўладзімера да Ігара сягачаснага, што скаваў розум сілай сваёй і навастрыў сваё мужнасьцю сэрца; напоўніўся духу барацьбянага і павёў сваё войска адважнае на землі Палавецкія за Рускія землі”35. Як бачым утварылася антыномія, выйсьці зь якой можна толькі дакладна зразумеўшы дзеясловы истягнути, поострити, а таксама назоўнік крепость і склонавую форму своего сердца. Найбольшы разнабой дае форма истягну -- натянул (Жукоўскі, Шарвінскі), напряг (Бальмонт, Стэлецкі, Цімафееў, Забалоцкі), задумал (Майкаў), выпрямил (Патабня), препоясал, опоясал, оперезав (Пажарскі, Ліхачоў, Новікаў, Рыльскі), скрепил, укріпив (Ліхачоў, Салевіч), выковал (Цівуноў), закалил (Анцукевіч), подчинил (Бацьвіньнік), потеснил (Шклярэўскі), взнуздал (Касарукаў), выверыў (Барадулін), скаваў, скуў (Купала), суладаў (Чыгрынаў). Уся праблема ў тым, што ў іншых рускіх помніках гэты дзеяслоў наагул не сустракаецца. Нечаканым ключом да яго мне паслужыла наўгародзкая берасьцяная грамата: a zамъке кSле a двьри кSлS a господарь въ нетяжS не дSe (А замок цэлы, а дзьверы цэлыя, а гаспадар у немачы, ня дзеіць)36. Сэмантычна блізкімі да наўгародзкага в нетяже, корань тяж-, ёсьць не сучасны дзеяслоў цягнуць, як думалі ўсе дагэтуль, а рускія і старабеларускія словы паўсьцяжлівы “стрыманы”; усьцягнуць, паўсьцягнуць “стрымаць” і сучаснае -- цягавіты “здольны да працы”, польскія словы zwycікїуж “перамагчы”, potkga “моц”, powњсі№gliwy “стрыманы”. У гэтым сэнсе корань тяг- сынанімічны кораню мог-, як польскае zwycікїус беларускаму перамагчы, у чэскай мове ёсьць абодва словы -- zviteziti і premoci. Адылі стараславянская прыстаўка из- адпавядае беларускім прыстаўкам вы- і з-, і, такім парадкам, истягну умь рэканструюецца як вымаг розум. Праўдзівейшай, як бачым,

выяўляецца вэрсія Купалы, а ня Пушкіна. Яна ж адпавядае сюжэту, бо Ігар, як ведама, зьдзейсьніў свой учынак насуперак развазе. Безь перакладу, фактычна, засталася і форма поостри -- поострил (Анцукевіч, Забалоцкі, Бацьвіньнік, Шклярэўскі, Ліхачоў), наострил, навастрыў, нагострив (Майкаў, Патабня, Купала, Рыльскі), вывастрыў, виострив (Барадулін, Салевіч), заострил (Бальмонт, Шарвінскі), изострил (Новікаў), отточил (Цівуноў, Стэлецкі), воспламенил (Касарукаў). Аднак усутыч да разгадкі наблізіўся, а потым адступіўся, толькі М. Анцукевіч. Ён заўважыў, што падобнае слова възъстряти "узбуджаць" аднойчы сустракаецца ў "Прыпавесьці аб душы і целе" Кірылы Тураўскага: Добро... к смSрению прилагаеть ум, и сердце на реть добродSтели възъстряеть37. Адсюль поостри рэканструюецца як сучаснае беларускае пабудзіў. Зразумеўшы дзеясловы, няцяжка зрабіць выбар і ў перакладзе назоўніка крепость -- крепость, кріпость (Жукоўскі, Анцукевіч, Новікаў, Цімафееў, Ліхачоў, Салевіч), дума крепкая (Майкаў), твёрдость, цьвёрдасьць (Патабня, Барадулін), твердыня (Бальмонт), решимость (Шарвінскі), мощ, міц (Цівуноў, Рыльскі), храбрость (Бацьвіньнік), дерзость (Шклярэўскі), сила, сіла (Забалоцкі, Ліхачоў, Купала, Чыгрынаў), сила воли, воля (Стэлецкі, Касарукаў), сіла свая (Купала). Тут маецца на ўвазе нейкая ўнутраная якасьць. Мае рацыю, па-мойму, У.І. Стэлецкі, які піша: "Найбольш адпаведным выходзіць сучаснае слова "воля"38. Але асноўную загадку выявіў трэці дзеяслоў, які, у прынцыпе, ніколі не выклікаў пытаньняў. Розьніца перакладаў палягала толькі ў стылёвых адценьнях. На расейскую мову, а зрэдку і на ўкраінскую наплънився зазвычай перакладалі славянізмам исполнился, сповнився (Жукоўскі, Анцукевіч, Стэлецкі, Новікаў, Цімафееў, Ліхачоў, Салевіч), або гіперславянізмам преисполнился (Шарвінскі, Бацьвіньнік, Шклярэўскі, Касарукаў), сучаснае ўкраінскае випивнівся (Рыльскі) таксама ўдае на кальку з царкоўнаславянскае, і толькі беларускае напоўніўся (Купала, Чыгрынаў) набліжаецца да арыгіналу. А разам з тым, што важна, канструкцыя з гэтым дзеясловам мае паралелі ў старабеларускіх судовых паперах: В року, тепер идучом, 1600.., наполнившысе деи злои воли своее, взявшы перед собе злыи умысл, тивун того именья... проч... утек (Запіс у кнізе Менскага гродзкага суду). В року, тепер идучом, 1603.., наполнившысе воли своее, подданые его

милости пана Антонея Мажонего.., уехавшы у гаи, у дуброву зарошчоную... князя Александра Полубенского... дерева дубины и березины... на тры копы, а хворосту незличоную реч... порубали (Запіс у кнізе гродзкага Слонімскага суду). Року теперешнего, 1612, ... уночы, нет ведома хто подъехавшы, альбо теж з своего злого умыслу наполнившысе своеи воли, подданые его власные проч вышли (Запіс у кнізе Браслаўскага земскага суду)39. Падобнае спалучэньне ёсьць і ў некаторых рэдакцыях “Задоншчыны”: “Истезавше умъ свой крепостию и поостриша сердца своя мужством и наполнившаяся ратнаго духа”40. Вось лягічная загадка-трохкутнік для Э. Кінана. Мне здаецца, “Задоншчына” і беларускія судовыя акты XVII стагодзьдзя ніяк не маглі мець сувязі, але ў іх мусіла быць супольная крыніца. І крыніца гэтая не канкрэтны тэкст, ня “Слова пра паход Ігараў”, а руская мова XII стагодзьдзя, на якой, зрэшты, пісалася і “Слова”, што паўплывала на “Задоншчыну”. І апошняе: словазлучэньне своего сердца некаторыя ўважалі за памылку, якую спрабавалі выправіць -- кожны па-свойму -- спачатку аўтар “Задоншчыны”, а потым І.П. Ялагін. Слова сердца ў ім многія ўспрымалі за азначэньне да слова мужество, так, прыкладам, думаў М. Анцукевіч, але, хутчэй за ўсё, гэта дапаўненьне ў форме роднага партытыўнага, як меркаваў У.І. Стэлецкі41. Такая форма даволі пашыраная ў беларускай мове, а ўрыўку яна надае рытарычнае стройнасьці, раўнамерна разьмяркоўваючы слоўныя масы вакол трох дзеясловаў-выказьнікаў. Ужываецца родны партытыўны абсалютна апраўдана, бо сэрцу, мужнаму і без таго, дадаецца мужнасьці. Разгледжаны вышэй урывак ня ёсьць мэтафараю, як гэта ўяўлялася А.С. Пушкіну. Ён утварае выкшталцоную рытарычную трыяду-супор: истягну -- тэзыс, поостри -- антытэзыс, наплънився -- сынтэз42. Князь Ігар учыніў супраць розуму, але паводле сэрца. Абмыльна нутраную форму даўнейшых слоў тут успрынялі за паэтычную фігуру. У цэлым урывак можа быць перакладзены наступным спосабам: Вымаг розум сілаю сваёю, пабудзіў сэрца сваё мужнасьцю, натхніўся змагарным духам. Яшчэ адно не да канца зразумелае месца ў “Слове пра паход Ігараў”: Ту ся копіем приламати, ту ся саблям потручяти о шеломы половецкыя. Што значыць слова потручяти? Здаецца, асаблівых разыходжаньняў у яго разуменьні няма, бальшыня ўспрымае як “пабіць”,

“пашчарбіць”. Але этымалёгію кожны прапаноўвае сваю. У.І. Стэлецкі піша: ”Слова паходзіць ад кораню тру (тров) (сягае кораню тр//тер) і ёсьць вытворным ад дзеяслова “трути” -- “тратить”. Роднымі паводле кораню, пэўна, ёсьць сучасныя словы: трут, тереть, тратить і да т.п. Даслоўнае значаньне: “сьцерціся”, “пашчарбіцца”43. Анцукевіч даводзіць іншае: “Я стаўлю яго ў зьвязак зь беларускім трущить(ся) “ламаць з трэскам, разьбіваць ушчэнт”. Яму ў даўнейшай рускай адпавядае труск”44. Але ўсё ж абедзьве вэрсіі, відаць, абмыльныя, асабліва апошняя. Слова потручяти сягае да польскіх слоў tr№саж “штурхаць”, tr№сіж “штурхнуць”, wstrkt “агіда”, старабеларускіх -- у “Сыноніме славенароскай” -- стручую -- возражаю, струченый -- возраженъ, низверженъ, тручаю -- рею, пореваю45, у М. Сматрыцкага -- вструтъ “пярэчаньне”, і -- літоўскага trenkti “грымнуць”. Можна спаткаць гэты корань і ў сучаснай беларускай мове: Не Сібір, астрог, ня кнут, // І ня цела цяжкі мукі. // Але дух народу струт (А. Абуховіч). Чым растлумачыць такую блізкасьць з заходнеславянскімі мовамі? Пэўна ж, не прыпісваньнем аўтарства “Слова” чэскім ці польскім славістам. Рэч у тым, што северскія гаворкі маюць заходнеславянскае паходжаньне. Многія гісторыкі лічаць, што севяране, або сеўрукі, таксама, як і крывічы, і наўгародцы-славене, прыйшлі з захаду, з тэрыторыі сучаснае Польшчы46. Ці не таму ключ да загадкавага истягну мы знаходзім і ў польскай мове, і ў старанаўгародзкай. У XX стагодзьдзі расейскі лінгвіст П. Растаргуеў дасьледаваў северскія гаворкі і аднёс іх да беларускае мовы. Шмат што з “Слова”, да чаго расейцы доўга ці марна шукаюць паралелі ў сваіх дыялектах, для беларускае мовы звыклая рэч. Прыкладам, обаполы -- абапал, вереженъ -- верад, вярэдзіць, троскотати -- траскатаць і г. д. А сказ Съ заранія въ пятъкъ потопташа поганыя плъкы половецкыя прымушае ўспомніць такія арыгінальныя тураўскія словы як заране, зараней, зарано, зарань “вельмі рана”47. Даўно зьвярнулі на сябе ўвагу і найменьні птушак чаица, галица, іх таксама можна сустрэць у беларускіх гаворках: на Магілеўшчыне чаіца “кнігаўка”, на Валожыншчыне галіца “каўка”48. Да гэтае пары яны спатыкаюцца ў беларускай літаратуры, прыкладам: Чаіца просіцца піць (М. Губярнатараў). А падабенства канструкцыяў з гэтымі словамі нават уражвае. “Слова”: Галици стады бSжать къ

Дону великому. Стары Ўлас: Варон і галіц лётаюць стады; Стады галіц увосень на полі. У гэтым кантэксьце пераклад П. Салевіча: Полки галичан біжать к Дону Великому -- можа выклікаць толькі ўсьмешку.49 Нават калі мы дапусьцім, што паэт-селянін Стары Ўлас чытаў “Слова” -- усё роўна сумнеўна, каб ён стаў ужываць нязвыклыя для яго роднае Валожыншчыны выразы. Што да фальсыфікатараў, дык у XVIII стагодзьдзі толькі пачыналася вывучэньне славянскіх моў, і ні пра якую імітацыю беларускіх дыялектаў нават гаварыць нельга. У “Слове пра паход Ігараў” гэтулькі нутраных хадоў, што знарок падрабіць іх мог хіба толькі Бог. Прыкладам, вывучаючы слова меч, я выпісаў з “Слова” ўсе кантэксты, зьвязаныя зь меч і шабля, і выявілася, што меч ужываецца вылучна ў апісаньнях войнаў з Захадам, а шабля -- войнаў з Усходам: Позвони своими острыми мечи о шеломы литовскія; Поскепаны саблями калеными шеломы аварьския. Гэта дакладна ілюструе гістарычную рэальнасьць: вайна з Усходам паступова вывела з ужытку ўсходніх славянаў мячы і замяніла іх на шаблі. Даўжэй за ўсіх мячамі карысталіся наўгародцы. У Заходняй жа Эўропе меч спаквaля трансфармаваўся ў шпаду. Усё гэта яшчэ раз сьведчыць пра тое, што аўтар “Слова” даволі канкрэтна і рэчыўна ўяўляў тое, пра што пісаў. Вышэй я адпрэчваў суб’ектыўныя чыньнікі ў розных падыходах да “Слова”, але скідаць іх з рахунку зусім -- ня варта. К. Попэр слушна лічыць, што індукцыйны мэтад ня здольны спараджаць гіпотэзаў. Яны ўзьнікаюць толькі шляхам дэдукцыі. Таму ў розных падыходах да “Слова” абавязкова бяруць удзел нашыя асабістыя сымпатыі і антыпатыі. Яшчэ З. Даленга-Хадакоўскі ў выраках скептыкаў згледжваў або незычлівасьць, або непаразуменьне, або недасьведчанасьць. Чаму ж сёньня, як нярэдка я заўважаю, многія беларусы з такой мазахісцкай асалодаю ловяць кожны вырак, скіраваны супраць “Слова пра паход Ігараў”? Яшчэ нядаўна, на пачатку XX стагодзьдзя, В. Ластоўскі ды У. Самойла ўздымалі “Слова” на шчыт, заклікалі яго вывучаць. Мне здаецца, што беларусы ня вытрымалі паядынку з расейскаю ідэалёгіяй. Беларуская нацыянальная сьведамасьць інтуіцыйна бароніцца ад усяго, што нас яднае з расейцамі. Але калі б мы былі больш дасьведчаныя і працавітыя, то ўбачылі б у “Слове” свой помнік краснага пісьменства. Убачылі б, што менавіта беларуская мова здольная раскрыць таямніцы гэтага

загадкавага твору. І апошняе. Працягваючы ў назове ўсьлед за Э. Кінанам “скразную” мэтафару, якая ў Плятона, дарэчы, сымбалізавала думаньне, мушу зазначыць, што шаноўны аўтар выбіў Богу вокны, г.зн. не пацэліў зусім, нават у мішэнь.

P.S. Пасьля таго як адказ Э. Кінану быў напісаны, рэдакцыя часопісу “ARCHE” ласкава ўзычыла мне рыхтаваны да публікацыі тэкст Р. Грабовіча. Тэкст гэты зусім іншае прыроды. Калі Э. Кінан цаляе ў мішэнь з ручное зброі, то Р. Грабовіч “валіць” з буйное артылерыі, без разбору. “Слова пра паход Ігараў” тут амаль ня згадваецца. Затое пералічваюцца і апісваюцца падробкі эпасу рознага кшталту й маштабу. Усякі тэкст, які лучае ў поле гэтых апісаньняў, гіне, як дробная птушка ў Бэрмудзкім трохкутніку. І тут ужо цяжка зразумець, ці Х футра скраў, ці ў Х футра скралі. Калі разважаць чыста юрыдычнымі катэгорыямі, дык Р. Грабовіч нічога не даводзіць. Нельга быць крыху вінаватым, як нельга быць крыху цяжарнай. Аднак так думалі не заўсёды. Гадоў 300--400 таму, як паказаў М. Фуко ў кнізе “Нагляд і кара”, віна мела градацыю. Лічылася, што быць пад сьледзтвам -- гэта значыць быць крыху вінаватым. І гэткі ход думак -- ня вынахад праўных казуістаў. Гэта фэномэн масавае сьведамасьці. Вось жа, калі пра нейкі тэкст доўга гаварыць як пра падробку, калі праз паўсотню старонак успамінаць яго ў шэрагу яўных падробак і заразом не аказваць аніводнага аргумэнту -- усё роўна спрацоўвае масавае “крыху”. Маўляў, няма дыму без агню. І хоць довады Э. Кінана, як я, у меру маіх сілаў, паспрабаваў паказаць, сумнеўныя, Р. Грабовіч “ничтоже сумняшеся” спасылаецца на іх як на чыста даведзеныя факты. Такі прыём можна назваць інтэлектуальным штурмам. Шчыра кажучы, чытаючы Грабовіча, я і сам пачаў сумнявацца. Але тэкст на тое і разьлічаны: пасеяць сумнеў, які некалі спрацуе, як міна запаволенага дзеяньня. Яшчэ езуіты казалі: ілжыце, ілжыце, хоць нешта, а застанецца. У XVI стагодзьдзі, прыкладам, яны так старанна абылгалі пратэстантаў як бязбожнікаў ды атэістаў, што супраць свае волі на 400 гадоў наперад стварылі для бальшавіцкіх гісторыкаў цэлы кляндайк піянэраў атэізму. Мы ніколі ня можам адгадаць, як мана спрацуе ў пэрспэктыве. Артыкул Р. Грабовіча я б не назваў маною, ці, па-савецку, паклёпам. Але мэханізм тут дзеіць той самы. Р. Грабовіч працуе як публіцыст, які імкнецца

перацягнуць масавага чытача на свой бок. У навуковай дыскусіі ўсё ім сказанае магло б быць цудоўнай прэлюдыяй. Далей мусілі б ісьці тэксталягічныя, лінгвістычныя і гістарычныя аргумэнты. Ажно не, замест гэтага публіцыст спасылаецца на сумнеўныя довады Э. Кінана, а таксама А. Мазона ды А. Зіміна. Аднак калі я разважыў, то прыйшоў да высновы, што тэкст Р. Грабовіча мне істотна дапамог. Р. Грабовіч у сваім артыкуле імпліцытна дае клясыфікацыю падробак. Першае: падробкі бываюць таленавітыя і бяздарныя, прафэсійныя і непрафэсійныя. Да таленавітых можна аднесьці “Песьні Асіяна”, да прафэсійных -- каралядворскія граматы, да бяздарных і непрафэсійных -- “Вялесаву кнігу”. Другое: выстройваецца яшчэ адна, вельмі важная для нас, клясыфікацыя -- ёсьць падробкі-містыфікацыі, ёсьць падробкі-кампіляцыі і ёсьць падробкі-інтэрпрэтацыі. Містыфікацыі, чыстыя падробкі -- “Песьні Асіяна”, каралядворскія граматы і да т. п. Да кампіляцыяў, а яны ўжо не зусім падробкі, адносіцца “Калевала”. Да абмыльных жа інтэрпрэтацыяў я б аднёс “Слова пра паход Ігараў”, хоць гэта зусім далёка ад таго, што мы ўважаем за падробку. Р. Грабовіч давёў, што не існавала адзінае мэтодыкі імітацыі нацыянальнага эпасу. Расейцы вызначыліся тым, што гатовым падручным матэрыялам для іх паслужыла рытарычная прамова. Гэта я даводзіў вышэй, і ў гэтым мяне яшчэ больш упэўніў тэкст Р. Грабовіча. Урэшце, да довадаў шаноўных аўтараў сам сабою ўзьнікае шэраг пытаньняў. Калі “Слова пра паход Ігараў” містыфікацыя, на ўзор Макфэрсана, дык чаму створаны толькі адзін, ды яшчэ такі маленькі, тэкст? “Песьні Асіяна” ж друкаваліся з працягам. Ці не занадта вялікая колькасьць людзей уцягваецца ў кола містыфікатараў? Скептыкі стварылі для сябе адмысловую пастку: кожнага, хто меў справу з арыгіналам “Слова”, яны вымушаныя аўтаматычна залічваць у шэрагі махляроў. Як маглі расейскія літаратары насьледаваць містыфікатарству Макфэрсана, калі ў 90-х гадох XVIII стагодзьдзя “Песьні Асіяна” яшчэ не былі выкрытыя? Хутчэй можна дапусьціць іншае: амаль усе шчыра верылі ў “шатляндзкі эпас” ды шукалі ў сябе нешта падобнае, найперш -- сярод гатовых тэкстаў. І, натуральна, “знайшлі”. Ведама, скепсыс ёсьць складнікам навуковага мысьленьня. Але гэта зусім ня значыць, што трэба ставіць знак роўнасьці паміж навуковасьцю

й нігілізмам. Куды прасьцей, не заглыбляючыся ў падрабязнасьці праблемы ды заняўшы скептычную пазыцыю, імітаваць навуковасьць. Вельмі проста, краем вуха пачуўшы пра Мазона, Зіміна ды Кінана, пышыцца сваім “навуковым крытыцызмам”. Аднак у скептыкаў ёсьць свая форма безадказнасьці ў інтэрпрэтацыях тэксту. Яны адвольна перамяшчаюць “Слова” ў часе ад XIII да XVIII стагодзьдзя, абы толькі не зьмясьціць яго ў XII-е. Сьпіс супярэчнасьцяў, якія выклікае скептычны падыход, большы за той, што маюць апалягеты. Яго можна яшчэ доўжыць, але пакінем гэты занятак дапытліваму чытачу.

Заўвагі:

1 Тут і далей гістарызм рускі ўжываецца замест маластраўнага слова старажытнаагульнаўсходнеславянскі. 2 Ерёмин И.П. Жанровая природа “Слова о полку Игореве” // Ерёмин И.П. Литература Древней Руси. Москва, Ленинград, 1966. С. 144163. 3 Гл., прыкладам: [Салевич П.] Переднє слово // Слово о поході Ігоревім Ігоря сина Святославового внука Олегового. Львів, 1999. С. 4. 4 Тамсама. С. 149. 5 Цыт. паводле: Козлов В.П. К истории “Слова о полку Игореве” в конце XVIII в. // Исследования “Слова о полку Игореве”. Москва, 1986. С. 164. 6 Анцукевич Н.П. Слово о полку Игореве: Перевод. Комментарий. Исследование. Вильнюс, 1992. С. 231237. 7 Лотман Ю.М. Риторика. // Риторика. 1995. № 2. С. 104105. 8 Гл., прыкладам: Якубанис Г. Эмпедокл: Философ, врач и чародей. Гёльдерлин Ф. Смерть Эмпедокла: Драма. Киев, 1994. С. 3454. 9 Холшевников В.И. Русская и польская силлабика и силлабо-тоника // Теория стиха. Ленинград, 1968. С. 27. 10 Багдановіч М. Поўны збор твораў: У 3 т. Т. 2. Менск, 1993. С. 202. 11 Никольский Н. О литературныхъ трудахъ митрополита Климента Смолятича, писателя XII вѢка. Санкт-Петербург, 1892. С. 104. 12 Гранстрем Е.Э. Почему митрополита Климента Смолятича называли философом // ТОДРЛ. 1970. Т. 25. 13 Прыбытка Г. Масковія і Еўропа (Да пытаньня ўзаемадачыненьняў беларусаў і маскавітаў) // Сьвіцязь. 1995. № 1. С. 8095. 14 Шпет Г.Г. Очерк развития русской философии // Введенский В.И., Лосев А.Ф., Радлов Э.Л., Шпет Г.Г. Очерки истории русской философии. Свердловск, 1991. С. 235. 15 Цыт.

паводле: Прыбытка Г. Тамсама. С. 84. 16 Цыт. паводле: Бунин И.А. Окаянные дни. Москва, 1990. С. 122. 17 Лотман Ю.М. Культура и взрыв. Москва, 1992. С. 6491. 18 Цыт. паводле: Моисеева Г.Н. Чешский славист Йозеф Добровский и “Слово о полку Игореве” // Альманах библиофила. Вып. 21. Москва, 1986. С. 103. 19 Тамсама. 20 Козлов В.П. К истории “Слова”... С. 164168; ён жа: Доказательство “Словом” И.П. Елагина // Альманах библиофила. Вып. 21. Москва, 1986. С. 9497. 21 Кучкин В.А. Ранние упоминания о мусин-пушкинском списке “Слова о полку Игореве” // Тамсама. С. 6667. 22 Моисеева Г.Н. Тамсама. С. 98. 23 Гудзий Н.К. Судьбы печатного текста “Слова о полку Игореве” // ТОДРЛ. 1951. Т. 8. С. 36. 24 Стеллецкий В.И. Слово о полку Игореве: Древнерусский текст и переводы. Москва, 1965. С. 70. 25 Шарлемань Н.В. Заметки натуралиста к “Слову о полку Игореве” // ТОДРЛ. 1951. Т. 8, С. 5367. 26 Анцукевич Н.П. С. 115. 27 Стеллецкий В.И. С. 51. 28 Слово о полку Игореве: Сборник. Ленинград, 1990. С. 57. 29 Анцукевич Н.П. С. 113114. 30 Станкевіч Я. Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік. Ню-Ёрк, [1990]. С. 979. 31 Рэканструяваная цытата паводле: Козлов В.П. К истории “Слова”... С. 164, 170172; яго ж: Доказательство “Словом”. С. 93; Кучкин В.А. С. 6573. 32 Пушкин А.С. Мысли о литературе. Москва, 1988. С. 330. 33 Слово о полку Игореве. Москва, 1987. С. 116. 34 Тамсама. С. 166, 27. 35 Купала Янка. Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 4. Менск, 1997. С. 191. 36 Хрестоматия по истории русского языка. Москва, 1990. С. 28. 37 Цыт. паводле: Анцукевич Н.П. С. 57. 38 Стеллецкий В.И. С. 125. 39 Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии: Конец XIV в. -- 1648 г.: Сб. документов и материалов: В 3 т. Т. 1. Минск, 1988. С. 151, 159, 195. 40 Древнерусская литература: Хрестоматия. Москва, 1988. С. 163. 41 Стеллецкий В.И. С. 125; Анцукевич Н.П. С. 5758. Гл. таксама: Мещерский Н.А.; Бурыкин А.А. Проблема критического текста “Слова о полку Игореве” // Исследования “Слова о полку Игореве”. С. 94. 42 Цікава, што гэтая выснова супадае з больш шырокімі абагульненьнямі А. Чарнова. Ён піша: “Кожная з частак, і практычна кожная самастойная тэма ў “Слове”, разьвіваецца паводле закону трыяды”. (Чернов А. Поэтическая полисемия и сфрагида автора в “Слове о полку Игореве” // Исследования “Слова о полку Игореве”. С. 273.) 43 Стеллецкий В.И. С. 137. 44 Анцукевич Н.П.

С. 84. 45 Гл.: Старабеларускія лексіконы. Менск, 1992. 46 Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Менск, 1990. С. 2640. 47 Тураўскі слоўнік. У 5 т. Т. 2. Менск, 1982. С. 118. 48 Жывёльны свет: Тэматычны слоўнік. Менск, 1999. С. 49, 41.

ahije601

Ne sutor ultra crepidam Уладзімір Агіевіч Нам хацелася напісаць на лацінскай мове гэтую рэпліку з нагоды публікацыі А. Надсана “Скарына і ананасы” ў № 3 часопісу “Arche-Пачатак” за 2001 год. Аднак зацікаўленасць у чытачу з шырокіх колаў грамадскасці абрэзала нам крылы: лаціны ён не адолее. Дый ці варта страляць з пушкі па вераб’ях, якія збіліся ў чародку на ніве сваіх публікацый у № 17 “Нашай Нівы” за гэты ж год пад загалоўкам “Міт, якому не дають памерці”, а таксама каментаром галоўнага рэдактара А. Дынько (дзвюма старонкамі раней (!)) з паралельнай карыкатурай, на якой Э. Качан паказаў свінню з апельсінам. Да расліннага ананасна-апельсінавага вегетарыянства далучыўся рэдактар газеты: з дубовай упёртасцю не хоча друкаваць адказу на іх заліхвацкае тыцканне ў мой бок пальцам, маўляў, дурань хоча перакуліць усю навуку скарыназнаўства. Нас публікацыя ў “Arche” задавальняе тым, што ў 26 абзацах наша імя паўторана роўна ў два разы больш. А гэта значыць, што метад “футра” (няважна, ён скраў ці ў яго скралі), ужыты аўтарам, спрацаваў супраць намеру. Аднак паколькі рацыянальнае асэнсаванне неабходна занатаваць для цікаўных, то пакажам ім бездапаможнасць імпэтных абвяргальнікаў матэматычна-астранамічных аксіёмаў. Чаму эскапады маюць месца не ў 1993 годзе, калі з’явілася першая публікацыя (дарэчы, у Лондане), і не ў 1997-м, калі быў апублікаваны метад даследавання, і не ў 1999-м, калі выйшла манаграфія, а акурат у 2001 годзе -- юбілейным для Скарыны, поўным знамянальных дат, напрыклад, 225-годдзя ўзнікнення навуковай Скарыніяны? У чым тут промысел Божы? У тым, што калі Ён пажадае некага пакараць, то пазбаўляе розуму... але ў пэўны час. Усё, як кажуць, у імені -- nomen est omen! Прыступаючы да справы, наш апанент пачынае таксама з яго, сцвярджае пра надпіс на Скарынавым партрэце: “Нават неабазнаныя з кірылічнай палеаграфіяй могуць прачытаць яго як Доктор Франциско Скорина”. Такім чынам аўтограф Скарыны ўспрымаюць многія, аднак ніводны даследчык не расклаў славянскай вязі на элементы-літары ў графічнай форме, адэкватнай арыгіналу надпісу. Элементарная спроба

пакажа, што няма ніякага “доктара”. Атрымаўшы першыя ўражанні ад метаду крытыканства, не хочацца прытрымлівацца этычнага тону акадэмічнай карэктнасці, наадварот, так і падштурхоўвае... Бо ёсць просты крытэрый для адрознення крытыка, які, будучы зацікаўленым у поспеху справы, робіць аналіз, каб даць ацэнку рабоце, -- ад крытыкана-нядобразычліў-ца, які працуе супраць асобы аўтара. Крытык разумее сэнс працы, адзначае станоўчае і адмоўнае, абавязкова бачыць перспектыву, якая іманентна вынікае з логікі твора. Нядобразычліўцы з larva (маскай) крытыка падладжваюцца пад яго ў разглядзе асобы аўтара, пераважна яе адмоўных ці нерэпрэзентабельных рыс. Недахопы -- вось што істотна для іх. Казаць, што дыпламаваны спецыяліст-выкладчык трох моваў блытае 2-ю асобу з 3-й, малапераканаўча. Карэктарская памылка, якіх, дарэчы, вельмі шмат у сучасных часопісных публікацыях, хісткая падстава. Наш настаўнік А. Бандарын, пэўна, круціўся б у труне ваўчком, калі б яго вучні не ўсведамлялі і не ведалі катэгорыі асобы. Не больш кур’ёзная справа з абвінавачваннямі кшталту “як гэтага хоча Агіевіч”. Так, мы пішам: “Відавочная недарэчнасць у выразе “носіць імя пана Францыска” недаравальная з розных бакоў...”, -- а А. Надсан падае: “...“nominatus est”... азначае “быў названы”, а ў ніякім выпадку не “носіць імя”, як гэтага хоча Агіевіч”. Ды не мы так хочам, а аўтары акадэмічнага выдання, якія тым самым выяўляюць сваю некрытычнасць, бо ў тэксце дакументу сказана “nominitabatur doctor Franciscus”. Рэдакцыя падуанскага пратакольнага запісу абумоўлена тым, што ў рытуальнай перадэкзаменацыйнай прысязе Скарына, ужо доктар вольных навук, папярэдзіў, што яго неаднаразова называлі (да часу прысягі, адсюль і ўжыванне перфектнай формы дзеяслову, а не дзеепрыметніку, як у Надсана) “доктарам Францыскам”, г.зн. акадэмічным (універсітэцкім) прафесіянімам (параўнай, напрыклад, з “доктарам Фаўстусам”). Дарэчы, нельга пазбаўляць статусу аўтарства волевыяўленне Скарыны пад выглядам таго, што яно было ў інтэрпрэтацыі некаторых скарыністаў перададзена старшыні камісіі або пратакалісту. Апошнія атрымалі інфармацыю толькі ад самога Скарыны, ён яе суверэн. Наагул жа, журналісцкая этыка пакідае жадаць лепшага. Спашлемся на прыклад, звязаны з ужываннем хроснага імя Скарыны. Нядаўна “ЛіМ” надрукаваў артыкул

члена-карэспандэнта НАНБ Ул. Кульчыцкага “Ці будзе радзіць дрэва без карэнняў?” (30 сакавіка 2001 году), дзе аўтар называе Скарыну Георгіем. Аднак рэдакцыя паправіла медыка на свой капыл, падтарнавала пад свой густ -- насуперак волі аўтара знарок замяніла хроснае імя Георгі на імя прынятае Францыск. Спытаемся, на карысць каго ці якога палажэння ў праблеме імя Скарыны сведчыць факт такой публікацыі? Каб потым сказаць: вось маем чарговы прыклад -- няма ніякага Георгія? Нам вядома, што доктар навук даслаў у рэдакцыю свой пратэст супраць адвольнага абыходжання з ягоным тэкстам, бо як спецыяліст, які ведае гісторыю і практыку зносін паміж чальцамі еўрапейскай медычнай карпарацыі, ён ставіць наперад хроснае імя чалавека, а затым прынятыя. Але ці толькі газета творчай інтэлігенцыі Беларусі аказваецца з душком аўтарытарызму? Хіба сучасная “Наша Ніва” не такая ж пад кіраўніцтвам А. Дынька, у руках у якога пагатоў затыкала-кляп для апанентаў? Усё гэта вада на млын імперскай ідэалогіі апендыксацэнтрызму, вядомай пад эўфемізмам “западноруссизм”, паводле якой калыска ўсходнеславянскай культуры і цывілізацыі апынулася... на перыферыі. Наконт разумення лексікі -- не будзем спрачацца. Мы падаём два дзесяткі значэнняў слова miser, а наш апанент абыходзіцца двума. Гэта само па сабе паказальна. Назву ордэну ён хоча перакладаць са злучнікам qui. Літаральнасць (пазбегнуць якой дапамагае акурат ужыванне энклітычнага сродку -- que замест et) пры перакладзе “ўзбагаціць” сонм апосталаў, г.зн. дадасць да Хрыстовых паплечнікаў яшчэ ўсіх ордэнцаў Храма Саламонавага. Шырокі жэст! Аднак шырыня душы здраджвае, калі, не зразумеўшы дыдактычнай цытаты з апісаннем і аналізам гравюрных выяваў, наш апанент называе з інквізітарскім тонам лухтой тое, што мы выкарыстоўваем для ілюстрацыі пераемнасці Скарынавага метаду ад пазнавальных традыцый. Каб некаторыя паспешлівыя чытачы не падумалі, што ператвараем Скарыну ў адэпта эзатэрычных вучэнняў, мы загадзя спецыяльна прысвяцілі гэтай прынцыповай тэме заключэнне манаграфіі. Многія папрокі грунтуюцца на верхаглядным прачытанні нашых работ. Адсюль і неахайнасць з цытаваннем і інтэрпрэтацыямі. Гэта заўвага датычыць разбору кірылічнай вязі на плакетцы з гравюрнага партрэта, а таксама трактавання павязкі на галаве чалавека ў Храме, этымалогіі

астральных аб'ектаў -- Пчалы і Лямпы, якія сімвалізуюць сузор'і і адначасова паслугоўваюць астранімамі (псеўданімамі) Скарыны -- імёнаў Георгі і Францыск. Гэта датычыць ледзь не кожнай дробязі. З найбольш істотных выберам "глупства астранамічнага маштабу". Тут айцу Надсану запляскалі ў далоні многія, нават некаторыя членкоршы з акадэміі, якія патрабуюць астранамічнай экспертызы. Яе ўзяўся зрабіць выпускнік Лонданскага ўніверсітэту. Аднак ці варты гэты Парыж імшы? Нам дастаткова ведаў з праграмы па астраноміі для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы (напрыклад, СШ № 19 імя Янкі Купалы Менску). З яе аб'ёмаў ведаў вынікае, што астранамічныя вымярэнні вугла ўзыходжання нябесных аб'ектаў робяцца ў дзень вясенняга раўнадзенства ад Авена. На эпоху Скарыны гэта быў дзень 10 сакавіка (паводле т.зв. старога стылю), або 20 сакавіка паводле гіпатэтычнага грыгарыянскага (у той час яшчэ не прынятага): 10 сакавіка + 10 дзён спазнення з часоў прыняцця юліянскага календара. Сузор'е Пчалы, якое на старажытных картах пазначалася назвамі Apis, Musca, Wespa (Пчала, Муха, Аса -- з-за рознасці перакладаў з арабскай мовы), знаходзіцца пад 347° ад яго, што і паказаў Скарына "манаграмай" ТМЗ, лічбавы эквівалент якой складае акурат 347. Гэта адно. Дзякуючы прэцэсіі месцазнаходжанне Пчалы разам з усімі целамі на нябеснай цвердзі перамяшчаецца па крузе адносна назіральніка з Зямлі. Застаючыся пры Авене і Цяльцы, яно аддаляецца ад дня вясенняга раўнадзенства і на эпоху Скарыны ўступала ў экліптыку не праз 13 дзён пасля раўнадзенства, а ўжо 23 красавіка, на дзень святога Георгія. (Дзякуючы ўсё той жа прэцэсіі гэтая дата ў наш час у XX і XXI стагоддзях прыпадае ўжо на 13 дзён пазней, г. зн. на 6 мая.) Вось чаму Пчала выбрана Скарынам у якасці астраніма. Мы адсылаем цікаўных да карт Я. Гевелія, К. Фламарыёна (с. 221 манаграфіі), а таксама да карт з кнігі М. Марозава "Пророки" (Масква, 1914), што карэктна адлюстравана і ў бібліяграфіі. Навошта пісаць: "Ён забыўся падаць даты, аўтараў і месцы выданняў гэтых мапаў"? А зараз зойдзем на поле супраціўніка. "Ян Дамаскін, Язэп Гімнограф і Язэп з Тэсалёнікаў ніколі не пісалі акафістаў: яны і вышэй менаваныя манахі-студыты былі аўтарамі канонаў..." -- піша знаўца ўсяго і ўсякага. Напомнім, што з устойлівай традыцыі VI ст., меўшай пачатак ад акафістаў Багародзіцы Прысна Дзевы Марыі, пачалася наагул гімнаграфія.

Як нельга ўявіць паэта, што не піша вершаў, так нельга назваць гімнографа, які б не пісаў акафістаў. Іншая справа, ці ўваходзілі тыя або іншыя акафісты розных гімнографаў у літургічную практыку. Магчыма, названыя аўтары і не мелі такой нагоды, але неўжыванне не ёсць неіснаваннем. Мы ж паказваем галоўнае: гімнографы карысталіся формай акравершаў. Ад іх як настаўнікаў пераняў і вучань, студыёзус, г.зн. студыт, а не пэўны гістарычны манах з Студыйскага манастыра. Усё гэта наводзіць на скрушнае сумненне адносна прычын настолькі мізэрнага спосабу "вядзення вайны". Чалавек, які блытае дыфаматара з дэфарматарам, або не можна зразумець, як мажліва прасачыць адпаведнасць дагматыкі Новага запавету -- Старому, або чаму бл. Геранім папярэднік Скарыны ў справе перакладу Біблії, -- такі не цікавы нават прафесару Х. Хігінсу. На малюнку "Не так селі...", змешчаным некалі ў часопісе "Беларусь" і газеце "Веды", паказана, як успрымаюць першадрукара некаторыя сучаснікі, якія ўзурпавалі ў навуковай супольнасці права рэферэнтнай групы. Персаніфікацыя квадрывіуму навук са Скарынавай гравюры "Дыспут" абярнулася тут квадрыгай скарынаведаў з кагорты "навуковай грамадскасці". Яны паказваюць на літары кірыліцы, з якіх складзены аўтограф слова "Георгі", і скандуюць: "Сам Скарына ніколі тым іменем сябе не называў!"; "Скарына зваўся толькі Францішкам!" (А. Стэповіч, 1889; Х. Лаўмяньскі, 1925; С. Брага, 1966; Р. Максімовіч, 1974; Г. Сагановіч, 1993 і інш., сярод якіх і наш герой.) Гэтак некалі "навуковая грамадскасць" у асобе М. Лютэра і П. Меланхтона накінулася на М. Каперніка за яго "інтэрпрэтацыю" вядомай карціны свету са словамі: "Гэты дурань хоча перакуліць усю навуку астраномію!" Нарэшце, пра асоб, чые імёны спатрэбіліся "вегетарыянцу". Трэба адрозніваць тэксты, напрыклад, таго ж М. Уляхіна і не блытаць апошняга з У. Іллюхіным, як тое робіць саюзнік нашага апанента па "францішканстве" партызан А. Жураўскі, седзячы з ім у акопе аднадумства і шпурляючы ў нас свае папяровыя гранаткі. Падазраваць прафесіянала-тэкстолага М. Мушынскага ў неразуменні тэкстаў (тым больш Скарынавых) -- усё роўна што адмаўляць паэту А. Лойку ў спецыфічнай (паэтычнай) форме адбіваць з'явы рэчаіснасці аб'ектыўнага і суб'ектыўнага быцця. Нарэшце, пра выданне ЮНЕСКА кнігі "Francisk Skoryna". У полымі партыйна-палітычнай барацьбы з беларускім

нацыяналізмам згарэла прапанаваная АНБ кандыдатура М. Прашковіча на аўтарства кнігі. Мне давялося шукаць кандыдатуры пераемнікаў з другога і трэцяга эшалону скарыністаў. Так з'явіліся: Г. Галенчанка, гісторык-спецыяліст у галіне кнігазнаўства (блытае інкунабулы з палеатыпамі), В. Чамярыцкі, гісторык нацыянальнай літаратуры (да сяго часу выступае з асэнсаваннем праблемы, ці быў Скарына беларусам), нарэшце, В. Шматаў, jack-of-all-trades, і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц, адмысловец у галіне графікі (мастацтвазнаўчы тэрмін quattrocento перакладае як XIV стагоддзе). Цяпер я таксама падзяляю жарт чытачоў, якія, пазнаёміўшыся з іх замежным выданнем, гавораць: "Я нічога не ведаў пра Скарыну, нічога не ведаю і цяпер". У выніку прачытання артыкулу "Скарына і ананасы" ў чытача павінна скласціся ўражанне, быццам НАНБ -- Моська, што брэша на Слана, гіганта скарыназнаўства. Ад беспардоннасці выратоўвае вершаваная цытата з Казіміра Сваяка, дзе прозвішча Вялікага Палачаніна ўжыта ў чыста беларускім гучанні паводле нацыянальнай акцэнтуацыі і ў адпаведнасці з нормамі фанетыкі -- наш Скарына'.

pazn601

Масонскае скарыназнаўства Валеры Пазьнякоў

Неверагодна, але дыскусія пачалася. Калі сталі зьяўляцца артыкулы Ўладзімера Агіевіча пра тое, што Скарына — гэта праваслаўны Георгі, кніжнік-масон і г.д., неяк ня верылася, што хто-небудзь зоймецца праверкаю ўсёй гэтай “кабалістыкі”. Першым ня вытрымаў а. Аляксандар Надсан і паказаў на некаторыя памылкі “новага скарыназнаўства”, відавочныя і прыхаваныя. Агіевіч адказвае, чытач параўноўвае, скарыназнаўства быццам рухаецца наперад… У чытачу ўся і справа. Кожны з бакоў апэлюе да шырокай аўдыторыі, “люду паспалітага”. Толькі пішацца ўсё моваю ня простаю і пра рэчы досыць цьмяныя, далёкія ад дня сёньняшняга. Я сам спачатку чытаў тэксты Агіевіча праз радок, праз старонку, бо што за радасьць разьбіраць сярэднявечную лаціну, эзатэрыку, астралёгію і г.д.? Але як слова ў супрацьвагу ўсяго гэтага было сказана і дачакалася яно адказу, то ёсьць патрэба ацаніць, чаго вартая дыскусія вакол “новага скарыназнаўства” і яно само. У дыскусіі на першае месца выйшлі пытаньні філялёгіі, мовы. У пэўнай ступені гэта адзнака нашага часу, калі знайшлося досыць аматараў зьмяніць усяго толькі некалькі знакаў ці літараў ува ўсім вядомых тэкстах, каб перапісаць ці ня ўсю чалавечую гісторыю (усе ведаюць пра акадэміка-матэматыка Анатоля Фаменку і яго “новую храналёгію”). Выглядае такі мэтад эфэктна: лёгкім рухам рукі доктар Францішак Скарына пераўтвараецца ў Георгія Францішка Скарыну, у “паўпэра”, у “протамасона”. Мованаведы, што імкнуцца перакуліць сьвет, даволі характэрныя для мэдыявістыкі, гэта вынікае з самога характару той эпохі. Эпохі маўклівай большасьці, якая пакінула пасьля сябе даволі нешматлікія пісьмовыя сьведчаньні. Яны патрабуюць асабліва ашчаднага і ўзважлівага абыходжаньня. Увагі да тых самых літар, якія карціць некаму зьмяніць на сваю карысьць. Гэтак, кінем позірк на дыскусію, што адбылася паміж Агіевічам і а. Аляксандрам. Пэўна, нейкі ж плён яна прынесла, пасудзейнічала, так бы мовіць, нараджэньню ісьціны? Адно з галоўных “адкрыцьцяў” Агіевіча — новае прачытаньне подпісу

на ўсім вядомай гравюры з партрэтам першадрукара. Усе чыталі “Доктор Франциско Скорина”, цяпер прапануецца варыянт “Георги Франциск Скорина”. Ну, ня ведаю. Чалавек на 90 адсоткаў здабывае інфармацыю праз зрок, відавочнасьць заўсёды была галоўным доказам у спрэчцы. Калі сапраўды наглядная рэч выклікае такое рознае тлумачэньне, то ніякія довады аднаго з бакоў не пераканаюць суразмоўцу зьмяніць погляд. Пяройдзем да менш наглядных, а значыць, больш дыскутабэльных пытаньняў. Так, а. Аляксандар заўважае на маргінэзе працы “новага скарыназнаўцы”, што вызначэньне апошнім лацінскага слова nominatur як дзеяслова 2-й асобы — відавочная памылка, гэта 3-я асоба. Агіевіч згодны, што памылка, але адносіць яе на рахунак карэктара. Далей высьвятляецца, што nominatus est — гэта сапраўды “быў названы”, а не “носіць імя”, тут абодва дыспутанты згодныя. Але пры гэтым Агіевіч дадае, што ў тэксьце дакумэнту сказана “nominitabatur doctor Franciscus”. Вось гэтага якраз у дакумэнце і няма, гэта “рэканструкцыя” самога Агіевіча (слушная ці няслушная — гэта ўжо іншая справа). Абмеркавана было і слова praefatus, паводле Агіевіча — пэрфэктная форма дзеяслова. Лацінскія слоўнікі тут на баку а. Аляксандра. На гэтым дыскусію пра лацінскія тэрміны і сам тэкст падуанскіх дакумэнтаў Агіевіч палічыў патрэбным згарнуць, хоць а. Аляксандар яшчэ на цэлай старонцы разьбірае пабудовы Агіевіча наконт “сапсаваных” пісцамі падуанскіх тэкстаў. Калі адказу па сутнасьці а. Аляксандар не атрымаў, то пабочныя чытачы маюць права думаць, што праўда засталася на яго баку. Цікуючы па сьлядох дыскусіі, вырашыў спраўдзіць, як можна патлумачыць вызначэньне Скарыны бедным (pauper), што было зроблена ў Падуі. У запале дыспуту Агіевіч сьцьвярджае, што падае два дзясяткі значэньня слова miser, а а. Аляксандар — толькі два. На самой справе ў кнізе Агіевіча “Сімволіка гравюры Скарыны” ёсьць два дзясяткі вазначэньняў слова pauper, а ня miser. Трэба быць дакладным у цытаваньні і пры спасылцы на свае працы, каб можна было рабіць закіды іншым у “верхаглядным прачытаньні нашых работ”, у “неахайнасьці з цытаваньнем і інтэрпрэтацыямі”. Вось тое ж простае слова pauper, якое ў Агіевіча набыло сэнс містычнага тэрміну. Так двойчы названы Скарына ў падуанскіх дакумэнтах 1512 году. З усіх магчымых варыянтаў перакладу (“бедны, засмучаны,

безжыцьцёвы, кволы, нязначны, сьціплы, просты” і г.д.) Агіевіч ня выбраў ніводнага і пакінуў слова pauper безь перакладу, маўляў, гэта скарочаная назва сяброў ордэну храмоўнікаў (тампліераў), цалкам — Pauperes Commilitiones Christi Templumque Solomonici (бедныя таварышы па зброі Хрыста і Саламонавага храму). Вядома, такога значэньня слова pauper ніколі не існавала, яго ня знойдзеш у ніводным слоўніку. Але дапусьцім, Скарына сапраўды быў паўпэрам у сэнсе “ордэнскім братам”. Толькі чаму ў такім выпадку першадрукар прыпісаны да тампліераў? Сябры ўсіх манаскіх ордэнаў давалі зарок беднасьці і ў гэтым сэнсе былі “паўпэрамі”. А мо Скарына быў дамініканцам, а мо францішканцам ці якім яшчэ каталіцкім манахам? (Да Агіевіча Скарыну называў манахам толькі цьвёрды ленінец Вільгельм Кнорын.) Скажам, сябры ордэну шпітальнікаў (пазьней — Мальтанскі закон) называлі сябе “беднымі братамі шпіталя святога Яна”. Свой пасаж Агіевіч пачынае з пабочнага слова “ўспомнім”: “Успомнім, што да часу Скарыны існаваў ордэн храмоўнікаў…” Асабіста я цьвёрда памятаю, што ордэн храмоўнікаў быў разгромлены да пачатку XIV ст. сьвецкімі ўладарамі, а рэшткі яго маёмасьці адышлі да янітаў. Дарэчы, яніцкія структуры рэальна існавалі ў пачатку XVI стагодзьдзя ў Польшчы і Чэхіі, у прыватнасьці ў Празе. Дык можа, Скарына быў “паўпэрам”-янітам, г.зн. мальтанскім рыцарам-манахам? Аднак абыходжаньне Агіевіча са словам pauper яшчэ больш складанае і дробязнае. Намагаючыся пазбавіць яго ўсялякага адценьня “беднасьці”, абаронца масонскай плыні ў скарыназнаўстве пачаў перакладаць назву ордэну храмоўнікаў як “зрэбныя сутаварышы” (абы каб ня “бедныя сутаварышы”), хоць слова “зрэбныя” мае іншае значэньне — “зроблены са зрэб’я — грубой кудзелі, палатна”. І на гэтым гульня са словамі ня скончылася. Як слушна заўважыў а. Аляксандар, Агіевіч вельмі своеасабліва пераклаў назву ордэну тампліераў — “Зрэбныя сутаварышы Хрыстовы Храму Саламонавага”. Ранейшыя пераклады, граматычна слушныя (“…Хрыста і Саламонавага храму”) былі ім адкінутыя. І што цікава, на абвінавачаньні ў памылковасьці перакладу Агіевіч адказвае толькі ў агульным пляне: традыцыйны пераклад быццам залічвае ордэнскіх братоў у лік апосталаў Хрыста, а таму памылковы. Па-першае, зь перакладу гэта зусім не вынікае. Па-другое, хай бы сабе і вынікала — але гэта ўяўленьні

тых, хто прыдумаў такую назву. Нашто ж выстаўляць іх дурнямі — у іх былі свае ўяўленьні пра Хрыстовых вояў. І вынік, які відавочна выцякае з аналізу лінгвістычных практыкаваньняў абаронцы масонства Скарыны: праклямуецца літаральная дакладнасьць пры перакладзе тэкстаў, калі яна на карысьць уяўленьняў аўтара. Калі не — тым горш для яе, тады яна — памылковая бессэнсоўная літаральнасьць, тады гэта памылкі пісцоў і перапісчыкаў. Адна з асноўных тэмаў у Агіевіча — сымбалічнае расчытаньне выяваў на гравюрах Скарыны. Прычым чытаюцца яны з пазыцый масонскіх уяўленьняў. Клеткі пляцёнага кошыка — сымбаль калізіі на шляху пазнаньня. Барэт Скарыны — рытуальная павязка. Дый сам Скарына на сваім партрэце паказаны не ў кабінэце, а ў Храме ісьціны (ён жа храмоўнік!). На адпаведныя папрокі а. Аляксандра Агіевіч адказвае абвінавачаньнямі ў верхаглядзтве, і кожны з апанэнтаў застаўся ў сваёй сыстэме каардынатаў — хрысьціянскай і масонскай. Збліжэньне бакоў тут, відавочна, немагчымае. Нешта дыскутабэльнае можна намацаць пры абсьледаваньні астранамічнага матар'ялу. Зоркі, у адрозьненьне ад сымбаляў, існуюць аб'ектыўна. Агіевіч, які да гэтай пары не дачакаў акадэмічнай экспэртызы сваіх пабудоў, не задаволены водгукам а. Аляксандра — выпускніка Лёнданскага ўнівэрсытэту. Яму дастаткова ведаў, атрыманых у СШ № 19 г. Менску. Якое супадзеньне! Будучы выпускніком той самай школы, я магу размаўляць з Агіевічам на роўных, як астраном з астраномам. Вядома, Агіевічу так і не ўдалося даказаць існаваньне ў часах Скарыны сузор'я з назвай Пчала (Муха). Тры-чатыры зоркі на небе побач зь вядомым са старажытнасьці сузор'ем Авен (а цяпер у межах гэтага сузор'я) былі вылучаны як асобнае сузор'е Пчалы (Мухі) ужо пасьля Скарыны. На працягу сваёй кнігі Агіевіч шматкроць пісаў, што, "магчыма", "верагодна", было яно ў часы Скарыны. У адказе а. Аляксандру ён ужо не дапускае ніякай няпэўнасьці ў існаваньні Мухі пры Скарыну. Увераваў сам у яго існаваньне? Шчасьлівыя тыя, што вераць! Далей ідзе ўжо матэматыка. Для яе праверкі сапраўды даволі ведаў сярэдняй школы ці, прынамсі, самаадукацыйнага курсу астралёгіі. Так што палічым. Для пачатку трэба адзначыць, што астраном Агіевіч шырока карыстаецца зорнай мапай паўночных сузор'яў 1532 году, узятай ім з кнігі Мікалая Марозава "Прарокі" (1914). Мапа, безумоўна, вартая ўвагі, але мушу

адзначыць, што гэта копія (праўда, люстраная) славутай мапы Альбрэхта Дзюрэра з 1515 году. Гэтую мапу ведала ўся Эўропа, яе шмат капіявалі. Магчыма, зь ёю быў знаёмы і Скарына. Сузор'я Мухі на мапе Дзюрэра (і на мапе 1532 г.), ясна, няма. Дзюрэр ужывае экліптычную сыстэму нябесных каардынатаў, добра прыдатную для астралягічных разьлікаў. Нябеснае паўшар'е на ёй абмежавана кругам экліптыкі — гадавога шляху Сонца па зорным небе. Адпаведна, у цэнтры мапы паказаны полюс экліптыкі, а не Паўночная зорка. Зоркі нанесены на гэтую мапу ў адпаведнасьці з каардынатамі, якія апублікаваў для ўсеагульнага ўжытку славуты астраном старажытнасьці Пталямэй (II ст. ад Н.Х.). Рызыкую памыліцца, але Агіевіч, пэўна, пры сваіх астранамічных пабудовах скарыстаўся менавіта з мапы Дзюрэра 1515 году (1532 г.). Паглядзеўшы на яе і не знайшоўшы там ніякага сузор'я Пчалы (Мухі), ён напісаў проста: "Пчала пазначана сярод задыякальных сузор'яў простай сукупнасьцю зорак". Іншымі словамі, хоць яе там няма, яна там ёсьць. (Выклікае зьдзіўленьне і выраз "сярод задыякальных сузор'яў". Што ён абазначае, зусім не зразумела. Нават на тых мапах, дзе Пчала сапраўды ёсьць, яна пазначаецца збоку ад сузор'я Авен, а не "сярод"). Пасьля быў зьмераны вугал, пад якім знаходзіцца купка зорак — пазьнейшае сузор'е Пчалы. Пунктам адліку быў, натуральна, пункт вясновага раўнадзенства — старажытная і сучасная аснова каардынатаў. Вугал складае прыблізна 13 або 347 градусаў, гледзячы ў які бок ісьці — направа або налева. Даспадобы аказаўся лік 347, бо ў манаграме МТЗ на партрэце Скарыны Агіевіч бачыць стараславянскі лік 347. Усё сыходзіцца, прынамсі Пчала зь лікам 347? Нічога не сыходзіцца. Сапраўды, усе лічаць ад пункту вясновага раўнадзенства. Але ідуць ад яе па шляху Сонца, з усходу на захад, на мапе 1532 году — направа. Гэта добра відаць па яе градуіроўцы. Каардыната даўгаты купкі зорак пазьнейшага сузор'я Пчалы — каля 13 градусаў. І завецца гэтая каардыната менавіта даўгатой (пазначаецца грэцкай літарай лямбда). Мала таго што Агіевіч "закруціў" адлік каардынатаў ня ў той бок, але і зблытаў назву каардынаты. Існуе яшчэ адзін спосаб праекцыі зорнага неба на аркуш паперы — у цэнтры яго знаходзіцца полюс сьвету і сузор'е Малая Мядзьведзіца. Мы ўсе бачылі такія зорныя мапы ў школьным падручніку. Тая каардыната, якая ў экліптычнай сыстэме

каардынатаў завецца даўгатой, тут абазначаецца тэрмінам “прамое ўзыходжаньне” і грэцкай літарай альфа. Такі тэрмін і літару ўжывае Агіевіч. Дык можа, ён карыстаўся нейкай мапай зорнага неба зь менавіта такой, экватарыяльнай сыстэмай каардынатаў? Наўрад ці, бо карціна зорнага неба на ёй іншая. Тут вугал паміж пунктам вясновага раўнадзенства і групай зорак Пчалы складае каля 40 градусаў. Гэта калі браць сучасны пункт вясновага раўнадзенства. Калі браць яго на 1500 год, то вугал складзе каля 34 градусаў. Калі ж гэты вугал вымяраць на мапе Дзюрэра 1515 году (1532 г.), то ён складзе каля 10 градусаў. Карацей, поўны разнабой, які ніяк не пацьвярджае пабудоў Агіевіча. Ён, на жаль, не апісвае мэтодыкі сваіх падлікаў, так што дакладна прайсьці па ягоных сьлядах у вымярэньні касьмічных мух немагчыма. Затое можна зрабіць некалькі назіраньняў над адпаведнай касьмічнай тэрміналёгіяй. Агіевіч упэўнены, што вымярэньні вугла ўзыходжаньня робяцца ў дзень вясновага раўнадзенства ад Авена. У сучаснай астраноміі няма тэрміну “вугал узыходжаньня”, ёсьць “прамое ўзыходжаньне”. І вымяраць гэтую каардынату нябесных целаў можна ня толькі ў дзень вясновага раўнадзенства, але і ў любы іншы дзень году, а яшчэ лепш — у любую ноч, калі відаць зоркі (што такое “ад Авена”, увогуле не зразумела). Яшчэ з таго ж курсу школьнай астраноміі. Шлях Сонца па небе — экліптыка — нязьменны (амаль што нязьменны). Сонца праходзіць 12 задыякальных сузор’яў (у цяперашні час — 13 сузор’яў, бо так падзялілі неба). Між тым неаднойчы ў сваіх працах Агіевіч піша, што сузор’е Пчала (Муха) “зьяўляецца ў экліптыцы”. Верагодна, ён хацеў напісаць “Сонца зьяўляецца ў сузор’і Пчалы”? Бог ведае. Толькі Сонца ніколі не знаходзілася ў сузор’і Пчалы, ні раней, ні ў цяперашні час: яго шлях ляжыць убаку ад той групы зорак. Але для Агіевіча гэта пытаньне прынцыповае. Мала таго што ён упэўнены, нібы Пчала зьяўляецца ў экліптыцы, але і думае, што гэты незвычайны момант адбываецца акурат на 23 красавіка паводле старога стылю, г.зн. у дзень сьвятога Георгія (таму Скарына — Георгі!). Прымусіўшы рухацца нерухомыя зоркі, Агіевіч прапануе ўсім ахвотным упэўніцца ў гэтым, “узяць астранамічныя прыборы і вызначыць час зьяўленьня Пчалы ў экліптыцы” (г.зн. на шляху Сонца). Калі няма ахвоты маніпуляваць “прыборамі”, прапануецца паглядзець на зорныя мапы Яна Гевелія (XVII ст.) і

Каміля Флямарыёна (канец XIX ст.). Паглядзеўшы на твор Гевелія, можна ўпэўніцца яшчэ раз, што група зорак Пчалы адстаіць ад пункту вясновага раўнадзенства прыкладна на 13 градусаў, як, урэшце, і на зорных мапах 1515 і 1532 гадоў. Сонца пройдзе 13 градусаў нябеснага шляху адносна нерухомых зорак прыкладна за 13 дзён. Калі прыняць, што веснавое раўнадзенства прыпадае на 10 сакавіка (так думаў Скарына), то аднолькавая даўгата ў Сонца і Пчалы будзе прыкладна 23 сакавіка паводле старога стылю. Да 23 красавіка яшчэ вельмі далёка. У цяперашні час веснавое раўнадзенства прыпадае на 21 сакавіка паводле новага стылю. Прыбаўка 13 дзён (час "падарожжа" Сонца) дае дзень 3 красавіка паводле новага стылю, або 21 сакавіка паводле старога. Зноў жа, ніяк ня дзень 23 сакавіка, дзень сьвятога Георгія. На мапе Флямарыёна, як сьцьвярджае Агіевіч, сузор'е Пчала (Муха) зьяўляецца ў экліптыцы 23 красавіка паволе старога стылю. Фраза гэтая ўвогуле пазбаўлена сэнсу. На той мапе, натуральна, няма ні Пчалы, ні Мухі. Мапа Флямарыёна мае экватарыяльную сыстэму каардынатаў, пункт веснавога раўнадзенства прыпадае на 21 сакавіка паводле новага стылю. Паказана і лінія экліптыкі, якая, канечне, праходзіць удалечыні ад групы зорак Мухі. Прамое ўзыходжаньне гэтай купкі зорак — каля 40 градусаў. Сонца такое прамое ўзыходжаньне мае прыкладна 29 красавіка паводле новага стылю. Зноў жа, дзень сьвятога Георгія тут ніяк не выпадае. Верагодна, ня варта, як прапануе Агіевіч, зноў вылучаць на небе новае-старое сузор'е Пчалы і называць яго "Пчала Скарыны". У крайнім выпадку, улічваючы, колькі працы пакладзена на яго прапаганду, сузор'е можна назваць "Муха Агіевіча". Увогуле, шаноўнаму астраному варта было б больш дэталёва расьпісваць свае астранамічныя і матэматычныя вылічэньні, каб іх можна было спраўдзіць. На цяперашні дзень яны не даказваюць нічога. Паўтарыўшы каторы раз сьцьвярджэньні пра Муху як "астранім" Скарыны ("астранім" — наватвор Агіевіча, нешта падобнае на "астранамічны псэўданім"), тэарэтык масонскай скарыніяны пераходзіць да яшчэ аднаго "псэўданіму" першадрукара. Такім падаецца скарынаўскі "Феоктист", інак канстанцінопальскага Студыйскага манастыра. Агіевіч ня здолеў адшукаць такога манаха ў аналах гісторыі, а а. Аляксандар — здужаў (праўда, не спаслаўшыся на крыніцу). Агіевіч тут нічога аспрэчваць ня стаў:

пэўна, прызнаў сваю паразу. Але робіць сустрэчны выпад: усе царкоўныя гімнографы, маўляў, павінны пісаць акафісты, бо інакш гэта не гімнографы. Толькі параўнаньне з паэтам бязь вершаў тут кульгае: трэба, хутчэй, весьці размову пра паэтаў, якія ня пішуць паэмаў. Ёсьць такія паэты, як ёсьць гімнографы, што ня пішуць акафістаў! Ужо ў антычныя часы складаліся гімны, толькі не хрысьціянскія, а язычніцкім багам. Пасьля зьявіліся хрысьціянскія гімны. У прыватнасьці — акафісты. Мабыць, на поле праціўніка Агіевічу ня варта было заходзіць. А параўнаньне "студыёзус, г.зн. студыт" — такое ж лінгвістычнае "адкрыцьцё", як вывядзеньне назвы Каложы ад слова "кола" (чаму не ад "калошы"?). Што безумоўна новага ўнёс Агіевіч у скарыназнаўства — дык гэта пытаньне, ці быў Скарына сябрам нейкай таемнай суполкі або інтэлектуальнай карпарацыі. Праўда, адказ на гэтае пытаньне атрымаўся нейкім дзіўным, размытым, хоць і адназначным — быў. Сьцьвярджаецца, што Скарына, уступаючы ў нейкую суполку, прыдбаў сабе каталіцкае імя Францішак. Што гэта за суполка, Агіевіч указвае па-рознаму: эзатэрычная арганізацыя — карпарацыя кніжнікаў — манаска-рыцарскі ордэн тампліераў ("паўпэраў" у аўтарскай тэрміналёгіі). Вось гравюра з партрэтам першадрукара. Агіевіч адразу ўказвае на падабенства скарынаўскіх знакаў на масонскія, а дзьве дэкаратыўныя калёны атаясамлівае зь дзвюма рытуальнымі калёнамі ў масонскіх апартамэнтах. Далей усё наяўнае на гравюры трактуецца ў масонскім духу. Само памяшканьне — гэта Храм (зь вялікай літары, "частка вялікага Храму Ісьціны"), які павінен мець зорную столь і падлогу ў шахматную клетку. Праўда, у гравюрным памяшканьні столь зусім нябачная, а падлога проста белая. Гэтыя цяжкасьці Агіевіча не бянтэжаць: на столь ён не зьвяртае ўвагі, а падлогу лічыць увогуле заслоненай… дошкаю стала. Тыя рэчы, якія, лічылася, стаялі на падлозе, — лавы, кошыкі, сьвечку — Агіевіч прапаноўвае лічыць пастаўленымі на стале. А масонскія шахматныя клетачкі ён знаходзіць у перапляценьні лыкавых палос кошыкаў (для Агіевіча гэта крыптаграфія, то бо зашыфраваная ідэя; адсюль той даўгі пасаж, на які зьвяртае ўвагу а. Аляксандар). Зыходзячы з масонскай сымболікі, Агіевіч бачыць на Скарыну не барэт, а сымбалічную павязку, зьнятую з вачэй (стаў відушчым у масонскім Храме!), а на пюпітры — не абрус з гербам першадрукара, а масонскі рытуальны фартух,

зноў жа з масонскаю сымболікаю, і г. д. Пасьля такой масонскай атакі чытач пачынае думаць, што Скарына сапраўды быў масонам, хай сабе і падпольным. Для Агіевіча Скарына не масон, а протамасон. Чым протамасоны адрозьніваюцца ад проста масонаў, аўтар не тлумачыць — пэўна, яшчэ ня вырашыў. Але ня тым, што протамасонства — гэта зародак сапраўднага масонства. З аднаго боку, Агіевіч сьцьвярджае, што ў часы Скарыны масонства не існавала. З другога — некаторых сучасьнікаў Скрыны Агіевіч лічыць сапраўднымі масонамі — Парацэльса, Эразма Ратэрдамскага. Значыць, паралельна існавалі сапраўдныя масоны і протамасоны, якія ў нечым адрозьніваліся ад першых. У такім выпадку іх лягічней называць “паралельнымі масонамі”, парамасонамі. Бяда для Агіевіча толькі ў тым, што “далучанасьць Скарыны да закрытай арганізацыі протамасонскага тыпу нельга пацьвердзіць юрыдычна-дакумэнтальна” (прызнаньне самога аўтара), таму і ідуць у ход маніпуляцыі з гравюрамі. З антуражам гравюрнага партрэту Скарыны ўсё, бадай, прасьцей. Рэчы вакол Скарыны — звычайныя для тых часоў, і сустрэць іх можна на многіх партрэтах інтэлектуалаў канца XV — пачатку XVI стагодзьдзяў. Можна нават паказаць на той партрэт, які паслужыў узорам для партрэту нашага першадрукара. Ужо стала агульным месцам скарыназнаўства параўноўваць перакладчыцкія і кнігавыдавецкія вычыны Скарыны зь дзейнасьцю славутага перакладчыка Бібліі на лаціну Гераніма (IV—V стагодзьдзі). Параўноўвалі і іх партрэты. Гравіраваную на медзі выяву Гераніма зрабіў Альбрэхт Дзюрэр. Гэты партрэт, што датуецца 1514 годам, — сапраўдны шэдэўр славутага мастака, можа, найлепшая яго гравюра. З-за яе адышоў у цень і невядомы “люду паспалітаму” іншы партрэт Гераніма, зроблены тым жа мастаком у 1511 годзе. Канечне, ён саступае пазьнейшаму, але і сам уяўляе значную мастацкую вартасьць. Параўнаньне яго з партрэтам Скарыны 1517 году паказвае: акурат яго і меў перад вачыма мастак Скарыны, калі выразаў выяву Палачаніна. У кабінэце (кельлі) Гераніма можна пабачыць амаль усе тыя рэчы, што абкружаюць і Скарыну, адно што яны перастаўлены па-свойму. Леў, сымбаль Гераніма, на партрэце Скарыны заменены на пчалу (муху). Параўнаньне абодвух партрэтаў можа патлумачыць некаторыя дэталі на скарынаўскім партрэце. Мастацтвазнаўцам не давала спакою нязграбна пастаўленая

правая нага першадрукара і падстаўка пад яе. Для Агіевіча гэта ўвогуле не нага і не падножжа, а “матэрыяльныя прадметы рытуальнага характару” — бажніца, або скінія, або каўчэг запавету, або ківот на падстаўцы, вечка для пераносу якога выразна выпірае з-пад покрыва (далей ідзе вытлумачэньне ў масонскім стылі). Як відаць на партрэце Гераніма, гэта ўсё ж нага, адно што мастак, прыбраўшы з гравюры льва, ня здолеў прафэсійна паказаць, як ступня стаіць на падлозе ці падножжы. “Чэрствыя боханы хлеба” — “праснакі чысьціні і ісьціны” Агіевіча — гэта звычайныя падушкі на лавах. Сымбалічныя кнігі-“камяні”, пастаўленыя на доўгую бакавіну абрэза, можна пабачыць і на партрэце Гераніма, так што гэта самыя звычайныя кнігі (Агіевіч чамусьці ўпэўнены, што іх так ніколі ня ставілі). Натуральна, і партрэт Гераніма можна вытлумачыць у тым жа масонскім духу. Але Агіевіч чамусьці ня схільны да гэтага ў адносінах да іншых твораў мастацтва, яму дастаткова партрэту Скарыны (“… “другарадныя” прадметы … ў Дзюрэра ня маюць сімвалічнага сэнсу (і не могуць яго несьці з-за сваёй выпадковасьці), у той час як у Скарыны ніводзін зь іх не пазбаўлены дэманстратыўнай сімвалічнасьці”). Запэўніваю, што ў любой выяве можна знайсьці масонскі сэнс, трэба толькі капануць глыбей ды паскрэбці мацней… Масонская гіпотэза Агіевіча — неад’емны складнік ягонай тэорыі пра праваслаўе Скарыны. Дасьледнік мяркуе, што праваслаўным Скарына застаўся на ўсё жыцьцё, дарма што быў сябрам каталіцкага манаскага ордэну тампліераў. Але з новых доказаў праваслаўнай арыентацыі Скарыны Агіевіч прыводзіць толькі адзін (ня лічачы “пчалінай” астраноміі): у сваёй “Пасхаліі” першадрукар тройчы называе Вялікдзень (Пасху) “наша”. Адсюль разважаньні Агіевіча: “Калі “каталік” называе “сваёй” Пасху праваслаўных людзей, дык пэўна ён…” і г. д. Але ж каталіцкі і праваслаўны Вялікадні пачынаюць розьніцца ў календары толькі з 1583 году, да таго яны сьвяткаваліся ў адзін дзень. Так што вызначэньне “наша” ў адносінах да найвялікшага хрысьціянскага сьвята Скарына, пэўна, рабіў толькі дзеля таго, каб адрозьніць яго ад жыдоўскай пасхі. Першадрукар відавочна ня быў юдзеем, але такую выснову цяжка назваць арыгінальнаю. На тле твораў Агіевіча некаторыя асаблівасьці тэкстаў Скарыны праступаюць надзвычай ярка. Узяць тое ж вызначэньне Гераніма, перакладчыка Бібліі на

лаціну. Для заходняга хрысьціянства ён сьвяты, для праваслаўных — толькі блажэнны. У Агіевіча Геранім заўсёды вызначаецца як блажэнны. Адсюль пабочны наглядальнік можа зрабіць выснову, што сп. Агіевіч калі не праваслаўны вернік, то ўсё ж мае асаблівую ласку да праваслаўнай царквы і яе пастулятаў. А адносна Скарыны той жа наглядальнік зробіць супрацьлеглую выснову: першадрукар стаіць на пазыцыях каталіцкага вучэньня, бо заўсёды называе Гераніма сьвятым. Зрэшты, гэты аргумэнт пра канфэсійную прыналежнасьць Скарыны ўжо шматразова разглядаўся навукоўцамі, і далейшыя разважаньні тут ужо непатрэбныя. Выглядае, што Агіевічу не ўдалося даказаць ні праваслаўную веру ў Скарыны, ні схільнасьць яго да (прота)масонскіх арганізацыяў і вучэньняў, ні праваслаўнае (хрышчонае) яго імя Георгі. Сваіх апанэнтаў Агіевіч абвінавачвае ў рознага роду махлярствах, іх довады — “неарыгінальны ход аматараў перарабляць усё на свой капыл”. У яго самога, канечне, шмат арыгінальных хадоў, толькі што датычыць капыла, то ён зноў жа “свой”, на гэты раз — праваслаўны. Скарыну як цягнулі ў розныя бакі, так і цяпер цягнуць. Відаць, гэта непазьбежна.

Мал. 1. Невядомы мастак. Доктар Францішак Скарына. 1517. Дрэварыт. Мал. 2. Альбрэхт Дзюрэр. Сьвяты Геранім. 1511. Дрэварыт.